9-2008

# ARCHE

П А Ч А Т А К

9-2008



**ARCHE 9 (72)**
**верасень 2008**

9-2008 ARCHE ПАЧАТАК 9-2008

**Навуковы, навукова-папулярны, грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «ARCHE Пачатак» выдаецца зь верасьня 1998 году штомесяц.**

**РЭДАКЦЫЯ:**

**Валер Булгакаў** — галоўны рэдактар
**Віктар Жыбуль** — рэдактар
**Алена Казлова** — сакратарка рэдакцыі
**Аляксандра Макавік** — рэдактар
**Сяргей Макарэвіч** — распаўсюднік

**ARCHE is a Partner of European Cultural Journals Network Eurozine (www.eurozine.com)**

**Адрас для допісаў:** ARCHE, а/с 3, 220018, Менск-18.
**E-mail:** arche@arche.org.by.

Часопіс можна замовіць у распаўсюднікаў:

**Баранавічы** — Руслан Равяка, п/с 13, 225409, Баранавічы-9, тэл. (029) 767-20-37.

**Барысаў** — Алег Лучына, п/с 714, 222120, Барысаў-1, тэл. (029) 33-99-161.

**Берасьце** — Ігар Бараноўскі, тэл. (0162) 25-61-55.

**Віцебск** — Барыс Хамайда, тэл. (0212) 34-52-41.

**Гомель** — Ларыса Шчыракова, тэл. (029) 341-66-94; Дзяніс Федарэнка, тэл. (029) 733-55-22.

**Полацак** — Алесь Аркуш, тэл. (0214) 41-85-19.

**Магілёў** — Алесь Асіпцоў, тэл. (0222) 25-57-85, (029) 625-57-85.

**Менск** — Сяргей Макарэвіч, тэл. (029) 505-39-11.

Шукаем распаўсюднікаў зь іншых мясьцінаў.

**Падпіска на часопіс «ARCHE Пачатак» прымаецца ўва ўсіх аддзяленьнях «Белпошты».**

**Заснавальнік:** Андрэй Дынько.
**Выдавец:** установа «Рэдакцыя часопісу «Архэ-Пачатак».
Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 530 ад 4.05.2001.
ISSN 1392-9682
**Юрыдычны адрас:** вул. Нававіленская 24/1А, каб. 2П, 220053, Менск.
Цана дамоўная.

Рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе рукапісаў. Рэдакцыя рэдагуе матэрыялы, прынятыя да друку.

Падпісана ў друк 28.09.2008.
Выхад у сьвет 30.09.2008. Фармат 70x100 1/16.
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная. Ум. друк. арк. 15,5.
Наклад 500 асобнікаў. Замова

Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка ў друкарні ТАА «Палікрафт», вул. Кнорына, 50, 220103, Менск.

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаны фрагмэнт карціны Мікалая Апіёка. Фота Зьмітра Веліча. Дызайн Ягора Шумскага.

© «ARCHE Пачатак», 2008

**Падпісны індэкс 00345**

**ARCHE on-line:** http://arche.by

9-2008 ARCHE 9-2008

ЗЬМЕСТ


ВЫБАРЫ 2008

5 **ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ** Гульня на падвышаных стаўках

12 **ЮРЫ ЧАВУСАЎ** Расстаноўка сілаў у беларускай апазыцыі напярэдадні парлямэнцкіх выбараў

21 **ТАЦЯНА ЧУЛІЦКАЯ** Расейска-грузінская вайна ў мэдыйнай прасторы Беларусі

31 **ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ, ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ** Пасьля парлямэнцкіх выбараў: трансфармацыя без дэмакратызацыі

43 **ЭНДРУ ЎІЛСАН** Беларускія выбары пасьля вайны ў Грузіі: новая парадыгма або старая эквілібрыстыка?

АПЫТАНЬНЕ

51 Чаму я стаў грамадзкім актывістам, а мае аднаклясьнікі — не?

АНАЛІТЫКА

79 **ІРЫНА ВІДАНАВА** «Новыя СМІ» як форма моладзевага супраціву

89 **ЮРЫ ДРАКАХРУСТ** Культурныя тыпы і палітычны працэс

96 **АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ** Пакаленьні ў Беларускім Народным Фронце

100 **ВЯЧКА СТАНКЕВІЧ** Новая хваля эміграцыі: розныя мэты і каштоўнасьці

ГІСТОРЫЯ

106 **ВІКТАР ЖЫБУЛЬ** Футурыстычная мара беларусаў. Дзейнасьць «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны» ва ўспамінах і дакумэнтах

149 **ЛУКАН УЭЙ** Сіла і слабасьць сучасных аўтарытарных рэжымаў

158 **КЭТЛІН ХЭНКАК** Паўсувэрэнная незалежная дзяржава: Беларусь і расейская нэаімпэрыя

ЛІТАРАТУРА

183 **АНДРЭЙ ДЫНЬКО** Пасажыры танных ліній

185 **АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ** Дом творчасьці. Выбраныя месцы перапіскі з фрэндамі

ЭСЭІСТЫКА

194 **НОАМ ХОМСКІ** Як разумець сыстэму ўлады

IN MEMORIAM

235 **ВАСІЛЬ АЎРАМЕНКА** Ад дысыдэнта да імпэрыяліста. Аляксандар Салжаніцын і яго шлях

**USEFUL LINKS:**
**International Visegrad Fund:**
**www.visegradfund.org/**
*Official webpage of the Fund: overview of all programs including the rules, applications and the complete lists of previously-supported projects; project partner-search engine; calendar of currently-running projects; useful links; basic information about the Fund*
**Offi cial Portal of the Visegrad Group:**
**www.visegradgroup.eu/**
*Daily news updates from the region; calendar of events; useful links; basic information about the Czech Republic, the Republic of Hungary, the Republic of Poland and the Slovak Republic; official documents; essays and articles; photoand video-gallery and much more*

**The Visegrad Group (also known as the „Visegrad Four“ or abbreviated into „V4“) is the regional alliance of four Central European countries —the Czech Republic, the Republic of Hungary, the Republic of Poland and the Slovak Republic.**

● The Group was initiated as the so-called “Visegrad Three” on 15 February 1991 at a meeting of President of the Czechoslovak Republic, Vaclav Havel, President of the Republic of Poland, Lech Walesa, and Prime Minister of the Republic of Hungary, Jozsef Antall. After the split of Czechoslovakia in 1993 the Visegrad Group became the “Visegrad Four”. The name “Visegrad” is derived from the venue of the meeting — the medieval town of Visegrad located in Northern Hungary. ● Establishment of the Visegrad Group in 1991 was based on the principle of mutual solidarity and common shared values such as modern state of law, parliamentary democracy and modern free market economy.

# Scholarships for Belarusian Students

**● As of 2009, International Visegrad Fund opens a special program for Belarus. The program off ers 80 semesters of scholarship funding solely for students and scholars from Belarus who wish to study at any public or private accredited university in the Visegrad Group countries. They can apply for Master’s or Post-Master’s (Post-Graduate) scholarships in the lengths of 1 to 4 semesters.**

**For more information, see www.visegradfund.org/scholarships.html.**

**Visegrad Find:**
**visegradfi nd.visegradfund.org/**
***On-line notice-board for project partnersearch***
**The offi cial language of the Visegrad Group and of the International Visegrad Fund is English.**

Visegrad Fund

**INTERNATIONAL VISEGRAD FUND**
**Kralovske udolie 8, 811 02**
**Bratislava, Slovak Republic**
**Tel.: +421 259 203 811**
**Fax: +421 259 203 805**
**www.visegradfund.org**
**www.visegradgroup.eu *(official portal of the Visegrad Group)***

● Presently, the Visegrad Group operates as a cooperation and consultation forum among the four Central European countries on various issues and at various levels. Regular annual or bi-annual meetings are held by the prime ministers, foreign ministers, heads of states and other state institutions. ● Since 2004 the four Visegrad Group countries have been members of the European Union. After having achieved the key initial aim — the countries’ mutual entry into the European structures —the Visegrad Group has shifted part of its interests towards other neighboring countries, aiming at preventing any future “Iron Curtains” in the region of East, Central and South-Eastern Europe. The priority countries fall within the Eastern Dimension of the European Neighborhood Policy — i.e. countries on the Group’s Eastern border such as Belarus and Ukraine — and countries of the Western Balkans. ● The International Visegrad Fund was established in 2000 as the only institution of the Visegrad Group with the mission to fund joint projects in the fields of culture, education, scientific exchange and research, youth exchange, cross-border cooperation and promotion of tourism. Presently it runs 4 grant programs, 3 scholarship programs and an artist residency program in 11 annual deadlines. The main recipients of the grant programs are non-governmental non-profit organizations, municipalities and individual citizens.

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

# Гульня на падвышаных стаўках

## Імкненне афіцыйнага Мінска да легітымізацыі на фоне геапалітычнага крызісу ў рэгіёне

На працягу ўсяго толькі чатырох дзён, з 16 па 19 жніўня 2008 г., былі выпушчаныя з турмы былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін і два ўдзельнікі студзеньскай прадпрымальніцкай акцыі пратэсту Андрэй Кім і Сяргей Парсюкевіч. Фармальна гэта прывяло да таго, што колькасць палітычных вязняў стала роўнай нулю. Выкананне галоўнага патрабавання Еўрапейскага Саюза і Злучаных Штатаў адкрывае магчымасць для нармалізацыі адносінаў Беларусі з Захадам. Аднак, паколькі саступкі афіцыйнага Мінска Захаду зноў адбыліся на фоне інтэнсіфікацыі прэсінгу Крамля на Беларусь, гэтыя дзеянні маглі быць звычайнай ужо для беларускіх уладаў спробай дробнага шантажу Крамля «нармалізацыяй» адносінаў з Захадам. Нават у такім разе ўсё больш агрэсіўныя паводзіны Расіі на тле вайны ў Грузіі могуць стварыць больш моцныя, чым раней, стымулы для афіцыйнага Мінска рухацца ў бок Захаду. У такой сітуацыі эфектыўная і дакладна вызначаная палітыка абумоўленасці (conditionality), сфармуляваная і Еўрапейскім Саюзам, і Злучанымі Штатамі, можа стаць ключавым фактарам, які паспрыяе пазітыўным зменам у краіне ў блізкім будучым.

### ВЫЗВАЛЕННЕ КАЗУЛІНА: ТРАПНЫ РАЗЛІК ЧАСУ?

Вызваленне Аляксандра Казуліна разам з правядзеннем свабодных і празрыстых парламенцкіх выбараў было вызначана як крытэр для пачатку нармалізацыі стасункаў паміж ЕС і ЗША з аднаго боку і Беларуссю з іншага. Магчымасць вызвалення Казуліна з турмы ўпершыню з'явілася ў лютым-сакавіку гэтага года,

***Віталь Сіліцкі** — палітоляг, сталы аўтар «ARCHE».*

пасля вызвалення ўсіх астатніх палітычных зняволеных (акрамя яго) і кароткага вызвалення самога Казуліна для ўдзелу ў пахаванні жонкі, эпізоду, які сур'ёзна падарваў давер да «лібералізацыйных» інтэнцыяў беларускіх уладаў. Гэтыя інтэнцыі, аднак, падобна, цалкам зніклі крыху пазней пасля канфрантацыі са Злучанымі Штатамі з нагоды санкцыяў супраць «Белнафтахіму», за якімі паследавала значнае скарачэнне колькаснага складу амерыканскай амбасады ў Мінску, жорсткі разгон дэманстрацыі 25 сакавіка, рэпрэсіі супраць журналістаў, якія працуюць на беларускія радыёстанцыі ў замежжы (і эфектыўная крымiналiзацыя іхняй працы без рэгістрацыі), і суворыя выракі для Кіма і Парсюкевіча. У той жа час адмова выпусціць Казуліна (і «назапашванне» палітычных зняволеных у красавіку) разглядалася намі як спроба падвышэння ставак у магчымым гандлі з ЕС, калі афіцыйны Мінск палічыць неабходным вярнуцца да дыялогу.

**Вызваленне Казуліна, Кіма і Парсюкевіча не было праявай добрай волі.**

Вызваленне Казуліна, Кіма і Парсюкевіча не было праявай добрай волі. Яно было ўхваленае якраз у той момант, які быў прыдатны для паляпшэння міжнароднага вобразу. Па-першае, некаторыя прыхільнікі рэжыму ўжо намякалі на тое, што ўрад разглядае выкананне адной з дванаццаці ўмоваў ЕС як максімум таго, што ад яго можна патрабаваць, і што працяг ціску прывядзе да разрыву адносінаў. Па-другое, вызваленне Аляксандра Казуліна магло адбыцца наўмысна, як спроба справакаваць новы раўнд змагання за апазіцыйнае лідэрства перад парламенцкімі выбарамі.

Па-трэцяе, вызваленне Казуліна, магчыма, было спробай кампенсаваць правал выканання іншага патрабавання ЕС і Злучаных Штатаў — правесці свабодныя і празрыстыя парламенцкія выбары. Уключэнне 32 прадстаўнікоў апазіцыі ў акруговыя выбарчыя камісіі падавалася пазітыўным крокам у бок лібералізацыі электаральных практык. Тым не менш, ужо падчас рэгістрацыі ініцыятыўных груп назіраліся прыкметы таго, што фармат выбараў не будзе радыкальна зменены ў параўнанні з папярэднімі выбарамі 2004 г. Як вынік, прынамсі тры сябры апазіцыі, якія спрабавалі зарэгістравацца ў якасці кандыдатаў у дэпутаты, былі звольненыя з працы пасля таго, як яны абвясцілі пра свой намер балатавацца, у той час як многія іншыя зазналі праблемы падчас збору подпісаў. Вынік фармавання ўчастковых выбарчых камісіяў (то бок тых, што будуць непасрэдна лічыць галасы) быў найбольш расчаравальны. Толькі 40 з 810 прэтэндэнтаў, вылучаных апазіцыйнай кааліцыяй «Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы», былі ўключаныя ў склад участковых выбарчых камісіяў. Разам было вылучана 69 845 сяброў 6485 участковых выбарчых камісіяў, хаця толькі 161 з іх прадстаўляе палітычныя партыі. Шанцы на прызнанне выбараў на Захадзе наблізіліся да мінімуму па выніках рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, якая закончылася 28 жніўня адмовай прыкладна 20 дэмакратычным прэтэндэнтам.

Прымаючы да ўвагі гэтыя тэндэнцыі, ёсць падставы сцвярджаць, што абяцанне «правесці выбары паводле самых высокіх стандартаў» так і не было выканана.

## ЗНЕШНІ ЦІСК ДА НАРМАЛІЗАЦЫІ: ГУЛЬНЯ ЗАХАДУ

За апошнія некалькі месяцаў можна было назіраць падвышэнне цікавасці да нармалізацыі адносінаў з Беларуссю. Прычыны такой цікавасці выходзяць далёка па-за рамкі практыкаванняў у паляпшэнні іміджу афіцыйнага Мінска, для чаго быў нядаўна наняты брытанскі лорд Цімаці Бэл. Цікавым момантам з'яўляецца працяглы (увесь год) удзел нямецкай амбасады ў закулісных перамовах з Лукашэнкам, першы раўнд якіх меў месца ўзімку 2008 г. Падчас другога раўнда, які распачаўся ў жніўні пасля рэзкай рэакцыі Масквы на нейтралітэт Лукашэнкі ў грузінскай вайне, якраз і магло быць развязанае пытанне вызвалення Казуліна. Цікава, што тое самае было паабяцана лордам Бэлам за лічаныя дні да вызвалення, але гэтае сцвярджэнне магло быць не болей як самапіярам спадара Бэла.

Зацікаўленасць у нармалізацыі выявілася таксама падчас дэбатаў у брытанскім парламенце, што адбыліся 16 ліпеня пад кіраўніцтвам апазіцыйнага дэпутата Марка Прытчарда, які ў траўні наведаў Беларусь з місіяй, якая чамусьці не патрапіла пад увагу СМІ. Прытчард заявіў, што бізнес лонданскага Сіці зацікаўлены ў інвестыцыях у Беларусь і што краіне трэба палепшыць сітуацыю з правамі чалавека. Яго стратэгія палягала ў тым, каб прапанаваць Мінску план дзеянняў (roadmap) дзеля пазбаўлення ад найбольш нязручных аспектаў палітычнай ізаляцыі праз выкананне мінімальных палітычных умоваў — такіх, як вызваленне палітычных вязняў і правядзенне справядлівых і празрыстых выбараў, нават калі яны не прывядуць да стварэння значнага апазіцыйнага прадстаўніцтва ў Палаце прадстаўнікоў. Прымаючы да ўвагі той факт, што «лонданскі Сіці» можа быць прадстаўлены і расійскім капіталам, які атабарыўся на берагах Тэмзы, такі рух у кірунку нармалізацыі цалкам можа кіравацца тымі ж самымі саюзнікамі афіцыйнага Мінска, на інвестыцыі якіх ён так разлічвае. Некаторыя з гэтых бізнесовых інтарэсаў таксама могуць разглядаць Беларусь як бяспечнае месца для правядзення іхніх аперацыяў і, магчыма, як трамплін для вяртання ў Расію. Гэта цалкам можа пацягнуць за сабой паляпшэнне міжнароднай рэпутацыі Беларусі.

## «ПРИНУЖДЕНИЕ К ДРУЖБЕ» — ГУЛЬНЯ РАСІІ

Беларуска-расійскія адносіны застаюцца вызначальным фактарам ва ўнутрыпалітычнай дынаміцы Беларусі, гэтаксама як у адносінах паміж Беларуссю і Захадам. Узаемадзеянне Мінска з ЕС і Злучанымі Штатамі было проста функцыяй ад стасункаў паміж Мінскам і Крамлём. Ёсць прычына меркаваць, што гэта формула зноў паўтараецца: насамрэч, пацяпленне адносінаў Мінска і Бруселя адбываецца ў той час, калі Расія дэманструе большую самаўпэўненасць і агрэсіўнасць што да Беларусі (у адрозненне ад перыяду лютага-красавіка, калі падчас перадачы ўлады Крэмль быў гатовы пакінуць прымальныя цэны на газ і падтрымаць Беларусь у дыпламатычным канфлікце з ЗША).

Аднак у гэтай мадэлі з'явіліся важныя змены. Набліжэнне новага раўнда перамоваў з Расіяй па цэнах на газ адбываецца на фоне абяцання Крамля і надалей зніжаць энергетычныя субсідыі і патрабавання прыватызацыі найважнейшай

беларускай інфраструктуры расійскім капіталам. Беларуска-расійскія адносіны не зазналі сур'ёзных зменаў з часу інаўгурацыі Дзмітрыя Мядзведзева ў якасці новага прэзідэнта Расіі і зацвярджэння Уладзіміра Пуціна на пасадзе прэм'ер-міністра 7 траўня 2008 г. Хутчэй можна сказаць, што ўзмацніліся тыя тэндэнцыі, якія ўжо крышталізаваліся за апошнія некалькі гадоў. У прыватнасці, Масква зрабілася больш настойлівай у падвышэнні сваёй эканамічнай ролі ў бліжэйшым замежжы (як прыклад можна прывесці ініцыятыву Мядзведзева зрабіць расійскі рубель рэгіянальнай рэзервовай валютай). У Беларусі гэтая настойлівасць увасобілася ў шматлікіх дэкларацыях і прэм'ера Пуціна, і расійскага амбасадара ў Беларусі Аляксандра Сурыкава аб тым, што прыватызацыя найбольш значнай інфраструктуры і ўсталяванне больш шчыльных палітычных сувязяў з Масквой ёсць адзіным шляхам для Мінска, каб пазбегнуць рэзкага падвышэння цэнаў на газ у будучым. Тымчасам, дзеля рэзкага росту цэнаў на энергію, падвышэнне цаны газу з цяперашніх 128 даляраў ЗША за 1000 кубаметраў да амаль 200 даляраў у 2009 г. падаецца непазбежным пры любых абставінах.

## ЗБЛІЖЭННЕ БЕЛАРУСІ З ЗАХАДАМ: АХВЯРА ГРУЗІНСКАЙ ВАЙНЫ?

У гэтым раўндзе здольнасць Лукашэнкі мінімізаваць ціск Расіі пры дапамозе цырыманіяльных жэстаў у бок Захаду радыкальна зменшылася, хаця спробы працягнуць такую гульню і робяцца. Наступствы «пяцідзённай» грузінска-расійскай вайны могуць радыкальна змяніць баланс сіл і правілы геапалітычнай гульні на прасторы былога Савецкага Саюза. Логіка канфрантацыі Крамля з Захадам можа падштурхнуць яго да ўсталявання кантролю над тэрыторыяй, якую Масква разглядае як сваю «сферу ўплыву», што можа азначаць дэстабілізацыю Украіны, каб не дапусціць яе ўваходжання ў NATO (у больш мяккай форме, чым тое было ў Грузіі); і ўзмацненне сваёй улады над Беларуссю, каб не дапусціць перамены яе знешнепалітычнай арыентацыі. У часе канфлікту афіцыйны Мінск меў магчымасць гуляць ролю «апошняга сябра Масквы», што ён і рабіў у 1990-я, калі фармавалася саюзная дзяржава Расіі і Беларусі як знешняя сістэма падтрымкі рэжыму Лукашэнкі. Аднак беларускі бок захоўваў маўчанне і не спяшаўся ўхваляць дзеянні Крамля. Падаецца, што афіцыйны Мінск хацеў зноў выставіць цану сваёй лаяльнасці і вернасці. Але ўзамен гэтага дэкларацыі Сурыкава і паводзіны расійскіх афіцыйных асобаў адлюстравалі ўпэўненасць Крамля ў тым, што заплачана ўжо дастаткова для таго, каб Беларусь дакладна прытрымлівалася крамлёўскай лініі ў знешняй палітыцы.

Ціск Масквы на Грузію паставіў Лукашэнку перад яшчэ большай дылемай, чым гэта можна было прадказаць. Варта памятаць, што на працягу некалькіх гадоў афіцыйны Мінск устрымліваўся ад жорсткіх заяваў на адрас Тбілісі, і нядаўна адносіны былі рэзка скіраваныя ў бок нармалізацыі, аб чым сведчыць тое ж адкрыццё грузінскай амбасады ў Мінску. Некаторыя кампаніі, такія, як «Белавія», зараблялі грошы на расійска-грузінскіх канфліктах і блакадах. І нельга таксама забывацца на тое, што калі беларускі лідэр яшчэ разглядае ідэю дыверсіфі-

кацыі энергетычных паставак, надзвычай важна захаваць добрыя стасункі з Грузіяй.

Акцыі Крамля ў Грузіі сталі дэманстрацыяй для ўсёй постсавецкай прасторы, і нават далёкага замежжа, што выкарыстанне сілы вярнулася ў якасці інструмента знешняй палітыкі. Карыстаючыся эфектам шоку, Расія прымусіла Лукашэнку заявіць пра яго падтрымку яе дзеянняў у рэгіёне (хаця беларускі лідэр выказаў яе ў такой форме, каб было зразумела, што ён гэта робіць на са сваёй волі), а таксама нагадала пра ранейшыя абяцанні ў галіне палітычнай і эканамічнай інтэграцыі. Расія фарсіруе падпісанне дамовы пра адзіную сістэму супрацьпаветранай абароны саюзнай дзяржавы, а таксама прыватызацыю такіх ключавых кампаній, як МАЗ і «Палімір». У Мінска застаецца вельмі невялікая прастора для манеўру: з аднаго боку, яго міжнародная рэпутацыя не дазваляе разлічваць на сур'ёзную знешнепалітычную падтрымку з боку Захаду. З іншага, Расія патрабуе ад Беларусі акурат тое, што афіцыйны Мінск ёй неаднаразова абяцаў. (Дастаткова згадаць пра тую ж сістэму супрацьпаветранай абароны, пра стварэнне якой казаў сам Лукашэнка ў снежні мінулага года, калі беларускія ўлады былі заклапочаныя атрыманнем двухмільярднага стабілізацыйнага крэдыту.) Больш за тое, выгады ад ангажавання з Захадам пакуль не могуць замяніць таго, што прадстаўляе і чым шантажуе Крэмль, — доступу да расійскага рынку і танных энерганосьбітаў. Дзеля таго, каб напэўна захоўваць Беларусь у арбіце свайго ўплыву, Расіі дастаткова блакаваць усялякія палітычныя і эканамічныя змены ў краіне, якія б мянялі гэты статус-кво.

**Крэмль імкнецца да таго, каб Мінск прыняў рашэнні, якія рабілі б малавераагоднай нармалізацыю яго стасункаў з ЕС і ЗША.**

Фактычна, акурат гэтым Крэмль цяпер і займаецца, паколькі ён не толькі прымушае Беларусь да таго, каб падтрымаць яго ў канфлікце з Грузіяй, але таксама імкнецца да таго, каб Мінск прыняў рашэнні, якія рабілі б малаверагоднай нармалізацыю стасункаў з ЕС і ЗША, у прыватнасці, прызнанне незалежнасці Паўднёвай Асеціі і Абхазіі і, магчыма, прыняцце гэтых утварэнняў у саюз Беларусі і Расіі. У выпадку, калі такая падтрымка будзе выказаная, Лукашэнка паўстане перад светам не як лідэр незалежнай дзяржавы, з якім можна вырашаць пытанні, а як марыянеткавы кіраўнік аперэтачнай дзяржавы накшталт Сяргея Багапша і Эдуарда Какойты. У такой пазіцыі Лукашэнка будзе цалкам бездапаможны, калі прэсінг з боку Расіі пачне падрываць яго палітычныя і ўладныя пазіцыі.

**Прызнаўшы незалежнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі, Лукашэнка паўстане перад светам як марыянеткавы кіраўнік аперэтачнай дзяржавы.**

У цяперашніх абставінах уладныя інстынкты беларускага кіраўніка могуць стварыць больш трывалыя і больш доўгатэрміновыя, чым гэта было раней, імпуль-

сы для нармалізацыі адносінаў з Захадам. Пры разумным падыходзе гэты працэс можа пашырыць акно магчымасці для палітычнай лібералізацыі ў краіне.

## ВЫСНОВЫ

Двухбаковы геапалітычны ўціск падымае стаўкі для афіцыйнага Мінска ў яго паралельнай гульні з Расіяй і з Захадам. Ва ўмовах, калі Расія больш не лічыць сябе абмежаванай правіламі прыстойнасці і нормамі міжнароднага права, такая гульня пагражае дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Аднак, калі Захад выпрацуе канкрэтны і празрысты парадак дня для дыялогу і «дарожную карту» для нармалізацыі адносінаў, тыя самыя трывожныя фактары могуцьператварыцца ў фактары палітычнага прагрэсу ў краіне. Захад у стане прапанаваць Мінску перспектыву выхаду з міжнароднай ізаляцыі і доступ да рэальных перавагаў супрацоўніцтва з ЕС і Злучанымі Штатамі.

Паколькі ў беларускіх уладаў можа ўзнікнуць сапраўдная матывацыя да супрацоўніцтва, у новых умовах спрацуе доўгатэрміновая палітыка, а не кароткачасовы гандаль. Напрыклад, такія крокі, як санкцыі ЗША супраць канцэрну «Белнафтахім», ацэньваліся як неэфектыўныя і контрпрадуктыўныя ва ўмовах, калі афіцыйнаму Мінску была гарантаваная падтрымка з боку Расіі. Тыя ж самыя абмежаванні могуць мець зусім іншы эфект ва ўмовах, калі беларускім уладам даводзіцца больш дбаць пра міжнародны імідж і пра магчымую палітычную падтрымку з боку заходніх дзяржаваў. Палітыка ЗША адрознівалася паслядоўнасцю і ў той жа час гнуткасцю (як было прадэманстравана гатоўнасцю да наладжвання дыялогу з Мінскам даслоўна праз некалькі дзён пасля выканання патрабавання пра вызваленне палітычных зняволеных). Пры гэтым перспектыва паляпшэння адносінаў у кароткачасовай перспектыве была вызначаная ў залежнасці ад канкрэтных і вымяральных крокаў насустрач. Такая гнуткасць і аператыўнасць не характэрная для ЕС, дзе працэс прыняцця рашэнняў 27 дзяржавамі надзвычай замаруджаны. Акурат дзеля гэтага ініцыятыва ў заходняй палітыцы да Беларусі ў бліжэйшы час будзе належаць акурат Злучаным Штатам.

Каб перахапіць гэтую ініцыятыву, ЕС мусіць у бліжэйшы час выпрацаваць канкрэтную і паслядоўную «дарожную карту», якая б вызначыла шлях да нармалізацыі адносінаў у доўгатэрміновай перспектыве. Акурат такая «дарожная карта» магла б стаць і моцным палітычным дакументам, які б вызначыў для беларускага грамадства і элітаў еўрапейскую перспектыву іх краіны. Дзеля гэтага не трэба распрацоўваць новую і палітыку, і стратэгію: гутарка ідзе пра ўдакладненне тых падыходаў, якія ўжо выпрацаваныя. Пачаткам можа стаць перагляд і перафармуляванне вядомых 12 патрабаванняў ЕС і прывязка выканання кожнага канкрэтнага патрабавання да канкрэтных абяцанняў пашырэння супрацоўніцтва.

Гэтая «дарожная карта» можа выглядаць наступным чынам. Выкананне патрабаванняў празрыстасці і справядлівасці на парламенцкіх выбарах павінна стаць падставай для скарачэння візавых санкцый і гандлёвых абмежаванняў, а

таксама для павышэння ўзроўню кантактаў з афіцыйным Мінскам да ўзроўню міністраў. Пасля гэтага мусіць быць выпрацаваны доўгатэрміноваы план зближэння на аснове дакладна акрэсленых крытэраў паляпшэння ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне і адпаведных крокаў насустрач, якія мог бы зрабіць ЕС. Ужо цяпер, напрыклад, можна акрэсліць магчымасці да размарожвання дамовы пра партнёрства і супрацоўніцтва і да паўнавартаснага ўдзелу Беларусі ў Еўрапейскай палітыцы суседства пры ўмовах выканання беларускім бокам еўрапейскіх патрабаванняў што да павагі правоў грамадзянаў на свабоднае атрыманне інфармацыі, на свабоду асацыяцыяў і прафсаюзнай дзейнасці. Калі афіцыйны Мінск здолее захаваць станоўчы да нармалізацыі адносінаў палітычны клімат на працягу некалькіх гадоў і забяспечыць правядзенне прэзідэнцкіх выбараў 2011 г. згодна з еўрапейскімі стандартамі, на парадак дня мусіць стаць паўнавартаснае супрацоўніцтва, аблягчэнне візавага рэжыму і падтрымка ЕС далучэння Беларусі да міжнародных арганізацыяў — такіх, як Сусветная гандлёвая арганізацыя.

## ◘ ВЫБАРЫ 2008

ЮРЫ ЧАВУСАЎ

# Расстаноўка сілаў у беларускай апазыцыі напярэдадні парлямэнцкіх выбараў

У фармаце кароткага паведамленьня было б складана прасачыць усю плынь палітычных падзеяў, рэакцыяў, публічных рэфлексіяў, канфліктаў і замірэньняў, што адбываліся ў асяродзьдзі беларускай апазыцыі за апошні час. Нягледзячы на сваю адлучанасьць ад улады і мізэрны ўплыў на грамадзтва, беларуская палітычная апазыцыя спраўна прадукуе інфармацыйныя нагоды і жыве адносна жвавым жыцьцём, зьнешне даволі падобным да існаваньня апазыцыі ў дэмакратычных краінах. Прынамсі, інфармацыйны шум ад апазыцыйных палітыкаў спраўна напаўняе этэр і інтэрнэт-прастору — пры практычнай адсутнасьці сваіх друкаваных мэдыяў пазасыстэмная палітычная супольнасьць дае патрэбны матэрыял для працы радыёжурналістаў і аналітыкаў зь віртуальнай прасторы. Увага з боку гэтых назіральнікаў да апазыцыі непрапарцыйная ейнаму сапраўднаму ўплыву на грамадзтва. Гэта істотна скажае карціну і тлумачыцца тым, што практычна ўся незалежная мэдыйная прастора таксама выцесьненая ў тое ж маргінальнае поле пазасыстэмнага «паралельнага грамадзтва».

У гэтым аглядзе я ня буду схіляцца ў бок аналізу канкрэтных падзеяў палітычнага жыцьця, але агледжу асноўныя трэнды, што вызначаюць канфігурацыю апазыцыйных суб’ектаў у палітычнай прасторы цягам апошніх двух гадоў, каб зафіксаваць становішча ключавых апазыцыйных актараў у гэты прамежак часу.

---

***Юры Чавусаў** — палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Гэты тэкст быў упершыню агучаны на канфэрэнцыі «Канфлікт пакаленьняў, або беларускія адрознасьці ў мэтах, каштоўнасьцях і стратэгіі», адбытай 3—6 чэрвеня 2008 г. у варшаўскай Вышэйшай школе гандлю і права імя Р. Лазарскага.*

## ІСНАВАНЬНЕ Ў РАЗРЫВЕ ПАМІЖ ПАЛІТЫЧНЫМІ КАМПАНІЯМІ

Працэсы інстытуцыянальнага разьвіцьця структураў беларускай апазыцыі ў пэрыяд 2007—2008 гг. адбываліся пад уплывам шэрагу фактараў, абумоўленых як унутранымі праблемамі апазыцыйных структураў, так і зьнешнімі ў дачыненьні да іх. Гэты час можна вызначыць як «міжваенны» — гэта пэрыяд паміж дзьвюма значнымі палітычнымі кампаніямі апазыцыі, калі варта было б пераасэнсоўваць вынікі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г., рабіць высновы і рыхтавацца да старту ў новым палітычным цыклі, што ўключае ў сябе парлямэнцкія выбары 2008 г. і, па часе, прэзыдэнцкія выбары.

Мясцовыя выбары 2007 г., якія прыпалі на гэты «міжваенны» час, не былі значнай палітычнай падзеяй ані для ўладаў, ані для апазыцыі. Але яны сталіся трывожным знакам для ўсіх, хто мае нейкія спадзевы на палітычны патэнцыял апазыцыі. Улады звыкла правялі мясцовыя выбары паводле жорсткага рэпрэсіўнага сцэнара, аднак па вялікім рахунку ў гэтым не было асаблівай патрэбы — дастаткова было б звычайнага мадэляваньня. Гэтая кампанія сталася сумным прыкладам тактыкі «ні байкоту, ні ўдзелу» з боку апазыцыі. Больш за тое, сам сцэнар вылучэньня кандыдатаў быў арыентаваны на разьвязаньне ўнутраных праблемаў апазыцыі і практычна ня быў зьвязаны з барацьбой за галасы і мандаты. Удзел у гэтых мясцовых выбарах, нават у меншай ступені за мясцовыя выбары папярэдняга цыклю, служыў інтарэсам падрыхтоўкі да вырашальнай прэзыдэнцкай кампаніі і быў падпарадкаваны задачам перабудовы адносінаў унутры апазыцыі. Аднак адрозна ад папярэдняга цыклю, гэтым разам нават другасная задача структурнага яднаньня апазыцыі не была вырашаная.

## ПЕРАРАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ АПАЗЫЦЫЙНАГА КАПІТАЛУ

На разьвіцьцё працэсаў у беларускай апазыцыі ўплываў вопыт маштабнай кампаніі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. Вынікі той кампаніі былі асэнсаваныя па-рознаму, і адзінай канвэнцыйна ўзгодненай яе ацэнкі не існуе. Праз гэта ейныя здабыткі не былі засвоеныя.

Так выйшла, што па выніках той кампаніі палітычны капітал апазыцыі разьмеркаваўся нераўнамерна. Тварам кампаніі быў адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Мілінкевіч. Нягледзячы на тое, што ягоныя рукі ў час кампаніі былі ў значнай ступені зьвязаныя кааліцыйнымі абмежаваньнямі, а кіраўніцтва ягонай кампаніяй фактычна знаходзілася па-за сфэрай ягонага кантролю, на Мілінкевіча ўсклалі адказнасьць за вынік кампаніі. Але адначасова зь ягонай асобай былі зьвязаныя спадзяваньні шырокіх масаў дэмакратычнага электарату: здабыўшы падчас кампаніі агульнанацыянальную вядомасьць, Аляксандар Мілінкевіч стаўся асобай, якая для насельніцтва ўвасабляла апазыцыю і дэмакратычную альтэрнатыву ўвогуле.

Структурны ж рэсурс па-ранейшаму застаўся пераважна ў руках іншага цэнтру прыняцьця рашэньняў, сфармаванага кіраўніцтвам апазыцыйных партыяў.

Суб'ектна ўвасоблены ў выглядзе кааліцыі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС), гэты рэсурс ня быў спалучаны з пэрсаніфікаваным увасабленьнем тых самых дэмакратычных сілаў.

Вынікам гэтага разьдзяленьня здабыткаў кампаніі сталася барацьба паміж структурным цэнтрам АДС і пэрсаніфікаваным цэнтрам Аляксандра Мілінкевіча. Апошні змагаўся за структурны рэсурс і імкнуўся да кантролю за структурамі апазыцыі, у той час як лідэры АДС, баючыся страціць стратэгічную ініцыятыву, супрацьдзейнічалі Мілінкевічу і ўсяляк імкнуліся перагледзець ягоны лідэрскі статус. Менавіта гэтая барацьба і сталася асноўным фактарам, які вызначаў разьвіцьцё падзеяў на апазыцыйным палітычным полі ў 2007—2008 гг.

## ЗЬНЕШНІЯ ФАКТАРЫ: РАЗРАДКА, ШАНТАЖ І ШТО ЯШЧЭ МОЖА ДАЦЬ ЭЎРАЗЬВЯЗ

Фактары іншага парадку маюць у адносінах да дэмакратычных сілаў зьнешні характар — яны вызначаныя наяўнымі ў грамадзтве аб'ектыўнымі працэсамі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і зьнешнепалітычнага характару, а таксама палітыкай дзейнага ў Беларусі ўраду. Натуральна, гэтыя чыньнікі маюць розную ступень уплыву на электаральныя працэсы, розную працягласьць у часе, рознае паходжаньне і прыроду — у абмаляванай канструкцыі іх яднае толькі тое, што яны не залежаць альбо амаль не залежаць ад рашэньняў актараў апазыцыі.

Рознаскіраваны зьнешнепалітычны ціск на рэжым Лукашэнкі з Захаду і Ўсходу, увядзеньне эканамічных і палітычных санкцыяў з боку Захаду на фоне нестабільных гаспадарчых адносінаў паміж беларускім рэжымам і пуцінскай Расеяй, здавалася б, стваралі спрыяльны фон для палітычных крокаў з боку апазыцыі. У пэўнай ступені гэтай магчымасьцю апазыцыя скарысталася, і ейнага ўплыву на разьвіцьцё адносінаў паміж Беларусьсю і Захадам ня варта недаацэньваць. Але пры гэтым нельга казаць, што за сталом уяўнага дыялёгу паміж Лукашэнкам і Захадам зьявілася месца для апазыцыі. Пакуль гэтага месца няма, і апазыцыя ўсяго толькі спрабуе скарыстацца магчымасьцю ўплываць на заходні бок праз забесьпячэньне інфармацыйнага фону для дыялёгу. Таксама нельга назваць удалымі спробы прапанаваць свае паслугі ўладзе ў якасьці суб'екта, здольнага вырашаць праблемы на заходнім кірунку. Пакуль што працэс дыялёгу абыходзіцца бяз простага ўдзелу апазыцыі.

Памяншэньне маштабаў рэпрэсіяў і ўдасканаленьне дзяржаўнага рэпрэсіўнага апарату, пераход да больш тонкіх мэтадаў кантролю за сытуацыяй сталіся іншым зьнешнім фактарам, да якога апазыцыя была падрыхтаваная ня ў поўнай меры. Замест відавочна палітычна матываваных крымінальных справаў выкарыстоўваюцца абвінавачаньні ў крымінальных злачынствах, якія цяжка выставіць у вачох праваабаронцаў як «палітычныя». Правядзеньне знакавых масавых акцыяў наўпрост не забараняецца, але праз правакацыі і стварэньне неспрыяльнага інфармацыйнага атачэньня іх пасьпяховасьць абмяжоўваецца. Ды, зрэшты, рэжым заўжды пакідае за сабой права вярнуцца да звычайных брутальных дзе-

яньняў, рэалізуючы пагрозу згортваньня дыялёгу з Захадам і пазбаўленьня ад зьвязаных з тым дыялёгам абмежаваньняў ва ўнутранай палітыцы.

Гэты непасьлядоўны працэс «закручваньня» і «адкручваньня» гаек ня варта ацэньваць як спробы лібэралізацыі з боку рэжыму. Тут варта было б праводзіць паралелі хутчэй з «разрадкай» у адносінах паміж Захадам і Савецкім Саюзам у час халоднай вайны — як і тады, прычына «пацяпленьня» мае зьнешні характар. Адмова ад найбольш жорсткіх відаў рэпрэсіяў супраць іншадумцаў выкліканая не намерам дапусьціць іх да палітычнай сыстэмы, а зьяўляецца пасланьнем да зьнешняга адрасата, пакліканым засьведчыць ласкавае зьняцьцё перашкодаў да дыялёгу. Сымбалічна, што першая спроба вызваленьня галоўнага палітвязьня Аляксандра Казуліна нагадвала вызваленьне савецкіх дысыдэнтаў з наступнай высылкай. Але разрадка ў любы момант можа быць згорнутая альбо абмежаваная адным з суб'ектаў дыялёгу. Пры гэтым эскаляцыя канфлікту са Злучанымі Штатамі не выключае працягу дыялёгу з Эўрапейскім Зьвязам.

Вядомыя эканамічныя праблемы рэжыму і неабходнасьць «зацягнуць паясы» выклікалі згортваньне сацыяльных гарантыяў і не надалі палітычнага аўтарытэту ўладам. Здавалася б, гэта давала шанец апазыцыі скарыстацца спрыяльным момантам і на хвалі сацыяльнай рыторыкі здабыць падтрымку насельніцтва. І сапраўды, пэўны «левы паварот» у рыторыцы адбыўся, і акцэнтаваньне ўвагі на сацыяльна-эканамічных тэзах, а не на лёзунгах каштоўнаснага пляну, зрабілася ўласцівым большасьці апазыцыйных суб'ектаў. Але ж па вялікім рахунку посьпех гэтага рытарычнага сродку застаецца пад пытаньнем — ва ўмовах ізаляцыі ад палітычнай сыстэмы апазыцыі варта спачатку дамагчыся ўключэньня ў поле, дзе можна разважаць у катэгорыях электаральнай падтрымкі.

Пры гаворцы пра зьнешнія чыньнікі нельга абмінуць значэньня эўрапейскага пасланьня народу Беларусі, вядомага як «12 умоваў Эўразьвязу». Парадаксальным чынам гэты дакумэнт, абвешчаны ўвосень 2006 г., замяніў АДС (і ўсім апазыцыйным сілам Беларусі) стваральную праграму. Гэта датычыць нават тых палітычных структураў, якія трансьлююць скептычнае стаўленьне да пэрспэктываў эўрапейскай інтэграцыі для Беларусі — яны таксама вымушаныя суадносіць свае дзеяньні з тымі прапановамі. Пасланьне Эўразьвязу зрабілася своеасаблівым крытэрам для ацэнкі палітычных зьменаў у Беларусі і, шырэй, для ацэнкі любых унутрыпалітычных зьяваў унутры краіны. Фактычна, выкананьне эўрапейскіх умоваў з наступным карыстаньнем эўрапейскімі прапановамі зрабілася праграмай шырокага кола апазыцыйных сілаў.

## АБ'ЯДНАНЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ СІЛЫ: ТАКТЫЧНЫ ХАЎРУС І ПАТЭНЦЫЙНЫЯ СУПЯРЭЧАНЬНІ

Структурна ядром беларускай апазыцыі застаецца кааліцыя АДС, якая вядзе сваё паходжаньне ад канца 1990-х гг., калі ўпершыню адбылося яднаньне партыяў, адрозных у сваіх ідэалягічных дактрынах, аднак аб'яднаных тэзай вяртаньня Беларусі да дэмакратычнага шляху разьвіцьця. Фармаваньне кааліцыі пачалося

ў 1999 г. з падпісаньня пагадненьня паміж лідэрамі найбуйнейшых палітычных партыяў Беларусі (Партыяй БНФ, Аб’яднанай грамадзянскай партыяй, Партыяй камуністаў Беларускай, БСДП (Народная грамада), Партыяй працы, БСДГ, БСДП) і прадстаўнікамі розных недзяржаўных арганізацыяў. Так была створаная Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў, якая да часу прэзыдэнцкай кампаніі 2001 г. сфармавала Каардынацыйную раду апазыцыйных палітычных партыяў, што дазволіла вылучыць адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў на іх. У 2004 г. напярэдадні парлямэнцкіх выбараў была створаная кааліцыя «Пяцёрка плюс», у якую ўвайшлі пяць найбуйнейшых палітычных партыяў і шэраг грамадзкіх арганізацыяў. «Пяцёрка плюс» распрацавала праграму «Пяць крокаў да лепшага жыцьця». Пасьля парлямэнцкіх выбараў 2004 г. падпісаньнем аб’яднаўчага пагадненьня была пакліканая да жыцьця стала дзейная нарада дэмакратычных сілаў, у якую ўвайшлі дзесяць суб’ектаў — лідэраў апазыцыйных палітычных партыяў (утварэньне хутка пачалі па аналёгіі называць «дзясяткай»). У 2005 г. быў праведзены вялікі дэмакратычны форум — VI Кангрэс дэмакратычных сілаў, які пацьвердзіў адзінства мэтаў і каштоўнасьцяў апазыцыі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. і вызначыў адзіным кандыдатам на выбарах беспартыйнага Аляксандра Мілінкевіча, да таго вылучанага Партыяй зялёных і падтрыманага Партыяй БНФ.

Па выніках апошняй прэзыдэнцкай кампаніі ў АДС уваходзілі практычна ўсе зарэгістраваныя і незарэгістраваныя апазыцыйныя структуры (фактычна, акрамя Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ). Аднак згаданы канфлікт з Аляксандрам Мілінкевічам прывёў да таго, што створаны былым адзіным кандыдатам Рух за свабоду, фармальна ўваходзячы ў кааліцыю, стварыў праблему падвоенай ляяльнасьці ў актывістаў апазыцыі. Рашэньні і тактыка кааліцыі часьцяком супярэчылі тактыцы руху Мілінкевіча, што яскрава праявілася падчас VII Кангрэсу Аб’яднаных дэмакратычных сілаў 26—27 траўня 2007 г. Па выніках таго форуму Мілінкевіч быў *de jure* пазбаўлены статусу лідэра кааліцыі і апынуўся роўным сярод роўных іншых кіраўнікоў партыйных структураў. Праблема Мілінкевіча была ў пэўнай ступені зьнятая партыйнымі дзеячамі, але гэта не надало аўтарытэту апазыцыйнай кааліцыі. Больш за тое, умацаваньне структуры АДС на карысьць уплыву моцных партыяў (БНФ, АГП, БСДПГ, ПКБ) з адпаведнай перабудовай структуры прыняцьця рашэньняў у кааліцыі (фармаваньне Прэзыдыюму палітрады АДС у складзе 10 асобаў-прадстаўнікоў асноўных суб’ектаў кааліцыі і ўвядзеньне інстытуту ратацыі сустаршыняў кааліцыі) выклікала фрустрацыю ў малых суб’ектаў кааліцыі.

Як і раней, ідэалягічная стракатасьць кааліцыі ўскладняе фармуляваньне супольнай плятформы. Рыхлы характар кааліцыі не патрабуе ад партыяў адмовы ад сваёй уласнай ідэалягічнай дактрыны. Партыі АДС яднаныя зусім не ідэалягічнай блізкасьцю, а тактычнай па сутнасьці задачай зьмены палітычнай сыстэмы і вяртаньня да канкурэнтнай палітыкі. Як вынік, шматлікія спробы выпрацаваць супольную плятформу АДС застаюцца на паперы — Стратэгія АДС 2007 г., так званая «Малая канстытуцыя» і эканамічная плятформа АДС не зрабіліся гра-

мадзка значнымі дакумэнтамі. Фактычна, нейкая адзіная дактрына можа быць выпрацаваная АДС толькі ў межах выбарчай кампаніі і можа дзейнічаць толькі на пэрыяд выбараў.

Задача выпрацоўкі такой дактрыны ўскладаецца на адмысловы орган — адноўленую Плянава-аналітычную групу АДС. Гэтая група мае характар нарады адмыслоўцаў, дэлегаваных рознымі партыямі. Працэс выпрацоўкі рашэньняў дазваляе ёй прапаноўваць кіроўным органам АДС узгодненыя варыянты, што задавальняюць інтарэсы розных суб'ектаў кааліцыі і практычна заўжды прымаюцца за аснову. На дадзены момант групай распрацаванае Пасланьне АДС, зь якім кааліцыя пайшла на парлямэнцкія выбары ўвосень 2008 г. Таксама ўзгоднены сьпіс 110 кандыдатаў АДС, якія балятуюцца ў парлямэнт (адбор прэтэндэнтаў быў адкрыты для пазакааліцыйных вылучэнцаў).

## РУХ ЗА СВАБОДУ АЛЯКСАНДРА МІЛІНКЕВІЧА (РЗС)

Запіс у рух у падтрымку Аляксандра Мілінкевіча пад лёзунгам «За свабоду» быў распачаты яшчэ ўвесну 2006 г. падчас грамадзкіх пратэстаў супраць мадэляваньня вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. Аднак структурнае афармленьне руху адбылося пры канцы 2006 г., калі разыходжаньні былога адзінага кандыдата з АДС зрабіліся непераадольнымі. З таго часу РЗС двойчы спрабаваў здабыць статус легальнага грамадзкага аб'яднаньня праваабарончага характару, аднак улады адмаўлялі яму ў рэгістрацыі. Ініцыятары аб'яднаньня пайшлі шляхам упартага змаганьня за рэгістрацыю, і на дадзены момант па трэцяй спробе рэгістрацыі ўлады далі адтэрміноўку.

Падобна на тое, што, не выходзячы з АДС, рух яднае вакол сябе некалькі больш дробных палітычных утварэньняў правацэнтрысцкай скіраванасьці і выконвае функцыю аўтаномнай нефармальнай фракцыі ўнутры кааліцыі АДС. Асновай для такога яднаньня зьяўляецца рэйтынг вядомасьці Мілінкевіча і ягоныя амбіцыі быць адзіным кандыдатам на наступных прэзыдэнцкіх выбарах. Нягледзячы на заяўленае імкненьне далучыць да працы ў руху непартыйных асобаў, у яго пераважна ўваходзяць акурат сябры іншых палітычных структураў, што паслужыла падставай для абвінавачаньня РЗС у празэлітызьме. Іншым фактарам, што адштурхоўвае дэмакратычных актывістаў ад РЗС, зьяўляецца непразрысты характар кіраваньня РЗС: у адрозьненьне ад АДС, працэдура прыняцьця рашэньняў у ім нявызначаная і пераважна кулюарная, ды толькі асабістыя якасьці Мілінкевіча дазваляюць РЗС пазьбегнуць абвінавачаньня ў недэмакратычнасьці ўнутрыарганізацыйнага жыцьця.

Калі б апэрацыя «паглынаньня» Партыі БНФ, прадпрынятая прыхільнікамі РЗС падчас зьезду Партыі БНФ пры канцы 2007 г., удалася, вакол Мілінкевіча сфармавалася б моцная правая кааліцыя, раўназначная астатняй частцы дэмакратычных сілаў. Так бы мовіць, спадар Мілінкевіч атрымаў бы тады ўласную АДС і мог бы валодаць кантрольным пакетам у дэмакратычнай апазыцыі. Парадаксальным чынам Партыя БНФ выконвае ў дадзеным кантэксьце функцыю «за-

латой акцыі», якой на актуальным этапе пакуль карыстаецца АДС.

РЗС адмовіўся ад вылучэньня сваіх кандыдатаў на парлямэнцкія выбары, аднак шмат ягоных удзельнікаў вылучаюцца ў межах сьпісу АДС. РЗС паводле ўзгадненьня з кааліцыяй сканцэнтраваўся на правядзеньні кампаніі «За свабодныя выбары», што мае за мэту спрыяць правядзеньню свабодных і справядлівых выбараў у парлямэнт у адпаведнасьці зь беларускім заканадаўствам і прынятымі ў дэмакратычных краінах нормамі.

Падаецца, што асноўнай тактычнай мэтай РЗС па-ранейшаму застаецца захаваньне статусу Мілінкевіча як агульнапрызнанага лідэра апазыцыі насуперак меркаваньню АДС. Гэта, верагодна, справакуе ў будучыні новыя канфлікты і змаганьне за статус адзінага кандыдата ад апазыцыі: аўтарытэт Мілінкевіча бясспрэчны, аднак паўнамоцтвы вызначэньня асобы адзінага кандыдата застаюцца ў руках АДС.

## ЭЎРАПЕЙСКАЯ КААЛІЦЫЯ

Гэтае ўтварэньне мае яшчэ больш рыхлую структуру ў параўнаньні з АДС і РЗС. Створанае яшчэ да парлямэнцкіх выбараў 2004 г., аб’яднаньне застаецца няпэўным хаўрусам невялікіх незарэгістраваных арганізацыяў і ініцыятываў, якія фармальна выступаюць за эўрапейскі шлях разьвіцьця Беларусі. Суб’екты гэтай кааліцыі ў большасьці ўваходзяць у АДС, аднак не падтрымліваюць выбарчай стратэгіі АДС і абвінавачваюць АДС у антыэўрапейскіх настроях, хоць праэўрапейская тэма выразна адлюстраваная ў праграмных дакумэнтах АДС.

Эўрапейская кааліцыя заявіла, што мае сьпіс з 70 кандыдатаў, пераважна тых, хто быў адсеяны падчас узгадненьня акругаў у межах АДС. Аднак пры гэтым такія суб’екты Эўрапейскай кааліцыі, як «Хартыя-97» і «Малады фронт», ужо заявілі пра намер байкатаваць выбары і канцэнтравацца на арганізацыі масавых пратэстаў супраць выбарчых фальсыфікацыяў. Але гэта не перашкаджае прадстаўнікам згаданых суб’ектаў, напрыклад «Маладога фронту», балятавацца ў парлямэнт па сьпісе АДС.

Сьпікерам гэтага палітычнага ўтварэньня выступае былы палітвязень Мікола Статкевіч. Большасьць назіральнікаў адзначаюць, што ў дадзеным выпадку Статкевіч папросту выкарыстоўвае свой звыклы спосаб пазыцыянаваньня на палітычнай арэне — праз размежаваньне зь іншымі дэмакратычнымі сіламі і пошук свайго ўласнага шляху. Падобнае адасабленьне структураў, узначаленых Статкевічам, назіралася і ў час байкоту парлямэнцкіх выбараў і давыбараў 1999—2000 гг., і падчас мінулых парлямэнцкіх выбараў 2004 г.

## ДРУГАЯ СТУПЕНЬ ПАЗАСЫСТЭМНАСЬЦІ

Беларуская апазыцыя вось ужо дзясятак гадоў існуе ў фактычнай ізаляцыі ад сыстэмнай палітыкі: некаторыя эпізадычныя кантакты з фармальным бокам палітычнай сыстэмы ў выглядзе асобных перамог на мясцовых выбарах альбо

раптоўнай перафарбоўкі парлямэнцкай групы «Рэспубліка» ў апазыцыйныя колеры не дадаюць апазыцыі далучанасьці да сыстэмы прыняцьця дзяржаўных рашэньняў, а нават у пэўным сэнсе аддаляюць ад яе, замацоўваючы наяўны прынцыповы падзел. Аднак у коле пазасыстэмнай палітыкі паўстала свая сыстэма — сыстэма апазыцыі, адлучаная ад улады, але з уласнымі нормамі, колам суб'ектаў, мэтадамі дзейнасьці, канвэнцыйнымі і забароненымі сродкамі барацьбы.

Інтэнцыя да стварэньня груповак, якія былі б апазыцыяй да гэтай «сыстэмы апазыцыі», ня ёсьць нечым новым для беларускай палітыкі. Фактычна гэта ўжо традыцыя — раз-пораз зьяўляюцца палітыкі, якія імкнуцца скарыстацца з гэтага, на першы погляд, такога прывабнага рэсурсу. Спакуса пазыцыянаваць сябе як адрознага ад старой апазыцыі, як новую апазыцыю, не мінула Аляксандра Казуліна зь ягоным адыёзным рухам «Воля народу», былі і іншыя прэтэндэнты на статус «новай апазыцыі». Не пазьбег гэтага і Аляксандар Мілінкевіч, які аднак падышоў да праблемы больш тэхналягічна і паспрабаваў спалучыць паўнавартаснае карыстаньне здабыткамі і структурамі старой апазыцыйнай сыстэмы зь бескампрамісным яе адмаўленьнем: розныя часткі ягонага руху па-рознаму ставяцца да апазыцыйнай сыстэмы, крытыкуюць яе з розных і часам супярэчлівых пазыцыяў.

Аднак практычна ніводная з гэтых спробаў скарыстацца рэсурсам адмаўленьня ад старых апазыцыйных схемаў не прывяла да посьпеху. Нават былы бескампрамісны кандыдат ад «новай апазыцыі» А. Казулін адмовіўся ад ідэі шырокага грамадзкага руху і зрабіўся кіраўніком палітычнай партыі БСДПГ, а цяпер за ім зарэзэрваванае крэсла ў прэзыдыюме АДС. А. Мілінкевіч, нават пазбаўлены статусу адзінага лідэра АДС, трымаецца за партыйную кааліцыю і цешыцца статусам лідэра аднаго зь яе суб'ектаў.

Бадай што адзіны элемэнт беларускай палітычнай табліцы, які трывала пазыцыянуецца як «апазыцыя за межамі апазыцыі» — гэта прарасейскія сілы. Аднак гэты элемэнт у сваёй падвойнай віртуальнасьці можна ахарактарызаваць як выключна нестабільны, ягоныя ўласьцівасьці вядомыя толькі ў тэарэтычным аспэкце дзякуючы выступам аналітыкаў і экспэртаў. Эпізадычныя праявы гэтага элемэнту ў рэальным жыцьці (малалюдныя мітынгі за ўваходжаньне Беларусі ў склад Расеі, скандальны маніфэст Леаніда Сініцына і Ўладзімера Парфяновіча) пацьвярджаюць, што ён яшчэ не запатрабаваны.

Расчараваньне няздольнасьцю традыцыйнай апазыцыі зьмяніць сытуацыю застаецца па-ранейшаму ласым рэсурсам, асабліва для некаторых маладых палітыкаў. Ягоная значнасьць павялічылася за кошт далучэньня да барацьбы з рэжымам пэўнай колькасьці новых асобаў у выніку грамадзкага пратэсту ў Менску пасьля апошніх прэзыдэнцкіх выбараў. Гэта створаная па выніках Плошчы «Ініцыятыва», гэта рэшткі старога распушчанага «Зубра» ў выглядзе руху «Бунт». Маніфэст гэтых сілаў пад назвай «Час перамагаць» быў апублікаваны ўвесну 2007 г. і пакінуў дваістае ўражаньне. Прынамсі, стратэгія дзеяньняў гэтых структураў засталася па-за маніфэстам. Адносіць гэтыя структуры да палітычнае апазыцыі пакуль ня варта — функцыянальна гэта рух «негвалтоўнага супраціву», аднак

пазбаўлены мэты і апірышча ў выглядзе палітычнай праграмы. Пакуль яны выконваюць функцыі выключна каналізацыі грамадзкага пратэсту. Гэткія структуры зазвычай існуюць у якасьці спадарожных да агульнанацыянальных рухаў супраць аўтарытарызму. Іх барацьба з дыктатурай выклікае асацыяцыі з роляй «самурая без гаспадара» з адпаведнымі лірычным настроем і сумнымі пэрспэктывамі.

* * *

Так бачыцца інстытуцыйная канфігурацыя апазыцыі на дадзены момант. Праанелізаваўшы беларускі палітычны спэктар ад найбольш структураваных і інстытуцыйна моцных арганізацыяў да амаль віртуальных утварэньняў, мы можам адзначыць, што дэкляраванае адзінства апазыцыі далёкае ад рэчаіснасьці. Пры гэтым максымальная ступень узгадненьня дзеяньняў назіраецца ў тых суб'ектаў, якія маюць нейкае разуменьне сваёй задачы і цьвяроза ацэньваюць свае сілы. Так, нягледзячы на пэўнае разыходжаньне паміж АДС і РЗС, гэтыя ўтварэньні занятыя канкрэтнай дзейнасьцю, няхай сабе і рознаскіраванай. На гэтай базе можа быць дасягнутае паразуменьне і могуць быць узгодненыя кароткатэрміновыя падыходы, што дэманструе наяўнае ўзаемадзеяньне гэтых суб'ектаў у справе падрыхтоўкі да парлямэнцкіх выбараў. Верагодныя канфлікты, што могуць паўстаць пасьля выбараў, могуць быць разьвязаныя праз узгоднены фармат дзейнасьці, як гэта было і падчас папярэдніх прэзыдэнцкіх выбараў.

Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў АДС як кааліцыя палітычных партыяў заставалася фактычна адзінай структурай, якая мела нейкія акрэсьленыя задачы ў межах гэтай палітычнай кампаніі. Усе астатнія структуры зьвязвалі свой удзел альбо няўдзел у выбарах не з магчымасьцю доступу да парлямэнцкай формы палітычнай барацьбы, а зь пераразьмеркаваньнем сілаў унутры апазыцыі і атрыманьнем больш зручнай стартавай пляцоўкі напярэдадні будучых прэзыдэнцкіх выбараў.

ТАЦЯНА ЧУЛІЦКАЯ

# Расейска-грузінская вайна ў мэдыйнай прасторы Беларусі

## Ад «вымушанай дружбы» да капітуляцыі пасьля няўдалага бунту

Справакаваная канфліктам у Паўднёвай Асеціі расейска-грузінская вайна стала адной з найбольш цікавых падзеяў гэтага палітычнага году. Калі ў духу вэбэраўскага падыходу да трактоўкі палітыкі вынесьці за дужкі факт гуманітарнай катастрофы ў рэгіёне, а таксама гібель людзей і шматлікія выпадкі страты імі маёмасьці, упэўнена можна казаць, што гэты канфлікт стварыў высокаапэрацыйную прастору для дзейнасьці як у практычнай міжнароднай палітыцы, так і на сымбалічным полі яе прэзэнтацыі.

Інфармацыйная гульня ўсіх уцягнутых у канфлікт актараў перакрыла рэальныя падзеі, адсунуўшы на задні плян (калі ня выключыўшы наагул) фактычны складнік сытуацыі. У большасьці мэдыйных паведамленьняў расейска- і ангельскамоўнай інфармацыйнай прасторы падзеі разглядаліся як супрацьстаяньне Расеі і Грузіі, альбо Расеі і ЗША (Эўразьвязу), якія стаялі за Грузіяй. Тэзісы пра барацьбу за незалежнасьць Паўднёвай Асеціі без асаблівай цяжкасьці перакрываліся сьцьвярджэньнямі аб прасоўваньні інтарэсаў Расеі, інтэрпрэтацыямі аб усталяваньні новага сусьветнага парадку і карэгаваньнем зонаў зьнешнепалітычных інтарэсаў.

У гэтай сытуацыі мас-мэдыі заканамерна выканалі функцыю распаўсюджваньня сэнсаў, выгадных тым ці іншым гульцам. Высокая глядацкая (чытацкая) ціка-

*__Тацяна Чуліцкая__ — палітоляг, выкладчыца Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» — агляд «Беларусь: дэвіянтны выпадак сыстэмнай трансфармацыі?» (6/2008).*



Фота: REUTERS/Глеб Гараніч.

васьць да канфлікту справакавала грамадзкую думку на ўзнаўленьне даволі простых, але агрэсіўных сваім характарам сэнсавых палажэньняў і апазыцыяў: «Расея парушыла тэрытарыяльную цэльнасьць Грузіі», «Саакашвілі — бяздарны палітык, які распачаў вайну», «амэрыканцы і эўрапейцы лезуць у зону інтарэсаў Расеі» ды інш.

Мэта гэтага артыкулу — разгледзець, якім чынам міжнародны канфлікт, у які Беларусь не была ўлучаная непасрэдна, адбіўся на стратэгіі ейнага пазыцыянаваньня ў грамадзкай прасторы; якія новыя сэнсы і вобразы зьявіліся (альбо не зьявіліся) у яе прэзэнтацыі. Таксама рабілася спроба выявіць і пазначыць, паміж якімі сэнсавымі полюсамі ў канфліктнай сытуацыі апынуліся беларускія палітыкі ў асобе афіцыйнага Менску. Ня менш важны аналіз таго, якім чынам расейска-грузінскі канфлікт паўплываў на прэзэнтацыю Беларусі для ўнутранай мэтавай аўдыторыі, то бок для сваіх жа грамадзянаў.

Аналітычным інструмэнтам у межах гэтага артыкулу заяўлены дыскурс-аналіз.

У якасьці крыніцаў інфармацыі ўзятыя некалькі розных паводле тыпу, жанраў і палітычнага кантэксту СМІ:

- паведамленьні беларускіх інфармацыйных агенцтваў: www.tut.by, www.belapan.by, www.belta.by;
- публікацыі газэт «Наша Ніва», «БелГазета», «Советская Белоруссия».

Разгляданы пэрыяд мае часавы інтэрвал з 8 жніўня 2008 г. да 25 жніўня 2008 г. Выбар гэтых датаў зьвязаны з фактычным пачаткам баявых дзеяньняў у Паўднёвай Асеціі і прызнаньнем яе незалежнасьці Саветам Фэдэрацыі РФ. Апошняя падзея выкарыстаная як сэнсавая кропка, паколькі прызнаньне Расеяй незалежнасьці самаабвешчаных рэспублік стала падставай для адкрыцьця новай (больш лятэнтнай) стадыі канфлікту і зьмяшчае ў сабе магчымасьці новых сэнсаў.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ І РЭПРЭЗЭНТАЦЫЯ

Назіральніку, які спазьніўся ад пачатку канфлікту хаця б на некалькі дзён, было даволі складана проста аднавіць храналёгію падзеяў, якая на працягу невялічкага прамежку часу расплылася ў плынях бясконцых інтэрпрэтацыяў і падмены паняткаў. У выніку міжнародны канфлікт задаў новую сымбалічную рамку магчымасьцяў выкарыстаньня падзеяў для трэціх гульцоў, якія паспрабавалі закласьці падваліны для разьвязаньня (з большай ці меншай ступеньню пасьпяховасьці) уласных актуальных палітычных праблемаў. З найбольш цікавых прыкладаў стратэгіяў такіх паводзінаў можна назваць дзеяньні Ўкраіны, краінаў Балтыі і Беларусі, кожная зь якіх паспрабавала «разыграць» мэтафарычныя карты «прыхільніка-суперніка» для атрыманьня сымбалічных і рэальных бонусаў. У выпадку Ўкраіны такой «картай» стала сытуацыя вакол Крыму і Чарнаморскага флёту; у краінах Балтыі — патэнцыйная пагроза з боку Расеі ў пляне эканамічнага і палітычнага ўмяшаньня ва ўнутраныя справы; у выпадку Беларусі — дылема знаходжаньня паміж Расеяй і ЭЗ. «Гульня на чужым полі», то бок у пра-

сторы чужога канфлікту, стварыла для гэтых гульцоў ілюзію магчымага разьвязаньня ўласных праблемаў. Так, афіцыйны Менск намагаўся атрымаць дывідэнды ад абвастрэньня супярэчнасьцяў паміж Расеяй і Эўразьвязам. Пытаньне эфэктыўнасьці гэтых дзеяньняў застаецца адкрытым для трактовак экспэртнай супольнасьці, але сам факт палітычнай гульні ў гэтай сытуацыі зьяўляецца цікавым аб'ектам для аналізу.

У мэдыйным полі ўсе ўцягнутыя ў канфлікт актары — Расея, Грузія, ЭЗ, ЗША, а таксама менш уплывовыя суб'екты, як Польшча і іншыя *newcomers* Эўразьвязу — паспрабавалі з максымальнай для сябе выгадай выкарыстаць наяўную сытуацыю. У дадзеным кантэксьце пераключэньне тэлевізара з CNN альбо BBC на праграмы расейскіх тэлеканалаў успрымалася ў поўнай адпаведнасьці з апісаным П. Бурд'ё сьветам тэлебачаньня, *«які стварае ўражаньне, што сацыяльныя агенты, якія маюць усе бачныя прыкметы значнасьці, свабоды, незалежнасьці... насамрэч зьяўляюцца марыянэткамі неабходнасьці, якую трэба апісаць, якую неабходна выявіць і выставіць на ўсеагульны агляд»*. Кожны з палітычных гульцоў (улучна зь Беларусьсю, выпадак якой будзе разгледжаны ніжэй) выкарыстаў усе наяўныя мэдыйныя рэсурсы для прасоўваньня набору тэзаў у адпаведнасьці са сваімі зьнешне- і ўнутрыпалітычнымі інтарэсамі.

## ІЛЮЗІЯ РЭАЛЬНАСЬЦІ

Сэнсавы раскол у прэзэнтацыі расейска-грузінскага канфлікту лягічна супаў з падзелам сьвету на імпэрыі (пост-імпэрыі) і пэрыфэрыйныя дзяржавы, паказаў розьніцу наяўных рэсурсаў сымбалічнай прэзэнтацыі і схемаў інтэрпрэтацыі падзеяў. У дыскурсіўных практыках, што ўзьніклі вакол канфлікту, даволі выразна азначыліся запрапанаваныя палітычнымі гульцамі схемы. Прынцыпова важным зьяўляецца тое, што ўся прэзэнтацыя ажыццяўлялася з каштоўнасных пазыцыяў. Прыкладам меркаваньня з пазыцыяў маральнай ацэнкі можа служыць матэрыял «Советской Белоруссии» з характэрнай назвай «Разорванный мир», у якім ваенныя дзеяньні ацэньваюцца быццам бы з «агульначалавечай пазыцыі», што дазваляе аўтару выставіць ацэначныя акцэнты:

*Цяпер усё пра наступствы вайны Расеі і Грузіі, пра магчыма новы падзел сьвету — і я нават не чакала, да якой ступені мае думкі ўцягнутыя ў роздумы аб гэтым... За тысячы кілямэтраў ад нашага дому разгарэлася вайна. Але чаму так трывожна, так брудна на сэрцы? Ці не таму, што сьвет вонкавы і ўнутраны — ён непадзельны, ён адзіны?*[1]

У сымбалічным полі дзейнічала лёгіка звычайнага палітычнага гандлю, у якім апроч мэханізмаў ціску актыўна выкарыстоўваліся сродкі простага змушэньня і

[1] Беларусь сегодня. 26 жніўня 2008.

рэсурсы накшталт «адключэньня вады і газу» (то бок невыдаваньня чарговага крэдыту альбо падвышэньня цэнаў на энэрганосьбіты). Такім чынам, камунікацыйнае дзеяньне (то бок дыялёгавая форма) падмянялася дзеяньнем стратэгічным, у якім *«адзін (суб'ект) узьдзейнічае на другога эмпірычна, пагражаючы выкарыстаньнем санкцыяў альбо малюючы пэрспэктывы ўзнагароджаньня»*[2]. Прыкладам такой схемы зьяўляецца ціск Расеі на афіцыйны Менск на пачатку кампаніі, калі беларускаму боку неадназначна намякнулі на неабходнасьць артыкуляцыі прарасейскай/хаўрусьніцкай пазыцыі[3].

Расейска-грузінская вайна стала мела ў сваіх падвалінах цэлы корпус як папярэдніх палітычных падзеяў, так і іх мэдыйныя рэпрэзэнтацыі: прызнаньне незалежнасьці Косава; «міратворчыя» апэрацыі ЗША ў адносінах Аўганістану, Іраку; «антытэрарыстычныя» апэрацыі Расеі ў Чачэніі[4]; дзеяньні савецкіх войскаў у краінах былога Варшаўскага блёку[5]. Так, напрыклад, матэрыял радыё «Свабода» «40 гадоў таму была здушаная «Праская вясна» правёў простую аналёгію паміж падзеямі, якія адбыліся ў Чэхіі і Грузіі. Крытыка «імпэрскіх амбіцыяў» Расеі адлюстраваная ўжо ў саміх назвах паведамленьняў па тэме «Грузія» на стужцы балтыйскага агенцтва «Delfi», якія выразна дэманстравалі прагрузінскую скіраванасьць падаванай інфармацыі.

**Для Беларусі створаная сымбалічная ступень, якая патрабуе абавязковага праходжаньня, — прызнаньне альбо непрызнаньне факту самаабвешчаньня незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.**

Да таго ж, гэты канфлікт (па аналёгіі з касаўскім прэцэдэнтам) мае ў сабе патэнцыял для далейшай сымбалічнай барацьбы і фармаваньня новых сэнсаў міжнароднага палітычнага поля. Так, для Беларусі створаная сымбалічная ступень, якая патрабуе абавязковага праходжаньня, — прызнаньне альбо непрызнаньне факту самаабвешчаньня незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. У будучыні зь вялікай доляй верагоднасьці (з улікам агульнасусьветных крызісных эканамічных тэндэнцыяў) можна меркаваць аб падобнай дылеме і для больш моцных і незалежных дзяржаваў сьвету.

У мэдыйнай прасторы пры прэзэнтацыі падзеяў былі выкарыстаныя раней ужо ўжываныя тактыкі бінарнага падзелу сьвету на тых, хто безумоўна «мае рацыю», і тых, хто «рацыі ня мае», «ахвяраў» і «агрэсараў». У шэрагу выпадкаў СМІ ўзнаўлялі (пераважна пасьпяхова) тэзы, ужо выкарыстаныя апанэнтамі. Най-

[2] Ю. Хабермас. Моральное сознание и коммуникативное действие. СПб: Наука, 2006. С. 92.

[3] Ілюстрацыяй дадзенай сытуацыі можа быць заява пасла Расеі ў Беларусі А. Сурыкава.

[4] Напрыклад, адзін з артыкулаў «Нашай Нівы»: Стрымаць Расею магчыма. Віталь Сіліцкі. Наша Ніва. 13 жніўня 2008.

[5] Напрыклад, для краінаў Балтыі, у прыватнасьці, Літвы, у мэдыйнай прасторы канфлікт пераважна ацэньваўся ў фармаце «імпэрскіх амбіцыяў» Расеі, якая ўмешваецца ва ўнутраную палітыку іншай дзяржавы.

больш яскравым прыкладам у дадзеным выпадку можа быць апэляцыя да факту прызнаньня незалежнасьці Косава, якая неаднакроць зьяўлялася як у расейскіх, так і ў беларускіх СМІ[6].

## ГРУЗІЯ — БЕЛАРУСЬ 5:0?

Агульнай характарыстыкай стану мэдыйнай прасторы Беларусі ў дачыненьні да расейска-грузінскага канфлікту зьяўляецца высокая колькасная шчыльнасьць прысутнасьці тэмы ў інфармацыйных плынях. Так, паводле крыху абагульненых падлікаў[7], у разгляданы пэрыяд згаданыя вышэй інфармацыйныя агенцтвы зьмясьцілі блізу 150 паведамленьняў, а газэты — 60 артыкулаў рознага тыпу. У якасных адносінах можна адзначыць наступныя тэндэнцыі асьвятленьня вайны (найперш ідзецца пра зьмест газэтных матэрыялаў, а таксама паведамленьні інфармацыйных агенцтваў, што маюць больш разгорнуты, чым простае інфармацыйнае паведамленьне, характар).

Па-першае, заканамерны высокі ўзровень інтарэсу ўсіх СМІ да падзеяў, што адбываюцца ў Паўднёвай Асеціі і Грузіі. Па-другое, аналіз канфлікту Расеі і Грузіі стаў зыходным пунктам для разгортваньня лініі рэфлексіі аб расейска-беларускіх дачыненьнях, іх актуальным стане і пэрспэктывах. Цікава, што разам з артыкуламі В. Марціновіча ў «БелГазете» адносную схільнасьць да аналізу выяўлялі і некаторыя публікацыі журналістаў «Советской Белоруссии». Так, у матэрыяле «В информационных войнах пленных не берут»[8] ёсьць спроба аналітычнага разбору заходняй прэсы і мэдыйных тэндэнцыяў прэзэнтацыі канфлікту, якая тым ня менш адцяняецца спробай паказаць «падвойныя стандарты» заходняга сьвету ў прэзэнтацыі рэчаіснасьці. Акрамя таго, у «рэфлексійным» блёку прысутнічае шэраг іміджавых артыкулаў, у якіх спрабуецца пазытыўна ці нэгатыўна адпазыцыянаваць адзін з бакоў у аблічча «ворага». Так, ва ўжо згаданым матэрыяле БелТА «САРКОстическая дискуссия» ў прэзэнтацыі Расеі і Грузіі першая зьяўляецца безумоўна «белай», а другая, адпаведна, «чорнай».

Наступнай характэрнай, хоць і абсалютна прадказальнай рысай прэзэнтацыі канфлікту ў беларускіх СМІ стаў падзел мэдыйнай прасторы на афіцыйны і апазыцыйны сэнсавыя блёкі. Пры гэтым выяўляецца характэрная асаблівасьць афі-

[6] Як прыклад можна прывесьці матэрыял інфармагенцтва БелТА пад характэрнай назвай «САРКОстическая дискуссия» (10.09.2008. 11:52). Далей падаецца толькі адна з характэрных сэнсавых цытатаў: «*Так, каб жа з роўным энтузіязмам год назад амэрыканскія і эўрапейскія палітыкі баранілі тэрытарыяльную цэльнасьць Сэрбіі, то ніякага косаўскага прэцэдэнту і блізка б не было…*»

[7] У дадзеным выпадку не былі адфільтраваныя тэматычна падобныя паведамленьні, а таксама паведамленьні, у якіх канфлікт не зьяўляецца асноўнай тэмай і згадваецца ў якасьці тэмы другога ўзроўню.

[8] Советская Белоруссия. 15 жніўня 2008.

цыйнага дыскурсу, у прыватнасьці, у матэрыялах БелТА і «Советской Белоруссии». Ад пачатку жніўня і да моманту сустрэчы А. Лукашэнкі з Дз. Мядзьведзевым сэнсавая лінія асьвятленьня канфлікту крыху не супадала са звычайнай, уласьцівай беларускім афіцыйным СМІ, матрыцай прэзэнтацыі «сябар — вораг». «Советская Белоруссия» спрабавала прадставіць адносна ўзважаную аналітычную пазыцыю, дазваляючы сабе ня вельмі вострую крытыку на адрас ЗША і ЭЗ:

*І яшчэ несумненна, прайграў Захад. Па-першае, таму, што ў пару не ўмяшаўся і не спыніў эскаляцыю напружанасьці. Па-другое, косаўскі інцыдэнт цяпер цалкам можа стаць прэцэдэнтам. Дзьмітры Мядзьведзеў зь юрыдычнай дакладнасьцю апэруе паняцьцямі «гуманітарная катастрофа» і «генацыд», кажучы пра вайну паміж Грузіяй і Паўднёвай Асеціяй. У пэўным сэнсе мы чуем рэха Косава. Але і Ічкерыі таксама*[9] .

Характэрна, што ў апошняй з прыведзеных цытатаў прысутнічае адценьне лёгкага крытычнага настрою ў адносінах да Расеі.

Пры разглядзе апазыцыйнага дыскурсу неабходна адзначыць найперш рознай ступені крытычны характар ацэнкі дзеяньняў Расеі — ад абсалютна нэгатыўнай да нэгатыўна-нэўтральнай. Яшчэ адным важным момантам зьяўляецца разгляд сытуацыі ў постканіяльнай тэрміналёгіі, у рамках якой на адрас Расеі гучыць крытыка «імпэрскіх амбіцыяў» — лёгікі выбудоўваньня вонкавай палітыкі гэтай дзяржавы. Важкім складнікам гэтага блёку выказваньняў зьяўляецца шырокае выкарыстаньне мэханізмаў цытаваньня, у прыватнасьці, выкарыстаньне камэнтароў розных экспэртаў (напрыклад, грузінскіх у публікацыях «БелГазеты» і амэрыканскіх, расейскіх і іншых экспэртаў у «Нашай Ніве»). Апошняя асаблівасьць вывела прэзэнтацыю канфлікту ў апазыцыйным дыскурсе на якасна іншы ўзровень у параўнаньні з апэляцыямі да «здаровага сэнсу» і варыяцыямі на тэму «агульначалавечых каштоўнасьцяў» афіцыйнага дыскурсу. У цэлым, гэтыя рэпрэзэнтацыйныя мадальнасьці знаходзяцца ў мэтафарычнай плашчыні параўнаньня карцінкі заходніх/амэрыканскіх і расейскіх тэлеканалаў, дзе першыя дэманстравалі грузінскага прэзыдэнта, які добра гаварыў па-ангельску, а другія паказвалі прадстаўнікоў расейскага Генштабу, што мелі відавочныя праблемы з вуснай камунікацыяй.

Разам з тым, пад канец разгляданага пэрыяду расейска-грузінскі канфлікт у афіцыйным беларускім дыскурсе страціў наяўныя на пачатку супрацьстаяньня пазытыўныя асаблівасьці і ператварыўся ў звыклую форму супрацьпастаўленьня саюзнай з Расеяй Беларусі астатняму сьвету. Афіцыйны Менск ня здолеў выкарыстаць канфліктнай сытуацыі для фармаваньня ўласных сэнсаў.

[9] Советская Белоруссия. 12 жніўня 2008.

## КРАСАМОЎНЫЯ ЗАГАЛОЎКІ

Паведамленьні беларускіх інфармацыйных агенцтваў мелі пераважна нэўтральны характар. Базавыя выказваньні пры гэтым зьмяняліся ў залежнасьці ад фазы канфлікту. Разам з тым, у матэрыялах інфармацыйных агенцтваў назіраўся шэраг асаблівасьцяў, якія прасочваліся нават у вызначэньні загалоўкаў.

У прыватнасьці, акумулюючы інфармацыю з розных крыніцаў, сайт tut.by сабраў максымальную колькасьць паведамленьняў аб хадзе канфлікту, сумясьціўшы прынцыпова розныя паводле сэнсавай напоўненасьці паведамленьні. Інфармацыя гэтай крыніцы найбольш цікавая хутчэй з гледзішча практычнага, чым сымбалічнага, бо ўяўляе зь сябе поўную храналёгію падзеяў і дае якасна розныя ўяўленьні пра іх.

Лёгіка прэзэнтацыі падзеяў агенцтвам БелТА выбудоўвалася паводле звыклай, немудрагелістай бінарнай схемы супрацьпастаўленьня «свой-чужы», зь некаторымі папраўкамі на ваганьні афіцыйнага Менску ў пачатку канфлікту. Журналісты агенцтва звыкла выкарыстоўвалі эсэнцыялісцкае супрацьпастаўленьне «нячэснага» Захаду «чэсным» паводзінам Расеі, пры гэтым ужываючы надуманыя катэгорыі кшталту «карэнныя жыхары», «прышлае насельніцтва»:

*У вачах многіх палітыкаў ЭС Грузія і Сэрбія знаходзяцца на цалкам розных плянэтах галяктыкі, а таму параўноўваць гэтыя выпадкі (наагул, цалкам аналягічныя, за выняткам, хіба што, таго, што касаўскія альбанцы — усё-такі прышлае насельніцтва краю, у той час як абхазы і асеціны на сваіх землях — карэнныя жыхары), лічыцца немагчымым*[10].

Што да трэцяга разгледжанага інфармацыйнага агенцтва — БелаПАН, то можна сказаць, што на ягонай стужцы навінаў адлюстраваная «эўрапейская лінія» падачы канфлікту. У прыватнасьці, яшчэ перад пачаткам актыўных баявых дзеяньняў на БелаПАНе пачалі зьяўляцца такія загалоўкі: *«Грузінскія ўлады выступаюць за ўзмацненьне ролі ЕС ва ўрэгуляваньні канфліктаў на сваёй тэрыторыі»*, *«Эўрасаюз крайне заклапочаны абвастрэньнем сытуацыі ў Паўднёвай Асеціі»* і падобныя, што фармуюць лінію праэўрапейскай парадыгмы ўспрыняцьця сытуацыі.

Акрамя таго, важным складнікам кантэкстуальнай лініі дадзенай крыніцы стала практычна бездакорная рэтрансьляцыя афіцыйных заяваў Грузіі, у тым ліку і ў сытуацыі, зьвязанай з выхадам з СНД. Да камэнтароў былі ўдала прыцягнутыя праэўрапейска настроеныя беларускія палітыкі. Цікавай асаблівасьцю стала перадача афіцыйнай пазыцыі лідэраў самаабвешчаных рэспублік без асаблівых дадатковых камэнтараў. У той жа самы час дзеяньні А. Лукашэнкі інтэрпрэтаваліся як абумоўленыя пераважна «вымушанай дружбай» з Расеяй альбо ў

[10] САРКОстическая дискуссия // БелТА. 10 верасьня 2008.

якасьці больш жорсткага варыянту — як здольныя прывесьці да страты незалежнасьці Беларусі і да яе кааптацыі ў склад Расеі:

*Безумоўная падтрымка беларускім прэзыдэнтам дзеяньняў Расеі на Паўднёвым Каўказе, выражаная на яго сустрэчы зь Дзьмітрыем Мядзьведзевым у Сочы 19 жніўня, дасягнутая там жа прынцыповая дамоўленасьць аб стварэньні адзінай сыстэмы СПА і дэманстрацыйная сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі Паўднёвай Асеціі і Абхазіі выразна прадэманстравалі, што кіраўніцтва Рэспублікі Беларусі імкнецца захоўваць статус «адзінага і незаменнага саюзьніка Расеі». Хоць для справядлівасьці трэба заўважыць, што ўсе гэтыя дзеяньні адбыліся адно пасьля нагонкі расейскага пасла ў Менску*[11].

У якасьці агульнай высновы можна адзначыць ня столькі зьмест непасрэдна саміх паведамленьняў, пераважна нэўтральных, колькі агульную сэнсавую прастору, якая ствараецца ў першую чаргу загалоўкамі і разьмяшчэньнем матэрыялаў на інфармацыйнай стужцы. У дадзеным выпадку можна казаць пра тое, што форма структураваньня інфармацыі вызначыла яе зьмест і несла асноўную сэнсавую нагрузку.

## СПРОБЫ АНАЛІТЫЧНАЙ САМАРЭФЛЕКСІІ НА ФОНЕ ГУЛЬНІ Ў АДНЫЯ ВАРОТЫ

Зьвярну ўвагу на імкненьне шэрагу беларускіх журналістаў падаць у аналізе сытуацыі ня толькі фактычны складнік, але і ўласную рэфлексію адносна таго, што адбываецца. Прыкладамі такога кшталту могуць быць публікацыі «БелГазеты» (напрыклад, «Отвоевали? Беларусь осталась над схваткой») альбо «Нашай Нівы» («Вайна ў дзень Алімпіяды»). Дадатковай асаблівасьцю спробы самаідэнтыфікацыі на фоне разьвіцьця канфлікту стала эстэтызацыя і крэатыўная прэзэнтацыя канфлікту. Прыкладам гэтага зьяўляецца артыкул «Нашай Нівы» «Тэрыторыя, змушаная да прыгажосьці».

Асобна спынімся на прэзэнтацыі канфлікту ў «Советской Белоруссии», якая ілюструе лінію паводзінаў афіцыйнага Менску. Пачатак асьвятленьня канфлікту «Советской Белоруссией» зьвязаны з сэнсавымі пасыламі аб агульнай занепакоенасьці сытуацыяй у рэгіёне, даволі асьцярожнымі і нявострымі выпадамі ў бок ЭЗ і псэўданаіўным выслоўем — «галоўнае, каб не было вайны». Больш за тое, у публікацыях выданьня да самай сустрэчы А. Лукашэнкі з Дз. Мядзьведзевым агучвалася даволі ўзважаная пазыцыя і нават рабіліся спробы аналізу мэдыйнай прэзэнтацыі канфлікту ў замежных крыніцах. Далей лёгіка прэзэнтацыі разьвівалася па ўзыходзячай у бок падтрымкі Расеі, крытыкі ЗША, а фінальным акордам стала сустрэча прэзыдэнтаў і выражэньне поўнай падтрымкі для расей-

[11] http://naviny.by. 26 жніўня 2008.

скага боку. Цікава, што назва публікацыі-капітуляцыі пасьля няўдалага бунту была «Время простых решений прошло».

Сытуацыя з «Советской Белоруссией» характэрная для большасьці залежных прадзяржаўных беларускіх СМІ, якія вымушаныя ўзнаўляць і карэктаваць запрапанаваныя сэнсы ў залежнасьці ад таго, з кім у оруэлаўскай лёгіцы мы сёньня ваюем: з «Поўначчу» ці «Поўднем».

## ВЫСНОВЫ

Міжнародныя канфлікты і іх прэзэнтацыя зьяўляюцца для трэціх, не задзейнічаных у канфліктах краінаў, полем сымбалічнай барацьбы альбо сымбалічнай прэзэнтацыі, на якім зьяўляецца гіпатэтычная магчымасьць замацаваньня новых сэнсаў і атрыманьня матэрыяльных альбо сымбалічных выгадаў. Для Беларусі расейска-грузінскі канфлікт стаўся ўзнаўленьнем лёгікі падзелу дыскурсу на афіцыйны і апазыцыйны, прычым апошні быў даволі markedly рознабаковым у сваіх формах і кантэкстах. Разам з тым пазначаныя на пачатку канфлікту тэндэнцыі выхаду на межы звычайных сэнсавых схемаў афіцыйнага дыскурсу скончыліся нічым.

## ВЫБАРЫ 2008

ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ, ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

# Пасля парламенцкіх выбараў

## Трансфармацыя без дэмакратызацыі

### ЛОГІКА ТРАНСФАРМАЦЫІ ЛУКАШЭНКАЎСКАЙ УЛАДЫ

Парламенцкія выбары 2008 г. праходзілі ў паваротны час для беларускага рэжыму. Сёлетнія падзеі, а менавіта сусветны фінансавы крызіс і расійска-грузінская вайна, абвастрылі неабходнасць трансфармацыі лукашэнкаўскай сістэмы для яе ж самавыжывання. З аднаго боку, вайна на Каўказе паказала, што галоўны знешнепалітычны саюзнік і донар старой лукашэнкаўскай сістэмы цяпер гатовы да сілавых інтэрвенцый з мэтай змены ўлады ўнутры краіны. З іншага, падзеі ў сусветнай эканоміцы могуць прывесці да таго, што ў хуткім часе разлічваць на Расію як адзінага выратавальніка беларускай мадэлі будзе ўжо цяжка.

Унутраная сацыяльная і эканамічная дынаміка стала таксама вымагаць трансфармацыі рамкавых варункаў сістэмы. Трэба, аднак, агаварыцца, што любыя перамены, на якія ідзе афіцыйны Мінск, ажыццяўляюцца з адной мэтай — максімальна пазбегнуць неабходнасці палітычных зменаў, гэта значыць, дамагчыся прарыву з міжнароднай ізаляцыі без сур'ёзных палітычных паслабленняў.

Гэтая задача была развязаная шляхам прафесійна зладжанай піяр-кампаніі, цягам якой беларускія ўлады прэвентыўна пайшлі на пацяпленне палітычнага клімата (напрыклад, вызваленне палітычных вязняў) і стварылі ў заходніх гульцоў уражанне, што і парламенцкія выбары могуць быць праведзеныя пры пэў-

---

*Дзяніс Мельянцоў — палітоляг, аналітык Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў. У ARCHE (4/2008) было апублікавана яго эсэ «Навошта Беларусі ўступаць у Эўрапейскі Саюз?»*

ным забеспячэнні дэмакратычных стандартаў. Атрымаўшы ў якасці авансу абяцанне зняць санкцыі, беларускія ўлады правялі выбары паводле звычайнага для сябе сцэнара. Запозненая крытыка выбараў была прадстаўленая афіцыйнай прапагандай як сведчанне падвойных стандартаў.

Паколькі ЕС і ЗША загадзя паказалі, што дыялог ім важны больш, чым афіцыйнаму Мінску, на вызначэнне стаўлення да выбараў паўплывала і шантажаванне «спыненнем дыялогу», што магло расшыфроўвацца і як вяртанне да палітычных рэпрэсіяў.

**Адсутнасць перспектывы ўнутрыпалітычнага прарыву штурхае Захад да дыялогу з беларускімі ўладамі, які будзе весціся на прагматычных і не заўжды прынцыповых падставах.**

Адсутнасць перспектывы ўнутрыпалітычнага прарыву робіць натуральнымі спробы пошукаў дыялогу з беларускімі ўладамі, і беларускія дэмакраты мусяць быць гатовыя да таго, што гэты дыялог будзе весціся на прагматычных і не заўжды прынцыповых падставах. Беларуская апазіцыя, якая пераўтварылася ў пераважна знешнепалітычнага гульца, магла б паўплываць на ход і парадак дня дыялогу паміж афіцыйным Мінскам і ЕС, але не здолела зрабіць гэтага праз адсутнасць унутранага адзінства і знешнепалітычнай стратэгіі.

У выніку выбараў і знешнепалітычнага дыялогу адбылося пэўнае пацяпленне палітычнага клімату. Аднак гэтым палітычныя здабыткі кампаніі і вычэрпваюцца, віной чаму стала адсутнасць у знешнепалітычных гульцоў адзінага сцэнара паводзінаў. Паколькі працяг дыялогу з беларускімі ўладамі падаецца непазбежным, галоўнай яго мэтай мусіць стаць замацаванне тых пазітыўных зрухаў, якія дасягнутыя за апошні час. Дзеля гэтага неабходная кантраляванасць дыялогу, заруКай якой мусіць стаць паступовае вяртанне да пакрокавай стратэгіі і выстаўленне жорсткай абумоўленасці наступных дзеянняў пры кантактах з беларускімі ўладамі. Кожны крок афіцыйнага Мінска і крок у адказ з боку Захаду павінен мець дакладна вызначаныя і прапісаныя крытэры ацэнкі.

**Кожны крок афіцыйнага Мінска і крок у адказ з боку Захаду павінен мець дакладна вызначаныя і прапісаныя крытэры ацэнкі.**

## ЧАМУ ЗАХАД ПАЙШОЎ НА ЗБЛІЖЭННЕ З БЕЛАРУСКІМ РЭЖЫМАМ?

Улетку 2008 г. стала відавочна, што ў ЕС і ЗША склалася палітычная кан'юнктура на нармалізацыю адносінаў з афіцыйным Мінскам. Пры гэтым Злучаныя Штаты і Еўрапейскі Саюз мелі неаднолькавыя матывы, якія прымусілі іх перайсці да палітыкі нармалізацыі стасункаў з афіцыйным Мінскам.

Адной з галоўных прычынаў таго, што ЕС пайшоў насустрач беларускім уладам, стала няўдача усіх папярэдніх вонкавых стратэгіяў дэмакратызацыі Беларусі. Бадай, за дванаццаць гадоў ЕС паспрабаваў усе магчымыя падыходы, якія,

праўда, не характарызаваліся паслядоўнасцю і эфектыўнасцю.

**ЕС пайшоў насустрач беларускім уладам, бо ўсе ранейшыя вонкавыя стратэгіі дэмакратызацыі Беларусі праваліліся.**

Апошняя спроба Еўрасаюза сфармуляваць стратэгію ў адносінах Беларусі мела сваім вынікам публікацыю «недакумента» «Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі», дзе пералічваліся 12 патрабаванняў да ўладаў Беларусі, пасля выканання якіх мог аднавіцца паўнавартасны дыялог Мінска з Бруселем. Крытычнай памылкай ЕС было не столькі выстаўленне абсалютна непрымальнага для беларускіх уладаў патрабавання рэфармаваць палітычную сістэму, а прапанова дужа расплывістых і неканкрэтных выгадаў, якія б мелі месца пасля выканання выстаўленых патрабаванняў. Адсутнасць дакладна прапісанай абумоўленасці і пакрокавага модусу выканання 12 пунктаў сталіся прычынай таго, што гэтая стратэгія таксама аказалася невыканальнай. Гэта стала відавочна ўжо адразу пасля яе абнародавання, калі афіцыйны Мінск недвухсэнсоўна даў зразумець Еўропе, што ён не збіраецца выконваць 12 пунктаў ЕС.

**Крытычнай памылкай ЕС была прапанова дужа неканкрэтных выгадаў, якія б мелі месца пасля выканання выстаўленых патрабаванняў.**

Падзеі 2007 г. і першай паловы 2008 г. паказалі, што ў беларуска-расійскіх адносінах працягвалі назапашвацца крызісныя з’явы, якія падштурхоўвалі беларускія ўлады палепшыць дачыненні з Еўрапейскім Саюзам. Акурат у гэты перыяд прэзідэнт Лукашэнка санкцыянуе адкрыццё прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі ў Мінску. Разам з тым, беларускія ўлады даюць зразумець еўрапейцам, што яны хочуць палітычнага збліжэння з ЕС, але не збіраюцца ісці на радыкальны перагляд унутранай палітыкі і не будуць выконваць ніякіх ультыматумаў.

Акцыя выгнання амерыканскіх дыпламатаў сёлета ўвесну была шмат у чым паказальная. Апрача ўсяго іншага яна мела прадэманстраваць Бруселю контрпрадуктыўнасць палітыкі санкцыяў і недапушчальнасць умяшання замежных прадстаўніцтваў ва ўнутрыбеларускія справы. Палітычныя эліты ЕС прачыталі гэты сігнал адэкватна і былі вымушаныя адмовіцца ад выстаўлення папярэдніх умоваў для пачатку дыялогу з беларускім рэжымам.

**Спроба паўплываць на паводзіны беларускіх уладаў праз увядзенне санкцыяў не прынесла чаканага выніку.**

Спроба паўплываць на паводзіны беларускіх уладаў праз увядзенне санкцыяў таксама не прынесла чаканага выніку. Абмежаваныя эканамічныя санкцыі не зрабілі адчувальнай шкоды беларускай эканоміцы, але былі выкарыстаныя беларускай прапагандай супраць самога ж ЕС. Неўключэнне Беларусі ў Еўрапейскую палітыку добрасуседства адмоўна адбілася на беларускіх грамадзянах, якія вымушаныя плаціць 60 еўра за шэнгенскія візы і маюць абмежаваныя магчымасці падарожнічаць па Еўропе і па-

**Персанальныя санкцыі ЕС мелі больш значны ўплыў, чым эканамічныя.**

раўноўваць узровень жыцця ў сваёй краіне з узроўнем жыцця ў ЕС. З іншага боку, сярод назіральнікаў умацавалася адчуванне, што персанальныя санкцыі мелі нават больш значны ўплыў, чым эканамічныя.

Яшчэ адной прычынай, якая падштурхнула ЕС да пачатку дыялогу з беларускім рэжымам, стала неэфектыўнасць выкарыстання беларускай апазіцыі ў якасці пасярэдніка паміж Еўрасаюзам і беларускім грамадствам. За гады аўтарытарызму беларуская апазіцыяператварылася ў знешняга актара, моцна страціла папулярнасць сярод беларускіх грамадзян і аказалася няздатнай мабілізаваць беларусаў на масавыя акцыі пратэсту, неабходныя для «каляровай рэвалюцыі». Таму Захад пачаў ставіць пад сумненне выкарыстанне апазіцыйных партыяў як эфектыўнага інструмента дэмакратызацыі краіны. Пачаўся пошук іншых каналаў уздзеяння на ўнутрыбеларускую сітуацыю, разам з палітычнымі кантактамі на высокім і вышэйшым узроўні.

**Рашэнне пазбавіцца ад «беларускага пытання» шляхам прызнання рэжыму азначае аднабаковую саступку і не гарантуе трансфармацыі палітычнай сістэмы ў Беларусі.**

Акрамя таго, бізнес-колы асобных еўрапейскіх дзяржаваў праяўлялі інтарэс да ўдзелу ў прыватызацыі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў і да інвеставання ў беларускую эканоміку. Асабліва гэты інтарэс пачаў выяўляцца пасля адмены інстытуту «залатой акцыі» і спрашчэння падаткаабкладання. Нагадаем, што шэраг беларускіх кампаніяў (у прыватнасці, аператар сотавай сувязі Velcom і завод «Мотавела») ужо былі прыватызаваныя з удзелам аўстрыйскага капіталу. Бізнесоўцы лонданскага Сіці таксама выявілі зацікаўленасць у прыходзе ў Беларусь. А для гэтага неабходна навязаць устойлівыя палітычныя адносіны, якія б забяспечвалі стабільныя правілы гульні.

Такія залежныя ад беларускага транзіту краіны, як Латвія і Літва, ужо дастаткова даўно спрабуюць наладзіць палітычны дыялог з беларускім урадам, не чакаючы дазволу з Бруселя. Да прыкладу, яшчэ да ўваходу ў Шэнгенскую зону Латвія адмяніла візавы збор для беларускіх грамадзян, а Літва з Беларуссю мелі сталыя кантакты на ўзроўні міністэрстваў і рэгулярна праводзілі эканамічныя форумы з удзелам дзелавых і палітычных колаў абедзвюх дзяржаў. У літоўскім Сойме ўжо шмат гадоў існуе камітэт сувязяў з Беларуссю (яго ўзначальвае этнічны беларус Вацлаў Станкевіч), які выступае за пашырэнне стасункаў з афіцыйным Мінскам. Літва разам з Польшчай не раз заяўлялі пра свой намер быць «адвакатам Беларусі» ў інстытутах ЕС. Рухавік еўрапейскай інтэграцыі, Нямеччына, таксама зацікаўленая ў інвеста-

**Апошнім штуршком, які запусціў механізм прызнання беларускага рэжыму Еўрапейскім Саюзам, стаў канфлікт у Грузіі.**

ванні ў Беларусь, пра што, у прыватнасці, недвухсэнсоўна заявіў амбасадар д-р Гебхардт Вайс.

Акрамя пералічаных прычынаў, у еўрапейскіх уладных калідорах існуе і стомленасць ад «беларускага пытання», якога Еўрапейскі Саюз не можа вырашыць ужо за больш як дзесяць гадоў. «Беларускае пытанне» мае для Еўрасаюза значную псіхалагічную нагрузку, бо дэкларуючы сябе глабальным актарам, які прасоўвае дэмакратыю і стабільнасць у бліжэйшым замежжы, ён не здолеў яго развязаць, за што неаднойчы яго крытыкавалі Злучаныя Штаты.

**Палітыка ЗША ў дачыненні Беларусі зазнала яшчэ больш радыкальны паварот, чым палітыка Еўрапейскага Саюза.**

Паколькі выпрабавання Беларуссю знешняя палітыка ЕС не прайшла, пастанавілі пазбавіцца ад «беларускага пытання» шляхам прызнання рэжыму і ўсталявання кантактаў на вышэйшым узроўні. Гэтае рашэнне, натуральна, даволі рызыкоўнае, бо азначае аднабаковую саступку з боку Еўрапейскага Саюза і не гарантуе трансфармацыі палітычнай сістэмы ў Беларусі. На працягу першай паловы 2008 г. ЕС фактычна адмовіўся ад ранейшай стратэгіі 12 пунктаў і звёў папярэднія ўмовы пачатку дыялогу з афіцыйным Мінскам да вызвалення палітычных вязняў і правядзення адкрытых і справядлівых выбараў, што не пацягнула змены ўнутрыпалітычных правілаў гульні ў Беларусі.

Апошнім штуршком, які запусціў механізм прызнання беларускага рэжыму Еўрапейскім Саюзам, стаў канфлікт у Грузіі. Паводзіны Мінска падчас гэтага канфлікту мелі прадэманстраваць Захаду незалежнасць ад Масквы і жаданне нармалізацыі стасункаў з ЕС і ЗША. Новая геапалітычная сітуацыя ў рэгіёне і чарговы крызіс у адносінах Расіі і Захаду адчынілі унікальнае акно магчымасцяў для таго, каб аслабіць залежнасць Беларусі ад Крамля.

**ЗША часткова знялі эканамічныя санкцыі з двух беларускіх прадпрыемстваў у адказ на непрызнанне Мінскам Абхазіі і Паўднёвай Асеціі акурат у той дзень, калі пытанне выносілася на абмеркаванне на саміце АДКБ.**

Палітыка ЗША ў дачыненні Беларусі зазнала яшчэ больш радыкальны паварот, чым палітыка Еўрапейскага Саюза. Новы курс адміністрацыі Дж. Буша ў стасунках з афіцыйным Мінскам можна назваць сенсацыйным і беспрэцэдэнтным у гісторыі беларуска-амерыканскіх адносінаў апошняга дзесяцігоддзя. Сапраўды, ад краіны, якая паслядоўна падтрымлівала беларускую апазіцыю, не ўстрымлівалася ад рэзкіх заяваў і ўвядзення санкцыяў у дачыненні да Беларусі, даволі цяжка было чакаць радыкальнай змены палітычнай лініі. Аднак яна адбылася. І, мяркуючы паводле тых падзеяў, на якія ў першую чаргу рэагаваў Вашынгтон, прычыны зменаў ягонай палітыкі да Беларусі палягаюць зусім не ў лібералізацыі беларускага рэжыму, але ў знешнепалітычным кантэксце і геапалітычнай сітуацыі, што склалася пасля вайны ў Грузіі.

Напрыклад, ЗША часткова знялі эканамічныя санкцыі з двух беларускіх прадпрыемстваў у адказ на непрызнанне Мінскам Абхазіі і Паўднёвай Асеціі акурат у той дзень, калі гэтае пытанне выносілася на абмеркаванне на саміце АДКБ.

Апошнія заявы часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі Джонатана Мура сведчаць хутчэй пра жаданне перакупіць Беларусь у Расіі, чым пра імкненне змяніць палітычны рэжым у краіне. Выглядае, што вызваленне палітычных вязняў ёсць для ЗША ўсяго толькі фармальнай падставай для нармалізацыі стасункаў з Мінскам, пры тым, што існуе разуменне рызыкоўнасці такога кроку пры адсутнасці юрыдычных абавязанняў з беларускага боку.

**Заявы Джонатана Мура сведчаць хутчэй пра жаданне перакупіць Беларусь у Расіі, чым пра імкненне змяніць палітычны рэжым у краіне.**

Беларуская апазіцыя, якую дагэтуль ЗША паслядоўна падтрымлівалі, сталася закладніцай новай амерыканскай палітыкі стрымлівання Расіі. Яе не толькі вымусілі ўдзельнічаць у несправядлівых парламенцкіх выбарах для атрымання дадатковай падставы для прызнання новага парламенту, але ёй нават не паведамілі пра сутнасць перамоваў паміж Захадам і беларускім рэжымам, не кажучы ўжо пра перспектыву ўдзелу ў перамовах як пасярэдніка. Гэткую палітыку адыходзячай амерыканскай адміністрацыі варта прызнаць недальнабачнай, бо яна цяпер сваімі дзеяннямі фармуе больш праблем, чым вырашае. У прыватнасці, такая палітыка вядзе да яшчэ большай маргіналізацыі беларускай апазіцыі і росту недаверу да заходніх партнёраў у вачах яе лідэраў.

## УНУТРЫПАЛІТЫЧНЫ КАНТЭКСТ

**Беларуская апазіцыя, якую дагэтуль ЗША паслядоўна падтрымлівалі, сталася закладніцай новай амерыканскай палітыкі стрымлівання Расіі.**

Перыяд «пацяплення» ў беларуска-еўрапейскіх адносінах праходзіць у кантэксце эвалюцыі беларускай сістэмы пад знакам «трансфармацыі без дэмакратызацыі». Эканамічныя рэформы і знешнепалітычнае пацяпленне ажыццяўляюцца акурат для таго, каб не выпускаць апазіцыю з рэзервацыі, у якую яна трапіла ў апошнія гады.

Ва ўнутрыпалітычным жыцці працягваецца дысідэнцкі перыяд, які па выніках выбараў (пры новым цалкам стэрылізаваным парламенце) мае перспектыву зацягнуцца на нявызначаны час. Пытанне пра дасканаласць палітычнай стратэгіі і тактыкі важнае, калі гутарка ідзе пра доўгатэрміновую перспектыву палітычнай перамогі. Ва ўмовах закрытасці каналаў камунікацыі з грамадствам, агульнай грамадскай апатыі і пэўнай руцінізацыі безнадзейнасці (стане грамадства, калі сама палітычная дзейнасць лічыцца чымсьці ірацыянальным), апазіцыйны асяродак скараціўся да некалькіх тысячаў ветэранаў дысідэнцкага руху. Нават чаканні палітычнага прарыву ад гэтага асяродку

больш падобныя да летуценняў. Да таго ж, сама палітычная сітуацыя прагramуе апазіцыю на барацьбу за тыя мэты, якія не знаходзяць падтрымкі ў «рацыянальнага» выбаршчыка, заклапочанага найперш уласным дабрабытам. Змаганне за сімпатыі выбаршчыкаў мае няшмат сэнсу, калі апазіцыя не можа рэалізаваць сваіх, хай нават і прывабных, платформаў. Таму на парадак дня для апазіцыі натуральна выходзіла пытанне правілаў гульні і празрыстасці выбарчых працэдураў — якое акурат і не з’яўляецца нейкім вызначальным ці прыярытэтным для грамадства.

**Апазіцыйны асяродак скараціўся да некалькіх тысячаў ветэранаў дысідэнцкага руху.**

Усе спробы «вынайсці» новую апазіцыю, якая б замяніла «заезджанае» апазіцыйнае кіраўніцтва апошніх гадоў, закончыліся няўдачай, аднак акурат у перадвыбарны сезон у шэрагу апазіцыйных партыяў абвастрылася барацьба за лідэрства. З іншага боку, на паводзіны апазіцыйнага кіраўніцтва наўпрост уплывала адчуванне «стомленасці» ад Беларусі на Захадзе і ўсё выразнейшы курс на супрацу з Лукашэнкам.

Падрыхтоўка апазіцыі да выбараў часткова складалася з рэфлексіўнага паўтарэння апрабаваных палітычных сцэнароў, што не заўжды адыгрывала адмоўную ролю: у прыватнасці, АДС здолелі вылучыць адзіны спіс кандыдатаў і вызначыцца з перадвыбарным пасланнем, якое, аднак, так і не было развіта ў змястоўную перадвыбарную праграму. Апазіцыя так і не вызначылася, дзеля чаго былі гэтыя выбары. Не было адзінага месіджа, які б рэзанаваў на ўсю краіну, ці вызначанага шэрагу праблемаў, пра якія гаварылі б усе кандыдаты. Нават самыя перспектыўныя апазіцыйныя кандыдаты, якімі былі рэгіянальныя актывісты, вялі кампанію, абапіраючыся пераважна на мясцовыя праблемы.

**Адзіным шанцам дасягнення палітычнага выніку на выбарах для апазіцыі была б выпрацоўка парадку дня для дыялогу Захаду і афіцыйнага Мінска.**

Яшчэ да таго, як абвясцілі выбары, іх «знешнепалітычны» аспект стаў для апазіцыі вызначальным. Галоўным стала пытанне, як удзел апазіцыі ў выбарах можа паўплываць на міжнародны статус рэжыму Лукашэнкі і на статус самой апазіцыі. Гэта цалкам заканамерна. У «дысідэнцкі» перыяд апазіцыя — найперш знешнепалітычны гулец, чыя роля ў грамадстве залежыць ад таго, як яна можа ўплываць на знешнепалітычных актараў, якія ўзаемадзейнічаюць з уладамі праз уціск ці дыялог. Маючы на ўвазе, што ажыццяўленне любых палітычных апазіцыйных стратэгій (акрамя, бадай, мясцовых грамадскіх) ва ўмовах заблакаванай палітычнай і грамадскай прасторы і сацыяльнай пасіўнасці ёсць хутчэй летуценніцтвам, магчыма, адзіным шанцам дасягнуць адчувальнага палітычнага выніку на гэтых выбарах для апазіцыі было б акурат мадэраванне дыялогу Захаду і афіцыйнага Мінска праз выпрацоўку яго парадку дня. Пад гэтым мы разумеем шэраг канкрэтных патрабаванняў, выкананне якіх

дазволіла б пашырыць палітычную і грамадскую прастору для альтэрнатыўнай дзейнасці і стварыла б варункі для рэальнай палітычнай канкурэнцыі. Набор з трох-чатырох варункаў мог бы мець на ўвазе выключэнне з выбарчага права найбольш адыёзных практык (датэрміновае галасаванне і г. д.) і адмену антырэвалюцыйных артыкулаў у Крымінальным кодэксе. Платай за такія змены мусіў быць частковы выхад рэжыму Лукашэнкі з міжнароднай ізаляцыі і, кажучы мовай апазіцыйных партый, яго легітымізацыя. Няма ніякай гарантыі, што акурат такая стратэгія прывяла б да лепшага выніку. Аднак у апазіцыі і Захаду быў бы адзіны парадак дня, які вывеў бы «дыялог» асобых заходніх актараў з рэжыму сакрэтных сепаратных перамоваў і выключыў бы адвольную трактоўку «прагрэсу», дасягнутага за час выбараў.

**Палітычная апазіцыя сёння — гэта кіраўніцтва палітычных партый у Мінску і некалькі дзесяткаў рэгіянальных асяродкаў, згуртаваных вакол моцных рэгіянальных лідэраў.**

Выстаўленне такіх умоваў, дарэчы, цалкам адпавядала б «дыялогавай» стратэгіі АДС, якую прынялі на Кангрэсе дэмакратычных сілаў у траўні 2007 г. Цікава, што сам факт існавання гэтай стратэгіі быў праігнараваны АДС, пра што сведчылі, напрыклад, атакі кіраўніцтва БНФ на Аляксандра Мілінкевіча, пасля таго, як ён прапанаваў распрацаваць кароткатэрміновы варыянт вядомага еўрапейскага паслання Беларусі як грунту для пачатку дыялогавага працэсу. Пры гэтым АДС ніколі не заяўлялі пра змену стратэгіі і тактыкі.

Напярэдадні парламенцкіх выбараў таксама назіраліся:

— абвастрэнне супярэчнасцяў паміж «партыйнай» і «вулічнай» апазіцыяй, на якую наклалася пакрыўджанасць асобных палітычных структураў. Спроба абвяшчэння байкоту выбараў «Хартыяй-97» і «Маладым фронтам», з аднаго боку, паказала, што аргументацыя за байкот з вуснаў спадароў Саннікава ці Дашкевіча нічым не адрознівалася ад аргументаў за байкот, якія мы чулі восем гадоў таму. Паказальна, што пераважная большасць апазіцыі праз нейкі час прызнала байкотную тактыку памылковай. Рэанімацыя байкоту праз восем гадоў стала магчымая дзякуючы палітычнай недасведчанасці новага пакалення апазіцыйнай моладзі, якім скарысталіся тыя, хто быў зацікаўлены ў перафарматаванні палітычнага кіраўніцтва;

— канфлікт пакаленняў і нарастанне супярэчнасцяў паміж «мінскай» і «рэгіянальнай» апазіцыяй, якія выразна выявіліся пры спробе абвяшчэння байкоту кіраўніцтвам БНФ. У структурным плане палітычная апазіцыя сёння — гэта некалькі груповак у Мінску, якія прадстаўляюць кіраўніцтва палітычных партый, і некалькі дзесяткаў рэгіянальных асяродкаў, якія пераважна гуртуюцца вакол моцных рэгіянальных лідэраў. Для шмат каго з апошніх удзел у выбарах — гэта працяг збольшага грамадскай дзейнасці, у якой абранне дэпутатам важны, але не вызначальны чыннік павышэння ўплыву ў сваёй супольнасці. Аднак лакальныя кампаніі — гэта хутчэй праца на перспектыву асобных палітычных поста-

цяў, якая не ўплывае наўпрост на змяненне глабальнага палітычнага кантэксту. А вось жа няўдача на выбарах для «цэнтральнай» мінскай апазіцыі кожны раз ставіць пытанне пра яе палітычную адэкватнасць;

— пэўная супярэчнасць паміж апазіцыяй і яе знешнімі сімпатыкамі, што прывяла да таго, што некаторыя заходнія дыпламаты сталі публічна выказвацца пра пытанні апазіцыйнай стратэгіі і тактыкі.

Абвешчаныя ўладамі вынікі не могуць быць крытэрам для вызначэння сілы ці слабасці тых ці іншых палітыкаў. Наадварот, выбары засведчылі даволі высокі ўзровень падтрымкі некаторых з іх. З іншага боку, адсутнасць выніку ў выбарах дадае матывацыі палітычным лідэрам не ўдзельнічаць у кааліцыйных працэсах, а спрабаваць знайсці шчасця паасобку. Без пераасэнсавання сутнасці апазіцыйнай дзейнасці ў дысідэнцкі перыяд апазіцыя можа падысці да 2011 г. у стане самага глыбокага арганізацыйнага і маральнага крызісу за ўсю сваю гісторыю. Відавочна, што гэты крызіс цяпер падштурхоўваецца радыкальнымі сіламі дзеля «змены ўлады» ў апазіцыйным лагеры.

**Абвешчаныя ўладамі вынікі не могуць быць крытэрам для вызначэння сілы ці слабасці тых ці іншых палітыкаў.**

## ЧАМУ АЦЭНКА БЫЛА ТАКАЯ, ЯКАЯ БЫЛА?

Як мы прагназавалі раней, назіральная місія АБСЕ не прызнала парламенцкіх выбараў у Беларусі адпаведнымі стандартам гэтай арганізацыі, адзначыўшы пры гэтым «нязначныя паляпшэнні» выбарчага працэсу. Аднак гэтая апошняя фраза стала падставай для фактычнага прызнання еўрапейскімі краінамі вынікаў выбараў і працягу дыялогу з беларускімі ўладамі.

Паводле заявы прадстаўніка Дзяржаўнага дэпартаменту ЗША, Злучаныя Штаты расчараваныя выбарамі ў Беларусі, але «маюць намер падтрымліваць дыялог з беларускімі ўладамі і народам». Пры гэтым жаданне працаваць з уладамі Беларусі тлумачыцца намерам адміністрацыі Дж. Буша накіраваць іх «на правільны шлях».

Віцэ-старшыня ПА АБСЕ і кіраўнік місіі назіральнікаў ПА АБСЕ на выбарах у Беларусі Ан-Мары Лізэн 29 верасня на прэс-канферэнцыі ў Мінску заявіла, што з боку ЕС павінен быць «рух наперад» у адносінах да Беларусі. А дзейны старшыня АБСЕ падчас свайго візіту ў Мінск нагул выказаў меркаванне, што «Беларусь рухаецца ў правільным кірунку».

**Дзейны старшыня АБСЕ падчас свайго візіту ў Мінск выказаў меркаванне, што «Беларусь рухаецца ў правільным кірунку».**

Еўрапейскі Саюз таксама захаваў генеральную лінію на нармалізацыю стасункаў з афіцыйным Мінскам. 30 верасня камісар ЕС па знешняй палітыцы Беніта Ферэра Вальднер заявіла: «Я ўзяла да ўвагі папярэднія высновы місіі БДІПЧ

АБСЕ па назіранні за выбарамі, што ўтрымліваюць як пазітыўныя паказнікі, так і некаторыя негатыўныя элементы». Заўважым, што выраз «нязначныя паляпшэнні» (minor improvements) з дакладу назіральнай місіі АБСЕ ў заяве камісара ЕС ужо ператварыўся ў «пазітыўныя паказнікі і *некаторыя негатыўныя* элементы», што можа сведчыць пра тое, што першапачатковая прывязка нармалізацыі стасункаў ЕС з беларускім урадам да вынікаў парламенцкіх выбараў была дастаткова ўмоўнай. 9 кастрычніка 2008 г., пасля абмеркавання палітычнай сітуацыі ў Беларусі, Еўрапейскі парламент прыняў рэзалюцыю па Беларусі, у якой прапануецца працягнуць дыялог з Мінскам, прыпыніць на паўгода дзеянне візавых санкцыяў у дачыненні да вышэйшых беларускіх чыноўнікаў і спрасціць працэдуру атрымання шэнгенскіх віз для грамадзян Беларусі. Прадстаўнікі асобных дзяржаў-сяброў ЕС таксама выступілі за працяг і пашырэнне дыялогу з беларускімі ўладамі пасля парламенцкіх выбараў.

Чаму ацэнка выбараў і наагул сітуацыі ў Беларусі з боку Захаду была менавіта такая?

*Па-першае,* паляпшэнне стасункаў з Беларуссю было ўжо вызначаным курсам, які мог змяніцца толькі ў выпадку экстраардынарных паводзінаў беларускіх уладаў. Паколькі ніякіх неспадзяванак з боку афіцыйнага Мінска не было, то і далейшая нармалізацыя працягвалася адпаведна са сваёй унутранай логікай.

**Ацэнка выбараў стала прадметам палітычнага шантажу.**

*Па-другое,* адсутнічаў і адсутнічае агульны парадак дня для дыялогу — было зразумела, што цалкам свабодных і справядлівых выбараў дамагчыся за адзін раз немагчыма, неабходна было вызначыць крытэры прагрэсу, якімі можна было абумовіць нармалізацыю.

*Па-трэцяе,* пры адсутнасці адзінства было немагчыма ажыццяўляць стратэгію абумоўленасці (conditionality), пры якой прагрэс вымяраецца зыходзячы з крытэраў, што вызначаныя пэўнымі каштоўнасцямі і якія не з'яўляюцца прадметам перамоваў. Пры гэтым прынцыповая пазіцыя не парушаецца, калі адказам на мінімальны прагрэс з'яўляецца адпаведна мінімальны ўзровень ангажавання. Замест гэтага была стаўка на палітычны гандаль, пры якім самі крытэры нармалізацыі ёсць прадметам перамоваў. Пытанне працэсу замянілі пытаннем нібыта гарантаванага прадстаўніцтва некалькіх прадстаўнікоў апазіцыі ў Палаце прадстаўнікоў. Такія варункі знівелявалі маральны аспект перамоў, бо зрабілі іх прадмет аб'ектам рынкавай здзелкі.

*Па-чацвёртае,* адсутнічае агульная культура дыялогу. Для Захаду дыялог — сродак дасягнення кампрамісу і вызначэння прасторы супольных каштоўнасцяў. Для беларускіх уладаў дыялог — гэта, па-першае, нагода для дэманстрацыі слабасці апанента, па-другое, спосаб уцягнуць яго ва ўласную піяр-кампанію. Заходнія назіральнікі настолькі былі ўсцешаныя сігналамі палітычнай адлігі (якія не мелі амаль ніякага дачынення да выбараў), што прынялі іх за прыкмету прагрэсу ў іншых галінах, уключаючы выбарчую. Каб заахвоціць гэты прагрэс, яны ўстрымліваліся ад крытыкі, што дало глебу афіцыйнай прапагандзе абвясціць,

што ход выбараў не выклікае нараканняў, і прыгатаваць контратаку пасля галасавання (маўляў, вызначэнне выбараў як неадпаведных стандартам АБСЕ ёсць прыкметай падвойных стандартаў).

Як вынік, ацэнка выбараў стала прадметам палітычнага шантажу, калі назіральнікам заявілі, што іх рэзкая крытыка можа выклікаць вяртанне да палітычных рэпрэсій.

У той жа час прыхільнікі дыялогу могуць сцвярджаць, што іх лінія прыносіць пэўныя вынікі і таму яе варта праводзіць, дарма што прагрэсу ў галоўным пытанні на парадку дня ў 2008 г. — пытанні выбараў — так і не дасягнулі. Як відавочны вынік дыялогу падаецца і вызваленне палітвязняў, і прыпыненне палітычных рэпрэсій (хоць гэтыя станоўчыя тэндэнцыі не змянілі нормаў і практык, якія рабілі магчымымі існаванне палітвязняў і рэпрэсіі), і пэўныя крокі ў бок эканамічнай лібералізацыі (хоць апошнія не выкліканыя ўласна дыялогам, заходнія актары могуць сцвярджаць, што лагоднейшы падыход да беларускіх уладаў заахвочвае іх).

Лукашэнка не марнаваў часу, каб зрабіць уражанне, што гэткая пазітыўная дынаміка можа быць замацавана акурат праз дыялог і палітычныя саступкі. На працягу тыдня пасля выбараў былі агучаныя такія рашэнні, як падатковая рэформа, амбітная прыватызацыйная праграма пры пашырэнні ўдзелу замежнага капіталу ў прыватызацыі і дазвол на куплю зямлі замежнікамі. Нават больш сенсацыйным і, магчыма, у доўгатэрміновай перспектыве важным было рашэнне пра адстаўку кіраўніка брыгады СОБР Дзмітрыя Паўлічэнкі. Яго зняццё, разам з адстаўкай Шэймана, можа быць прыметай кампраміснага развязання праблемы самага праблематычнага з 12 патрабаванняў ЕС, што ўмагчыміць ужо зусім іншыя сцэнары эвалюцыйнай трансфармацыі беларускай сістэмы. Пакуль што беларускія ўлады не марнуюць часу, каб пераканаць Захад, што «перамены праз ангажаванне» ў Беларусі магчымыя — хай і не ў палітычнай сферы.

## ВЫСНОВЫ

Ацэньваючы працэс пацяплення ў стасунках Беларусі і Захаду, варта падкрэсліць яго некалькі асаблівасцяў, якія могуць паўплываць на вынікі перамоваў і ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Беларусі.

*Па-першае,* Еўрапейскі Саюз у сваім жаданні нармалізаваць стасункі з Мінскам пайшоў на аднабаковыя саступкі без выстаўлення канкрэтных умоваў дзеля лібералізацыі палітычнай сістэмы і змянення заканадаўства, якія б папярэднічалі дыялогу. Рэжым разглядае такія паводзіны ЕС як слабасць і, верагодна, будзе патрабаваць далейшых саступак і шантажаваць разрывам дыялогу і больш шчыльнай інтэграцыяй з РФ. Пагрозы з боку Еўрасаюза афіцыйны Мінск не будзе ўспрымаць усур'ёз, бо ЕС ужо прадэманстраваў нyздатнасць адстойваць свае пазіцыі і дамагацца выканання патрабаванняў.

*Па-другое,* да сённяшняга дня не існуе «дарожнай карты» дыялогу паміж Беларуссю і Захадам; заходнія дэмакратыі не выставілі крытэраў і ўмоваў, якія б

гарантавалі выкананне абяцанняў і дазвалялі б ацэньваць паспяховасць ці непаспяховасць дыялогу. Фактычна цяпер ідзе аднабаковае некантраляванае прызнанне беларускага рэжыму з боку ЕС і ЗША, якое не гарантуе таго, што і надалей Мінск будзе дэманстраваць добрую волю. Патураючы беларускаму рэжыму, Захад ідзе на велізарную рызыку, бо сёння немагчыма ўпэўнена сцвярджаць, што новы беларускі парламент не прызнае Паўднёвую Асецію і Абхазію, і што не з'явяцца новыя палітычныя вязні ці не вернуцца за краты старыя.

*Па-трэцяе,* перамовы паміж Захадам і Беларуссю застаюцца непразрыстымі для шырокай грамадскасці. Выглядае, што цяпер ідзе шматузроўневы гандаль паміж такімі актарамі, як беларускі рэжым, ЕС, ЗША і Расія, за тое, каму ўрэшце дастанецца Беларусь і яе эканоміка. Беларуская апазіцыя сталася закладніцай палітыкі нармалізацыі і была выкарыстаная Захадам у гандлі з рэжымам. У будучым гэта можа прывесці да яшчэ большай маргіналізацыі дэмакратычнага руху і росту недаверу паміж апазіцыйнымі партыямі і заходнімі партнёрамі. Фактычна, гэта азначае, што Захад страціць апошнія рычагі ўплыву на ўнутрыбеларускую сітуацыю. Гэта будзе асабліва крытычна ў тым выпадку, калі Захад прайграе «тэндэр» на Беларусь і афіцыйны Мінск аднабакова спыніць дыялог.

Якім чынам ЗША і ЕС могуць стабілізаваць сітуацыю і збалансаваць дыялог? На нашу думку, галоўным фактарам кантраляванасці дыялогу з'яўляецца паступовае вяртанне да пакрокавай стратэгіі і выстаўленне жорсткай абумоўленасці (conditionality) наступных дзеянняў у межах дыялогу з беларускім урадам. Трэба пераадолець сённяшнюю сітуацыю, калі Захад ідзе на аднабаковае прызнанне беларускага рэжыму і здымае санкцыі ўсяго толькі ў абмен на палітычныя заявы і жэсты, не падмацаваныя інстытуцыйнымі і заканадаўчымі захадамі.

Першым этапам у выроўніванні дыялогу павінна стаць распрацоўка «дарожнай мапы», парадку дня перамоўнага працэсу з вызначэннем крытэраў паспяховасці, дзеянняў абодвух бакоў і адказнасці за невыкананне абавязанняў. Абавязковай умовай эфектыўнасці «дарожнай мапы» варта прызнаць кансалідаваную пазіцыю ЗША і Еўрапейскага Саюза ў пытаннях дыялогу з беларускім рэжымам.

Важным фактарам перамоўнага працэсу, які пакліканы забяспечыць давер разнастайных актараў унутры Беларусі да еўрапейскіх і амерыканскіх партнёраў, з'яўляецца празрыстасць дыялогу, яго ўмоваў і дзеянняў, якія прадпрымаюцца ў межах нармалізацыі стасункаў Беларусі з ЕС і ЗША. На далейшых этапах дыялогу неабходна далучыць да выпрацоўкі парадку дня перамоўнага працэсу ўрады суседніх з Беларуссю краін, беларускія палітычныя партыі і аналітычныя цэнтры, а таксама найбуйнейшыя незалежныя сродкі масавай інфармацыі.

## ВЫБАРЫ 2008

ЭНДРУ ЎІЛСАН

# Беларускія выбары пасля вайны ў Грузіі: новая парадыгма або старая эквілібрыстыка?

Доўгі час Лукашэнка адначасова ўжываў дзве тэхнікі палітычнага эквілібрызму. Ва ўнутранай палітыцы ён вар'іраваў градус аўтарытарызму, каб запабегчы любому выкліку свайму кіраванню, падтрымліваючы пры гэтым папулісцкі імідж клапатлівага «бацькі». У знешняй палітыцы Лукашэнка на манер Ёсіпа Броз Ціта заігрываў з Расіяй супраць Захаду — ці, больш дакладна, перыядычна і ненастойліва заляцаўся да Захаду, каб забяспечыць сабе максімальныя дывідэнды ў сваёй асноўнай гульні з Расіяй. Нядаўна ён асвоіў яшчэ адную эквілібрычную тэхніку: убраную ў шаты сацыяльнага папулізму (the welfare populism) стаўку на спажывецтва, якая складае яго ключавы «сацыяльны кантракт» з народам, спрабуючы адначасова часткова задаволіць узрастаючы ціск наменклатурнай прыватызацыі. Дарма што яго вобраз былога дырэктара саўгаса, што спецыялізаваўся на птушкагадоўлі, і праставатага мужыка дагэтуль не выпятраў з некаторых галоў, Лукашэнка досыць паспяхова скіроўваў свае абмежаваныя рэсурсы на рэалізацыю гэтых трох стратэгій. Таму асноўнае пытанне вераснёўскіх выбараў 2008 г. павінна гучаць так: ці гэта новае выданне згаданых відаў эквілібрыстыкі, ці яны азначаюць фундаментальны зрух у прыродзе рэжыму?

***Эндру Ўілсан*** *— палітоляг, эксперт Эўрапейскай рады міжнародных адносінаў (сядзіба ў Брусэлі), старшы выкладчык катадры ўкраіністыкі Лёнданскага ўнівэрсытэцкага коледжу, аўтар шматлікіх дасьледаваньняў постсавецкіх краінаў. Сёлета ў «ARCHE» друкаваўся яго аналіз «Крамлёўская «апэрацыя “Пераемнік 2.0”» (4/2008).*

ЭНДРУ ЎІЛСАН

# ЛУКАШЭНКА-ХАМЕЛЕОН

Лукашэнка лёгка перажыў эру Ельцына. Адносіны з Пуціным былі спярша больш складанымі, аднак памаранчавая рэвалюцыя надала Лукашэнку другое дыханне, паколькі Беларусь у 2005—2006 гг. стала лабараторыяй расійскіх «контррэвалюцыйных тэхналогій». Аднак у час трэцяга тэрміну Лукашэнкі, з 2006 г., акрэсліліся тры магутныя выклікі.

**Стаўка на спажывецтва складае ключавы «сацыяльны кантракт» Лукашэнкі з народам.**

Па-першае, Расія перагледзела цану сваёй падтрымкі[1]: не тое, каб расійскі ўрад спыніў фінансавыя і іншыя субсідыі беларускаму рэжыму, але абставіў іх больш жорсткімі ўмовамі. Расія з надзвычайнай хуткасцю ўзняла цэны на газ і выбіла 50 % акцый «Белтрансгазу» пасля выбараў у сакавіку 2006 г., што, як і разлічваў расійскі бок, стала сапраўдным шокам для Мінску. Сувязі Лукашэнкі з такімі людзьмі, як Сяргей Іваноў і Ігар Сечын (праз ранейшыя нафтавыя гешэфты), выявіліся двувострай зброяй, калі надышоў час тандэму Пуцін-Мядзведзеў.

Па-другое, ЕС у рэшце рэшт пачаў пераасэнсоўваць сваю палітыку ў дачыненні да Беларусі. З 1997 і недзе да 2004 г. Брусель не зазнаваў сапраўднага ўціску з боку краін-дзяржаў ЕС на карысць змены свайго ізаляцыяніснцкага падыходу. Пасля пашырэння Эўрапейскага Саюзу Польшча стала рухавіком вызначэння стратэгіі ЕС да Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г., аднак цяпер польскае кіраўніцтва разумее, што праводжаная ім нейкі час палітыка прасоўвання Мілінкевіча была контрпрадуктыўнай. Сапраўды, Лукашэнка атрымаў цудоўны падарунак для сваёй прапаганды — «змову апазіцыі з Польшчай». Літва спакусілася падтрымаць «каляровую рэвалюцыю» ў Мінску ў 2006, што таксама пайшло на руку Лукашэнку, але і Вільня з таго часу стала больш прагматычнай. Больш за тое, у 2007—2008 гг. Польшча і Літва ў кампаніі з іншымі новымі членамі ЕС (і некаторымі старымі дзяржавамі-членамі ЕС, такімі як Швецыя) пачалі настойваць на стратэгічным пераглядзе палітыкі ў дачыненні да Беларусі. Падтрымалі ЕС і ЗША, дзе таксама не ўпэўнены, што ўсе стаўкі трэба рабіць на слабую і падзеленую апазіцыю. (Між іншага, пасля няўдалай справы з накладаннем санкцый на «Белнафтахім» ЗША, здаецца, з вядучага «ястраба» ператвараюцца ў аднаго з вядучых «галубоў»). Праект Квасьнеўскага, датычны Беларусі, адыграў у гэтым працэсе важную ролю. Трэба прызнаць, што ЕС не прытрымліваецца агульнай лініі, якая яшчэ і не выпрацавана. Германія карыс-

**Палітыка польскага кіраўніцтва прасоўвання Мілінкевіча аказалася контрпрадуктыўнай.**

[1] Павелічэнне цаны газу да 100 USD за 1000 кубаметраў у студзені 2007 г. каштавала Беларусі прыкладна 1,6 мільярда долараў. «Стабілізацыйны крэдыт», вылучаны Расіяй у снежні 2007 г., сягаў 1,5 мільярда долараў.

таецца адной стратэгіяй, польскі міністр замежных спраў Сікорскі — другой (прычым яна крытыкуецца прэзідэнтам Польшчы Качынскім), яго фінскі калега Стуб, старшыня АБСЕ, мае іншы варыянт дзеянняў.

Па-трэцяе, у беларускай эліце рэй цяпер вядуць не «сілавікі», якія аказаліся неабходнымі для захавання ўлады Лукашэнкі ў 2006 г., а «тэхнакраты», якія хацелі б узбагаціцца шляхам наменклатурнай прыватызацыі. Аднак пакуль яшчэ не ясна, чым тлумачацца змены «наверсе» — палітычнымі крокамі, то бок чысткай прарасійскіх колаў і/або ўзвышэннем Віктара Лукашэнкі, альбо эканамічным развіццём. Цяпер у Беларусі ясна вымалёўваюцца доўгатэрміновыя праблемы ў рэсурсазабеспячэнні, але пакуль эканоміка кантралюецца дастаткова добра — у 2007 г. прырост ВУП склаў 8 %, дзяржава напаўняе свой бюджэт. З іншага боку, беларуская бухгалтэрыя не празрыстая і статыстычныя звесткі могуць быць недакладнымі.

**ЗША з вядучага «ястраба» ператвараюцца ў аднаго з вядучых «галубоў».**

## У БЕЛАРУСІ ТАКСАМА ІДУЦЬ «ВОЙНЫ СІЛАВІКОЎ»

Унутранае напружанне, створанае гэтымі трыма відамі захавання раўнавагі, выйшла на паверхню ўжо ўлетку 2007 г. — час, калі ў Беларусі адбылася нешта падобнае да расійскіх «воен сілавікоў». Як і ў Расіі ў час выбараў 2007—2008 гг., гэтыя канфлікты адлюстроўвалі барацьбу кланаў за ўладу і грошы. Публічнае збіццё Зянона Ломаця, старшыні Камітэта дзяржкантроля, у ліпені 2007 г. супала з чысткамі ў кіраўніцтве «Белнафтахіму» (травень 2007 г.), «Белтрансгазу» і «Беларускай нафтавай кампаніі» (ліпень 2007 г.). Адхіленне старшыні КДБ Сцяпана Сухарэнкі пасля нападу на Ломаця было першым знакам аслаблення ўплыву дзіўнай кааліцыі, што склалася вакол Віктара Шэймана. За Шэйманам стаялі некаторыя расійскія алігархі і беларускія нафтавыя кампаніі, і яго групоўка трымалася «жорсткага курсу» ва ўнутраных справах. Аслабленне Шэймана пацвердзілася, калі ён быў адпраўлены ў адстаўку пасля яшчэ больш загадкавага выбуху ў Мінску (ліпень 2008 г.) разам са сваім хаўруснікам Генадзем Нявыгласам, кіраўніком адміністрацыі прэзідэнта. Адстаўка Шэймана, які доўгі час лічыўся другім чалавекам у дзяржаве пасля Аляксандра Лукашэнкі, была драматычным і патэнцыйна рызыкоўным крокам, бо той ведае месца, дзе ляжаць трупы — як у даслоўным сэнсе, беручы пад увагу ролю, якая прыпісваецца яму ў знікненнях у 1999—2000 гг., так і метафарычным, бо ён доўгі час быў у цэнтры збору мясцовага кампрамату (не кажучы пра «лёзненскі інцыдэнт», інсцэніроўку замаху на жыццё Лукашэнкі ў 1994 г., разыграную, верагодна, з удзелам Шэймана).

**У беларускай эліце рэй цяпер вядуць не «сілавікі», неабходныя для захавання ўлады Лукашэнкі ў 2006 г., а «тэхнакраты», якія хацелі б узбагаціцца шляхам наменклатурнай прыватызацыі.**

Заняпад аднаго клана супаў з узвышэннем другога, які сфармаваўся вакол Віктара Лукашэнкі, прэзідэнтавага сына, які ў апошні час узмоцніў пазіцыі ў сферы кантроля над будаўніцтвам і нерухомай маёмасцю. Ператасоўкі ў кіраўнічай эліце засведчылі таксама, што прыналежнасць да клана значыць больш, чым кампетэнтнасць. Гэта вынікае з кандыдатур, прасунутых Віктарам Лукашэнкам і «тэхнакратамі»: і Юрый Жадобін, які ў 2007 г. замяніў Сухарэнку на чале КДБ, а ў ліпені 2008 г. узначаліў Савет Бяспекі, і новы старшыня КДБ Вадзім Зайцаў, нарадзіліся ва Ўкраіне і не маюць непасрэднага вопыту ў галіне дзяржаўнай бяспекі. Жадобін раней узначальваў службу бяспекі прэзідэнта, а Зайцаў быў пратэжэ Ігара Рачкоўскага — іншага хаўрусніка Віктара Лукашэнкі — у Дзяржаўным пагранічным камітэце. Нявыгласа на пасадзе кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі заступіў Уладзімір Макей, чалавек, здаўна блізкі да абодвух Лукашэнак — хаця тут не так ясна, хто на чыіх плячах стаіць. Макей, магчыма, з’яўляецца новым «шэрым кардыналам» рэжыму. Ён лічыцца выдатным маніпулятарам, але далёка не лібералам.

**Ператасоўкі ў кіраўнічай эліце засведчылі таксама, што прыналежнасць да клана значыць больш, чым кампетэнтнасць.**

Чысты вынік усёй гэтай зацягнутай гульні з перастаноўкамі крэслаў здаецца ясным: «старая гвардыя» лукашэнкаўцаў параможана і практычна не існуе. Калі дапусціць, што прэм’ер-міністр Сідорскі знаходзіцца ў лагеры «тэхнакратаў», то са «старой гвардыі» толькі Навумаў і Мальцаў яшчэ кіруюць міністэрствамі ўнутраных спраў і абароны. Аднак новыя «тэхнакраты» — такая ж своекарыслівая група, як і стары шэйманаўскі клан. Яны не хочуць, каб Беларусь вучылася на памылках Расіі і Ўкраіны 1990-х гг., а зусім наадварот, жадаюць узбагаціцца на той самы манер. Яны чакаюць падтрымкі з Захаду, але не хочуць пусціць у краіну замнога заходняга капіталу. «Тэхнакраты» хочуць захаваць ключавыя эканамічныя актывы ў краіне для сябе, а Захад успрымаюць як карысную процівагу расійскаму засіллю, якое цягне за сабой надта шмат павіннасцяў. Расійскія алігархі, такія як Раман Абрамовіч, ужо кружляюць над найбольш ласымі кавалкамі беларускай маёмасці.

**Макей з’яўляецца новым «шэрым кардыналам» рэжыму. Ён лічыцца выдатным маніпулятарам, але зусім не лібералам.**

Некаторыя «тэхнакраты», магчыма, падманваюць сябе, жадаючы скарыстаць Лукашэнку-малодшага ў якасці тарана для заваёвы ўлады, падобна як «маладыя ваўкі» спрабавалі скарыстаць Лукашэнку-старэйшага ў 1994 г.[2] Аднак прэзідэнта Лукашэнку цяжка пераўзысці ў мастацтве манёўравання, і наўрад ці ён дазволіць свайму сыну манапалізаваць уладу. Напрыклад, часта падкрэсліваецца, што

[2] Гл.: Александр Федута. Лукашенко: политическая биография. Москва: Референдум, 2005. С. 72 і 64—66.

па іроніі Лукашэнка пачаў уводзіць «ідэалогію беларускай дзяржавы» ў 2003 г., г. зн. акурат у той самы час, калі многія з яго ключавых дакрын пацярпелі крах. Але яму цяжка будзе поўнасцю адмовіцца ад сваёй зацяжной рыторыкі супраць алігархаў і прыхватызацыі (corrupt privatisation). Скарачэнне некаторых ільгот для насельніцтва ў траўні 2007 г. (субсідыі пенсіянерам на лекі, бясплатны праезд студэнтаў[3]) стала значнай вяхой, але важна і тое, што неўзабаве рашэнне было часткова перагледжанае. Цікавай прыкметай вагання Лукашэнкі стала тое, што ён не згадзіўся ачоліць партыю ўлады («Белая Русь»), якая больш шчыльна прывязала б яго да новай эліты.

**«Старая гвардыя» лукашэнкаўцаў пераможана і практычна не існуе.**

## БЕЛАРУСЬ І ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ

Як ЕС трэба рэагаваць на перспектыву новай Беларусі? Перш за ўсё, без лішняга імпэту. Рэальная магчымасць непасрэднага кантакту з рэжымам злёгку павялічылася. Але з гледзішча двухкірунковай (twin-track policy) палітыкі ЕС, прынятай у канцы 2004 г. і развітай у неафіцыйным дакуменце Еўрапейскай камісіі — «ценевым плане дзеянняў», адрасаваным беларускаму народу ў снежні 2006 г.[4] — Беларусь далёка не прасунулася. Мабыць, вызваленне палітычных вязняў перад выбарамі ў верасні 2008 г. было больш важнай падзеяй, чым касметычныя папраўкі, унесеныя ў сам выбарчы працэс. Дазвол назіральнікам АБСЕ прысутнічаць на выбарах быў значным крокам, але крокам у рамках існуючай сістэмы, з-за якой гэтыя назіральнікі не маглі ўбачыць вельмі многае. Наяўнасць 50—60 апазіцыйных кандыдатаў прывяла да непрыстойных спекуляцый, нават здзелак вакол таго, колькі менавіта дэпутатаў ад апазіцыі будзе дастаткова для «прызнання» выбараў. Вынікам сталася відавочнае расчараванне, калі ў парламент не прайшоў ніводзін апазіцыйны кандыдат. Па традыцыі, на стадыі рэгістрацыі былі адсеяны многія моцныя апаненты ўлады, апазіцыя была ў цэлым выключана з выбарчых камісій (а на вышэйшым узроўні, дзе фактычна падлічваюцца галасы, не было сапраўдных назіральнікаў). У чэрвені 2008 г. былі прынятыя закон аб СМІ і папраўкі да Крымінальнага кодэкса, якія маюць карны характар (у дадатак да абмежаванняў, уведзеных «сухарэнкаўскім законам» напярэдадні выбараў 2006 г.). Да таго ж, супраць

**Вызваленне палітычных вязняў перад выбарамі ў верасні 2008 г. было больш важнай падзеяй, чым касметычныя папраўкі, унесеныя ў сам выбарчы працэс.**

[3] Насамрэч праезд навучэнцаў у грамадскім транспарце і да траўня 2007 г. не быў бясплатным: іх абавязалі плаціць 100 % цаны білетаў замест 50 %. — *заўв. перакл.*

[4] Гл.: «Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі» на http://www.delblr.ec.europa.eu/page3242.html. Тут накрэслены неафіцыйны спіс крокаў, якія беларускі рэжым мог бы здзейсніць, каб палепшыць адносіны.

сацыял-дэмакратычнай партыі Казуліна, Аб'яднаных дэмакратычных сіл і іншых груповак, падобна, былі ўжытыя «актыўныя захады», скіраваныя на раскол[5]; у чэрвені дзяржаўнае тэлебачанне яшчэ больш нагняло атмасферу, паказаўшы прапагандысцкі серыял «Сетка» з традыцыйным ужо зместам — апазіцыя малюецца купкай фінансаваных з-за мяжы прадажнікаў. Як выяўляецца са справаздачы АБСЕ-БДІПЧ[6], ніякай «празрыстасці» ў працэсе падліку галасоў не было.

**Паколькі ў бліжэйшы час станоўчых зрухаў не прадбачыцца, аптымістычныя назіральнікі зазіраюць далей у будучыню.**

Паколькі ў бліжэйшы час станоўчых зрухаў не прадбачыцца, аптымістычна настроеныя назіральнікі зазіраюць далей у будучыню. Сапраўды, з цягам часу «тэхнакраты» могуць прывесці рэжым да пераменаў. Як толькі яны зробяцца алігархамі, то акажуцца больш зацікаўленымі ў нормах прававой дзяржавы. Але, каб стаць алігархамі, ім не абысціся без злоўжыванняў сістэмай на нейкі час. Ясна, што ЕС мусіць заахвочваць вяршэнства права, а не бяспраўе.

Між тым, Лукашэнка прэзентуе сябе не як абаронцу дэмакратыі, а як абаронцу беларускага суверэнітэту, разлічваючы, што пасля грузінскіх падзей гэткая самапрэзентацыя адпавядае заходняй «realpolitik». «Тэхнакраты», вядома, таксама ў будучыні захочуць абараніць свае будучыя актывы з дапамогай моцнай дзяржавы. Але Захаду не варта спяшацца з пераглядам палітыкі ў дачыненні да Беларусі, пакуль ён не вырашыў, якім будзе ягоны падыход да рэгіёна ў цэлым. ЕС (і НАТО, хаця і ў меншай ступені) мусяць усведаміць, што па суседстве ізноў разгортваецца канкурэнтная барацьба, і трэба зрабіць выбар паміж двума відамі канкурэнцыі. Можна прыняць як рэальнасць палітыку сфер уплыву і спрачацца аб тым, дзе правесці мяжу паміж гэтымі сферамі (ці можна ўплываць на Беларусь? ці страчана Грузія? ці можна далучыць Украіну?). А можна замест гэтага выбраць барацьбу за правілы гульні і працяг падтрымкі еўрапейскіх каштоўнасцей, прэзентуючы іх як альтэрнатыву зусім іншай палітычнай і бізнэс культуры, якую нясе з сабой расійскі варыянт «палітыкі добрасуседства».

Некаторыя палітыкі Еўрасаюза ўжо паспяшаліся абвясціць, што першаснай мэтай пасля грузінскай вайны трэба лічыць «стрымліванне расійскага ўплыву» ў Беларусі. Паводле Аляксандра Мілінкевіча, захаванне незалежнасці краіны ад паглынання Расіяй значыць больш, чым усе іншыя мэты, і таму палітыцы дыялога з цяперашнім рэжымам няма альтэрнатывы.

Аднак Захад будзе абвінавачаны ў двайных стандартах, калі згодзіцца запрасіць Лукашэнку да перамоў, тым часам як у самой Беларусі адбылося так мала перамен. З другога боку, пасля вайны ў Грузіі змянілася ўся навакольная абстаноўка. Адбылася змена парадыгмы, да якой давядзецца адаптавацца ЕС, НАТО

[5] Магчыма, Лукашэнка вядзе гульню з далёкім прыцэлам — яшчэ больш раскласці апазіцыю перад прэзідэнцкімі выбарамі 2011 г.

[6] www.osce.org/odihr-elections/item_12_32542.html.

і ЗША. Але Лукашэнку трэба яшчэ вырасці ў сапраўднага маршала Ціта, пакуль жа ў беларускай замежнай палітыцы няма «роўнааддаленасці» ад усіх партнёраў (Югаславія ўваходзіла ў «рух недалучэння», хаця і належала да камуністычнага блоку). Перамовы з Захадам — толькі частка шырэйшай стратэгіі дыверсіфікацыі замежнай і энергетычнай палітыкі, у рамках якой беларускія місіі працуюць ва ўсіх краінах, багатых на энергарэсурсы (Нарвегія, але таксама Венесуэла, Іран, Азербайджан, Нігерыя, Кітай). Захаду не варта грунтаваць сваю палітыку на памылковым дапушчэнні, што Лукашэнка ўжо з'яўляецца вопытным і ўмелым геапалітычным гульцом (balancer), але ёсць сэнс у тым, каб праводзіць сваю палітыку так, каб заахвоціць яго стаць ім.

**Захаду не варта думаць, што Лукашэнка ўжо стаў вопытным і ўмелым геапалітычным гульцом, але праводзіць сваю палітыку так, каб заахвоціць яго стаць ім.**

## ПАЛІТЫЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ

Што здарыцца пасля трохбаковай сустрэчы прадстаўнікоў ЕС з міністрам замежных спраў Беларусі С. Мартынавым 13 кастрычніка? Зніжэнне кошту віз для беларускіх грамадзян з 60 еўра да 35 еўра было б крокам у правільным напрамку. Тым не менш, забарона на паездкі ў ЕС для беларускіх кіраўнікоў, уведзеная пасля «знікненняў» 1999—2000 гг. і змадэляваных выбараў 2004 і 2006 гг., павінна застацца ў сіле. ЗША першымі прыпынілі санкцыі супраць «Белнафтахіма», але ЕС наўрад ці варта вяртаць Беларусь у Генеральную сістэму прэферэнцый, пакуль беларускія прафсаюзы не запрацуюць у больш ліберальных умовах.

Беларусь не стане дэмакратычнай краінай за адзін дзень, таму ЕС не варта марнаваць сілы на надта амбітныя праекты і падпарадкоўваць ім усю сваю палітыку. Замест гэтага ЕС трэба больш настойліва дабівацца саступак у тых сферах, дзе дбаннем еўрапейцаў ужо дасягнуты пэўны прагрэс. Напрыклад, калі ўлады ў Мінску фактычна не зрабілі саступак у выбарчым працэсе, але выпусцілі палітычных вязняў, ЕС мусіць дабівацца большага ў апошняй сферы, у прыватнасці, настойваць на мараторыі на смяротную кару, спасылаючыся і на рашэнне Канстытуцыйнага Суда ў 2004 г. Трэба адзначыць, што Лукашэнка зняў з пасады галоўнае пудзіла рэжыму Дзмітрыя Паўлічэнку, якому забаронены ўезд у ЕС дзеля ягонай меркаванай ролі ў «знікненнях» 1999—2000 гг. і гвалтоўным падаўленні пратэстаў пасля выбараў 2006 г.

Выдатным праектам з'яўляецца падтрымка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільні. ЕС мусіць таксама вярнуцца да падтрымкі адукацыйных праграм і грамадзянскай супольнасці ў межах Беларусі.

RTVi і «Еўрапейскае радыё для Беларусі» маюць абмежаваную глядацкую/слухацкую аўдыторыю ў краіне. ЕС трэба шукаць шляхоў падтрымкі свабодных медыяў у самой Беларусі. Афіцыйны Мінск пачаў часткова цэнзураваць Інтэрнэт толькі нядаўна. Вядома, улады шмат энергіі ўклалі ў сваю «моладзевую паліты-

ку» і не жадаюць выпускаць з поля зроку маладзейшае пакаленне, якое свабодна карыстаецца Інтэрнэтам. ЕС мусіць настойваць на значна больш ліберальнай сістэме рэгулявання віртуальнай прасторы.

Сапраўднай лакмусавай паперкай будуць няўрадавыя арганізацыі (НДА). Напэўна, справядліва будзе сцвярджаць, што ў апошнія гады Лукашэнка не дарэмна надаваў такую ўвагу закрыццю незалежных НДА і ўтварэнню замест іх структур, падкантрольных рэжыму; наўрад ці ён дазволіць, каб незалежныя НДА адрадзіліся. Але ЕС варта быць гатовым і да гэтага.

Як Беларусь, так і ЕС зацікаўлены ў дыверсіфікацыі пастаўшчыкоў энергіі. Ні адзін, ні другі бок не хацелі б, каб «Газпром» здабыў поўны кантроль над «Белтрансгазам». ЕС мог бы дапамагчы Беларусі вывучыць магчымасць падлучэння да нафтаправоду «Адэса-Броды» і атрымання энергіі з Літвы.

**Калі Беларусь прызнае Абхазію і Паўднёвую Асецію, акенца для паляпшэння адносін зачыніцца амаль гэтак хутка, як адчынілася.**

## ВЫСНОВЫ

Палітыка ЕС у дачыненні да Беларусі зайшла ў тупік, але выйсце з яго магчымае. Ізаляцыя, арганізаваная пасля 1997 г., відавочна не спрацавала, прынамсі ЕС не атрымаў вагароў уціску на Мінск. Але новая палітыка яшчэ не распрацаваная і нават не прасочваецца на гарызонце. Еўрапейскі Саюз павінен зрабіць стаўку на сваю ўласную эквілібрыстыку. З аднаго боку, ёсць сэнс дзейнічаць як мага хутчэй. Калі Беларусь прызнае Абхазію і Паўднёвую Асецію, акенца для паляпшэння адносін зачыніцца амаль гэтак хутка, як адчынілася. З іншага боку, ЕС варта ўпісаць сваю палітыку ў дачыненні да Беларусі ў кантэкст агульнай стратэгіі добрасуседства, дзе прыярытэт павінен быць аддадзены процідзеянню расійскай «realpolitik».

*Пераклаў з англійскай В.Р. паводле аўтарскага рукапісу*

## ¤ АПЫТАНЬНЕ

# Чаму я стаў грамадзкім актывістам, а мае аднаклясьнікі — не?

Удзельнікі: Віталь Броўка, Аляксандр Чыгір, Дарка Слабчанка, Алесь Зарэмбюк, Вольга Карач, Юрась Меляшкевіч, Міхась Пашкевіч.

### ВІТАЛЬ БРОЎКА

*Если, путь прорубая отцовским мечом,*
*Ты соленые слезы на ус намотал,*
*Если в жарком бою испытал, что почем, —*
*Значит, нужные книги ты в детстве читал!*

У. Высоцкі

Насуперак пытаньню, пастаўленаму ў загалоўку, мае аднаклясьнікі сталі ўсё ж такі грамадзкімі актывістамі: асноўны касьцяк нашае ліцэйскае клясы ўваходзіў у вучнёўскае самакіраваньне школы, мы трымалі доўгі час першынство ў інтэлектуальных гульнях у рэгіёне, і, увогуле, мы пачуваліся вельмі свабодна, але культурніцкая прастора мястэчка была для нас замалая. Таму лягічна, што па заканчэньні ў 1998 годзе школы і ад’езьдзе з роднага Сянна бальшыня маіх сяброў далучылася да студэнцкіх арганізацый і мастацкіх суполак у розных гарадох Беларусі.

Іншая рэч, што ў 2003 годзе, калі мы канчалі сваю адукацыю, хіба што два-тры чалавекі яшчэ адчувалі сябе ў прасторы грамадзкага актывізму.

Чаму? Тут трэба разабрацца ў прычынах, што штурхаюць маладых людзей на грамадзкую актыўнасьць і, што важней, у прычынах, якія здольныя ўтрымаць працяглы час у НДА ці партыях.

Якая рыса характару чалавека цяпер найважнейшая, самая неабходная, каб быць грамадзка актыўным, вытрымліваць уціск афіцыйных інстытуцый, нера-

***Віталь Броўка** — відны віцебскі грамадзкі актывіст.*

зуменьне сваякоў? Што ёсьць гэтай рысай: сьмеласьць, альтруізм ці матываванасьць?

Усе рысы важныя, на маю думку. Але менавіта матываванасьць, магчымасьць рэалізаваць сябе й дасягнуць пэўнай сацыяльнай значнасьці на нейкім узроўні, я лічу, ёсьць найважнейшым складнікам сталай грамадзкай актыўнасьці. Ня проста выхаду на вуліцу зь нейкай нагоды — для гэтага перадусім патрэбная сьмеласьць, а менавіта пастаянства актывізму на працягу нейкага часу.

Для разумнага й амбітнага маладога чалавека важна мець посьпех у жыцьці. Я не кажу пра грошы і ўладу, якія прынята лічыць эквівалентам посьпеху. Я кажу перадусім пра павагу аднагодкаў, старых сяброў, сваякоў, уплыў, аўтарытэт у сваім асяродзьдзіі, банальную магчымасьць пахваліцца гісторыяй свайго посьпеху падчас той жа сустрэчы аднаклясьнікаў.

Актуальная сытуацыя ў Віцебску: беларускамоўных более, асабліва сярод 16—19-гадовых, гэта модна. А грамадзкіх дэмакратычных актывістаў — менее, бо гэта непрэстыжна. Грамадзкаму актывісту цяжка пахваліцца нейкімі посьпехамі ў пабудове дэмакратыі, часам нават блізкім сябрам немагчыма патлумачыць, што такое важнае зрабіла твая арганізацыя ці партыя. Прыналежнасьць да палітычных актывістаў не ўздымае маладзёна ў вачах дзяўчат ці аднагодкаў…

Безумоўна, складанасьць дасягнуць посьпеху, неадпаведнасьць прыкладзеных высілкаў і выніку працы ня ёсьць адзінай перашкодай для росту колькасьці й якасьці грамадзкіх актывістаў. Бяда беларускага грамадзтва — гэта паўсюдны канфармізм: ім прасякнутыя стасункі паміж служачымі бюджэтнай сфэры, студэнцкае жыцьцё.

Бацькі назвалі мяне ў гонар Віталя Банівура — рэвалюцыянэра, аднаго зь лідэраў антыяпонскага падпольля на Далёкім Усходзе Расеі. Вобраз Віталя быў папулярны ў СССР на пачатку 1980-х. Думаю, што шмат якія людзі называлі сваіх дзяцей у гонар вобразаў высакародных змагароў, герояў, нонканфармістаў... Пры гэтым самі бацькі, калі дзеці выраcталі, дзейнічалі па-канфармісцку, цалкам у духу савецкага мэйнстрыму. Я схільны бачыць у такіх паводзінах савецкіх грамадзянаў прыкметы двудушніцтва, бо называючы дзяцей у гонар герояў-альтруістаў і заяўляючы пра высокія ідэалы, прапагандуючы актывісцкі лад жыцьця, насамрэч навучалі дзяцей «быць як усе», не вытыркацца, знаходзіць цяплейшае месца і г. д.

Сучасныя дваццацігадовыя ўсё сьвядомае жыцьцё жывуць пры дыктатуры, яны ня бачылі пасьпяховых прыкладаў нонканфармізму, альтэрнатыўных шляхоў жыцьця. Яны зь дзяцінства назіралі, як людзі вакол імкнуцца палепшыць умовы свайго фізычнага існаваньня і дастаткова спакойна ці нават прыхільна ставяцца да стану ў краіне. Праекцыя на асабістае жыцьцё кожнага жыхара, агульнанацыянальнае змаганьне «за продовольственную безопасность» і «стабильность» зьяўляюцца вызначальнымі каштоўнаснымі складнікамі. Агульная абыякавасьць беднага духам грамадзтва давяршае найбольш распаўсюджаную мадэль паводзінаў, дзе шлях найменшага супраціву вабіць нават самых разумных і прасунутых маладых людзей.

Мімікрыя рэжыму пад дэмакратыю, выстаўленьне дэмакратычнай шыльды, вонкавае і ўнутранае ўзмацненьне атрыбутаў капіталізму ў краіне тым больш не пакідаюць нагодаў для пратэстаў, сыходу ў апазыцыю для большасьці маладых людзей.

Але вяртаючыся да заяўленай тэмы і першых (паводле часу зьяўленьня ў маім жыцьці) прычынаў маёй грамадзкай актыўнасьці.

Гэта кнігі.

Караткевіч, Уладзімер Арлоў... іншыя пісьменьнікі, што ўплываюць на фармаваньне нацыянальнай сьвядомасьці і актывізму, звычайна былі і ў маім жыцьці, але значна пазьней. А ў 9—12 гадоў я захапляўся Янкам Маўрам, якога часта несправядліва абвінавачваюць у сталінізьме, ды іншай савецкай літаратурай. Магу з поўнай упэўненасьцю сказаць, што менавіта прапагандаваныя са старонак кніг свабода, роўнасьць, братэрства, актывізм, альтруізм і імкненьне да самарэалізацыі і грамадзкай карыснасьці пачалі маё фармаваньне як асобы. Песьні Высоцкага й тэксты Аркадзя й Барыса Стругацкіх загартавалі маё стаўленьне да жыцьця й імкненьне адстойваць ідэалы.

Цяпер у маім жыцьці вялізарнае месца займаюць музыка, кіно й тэатар, увогуле нефарматная альтэрнатыўная культура... Мне падаецца, якраз вобразы нонканфармістаў, індывідуалаў і змагароў, што ярка гараць у сфэры нефармальнага мастацтва, запальваюць новых актывістаў у Беларусі, не даюць скласьці рук і сысьці ў маўклівы статак тым, хто, умоўна кажучы, стаміўся.

Цікава, што калі кумірам пратэстнай моладзі канца 1980-х — пачатку 1990-х гадоў у постсавецкай прасторы быў Ягор Летаў і гурт «Гражданская оборона», цяпер гэтае месца займае гурт «Lumen» з Уфы. Дзіўна, але менавіта расейскі гурт у Беларусі паўсюдна сустракаюць шматхвілінным скандаваньнем «Жыве Беларусь!» тысячы маладых людзей. Непрыняцьце паноўнага рэжыму для маладога пакаленьня пераходзіць на інстытуты дзяржавы ў цэлым. Таму радкі «Lumen» «Я так люблю свою страну, но ненавижу государство!» адгукаюцца рэфрэнам у сэрцах маладых.

Мне пашчасьціла ня толькі ўтрымацца ў сфэры грамадзкай актыўнасьці без малога дзесяць гадоў, але й самарэалізавацца. Нягледзячы на шэраг паразных праектаў, у якіх я браў удзел, мне цяпер ёсьць чым адсправаздачыцца за зробленае перад старымі знаёмымі, пахваліцца перад аднаклясьнікамі дасягненьнямі ня толькі ў важных для мяне каштоўнасных катэгорыях, але і ў агульнапрынятых у грамадзтве — такіх, як сацыяльны статус, папулярнасьць у горадзе, разьвітасьць і ўстойлівасьць справы, якой займаюся. Пры гэтым я цалкам беларускамоўны апошнія дзесяць гадоў і не хаваю нідзе сваіх перакананьняў і палітычных поглядаў. Нясьціпла выкажу меркаваньне, што прысутнасьць на месцах, у розных асяродках яркіх беларускамоўных актывістаў, якіх можна будзе браць за прыклад, істотна павялічыць колькасьць грамадзкіх актывістаў у Беларусі.

# АЛЯКСАНДР ЧЫГІР

Я часта ўспамінаю апошнія гады СССР.

1989 год, я толькі скончыў школу, уладкаваўся працаваць на Рэчыцкі вопытны завод «Рытм» вучнем рэгуліроўшчыка радыёэлектроннай апаратуры. Я дакладна ведаў, што праз тры месяцы я буду атрымоўваць 300 савецкіх рублёў, потым пайду служыць у савецкае войска, пасля войска — зноў на завод, паступлю на вячэрняе аддзяленне тэхнікума, а калі пашанцуе, то і інстытута, праз два гады стану майстрам, праз пяць — атрымаю кватэру і пасаду начальніка цэха. Мы, савецкія школьнікі, маглі без цяжкасцяў уявіць сваё далейшае жыццё. Жыццё, дзе не трэба думаць пра заўтрашні дзень, жыццё паводле прынцыпу «Не горш, чым у людзей».

Летам 1992 года цягнік Рыга — Гомель вёз мяне, дэмбеля, дахаты! Я вяртаўся ў зусім іншы, незразумелы свет. Свет, які не адпавядаў таму, што ў мяне ўклала тая савецкая сістэма адукацыі і выхавання. Я патрапіў у свет, дзе кожны дзень трэба думаць пра тое, што будзе з табой заўтра!

Маё пакаленне вучылі думаць пра галодных дзяцей Камбоджы, пра жыхароў трушчобаў Нью-Ёрка. Нас вучылі «браць» вытворныя, рашаць інтэгральныя раўнанні, канспектаваць класікаў марксізма-ленінізма, але нас не вучылі задумвацца пра сябе, сваё месца ў гэтым свеце, нас не вучылі аналізаваць тое, што адбываецца вакол нас.

Першыя гады незалежнай Беларусі былі асабліва цяжкія, але вельмі цікавыя, адны мае аднакласнікі адкрывалі для сябе «Нашу Ніву», іншыя — магчымасць хутка зарабіць, трэція — Бога, чацвёртыя — танныя спіртовыя напоі.

У 1994 годзе я і мае аднакласнікі не галасавалі за Лукашэнку! Мы ў сваёй большасці не жадалі вяртання ў СССР. Мы толькі пачыналі думаць і ад гэтага атрымоўвалі задавальненне. Але большасці былі патрэбныя не абстрактныя ідэі, а прапісныя ісціны старой сістэмы. Упэўненасць у заўтрашнім дні!

Асабіста мне падавалася, што ўсё гэта ненадоўга. Ды і хто мог паверыць, што пасля «Архіпелага ГУЛАГ», праграмы «Взгляд», кінафільмаў часу перабудовы магчымае вяртанне ў мінулае, да той старой гнілой сістэмы.

Прайшло чатырнаццаць гадоў. За гэты час маё жыццё і жыццё маіх аднакласнікаў змянілася радыкальна. Калі Лукашэнка прыйшоў да ўлады, нам было 22 гады, мала хто з нас задумваўся пра стварэнне сям'і. Цяпер нам 36 гадоў. Некато-

---

***Аляксандар Чыгір*** *— грамадзкі актывіст з Бабруйску. Настаўнік гісторыі з 13-гадовым стажам, ён быў звольнены з гэтай пасады пасьля ўдзелу ў шэрагу гучных палітычных акцый. Дэпутат Бабруйскага гарсавету (2002—2007).*

рых з маіх аднакласнікаў ужо няма — танная гарэлка, наркотыкі, забойствы на бытавой глебе. Нехта мае працу, нехта бізнес, большасць стварылі сем'і. Але абсалютная большасць ператалі шукаць і жывуць паводле прынцыпу «Дзень прайшоў, ну і добра». Мае аднакласнікі правялі рысу паміж сабой і краінай.

Яны страцілі веру ў свае сілы.

*Навошта плыць супраць плыні, калі ўсё ўжо вырашана, а я маленькі чалавек? Што я магу змяніць? Лепш я буду добра займацца сваёй справай, а перабудоўваць свет — гэта не мае,*

— так сёння разважае большасць майго пакалення.

Ці можна гэтаму здзіўляцца? Мабыць, не. Чатырнаццаць гадоў рэжым праз падкантрольныя СМІ ствараў хлусліваю рэчаіснасць. Чатырнаццаць гадоў рэжым раз'ядноўваў людзей. І як вынік, мы атрымалі грамадства «без душы».

Рэжым Лукашэнкі не статычны. Ён падобны да шчыгрынавай скуры, стала звужае для чалавека поле, на якім магчымы выбар.

Калі ў 1990-я гады была надзея на лепшае, а чарговы маразм улады выклікаў, як мінімум, усмешкі сярод людзей майго пакалення, то ў апошнія гады людзі замкнуліся ў сабе. Людзі прынялі ўмовы, навязаныя рэжымам. Альбо ты гуляеш паводле нашых правілаў, альбо ты супраць нас.

Гуляць паводле правілаў — гэта не значыць падтрымліваць рэжым, як у сталінскі час, першы тост за «правадыра ўсіх народаў», стоячы і залпам. Гэта хутчэй значыць не дэманстраваць сваёй нелаяльнасці. Не лезці ў палітыку, адкрыта не крытыкаваць начальства, удзельнічаць у святочных мерапрыемствах за адгул альбо прэміяльныя.

Калі я працаваў у школе, то мяне здзіўляла, як можа чалавек маіх год, які на словах не падтрымлівае рэжым, браць удзел у фальсіфікацыях. Аказваецца, можа! Бо прасцей дэманстраваць лаяльнасць, чым выступіць супраць.

Быць супраць — гэта значыць думаць, жыць у адпаведнасці са сваім розумам і прынцыпамі, быць не такім, як усё. У сённяшнім беларускім грамадстве за гэта даводзіцца як мінімум быць у ізаляцыі.

На пытанне «Чаму я стаў грамадзкім актывістам, а мае аднакласьнікі — не», адкажу проста: мне пашчасціла вучыцца на гістарычным факультэце не дзеля дыплома, а для сябе. Мне пашчасціла сустрэць жанчыну, якая мяне кахае, разумее і прымае мае жыццёвыя каштоўнасці і прынцыпы. У шматлікіх маіх аднакласнікаў усяго гэтага не было. А хтосьці не змог падняць галаву з-пад прэсу жыццёвых акалічнасцяў.

# ДАРКА СЛАБЧАНКА

*Досьвед няўдач ды пакутаў нічога ня значыць,*
*бо кожнае пакаленьне ўсё пачынае спачатку.*

В. Быкаў. «Пахаджане»

Пытаньне, пастаўленае ў загаловак, «Чаму я зрабілася грамадзкай актывісткай, а мае аднаклясьнікі — не?», прымусіла задумацца: і сапраўды, чаму?

Адказ на пытаньне, чаму людзі, якія сядзелі за адной партаю, доўгі час ішлі поруч, чыталі адныя й тыя ж кніжкі, у выніку абралі такія розныя шляхі, паспрабую знайсьці, у тым ліку й на падставе ўласнага досьведу.

Я не палітоляг і не сацыёляг, таму мае тэарэтычныя пазнаньні таго, што ёсьць грамадзянскай супольнасьцю, грамадзкай актыўнасьцю й трэцім сэктарам, хутчэй практычныя. Магу з гледзішча чалавека, які неўзабаве атрымае дыплём эканаміста, сказаць пра эфэктыўнасьць. У нашых людзей, у нашага грамадзтва велізарны патэнцыял, які ня тое што не выкарыстоўваецца, наадварот, усімі сродкамі зьніжаецца. Таму грамадзкую актыўнасьць, у тым ліку і сваю, я бачу ня толькі як рэалізацыю ўласных амбіцыяў, але і як дапамогу іншым у пошуку свайго месца.

Я належу да тых маладых людзей, у якіх імя ў пашпарце адрозьніваецца ад таго, якім падпісваесься. Таму што на момант яго атрыманьня думкі напісаць імя беларускай лацінкай нават ня ўзьнікла. Вось і чакаеш зьмены пашпарта.

Я належу да той часткі майго пакаленьня, якая на свае першыя ў жыцьці мітынгі патрапіла яшчэ на плячох у бацькоў, якая сустрэла масавы прыход у краіну джынсаў, барбі і жуек з каляровымі фанцікамі. Аднак, зразумела, што ня ў гэтым важнасьць таго, што адбываецца. Тое пакаленьне, якое першым памятае бела-чырвона-белы сьцяг і якое вучыла альфабэт зь літараю «ў».

Мы не разумелі, што адбываецца, але адбывалася нешта важнае. Нашыя бацькі былі маладыя, прыгожыя й адухоўленыя.

(Абмоўлюся, аднак, што ніякім разам не магу абагульняць. Хтосьці згадвае галечу, чэргі...)

А потым нешта здарылася. Мая любімая настаўніца беларускай мовы, Яніна Іванаўна, сказала нам неяк, стоячы пад Пагоняй: «Вашыя бацькі прадалі Радзіму за кавалак кілбасы. Прычым, таннай». Адбыўся рэфэрэндум.

На настаўніцу ня раз пісалі ананімкі, але Пагоня ў клясе вісела да апошняга. Калі ў дыктоўцы хто паставіць «лішні» мяккі знак, Яніна Іванаўна не лічыла гэта

---

*Дарка Слабчанка — грамадзкая актывістка, журналістка інтэрнэт-рэсурсу Generation.by. Выпускніца Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту.*

памылкаю. У адзінаццатай клясе вялікая колькасьць вучняў вырашыла здаваць беларускую літаратуру — тое выклікала зьдзіўленьне, і на іспыты прыйшла нейкая камісія.

Нас у клясе было пад трыццаць чалавек. І я ня ведаю, колькіх зь іх можна назваць ня тое што грамадзкімі, проста актывістамі, людзьмі з самастойным, незалежным поглядам на жыцьцё. Хочацца верыць і спадзявацца, што ня я адна магу назваць сябе «грамадзкаю актывісткаю».

Дык чаму так адбываецца, што ня ўсё «зерне, кінутае ў ніву, усходзіць ды красуе»?

Я лічу, што каб быць грамадзкім актывістам, трэба найперш увогуле быць актыўным, мець пэўныя ўласныя якасьці — якасьці не выбітныя, але, на жаль, прыгнечаныя ў нашых людзей. Гэта ўпартасьць, цікаўнасьць і сьмеласьць казаць «не» ці «так», калі ўсе кажуць адваротнае. «Вашая дзяўчынка задае зашмат пытаньняў», — паскардзілася настаўніца малодшых клясаў маёй маці. Пытаньні ёсьць шмат у якіх дзяцей, у маленькіх — у большасьці. Але ўпартасьці дамагчыся на іх адказу мала каму хапае. Потым зьнікае цікаўнасьць іх задаваць.

То бок, калі ўжо казаць пра ўласны досьвед, актыўнасьці было шмат, але да грамадзкіх справаў яна яшчэ не дабралася.

Маё пакаленьне навучылася на просьбу ці прапанову дзелавіта запытваць: «А што мне з таго будзе?» На жаль, сытуацыя складваецца такім чынам, што «будзе» толькі ад угоды з сумленьнем. Тую частку майго пакаленьня, якая ад гэтай угоды адмовілася, я і лічу грамадзкімі актывістамі. Бо адмова ў нашым грамадзтве — вельмі актыўнае дзеяньне.

Актыўная моладзь можа праяўляць сябе таксама ў розных сфэрах — хтосьці накіраваўся ў БРСМ, і ня толькі дзеля галачкі для дэканату, але й дзеля задавальненьня ўласных амбіцыяў, прагі дзеяньняў. Хтосьці — у «Малады фронт», напрыклад. Іншыя да партыяў ці арганізацыяў не далучаліся, але ў бульбу не хаваліся.

Алімпіядніца, залатая мэдалістка й даволі прыкметная асоба — я магла б стаць гонарам унівэрсытэцкага БРСМ. Але мне нават не прапаноўвалі далучыцца. Таму калі пачынаюцца размовы пра тое, што студэнтаў прымушаюць — так, факт застаецца фактам, але таго, каго паводле азначэньня прымусіць немагчыма, таго не прымушалі.

А потым я апынулася за мяжой. На іншым кантынэнце, там, дзе п’юць каву «Старбакс», набываюць фірмовае адзеньне за сьмешныя грошы, здымаюць апартамэнты, а заробак атрымоўваюць па гадзінах — за дзень столькі, колькі тут за месяц.

Усё гэта дужа прывабна — таму большасьць ня мае моцы з тым разьвітацца, жыве там і ўпэўнівае сябе ва ўласным шчасьці. Пачынаюць размаўляць з акцэнтам і слухаць RnB. Я таксама зьбіралася застацца... Ехала ў камфортным аўтобусе на працу, толькі вось слухала «Бывай, мой родны край» — і плакала. Тады я і зразумела, што такое Радзіма, мова родная, свае людзі, «гаварыльня даўдна». І самым вялікім шчасьцем тады было ўзяць квіток на Менск.

Жыць, каб працаваць на страўнік, адпачываць перад тэлевізарам і абмяркоўваць зь сябрамі жыцьцё расейскіх поп-зорак? Не. Тады лепей было заставацца там, дзе за год-два можна было б набыць машыну ды ўзяць крэдыт на ўласны дом.

Быў 2006-ты. Пайшлі зь сябрам на Плошчу. Было страшна. Але была надзея. Тады я нікога ня ведала, у прынцыпе, сытуацыяй валодала кепска. Але гэтае пачуцьцё, знаёмае зь дзяцінства, — адбываецца нешта важнае. Тады на плошчы Каліноўскага сабраліся, я лічу, найлепшыя людзі майго пакаленьня, якіх я ўсё жыцьцё буду паважаць і любіць. Для многіх усё тады пачалося. Праўда, тады ж і скончылася. Хтосьці лічыць тое паразай. Але, як казаў савецкі дысыдэнт Сяргей Даўлатаў, «у нашых умовах больш годна прайграць, чым выйграць».

Тады прыйшла неабходнасьць гаварыць на роднай мове. На жаль, у мяне не было бабулі ў вёсцы, таму ў падкорцы беларускія словы не адклаліся. Але, відаць, адклаліся недзе глыбей, як кажуць, у геннай памяці. У крыві, хто яго ведае. Але мова пачала вызначаць жыцьцё. Мова стала тым, што заўсёды з табой, што выражае тваю пазыцыю — пра што б ты ні казала, хоць бы які фільм абмяркоўвала зь сябрамі. Мова — гэта тое, чаго ніхто ня здолее забраць. Мова — гэта тое, за што ня трэба галасаваць на выбарах усёй краінай, каб потым скралі перамогу.

**Калі чалавек гаворыць па-беларуску, ён ня зможа заставацца абыякавым, сядзець у сваёй норцы і задавацца пытаньнем: «А што я з таго атрымаю?»**

Калі чалавек гаворыць па-беларуску, чытае беларускіх пісьменьнікаў і слухае беларускія песьні, ён аніяк ня зможа заставацца абыякавым, сядзець у сваёй норцы і задавацца пытаньнем: «А што я з таго атрымаю?»

Сіла народу — у тым, што бацькі перадаюць дзецям. У мове, культуры, звычаях, рэлігіі, духоўнасьці. Чалавек сталее, і падмуркам яму тыя каштоўнасьці, ён на іх абапіраецца. Нашаму пакаленьню ніхто тых каштоўнасьцяў не даваў. На іх здабыцьцё сыходзяць велізарныя высілкі. Я самастойна пахрысьцілася на першым курсе. На трэцім пачала гаварыць па-беларуску. І гэта яшчэ я сваёй маці данесла ўсю прыгажосьць беларускае культуры.

Тыя, хто самастойна здабыў усе гэтыя скарбы, ня збочыў, — вельмі моцныя. Мацнейшыя за сваіх аднагодкаў. Таму ім часта цяжка знайсьці паразуменьне. Але ня трэба адварочвацца. Ня трэба патрабаваць болей за тое, на што чалавек здольны. У кожнага з нас быў момант у жыцьці альбо нейкая асоба, якая паўплывала на выбар шляху, паказала альтэрнатыву.

Калі можаш — стань такім чалавекам для іншых. Менавіта таму мы зь сябрамі езьдзім у дзіцячыя дамы. Мы гуляемся зь дзеткамі, малюем. Мы гаворым па-беларуску. Ім у жыцьці прыйдзецца вой як цяжка. Яны змагацца будуць за элемэнтарнае выжываньне. Дзе ім думаць пра духоўныя каштоўнасьці? А дзякуючы нам, хай ня кожны, але нехта зь іх, стоячы «на ростанях», зробіць правільны выбар, таму што ведае, што дарог — некалькі.

Хацелася б засяродзіцца ўвогуле на ролі моладзі ў грамадзтве. Сумна, але на сёньня сытуацыя такая, што збольшага моладзь пасіўная. Сваёй ролі, магчымасьці ўплываць на тыя працэсы, што адбываюцца ў грамадзтве, маладыя людзі ня бачаць. Дый ня хочуць бачыць. Пра старэйшае пакаленьне часта можна пачуць: «Ім бы чарку ды скварку — і да тэлевізара». Хоць і ня ўсе, але многія студэнты падзяляюць тую ж філязофію. Зацікавіць вельмі цяжка. Выслухаюць — і тое добра, падштурхнуць на дзеяньне часам амаль немагчыма.

Для актыўнай часткі моладзі вельмі важнае нейкае кансалідоўнае ядро. Для мяне ў свой час гэтую функцыю выканаў Generation.by (ранейшыя Studenty.by). Гэта онлайн-праект, які актыўна дзейнічае і па-за межамі сеціва. Вакол праекту сабралася суполка маладых, актыўных людзей з самых розных сфэраў, якія імкнуцца да самарэалізацыі, якія бачаць магчымасьці разьвівацца ў сваёй краіне.

Так апісваюць праект яго стваральнікі:

*Generation.by — гэта рэсурс для актыўных людзей і пляцоўка для рэалізацыі творчых ідэяў. Мы чэрпаем натхненьне ў студэнцкіх часах — бо для нас студэнцтва — незабыўны час. …Мы хочам атрымаць ад жыцьця ўсё. І хоць далёка ня кожны сучасны беларускі хлопец ці дзяўчына мае ўласны iPod ці ноўтбук «Apple», і многія з нас нават нарадзіліся яшчэ ў СССР, але ўсё роўна мы зьяўляемся першым пакаленьнем, што вырасла ў незалежнай Беларусі, што ўжо робіць нас чымсьці адметнымі. Мы — пакаленьне, якое хоча дасягнуць усіх вяршыняў і ні сантымэтрам меней, якое разумее, што ўладкоўваць сваё жыцьцё патрэбна самастойна.*

Удзел у такім праекце дае магчымасьць фармаваць свой сьветапогляд незалежна, але пры падтрымцы сяброў.

Яшчэ хацелася б закрануць вельмі балючую тэму — нашую «найлепшую ў сьвеце» сыстэму адукацыі. Я ня буду казаць пра ўзровень падрыхтоўкі й ведаў, зь якім выходзіць «малады спэцыяліст». Відаць, галоўная задача нашай адукацыі — не забіць нашыя галовы карыснымі ведамі, а забіць наш расклад. Галоўнае — не вучыцца, галоўнае — наведваць пары. Уся сыстэма збудаваная так, што мець нейкую пазанавучальную актыўнасьць вельмі складана. Нават тыя, хто гуляе за любы ўнівэр у хакей ці баскетбол, удзельнічае ў КВЗ ці танчыць на «студэнцкіх вёснах», мусяць атрымаць дазвол дэканату. За іх дамаўляюцца на сэсіях. Староста важна паведамляе: «У яго/яе паважлівая прычына — ён/яна рэпэтуе».

Некаторыя не пытаюць дазволу дэканату — яны пытаюць дазволу ў свайго сумленьня.

Прыкладаў, як гэта можа скончыцца, вельмі шмат. Звычайна выключэньнем. Можа й горш. Адна зь нядаўніх гучных справаў — выключэньне гомельскага студэнта Зьмітра Жалезьнічэнкі. Грамадзкую актыўнасьць разумнага й сумленнага чалавека абмежавалі проста — жаўнерскімі ботамі. Пры тым Зьміцер і яго сям’я паказалі прыклад мужнасьці й вернасьці сваім перакананьням і прынцыпам.

Нават у войску Зьміцер ня скардзіцца на лёс, а клапоціцца пра іншых. А мог жа проста зьехаць.

Ёсьць людзі, якія самастойна прыходзяць да актыўнай грамадзкай дзейнасьці й граюць не апошнюю ролю. Сярод іншага, на мой погляд, ім уласьцівыя наступныя рысы:

— нацыянальная сьвядомасьць;
— цьвёрды характар;
— духоўнасьць;
— ініцыятыўнасьць;
— непахісныя маральна-этычныя прынцыпы.

Каб іх дзейнасьць была плённай, важная шырокая падтрымка, зацікаўленасьць усяго грамадзтва. Насамрэч, магчымасьцяў праявіцца хапае, галоўнае даць чалавеку самаму вызначыцца, памагчы самастойна прайсьці шлях усьведамленьня сваёй важнасьці тут і цяпер. Толькі так ёсьць надзея на тое, што беларусы стануць грамадзкай супольнасьцю. Ролю грамадзкіх арганізацыяў ці рухаў, дый проста згуртаваньняў неабыякавых людзей, я бачу ў актывізацыі камунікацыяў унутры і між пакаленьнямі. Вельмі важна не згубіць моладзь, каб наступнае пакаленьне не нарадзілася ў няволі. У няволі сваёй уласнай абыякавасьці, безыніцыятыўнасьці й бездухоўнасьці.

## АЛЕСЬ ЗАРЭМБЮК

Мая апазіцыйная актыўнасць пачалася ў старэйшых класах сярэдняе школы. Прычынай таго, што я пачаў займацца грамадска-палітычнай дзейнасцю, стаў ганебны рэферэндум у маі 1995 года па змене нацыянальнай сімволікі на бээсэсэраўскую. З гэтага моманту я пачаў шукаць крыніцы альтэрнатыўнай інфармацыі, у якіх можна было б прачытаць «іншыя» паведамленні пра падзеі ў краіне. Так я стаў набываць у шапіку «Белсаюздруку» незалежныя газеты. Штотыдзень я чытаў «Нашу Ніву», «Пагоню» і «Имя». Гэтыя выданні, разам з школьнымі ўрокамі па гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры, пачалі фармаваць маю юнацкую свядомасць. Я ўспрымаў сітуацыю, якая стварылася ў краіне, праз старонкі гэтых газет, абудзіўся мой гонар за гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, я захапляўся постаццю Алеся Загорскага ў Караткевічавых «Каласах пад сярпом тваім».

Адначасова эканамічная сітуацыя маіх бацькоў значна пагоршала з прыходам да ўлады Лукашэнкі: ён увёў мыта на ўвоз легкавых аўтамабіляў з еўрапейскіх

***Алесь Зарэмбюк** — палітык, актывіст незарэгістраванага руху «За свабоду». Былы дэпутат Мастоўскага райсавету.*

краінаў у Беларусь. Заробак ад продажу патрыманых аўто быў галоўнай крыніцай даходаў маёй сям'і. Бацька такім чынам зарабляў на жыццё. І пагаршэнне ўзроўню жыцця маёй сям'і выклікала яшчэ большую апазіцыйнасць да ўлады.

Бацькавы сябры, у асноўным дробныя прадпрымальнікі, таксама былі не задаволеныя Лукашэнкам — зарабляць стала цяжэй. Я чуў іх незадаволенасць амаль у кожнай размове, на рыбе, у гутарках за сталом. Мая апазіцыйнасць толькі павялічвалася, і я пачаў задаваць сам сабе пытанні: што я магу зрабіць для таго, каб змяніць сітуацыю? Як і чым магу дапамагчы апазіцыйным рухам і арганізацыям, пра дзейнасць якіх я чытаў у незалежных газетах?

Падчас другога антыбеларускага рэферэндума ў маёй школе актыўна ішла агітацыйная кампанія ў падтрымку канстытуцыйных зменаў, якія прапанаваў Лукашэнка. Усе стэнды і сцены былі абклееныя плакатамі з ягонымі прапановамі, а сярод школьнікаў распаўсюджваліся сотні каляндарыкаў з партрэтам Лукашэнкі і заклікам «Прошу вашей поддержки», якія павінны былі загітаваць нашых бацькоў аддаць свае галасы за змены ў Канстытуцыю, што прапанаваў першы прэзідэнт Беларусі. Мы — тады яшчэ дзеці — слаба разумелі тое, што адбывалася навокал, нават не ўяўлялі сабе, што ад пазіцыі нашых бацькоў на гэтым рэферэндуме залежыць нашая агульная будучыня. Менавіта ад пазіцыі, бо ўжо тады проста аддаць голас было недастаткова. Як паказаў час, трэба было ехаць і абараняць сваю пазіцыю на плошчы Незалежнасці. Ад колькасці і рашучасці пратэстоўцаў залежала, як павядзе сябе кіраўніцтва Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання.

Многія з нашых бацькоў не разумелі гэтага, яны ўсё яшчэ знаходзіліся пад уздзеяннем лукашэнкаўскіх палымяных папулісцкіх прамоваў. Што праўда, мае бацькі на выбарах 1994 года аддалі свае галасы за Станіслава Шушкевіча, на рэферэндуме 1995-га прагаласавалі за бел-чырвона-белы сцяг і Пагоню, а ўвосень 1996-га падтрымалі прапановы Вярхоўнага Савета. Безумоўна, я цікавіўся вынікамі выбараў, бо ў параўнанні з камуністычнымі прадказальнымі выбарамі ў СССР гэта было нешта новае — альтэрнатыўныя кандыдаты, плакаты і ўлёткі. Супрацьстаянне дзвюх галінаў улады. Выбарчая інтрыга...

Пазіцыя маіх бацькоў спрыяла таму, што я ўмацоўваўся ў сваіх апазіцыйных да дзейнага рэжыму поглядах. У 1997 годзе ў Мінску быў створаны моладзевы рух «Малады фронт», пра акцыі і дзейнасць якога пісалі ўсе незалежныя СМІ. Вельмі актыўна дзейнічала гродзенская арганізацыя «Маладога фронту», пра што падрабязна пісала газета «Пагоня». На вялікі жаль, у маім родным горадзе не было моладзевых апазіцыйных арганізацый. Гэта прымусіла мяне стварыць мастоўскую суполку «Маладога фронту». Я сам пачаў лічыць сябе сябрам «Маладога фронту», падтрымліваў дзеянні актывістаў гэтай арганізацыі і захапляўся тымі акцыямі, якія арганізоўвалі сябры гэтага моладзевага руху па ўсёй Беларусі.

Падчас вандроўкі ў Гродна летам 1998 года на дызельным цягніку я сустрэў маладога хлопца. Ён сядзеў недалёка ад мяне і прыцягнуў да сябе ўвагу вялікай круглай значкай, прышпіленай да кашулі. На фоне эмблемы белага і чырвонага колераў з выявай шасціканцовага крыжа было напісана — «Малады фронт».

Саромеючыся, доўга думаў, ці варта падысці да яго і пазнаёміцца, брала нейкая няўпэўненасць, спрацоўвалі правінцыйныя комплексы. Усё ж такі наважыўся і падышоў. Яго звалі Сяргей, ён быў з Ваўкавыска (суседні з Мастамі, трохі большы горад на Гродзеншчыне). Мы пазнаёміліся, абмяняліся кантактамі і пагаварылі пра дзейнасць «Маладога фронту». Пасля чаго ён запрасіў мяне з маімі сябрамі ў Ваўкавыск і на развітанне, на маю просьбу, пакінуў кантакты гродзенскага «Маладога фронту». Пасля гэтай гісторыі мы стварылі суполку «Маладога фронту» ў Мастах, якая складалася на той момант з трох чалавек. Акрамя мяне гэта былі мой сябар, з якім мы жылі ў адным мікрараёне, і наш выдатнік-аднакласнік.

Праз некаторы час наша суполка была пастаўленая на ўлік у Мінску, і мы пачалі прывозіць з Гродна і Ваўкавыска матэрыялы і распаўсюджваць іх. Было страшнавата, а разам з гэтым і цікава, малады арганізм патрабаваў адрэналіну і прыгодаў. Мы насілі значкі сябраў «Маладога фронту» і агітавалі аднакласнікаў і іншую моладзь далучацца да нашай дзейнасці.

Аднакласнікі ж успрымалі маю грамадска-палітычную дзейнасць неадназначна. Частка іх ставілася да ўсяго, што мы рабілі, з іроніяй і страхам. Беларуская мова, на якой мы з хлопцамі пачалі паступова гаварыць, асацыявалася ў аднагодкаў з вёскай і калгасам. Ім было не зразумела, чаму мы пачалі гаварыць па-беларуску і распаўсюджваць стосы рознай беларускамоўнай літаратуры на апазіцыйную тэматыку. Мае аргументы пра патрыятызм і любоў да Бацькаўшчыны не ўспрымаліся да канца. Яны не маглі назваць мяне «калгаснікам», бо я ніколі не выглядаў такім чынам, меў шмат знаёмых і сяброў па ўсім горадзе і паводзіў сябе як звычайны сучасны малады чалавек.

Нехта казаў, што мяне купілі і плацяць грошы за маю дзейнасць. А хтосьці лічыў усе мае дзеянні, па-добраму, вар'яцкімі. Казалі: «нечего делать». Добрую частку маіх аднакласнікаў у дзесятым і адзінаццатым класах цікавіла толькі паступленне ў тэхнікумы, каледжы і універсітэты.

Мяне, акрамя паступлення ва універсітэт, цікавіла любая дзейнасць, якая б магла паскорыць працэс пераменаў у краіне. Я сачыў за суседняй Польшчай, праглядаючы штовечар выпускі навінаў на польскім тэлебачанні, якое глядзеў мой бацька. Я перажываў адсутнасць перспектываў для сябе ў Беларусі ў будучыні. Вельмі хацелася займацца грамадска-палітычнай дзейнасцю і рабіць кар'еру пасля атрымання вышэйшай адукацыі, каб працаваць у органах мясцовага самакіравання. Хацелася адбудоўваць свой горад для жыхароў і бачыць на іх тварах шчаслівыя ўсмешкі ад вынікаў маёй дзейнасці.

Мае аднакласнікі не пайшлі ў апазіцыю перадусім таму, што гэта не простая справа і, самае галоўнае, не прэстыжная. Раскідаць улёткі па скрынях, збіраць подпісы, назіраць заператрусамі ў офісах і бацькоўскіх дамах, мець праблемы ва універсітэтах і на працы — гэта галоўная прычына таго, чаму яны не пайшлі. Страх! Страх згубіць усё і патрапіць за краты. Людзі прыстасоўваюцца і прызвычайваюцца, яны лаюць гэтую ўладу на кухнях, але ж амаль не здольныя выйсці і супольна абараніць свае правы, уласнасць ці бізнес.

Мае аднакласнікі таксама ўжо прыстасаваліся, яны хочуць жыць нармальным жыццём. Апазіцыйная дзейнасць для іх, не без уздзеяння дзяржаўнай прапагандысцкай машыны, — ненармальная. Тэрмін «апазіцыя» ў Беларусі — негатыўны, таму настаўнікі і дактары не стаяць у чарзе, каб запісацца ў апазіцыйную партыю. Працягваючы тэму, трэба адзначыць, што мае аднакласнікі падтрымліваюць са мной нармальныя стасункі, але ж не без аглядкі. Адзін з іх негалосна дапамагае. Той, які быў сябром «Маладога фронту» і заснавальнікам мастоўскай маладафронтаўскай суполкі, ужо шэсць гадоў жыве ў Амерыцы.

Адной з прычынаў таго, што мае аднакласнікі не сталі актывістамі апазіцыі, ёсць адсутнасць беларускай сьвядомасці. Многія з іх працягваюць жыць з амаль такімі ж думкамі, як і іх бацькі падчас савецкай акупацыі. *Homo soveticus* не памятае ўласнай гісторыі і не ведае герояў той зямлі, на якой жыве. Ён не навучаны думаць уласным розумам, а чакае, што ўсё вырашыць цар ці генеральны сакратар. Абсалютная большасць маладых людзей, з якімі я вучыўся ў пятай гарадской школе горада Масты, былі выхаваныя бацькамі з адной мэтай — паступіць хоць куды-небудзь, абы толькі ў будучыні не быць рабочымі дрэваапрацоўчага завода «Мастоўдрэў». А калі пашчасціць — з'ехаць з правінцыйнага горада. Як вынік, вялікую колькасць маіх аднакласнікаў напаткаў гэты «мастоўдрэваўскі» лёс, нехта працуе на заводзе рабочым — а хтосьці ў кабінетах і на пасадах гэтага ж завода.

І тым не менш, нягледзячы на слабасць нацыянальнай свядомасці і страх перад рэпрэсіўным рэжымам, большасць маіх аднакласнікаў цяпер падтрымлівае дзейнасць мясцовай апазіцыі. Гэта пацвярджаюць прыватныя размовы і вынікі выбарчых кампаніяў за апошнія пяць гадоў. Нават сёння ў складзе мясцовых саветаў нашага рэгіёна ёсць два дэпутаты ад апазіцыі.

Многія з аднакласнікаў падчас студэнцтва пабывалі на стажыроўках за мяжой і бачылі цалкам іншы ўзровень жыцця. Некаторыя былі на Захадзе на заробках і таксама разумеюць неэфектыўнасць курсу, якім вядзе краіну нелегітымнае кіраўніцтва. Заробленыя на Захадзе грошы яны наўпрост не могуць укласці ў сваю справу, бо заўтра справу могуць закрыць, а ўласнасць — сканфіскаваць. Усе гэтыя прычыны паступова прымушаюць людзей задумвацца пра палітыку. Урэшце, гэта абавязкова прывядзе да пераменаў і пазітыўнага ўспрымання тэрміну «апазіцыя» беларускім насельніцтвам, якое абавязкова стане нармальным еўрапейскім грамадствам. Я ў гэта веру і дзеля гэтага працую. Галоўная матывацыя маіх дзеянняў — гэта незалежная Беларусь у складзе трансатлантычнай цывілізацыі.

# ВОЛЬГА КАРАЧ

*— Паслухай, Маня, — кажа селянін, — мне здаецца, што белая курка крыху засумавала. Ці не згатаваць зь яе суп?*
*— Ну, калі ты думаеш гэтым яе разьвесяліць...*

Беларуская народная показка

У горадзе Віцебску ва ўсіх аптэках ідзе бойкі гандаль. Гандлююць не віяграй і не таблеткамі ад грыпу. Ідзе гандаль «фунфырыкамі» — гэта ў народзе так ласкава празвалі бутэлечкі са сьпіртавым настоем глогу. Зранку завозяць, а часам даводзіцца завозіць «фунфырыкі» і па абедзе — не хапае на ўсіх ахвочых. Знаходлівыя алкашы падлічылі: купіць сьпіртавы настой глогу таньней, чым у пераліку бутэльку гарэлкі. Існуе міт, што глог больш карысны: усё-ткі ён прызначаецца для лекаваньня сардэчных захворваньняў. Сэрца алькаголікам не баліць — за іх ужо ўсё вырашана, у іх ужо ўсё добра. Зранку наскрэбсьці ўсімі праўдамі-няпраўдамі драбязу, прынесьці пакамечаныя і брудныя паперкі і абмяняць на «фунфырык». Зранку выпіў — дзень вольны. Няма праблемаў і няма турботаў…

Чаму беларусы выбіраюць «фунфырыкі» зранку, а не выбіраюць такую пачэсную справу — барацьбу за сьветлую будучыню Беларусі? Чаму колькасьць актывістаў апазыцыі паціху скарачаецца, а не расьце?

Пытаньне рытарычнае. А што, акрамя праблемаў, можа прынесьці ўдзел у палітыцы Беларусі?

За чатырнаццаць гадоў палітычнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі вакол Беларусі склаўся шэраг нейкіх мітаў беларусаў пра саміх сябе, праз якія складана будаваць сваю палітычную працу.

## Міт № 1. Я — адзін самы разумны, а ўсе астатнія ёлупні

У Беларусі склалася слаўная традыцыя лічыць усіх ідыётамі, апроч самаго сябе.

Паўстаў міт, што недзе там, у Беларусі, затаілася цэлае племя дзіўных людзей пад назвай «валянтэры». Гэтыя людзі сьпяць і бачаць, як бы ім паўдзельнічаць у любой акцыі альбо мерапрыемстве, атрымаць дубінкай па галаве, вялізны штраф і вопіс маёмасьці, а яшчэ лепей 15 сутак за кратамі — з рызыкай сесьці гады на тры. А ўсе гэтыя непрыемнасьці лёгка кампэнсуюцца правам гэтых людзей паслухаць вашыя роздумы пра лёс Беларусі і беларускага народу.

---

***Вольга Карач*** *— палітык (узначальвае Віцебскую філію Аб'яднанай грамадзянскай партыі), былы дэпутат Віцебскага гарсавету.*

Чаму ў апазыцыі толькі некалькі тысяч чалавек — на ўсе 10 мільёнаў беларусаў? Чаму мае аднаклясьнікі ня ўдзельнічаюць у палітыцы? А ўсё вельмі проста: ці можа палітыка забясьпечыць ім гарантыі хаця б не памерці з голаду, пасьля таго, як зь імі не падоўжаць кантракту? Ці можа яна дапамагчы выгадаваць дзяцей? Ці можа яна зьмяніць нешта да лепшага? Так, у агульначалавечым сэнсе. А вось у жыцьці канкрэтнага чалавека ўдзел у палітыцы — гэта што? Гэта пагроза вялізных штрафаў, галоднай сьмерці, турмы, перасьледу. Акрамя таго, з усімі гэтымі праблемамі чалавек застаецца сам-насам, без салідарнасьці і дапамогі з боку іншых. І адсутнасьць салідарнасьці ў нейкай ступені зразумелая: навошта будучаму прэзыдэнту дапамагаць іншаму будучаму прэзыдэнту Беларусі?

Таму раней ці пазьней у любога пачаткоўца ўзьнікае пытаньне: дзеля чаго? І ён павінен самастойна знайсьці на яго адказ. А калі адказу няма — чалавек сыходзіць з палітыкі…

## Міт № 2. Я адзін ведаю правільны шлях, у Беларусі да гэтага часу няма дэмакратыі, таму што ніхто не жадае мяне слухаць

У беларускім грамадзтве пануюць два стэрэатыпы: кожны можна быць настаўнікам і кожны можа быць палітыкам — як кажуць, дурная справа ня хітрая. Мне не пашанцавала: я і палітык, і настаўнік. Таму на сабе адчула ўсе «перавагі» такога меркаваньня. У гэтай сфэры першы крок любога «немаўляці»-палітыка пачынаецца з таго, што людзі наўкол вас, даведаўшыся пра вашую прыналежнасьць да такой спэцыфічнай сфэры заняткаў, адразу згадваюць, што выраслі ў краіне саветаў — яны адразу пачынаюць саветаваць, што і як трэба зрабіць (прычым аніводны кіравацца сваімі ж уласнымі парадамі не зьбіраецца). Паслухаеш такога разумнага чалавека — і дзівісься: чаму ён не прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь: ведае ўсе адказы на ўсе пытаньні, ведае ўсе рэцэпты шчасьця для простага народу. Але толькі — на словах… На практыцы такі чалавек ніколі ні ў чым ня ўдзельнічаў і ўдзельнічаць не зьбіраецца. Затое адказы ведае на ўсе сто працэнтаў. Адзін палітык неяк нават прызнаўся мне ў размове: «Цяжка жыць у краіне, дзе 10 мільёнаў прэзыдэнтаў». Гэта самае кепскае, што зрабіў Аляксандар Лукашэнка, праўда, ненаўмысна, для рэгрэсу ў разьвіцьці палітычных дачыненьняў: ягоная перамога здаецца настолькі лёгкай, што ўжо чатырнаццаць гадоў не адно пакаленьне пачаткоўцаў-палітыкаў ламае дзіды, спрабуючы паўтарыць ягоны подзьвіг. І кожны новы палітык ну ніяк не пагаджаецца на меншае за пост прэзыдэнта: ужо калі Аляксандар Лукашэнка здолеў, дык што я — ня здолею? Я што, горшы? І вось гэтыя «шапказакідальніцкія» настроі замінаюць многім нармальна арганізаваць сваю працу, спытаць сябе: а якія, уласна, я імкнуся рэалізаваць ідэі? Бо палітык — чалавек, які стварае і рэалізуе ідэі. Гэта ня толькі партфэль альбо прыгожая пасада. Гэта цяжкая напружаная праца дзеля вынікаў, якія, магчыма, будуць толькі праз дзясяткі гадоў. І ў такой працы не дапамогуць побытавыя развагі аб «народным шчасьці», альбо «як усё падзяліць па справядлівасьці». Дарэчы, менавіта таму я так не люблю сямейных сьвятаў: пры-

ходзіш расслабіцца ад палітыкі і адпачыць у ціхім сямейным коле, а твае сваякі прыходзяць у «поўнай баявой расфарбоўцы» паспрачацца з табой на палітычныя тэмы. І выглядае гэта як прынцып лесаруба: «у лесе пра бабаў, з бабамі — пра лес».

Гэта сур'ёзная праблема. Выходзіць замкнёнае кола. Кожны палітык-пачатковец адразу думае пра сваю перадвыбарную кампанію — і адразу як кандыдата ў прэзыдэнты. Аніяк ня менш. Нікому да галавы не прыходзіць відавочная думка, што ахвочых на пасаду прэзыдэнта багата, а вось чамусьці ніхто да гэтага часу не зьмяніў Аляксандра Лукашэнку на гэтай пасадзе — значыць, ня ўсё так проста, як падаецца збоку…

Таму пакуль мы не ўсьвядомім і не асэнсуем сваіх мінулых памылак, ня вывучыўшы, няхай і нэгатыўны, досьвед мінулых гадоў, не пачнем гэтыя памылкі выпраўляць, да нас ня прыйдуць новыя людзі, каб стаць поплеч. Дакладней, прыйдуць і… адразу сыдуць. Таму што бег па замкнёным коле не абрыдае толькі цыркавым коням.

## Міт № 3. Мне павінны дазволіць і мяне павінны прызнаць

Беларусы вельмі любяць сябе абмяжоўваць і займацца самацэнзурай. Ім трэба на ўсё «спэцыяльны дазвол» — дазвол зьбіраць подпісы, дазвол працаваць зь людзьмі, дазвол рабіць грамадзянскія кампаніі. Вельмі часта палітычную апазыцыю папікаюць тым, што яна жыве «ад выбараў да выбараў», прычым папікаюць свае, беларускія абывацелі і аналітыкі. А насамрэч адказ просты: беларускія палітыкі, як і частка беларускага грамадзтва, самі сябе абмежавалі. Яны сябе абмежавалі выбарчымі кампаніямі. Ім здаецца, што па-за гэтымі кампаніямі для працы зь людзьмі патрэбны спэцыяльны дазвол ад кагосьці. Напрыклад, адзін віцебскі палітык шчыра лічыць, што калі ён у апазыцыі, яму для ўскладаньня вянкоў да помніка ў Дзень Перамогі патрэбны спэцыяльны дазвол гарвыканкаму. І ён ідзе па гэты дазвол і заломвае рукі з гора, бо, канечне, гарвыканкам яму адмаўляе. Усё гэта нагадвае беларускую показку на тэму, калі селянін прыйшоў да сьвятара і спытаў, ці можна яму есьці ў Вялікі пост мяса. «Вядома, не», — адказаў сьвятар. «А ці можна мне есьці ў Вялікі пост рыбу?» — спытаў ізноў селянін. «Вядома, не», — адказаў сьвятар. «Тады, сьвяты айцец, чаму вы ясьцё ў Вялікі пост і мяса, і рыбу?» — спытаў зьдзіўлены селянін. «Таму што, сын мой, нікога пра гэта не пытаю», — быў адказ…

Дазволу ўзяць уладу ніхто ні ў каго не пытае — гэта даўно вядомая аксіёма. Але лёгка сказаць ды цяжка зрабіць, калі патрэба ў «дазволе» сядзіць у галаве і блякуе любыя ініцыятывы.

Але калі чалавек забараняе сам сабе, то хто можа даць такі «дазвол»? Можа дазволіць рабіць штосьці аўтарытэт. Але ў беларусаў няма агульнанацыянальных беларускіх аўтарытэтаў. Іх і ня можа быць, пакуль ніхто не прызнае за іншым беларусам права быць лепшым і разумнейшым у палітыцы. Тады такі «дазвол» тэарэтычна можа даць аўтарытэтны замежнік. Але тут бяда — таму што замежнік

можа даваць «дазвол» на нейкія дзеяньні, зыходзячы з сваёй культуры і свайго досьведу, які ў беларускіх умовах звычайна не дапамагае. Менавіта таму ў беларускай палітыцы так шмат снобаў зь іх аповедамі, дзе, хто і на якім узроўні сустракаўся. Яны для сябе вызначаюць палітычную каштоўнасьць менавіта паводле ўзроўню высокіх прадстаўнічых сустрэчаў і таго, што хто каму сказаў. Насамрэч гэтыя сустрэчы на высокім узроўні не такія ўжо і важныя, гэта проста частка палітычнай работы, два чалавекі паціснулі адзін аднаму рукі і сказалі колькі фразаў пра дэмакратыю і правы чалавека. Вынік гэтых сустрэчаў — у лепшым разе якая-небудзь чарговая пустая рэзалюцыя па Беларусі. У горшым — ні я, ні гэты палітык праз тыдзень нават не згадаем гэтай сустрэчы. Але некаторыя беларускія палітыкі надаюць празьмерна вялікую ўвагу гэтым сустрэчам, менавіта таму, што ў гэтых сустрэчах яны як бы атрымліваюць «дазвол» быць лідэрам.

Усе забываюцца на тое, што беларуская палітыка ўжо робіцца нават не на кухнях, яна робіцца ў пад’ездах. Там брудна, няўтульна, сьмярдзіць каналізацыяй і пратухлымі харчамі. Там абшарпаныя сьцены і апляваныя сходы. Але менавіта там вырашаецца лёс любой палітычнай кампаніі і любога палітыка. Хто заваюе пад’езды — заваюе Беларусь. Высокі кабінэт і людзі ў дзелавых касьцюмах — гэта шырма, простая карцінка. Можна прыгожай карцінай завесіць дзірку ў сьцяне, але самой сьцяны яна не памяняе.

## Міт № 4. Я — самы геніяльны палітык усіх часоў і народаў

Калі ў Беларусі чалавек дасягнуў вяршыняў у іншай сфэры, яму будзе цяжка стаць добрым палітыкам: высокі грамадзкі статус будзе замінаць назапашваньню палітычнага досьведу і пазбаўленьню ад пабытовых стэрэатыпаў пра палітыку, а грамадзтва будзе заўважаць усе ягоныя памылкі і не даруваць іх зноў-такі праз статус.

У чым праблема «доўгажыхарства» Аляксандра Лукашэнкі? У чым праблема многіх іншых палітыкаў Беларусі? Яны прыходзяць у палітыку зазвычай тады, калі ўжо зрэалізаваліся ў іншай сфэры, і не разумеюць, што трапляюць у вельмі спэцыфічны асяродак — гэта як Аліса трапіла ў Залюстроўе: быццам усё знаёмае, але неяк ня так. Гэта як зь бізнэсу адразу трапіць у чыноўнікі — вельмі складана, таму што іншыя людзі, іншыя правілы, іншыя мэханізмы і іншыя стэрэатыпы. А тут яшчэ чалавек верыць, што ягоны папярэдні жыцьцёвы досьвед дапаможа яму ў палітыцы. І чым вышэйшы быў статус чалавека, тым складаней будзе яму адаптавацца ў новых умовах, тым складаней яму сказаць: «Цяпер пачынаем усё спачатку». Гэта не зьвязана з тым, што ён дурнейшы, гэта зьвязана з тым, што ён атрымлівае болей грамадзкай увагі адразу і меней часу на аналіз уласных памылак і пралікаў. І калі статус чалавека дастаткова высокі, то ён адразу ўзьлятае на палітычны алімп, ад яго патрабуюць біць рэкорды па бегу, калі ён і хадзіць добра ня ўмее. Нядобразычліўцаў багата, досьведу ў адборы каманды няма, стратэгічнага мысьленьня таксама, ён яшчэ і сам не разумее, што ён жадае

ў выніку атрымаць, а ягоныя памылкі адразу кідаюцца ў вочы. Ён яшчэ ня ўмее адрозьніваць балбатуноў і дэмагогаў ад людзей, якія сапраўды штосьці могуць і ўмеюць, ён не гатовы сам выпрацоўваць ідэі і стратэгіі, а яму падсоўваюць нейкія паперкі з мудрагелістымі графікамі, у якіх ён зусім не разьбіраецца. Таму ўсё ідзе паводле вядомай схемы: усе кідаюцца да новага «лідэра», віснуць на ім, а потым, утапіўшы яго пад цяжарам сваіх і ягоных памылак, гаротна ўсклікаюць: «Ізноў ня той!» Складана чалавеку, які, трапіўшы ў палітыку з пасады, напрыклад, дырэктара заводу, пачынаць з нуля: разносіць улёткі, зьбіраць подпісы, тэлефанаваць людзям, то бок выконваць усю чарнавую, тэхнічную працу. Ну хоць задушыся — ня можа дырэктар заводу ісьці да людзей, грукацца ў кожныя дзьверы і размаўляць зь людзьмі. Ён прызвычаіўся, што людзі самі да яго прыходзяць, яму будзе складана перайначыць сябе. А не паспрабаваўшы ўсяго гэтага, аніводнай кампаніі добра не сплянуеш і ня здолееш ацаніць, наколькі добра яе сплянавалі і правялі іншыя. Вось і выходзіць: абвясьціўшы сябе чарговым «шахматным каралём» — выратавальнікам нацыі ад злоснага тырана, палітык, які не пасьпеў пабыць пешкай і не набраўся палітычнага досьведу, адразу ж атрымлівае мат. І выходзіць з гульні. І пачынае шыпець альбо ў бок «караля» іншага колеру: «ён жа вар’ят», альбо ў бок сваіх былых паплечнікаў, што яны нейкія «не такія», што ім даўно час «на звалку гісторыі». І што ён бы наагул усё зрабіў інакш, калі б яму далі яшчэ адзін такі шанец. Але, на жаль, кароль памёр, жыве кароль! — грамадзтва ў гэты час разгортвае ліхаманкавыя пошукі новага «караля».

Пакуль у палітыцы ня выгадуюцца лідэры з нуля (прычым самі; нікога спэцыяльна гадаваць ня трэба), якія падняліся па ўсіх прыступках палітычнай лесьвіцы, ня будзе і масавага прытоку новых людзей у палітыку. Таму што валянтэры глядзяць на падзеі аднымі вачыма, а лідэр — іншымі. Умельства глядзець на зьяву з усіх бакоў — талент рэдкі, але ён кампэнсоўваецца жыцьцёвым досьведам — то бок чалавек павінен пабываць і ў шкуры валянтэра, і ў шкуры лідэра.

## Міт № 5. Сытуацыя даўно б зьмянілася, калі б усе выйшлі на вуліцы

Падманлівая лёгкасьць перамогі Аляксандра Лукашэнкі ў 1994 г. мела вынікам тое, што кожны год у Беларусі хтосьці хоча зьмяніць уладу. А цяпер уявіце сабе, што такое быць палітыкам у краіне, дзе кожны год — спробы рэвалюцыі? Чалавек прыходзіць у палітыку, сутыкаецца з кімсьці, хто з палаючымі вачыма яго пераконвае, што «альбо цяпер, альбо ніколі»… Пачынае працаваць, зарабляе непрыемнасьці, застаецца адзін, таму што ніхто яму дапамагаць выблытвацца з гэтых непрыемнасьцяў не жадае дый ня можа, на парозе — новая рэвалюцыя. Проста няма калі падумаць і прааналізаваць. Гэта ўсё вельмі сумна — «ёсьць у рэвалюцыі пачатак, няма ў рэвалюцыі канца»… Арганізацыі і партыі банальна задыхаюцца пад цяжарам «рэвалюцыяў», яны ня могуць разьвівацца, выпрацоўваць свае стратэгіі — таму што ў рэвалюцыі стратэгіі не патрэбныя, а патрэбныя палымяныя прамовы і барыкады, крэйсэр «Аўрора», рэвалюцыйныя песьні, крыкі

«Ўра!» і героі, што закрываюць грудзямі варожыя дзоты. Падчас рэвалюцыі няма патрэбы ў карпатлівай працы штодня, бо ў рэвалюцыі ёсьць толькі сёньня і няма заўтра. Як вынік, раней ці пазьней просты чалавек пачынае адчуваць своеасаблівае дэжа-вю — недзе я ўжо гэта бачыў, чуў альбо ўдзельнічаў. Але штогод у Беларусі прачынаецца нейкая новая купка людзей і пачынае насіцца з ідэяй «А давайце хутка скінем Лукашэнку, га?», і пры гэтым забываецца, што большасьць беларусаў ужо пасьпела паўдзельнічаць у такіх дзеяньнях і ўжо набыла досьвед у выглядзе гузакоў. І глядзяць на навічкоў з жалем і спагадай. Дарэчы, абодва гэтыя пачуцьці — менавіта тое, пра што з захапленьнем апавядаюць маладыя палітыкі ад апазыцыі: як шкадуюць іх і як ім спагадаюць простыя людзі, асабліва бабулькі: «Ай, мой бедненькі, ды куды ж ты палез! Як цяжка табе будзе!». І забываюць, што так звычайныя людзі спачуваюць яшчэ адной катэгорыі — вясковым вар’ятам…

Акрамя гэтага, ёсьць яшчэ адзін вельмі дзіўны міт у беларускіх палітыкаў: галоўнае — выцягнуць беларусаў на вуліцы, а ўжо там… Што маецца на ўвазе пад гэтым «ужо там» — ніхто ня ведае. Але ж беларусы ўжо выходзілі на вуліцы і стаялі — і ў 1996, і ў 1999, і ў 2006 гг., але чамусьці нічога так і не зьмянілася. Акрамя таго, на сьвяты таксама выходзіць вялізны натоўп народу — а рэвалюцыі няма. Выглядае, галоўнае ня выхад на вуліцу вялікай колькасьці беларусаў, а мусіць быць нешта яшчэ…

Таму мае аднаклясьнікі і ня будуць удзельнічаць у палітыцы — пакуль ня ўбачаць доўгатэрміновасьці і сур’ёзнасьці той ці іншай арганізацыі і не пераканаюцца, што гэта не чарговыя патугі новай групы наіўных рамантыкаў.

## Міт № 6. Сытуацыю ў Беларусі можа зьмяніць моладзь, асабліва студэнты

Выхаваная паваенным пакаленьнем пад лёзунгам «Што заўгодна — абы не было вайны» моладзь эпохі лукашызму ахвотней адгукаецца менавіта на ідэю чарговай «рэвалюцыі», яны больш гуляюцца ў палітыку і палітыкаў. Гуляюцца з усёй сур’ёзнасьцю і энэргіяй, на якую здольныя, але гэта толькі гульня. На жаль, моладзь і студэнты ня здолеюць устаць на чале дэмакратычнага руху і некуды яго павесьці. Не таму што дурныя, а таму што няма палітычнага досьведу, няхай нават і нэгатыўнага. Патрэбны час, каб набраць гэты досьвед. Час, каб навучыцца пралічваць свае крокі і аналізаваць наступствы гэтых крокаў. Час, каб пачаць жыць катэгорыяй часу. Мала хто ў дваццаць гадоў пляную сваё жыцьцё на дваццаць гадоў наперад — ды нават на тры гады наперад, бо і тры гады здаюцца далёкімі. І патрэбны час, каб навучыцца не наступаць на тыя ж граблі і не паўтараць старых памылак. У палітыцы няма геніяў, якія нараджаюцца з абсалютнымі ведамі і палітычнымі талентамі. Хоць і ўзрост таксама не гарантуе палітычнага досьведу, таму што асноўная маса цяперашніх апазыцыйных палітыкаў прыйшла ў палітыку прыблізна ў адзін час — хтосьці быў маладзейшы, хтосьці старэйшы, але ўсе прыйшлі ў палітыку адначасова…

Сытуацыю ў Беларусі здолее зьмяніць толькі насельніцтва Беларусі, прычым не адна нейкая група, а розныя сацыяльныя групы, якія жадаюць пераменаў. Але гэтае жаданьне прагматычнае — беларусы жадаюць ведаць, якія перамены ім можа прынесьці тая ці іншая палітычная група. Кожны беларус хоча быць упэўнены, што перамены ня зробяць ягонае жыцьцё горшым. І тыя палітыкі, якія здолеюць пераканаць у гэтым большасьць беларусаў, і прыйдуць да ўлады…

Таму, калі чалавек прыходзіць у палітыку, ён павінен быць гатовы да таго, што ён атрымае.

1. Трэба падрыхтавацца да таго, што ўсе вакол даюць *бясплатныя «каштоўныя» парады*, але толькі адзін чалавек нясе поўную адказнасьць за іх рэалізацыю. Гэта вы. І нават ваш дарадца, калі штосьці ня ўдасца, у выніку будзе дакараць вас за няўдачу. Таму найлепшы дарадца — вашыя лёгіка і здаровы сэнс.

2. *У большасьці сваёй беларусы — летуценьнікі*, яны не гатовыя да рэальнай чарнавой штодзённай працы. Мала таго, яны жывуць у выдуманым сьвеце і схільныя да самападману. І пачынаюць ненавідзець таго, хто разбурае іх ілюзіі і фантазіі, асабліва на палітычную тэму. Таму будзьце гатовыя да гэтай нянавісьці.

3. *Праверыць сваю псыхіку на трываласьць*. Ня трэба забывацца, што псыхіка нармальнага чалавека не прыстасаваная да камунікаваньня зь вялізнай колькасьцю людзей. А любая палітычная кампанія — гэта менавіта камунікаваньне зь вялізнай колькасьцю людзей, якіх трэба пераканаць у сваёй рацыі. Сёньня нават шараговы зборшчык подпісаў сустракае і пераконвае за адзін дзень столькі незнаёмых людзей, колькі ягоны прапрадзед у XIX ст. не сустракаў за цэлы год. Таму любы чалавек, калі прыходзіць у палітыку, сутыкаецца з такім фактам масіраванага чалавечага камунікаваньня, і далёка ня ўсе здольныя гэта вытрымаць. Гэта шалёна цяжка, і, як правіла, цяжару гэтага кавалку палітычнай працы не разумее толькі той, хто ў гэтым ніколі ня ўдзельнічаў. І патлумачыць цяжка: гэта тое самае, што тлумачыць сьляпому, што такое чырвоны колер. Пакуль сам ня ўбачыш і не пакаштуеш — не зразумееш.

4. *У Беларусі палітык сам павінен структураваць прастору вакол сябе.* У Беларусі ёсьць адна асаблівасьць, што адразу кідаецца ў вочы: нашае грамадзтва скрайне неструктураванае. І вось гэтая адсутнасьць усякае структуры ў выніку мае такі фэномэн: чалавек атрымаў цудоўную пасаду, адпрацаваў на ёй, выклаўся, далей — тупік, і гэтая пасада анічога не дае яму, і ён ня ў стане нічога даць ёй. Здавалася б, павінен прыйсьці іншы — зь сьвежымі сіламі і энэргіяй. А чалавек чапляецца за пасаду, таму што вакол — пуста, таму што ўжо не хапае энэргіі пачынаць з нуля і будаваць новую прастору зноўку.

Калі хтось марыць стаць акторам у Эўропе, ён ідзе ў агенцыю і спрабуе свае сілы. Калі хтосьці хоча стаць акторам у Беларусі, то гэта ня так лёгка, як здаецца на першы погляд. Ён павінен сам арганізаваць прастору вакол сябе. Ён павінен сам знайсьці добрага сцэнарыста, які напіша сцэнар, альбо сам напісаць сцэнар. Потым ён павінен знайсьці грошы, каб прафінансаваць выпуск фільму. Потым

ён сам павінен знайсьці іншых актораў, арганізаваць увесь вытворчы працэс, быць адначасова мэнэджарам, грымэрам, стылістам, сакратаркай і рэвізорам. Пасьля гэтага ён сам павінен арганізаваць паказы свайго фільму ў Беларусі, то бок прадаць яго. Колькі пасадаў для аднаго маленькага чалавечка, які ўсяго толькі хоча стаць акторам. А калі хаця б у адной пасадзе, напрыклад, у пасадзе стыліста, ён ня выкажа таленту, то ён ніколі ня здолее давесьці ў Беларусі, што ён — геніяльны актор. У палітыцы яшчэ горай — людзі наагул сабе не ўяўляюць, чым павінны займацца палітыкі: палітык павінен быць геніяльным ідэолягам, дырэктарам, аратарам, псыхолягам, арганізатарам, мэнэджарам, фінансістам, прадпрымальнікам, бугальтарам, рэклямным агентам, гісторыкам, мастацтвазнаўцам, філёзафам, лекарам, настаўнікам, стылістам, грымэрам, дызайнэрам, пісьменьнікам, сакратаркай, кантралёрам, крытыкам, начальнікам аддзелу кадраў, юрыстам-праваабаронцам з глыбокім веданьнем законаў, журналістам, адміністратарам, перакладчыкам, лінгвістам, палітолягам, сацыёлягам, праграмістам, выведнікам і яшчэ немаведама кім. Мала таго, мяркуецца паводле змоўчаньня — і грамадзтва ад палітыка гэтага чакае, — што ўсе гэтыя функцыі ён будзе выконваць сумленна і цалкам бескарысьліва. То бок ён павінен быць геніем-шматстаночнікам. Дык ці варта дзівіцца, што пасьля ўсіх подзьвігаў, усіх прафэсіяў, якія вымушаны асвоіць гаротны, каб стаць беларускім палітыкам, ён пасьля гэтага крыху не ў сабе?

5. Па сутнасьці, калі палітык жадае падняцца ў Беларусі на наступную прыступку ў сваёй кар'еры, ён *гэтую прыступку павінен сьпярша пабудаваць сваімі рукамі*, а толькі потым на яе крочыць. Але ня будзем забывацца, што палітыка — гульня камандная. Калі ён задумваецца пра тое, зь якой камандай ён ідзе наперад, то ён павінен нацягаць цэмэнту і для прыступак у кар'ернай лесьвіцы сяброў сваёй каманды, паклапаціцца пра тое, як разьвіваць іхныя здольнасьці і таленты, дзе ім лепш знайсьці выкарыстаньне. А інакш — усе будуць таптацца на адной прыступцы, ствараць штурханіну, а ў натоўпе — сваркі, канфлікты, непаразуменьні...

6. *Палітык як «Тэрмінатар».* Звычайныя беларусы праз адсутнасьць палітычнай культуры і амаль адсутнасьць палітыкаў, успрымаюць апошніх як «тэрмінатараў» — сьветлы герой-адзіночка, які змагаецца з абсалютным злом, абсалютна ідэальны змагар. А навошта такому Герою памагатыя? Барацьба Тэрмінатара — гэта заўсёды барацьба аднаго. Вось чаму мае аднаклясьнікі сядзяць дома і гадуюць дзяцей — у чаканьні, што прыйдзе сьветлы Герой, Прынц на кані, Бог, Іншаплянэтнік (непатрэбнае выкрасьліць) і зьменіць сытуацыю да лепшага.

7. *Людзі ў Беларусі — максымалісты.* Яны адмаўляюцца даваць палітыку права на памылкі. Альбо палітык абсалютна добры, альбо абсалютна кепскі. Абсалютна добраму палітыку — *Тэрмінатару, як казалася вышэй,* — няма сэнсу дапамагаць, ён усё адолее і сам. А калі не адолее, то тым больш ня варты ён быў вашай падтрымкі. А калі палітык — абсалютны нягоднік, то хто ж такому дапамагаць будзе? Гэта вельмі зручная філязофія, таму што яна ў любым

выглядзе прапануе пасіўнасьць і бязьдзейнасьць для звычайнага чалавека.

8. *Зацыкліліся на маштабах.* Любы беларус так ці іначай спрабаваў сябе ў палітыцы — любой. І ў любога штосьці ня выйшла. Але часьцей за ўсё ня выйшла з адной вельмі простай прычыны — хочацца адразу ўсяго і шмат. Альбо адразу мільён даляраў, альбо нічога. Людзі ў палітыцы ня звыкліся працаваць крок за крокам — кожны дзень, каб дайсьці да выніку паступова. Гэта нечым нагадвае чаканьне некаторых жанчын ад патэнцыйнага мужа: «Каб ня піў, не паліў, каб заўсёды кветкі дарыў…», і якія ў адказ могуць прапанаваць толькі… сябе. Прычым, паводле змоўчаньня, яна — найлепшая, і ёй трэба аніяк ня менш за прынца з каралеўствам у дадатак. Таму і выходзіць, што прыходзіць чалавек у палітыку, прапанаваць яму яшчэ няма чаго, а чаканьні завышаныя, плюс адсутнасьць самакрытычнасьці. Як вынік — мноства расчараваных людзей, якія ў палітыцы не ўтрымаліся. Таму гэты стэрэатып будзе блякаваць вельмі многіх, у прынцыпе добрых і вартых людзей, ад удзелу ў палітыцы…

Але калі такая сытуацыя вакол, то чаму я ўдзельнічаю?

1. *Неабходнасьць улады і ўплыву ў людзей яшчэ ніхто не адмяняў.*

Я страшна не люблю, калі мае справы хтосьці вырашае за мяне. Мне не падабаецца, калі хтосьці дэкляруе рэцэпт абсалютнага шчасьця для ўсіх. Я ў палітыцы, бо я жадаю мець уладу, каб такіх «рэцэптаў» больш ніхто не ажыцьцяўляў. З другога боку, мне падабаецца бачыць, як працуюць мае ідэі — як штосьці мяняецца вакол дзякуючы мне. І я за тое, каб у любога чалавека было права — вырашаць самаму, кім быць і што рабіць.

2. *Сёньня закладаецца падмурак будучай Беларусі.*

Але тыя праекты будучай Беларусі, што ёсьць, мне не падабаюцца, я не жадаю жыць у такой Беларусі. Мне не падабаецца Беларусь Лукашэнкі, але, хай даруюць мне некаторыя дэмакраты, іх Беларусь мне таксама не падабаецца. Гэтае пытаньне нельга пускаць на самацёк — нельга даваць людзям права вырашаць за мяне і безь мяне. Таму што я ўжо ведаю, што вынік мне не спадабаецца. Ён ня ўлічыць маіх інтарэсаў і маіх ведаў. Таму што безь мяне.

3. *Хтосьці павінен быць першым*, каб паказаць, што так можна, так можа быць. Права быць іншым — вельмі важнае права, якое адсутнічае ў нашым постсавецкім грамадзтве. І за гэтае права таксама трэба змагацца. Але нават калі чалавек выбірае «фунфырык», а не мяне, то трэба даць яму права гэтага выбару…

## ЮРАСЬ МЕЛЯШКЕВІЧ

Каб даць адказ на гэтае пытанне, трэба разглядаць не столькі індывідуальны шлях кожнага асобнага моладзевага актывіста, а найперш засяродзіць увагу на тых умовах, у якіх апынуліся прадстаўнікі майго пакалення пасля таго, як Беларусь атрымала незалежнасць, а разам з ёй і ўсе неабходныя атрыбуты незалежнай дзяржавы — дзяржаўную беларускую мову, нацыянальныя сімвалы і г. д. Менавіта пад уздзеяннем гэтых чыннікаў фармавалася свядомасць новай генерацыі беларусаў, якія ідэнтыфікавалі сябе як прадстаўнікі незалежнай дзяржавы. Гэтае пакаленне найперш адчувала сябе грамадзянамі Беларусі, адрозна ад папярэдніх пакаленняў «саветызаваных» беларусаў альбо пазнейшых пакаленняў, якія ўжо былі моцна закранутыя лукашэнкаўскай прапагандай.

Важным чыннікам, які забяспечваў удзел маладога пакалення ў грамадскім жыцці краіны, была наяўнасць вялікіх агульнарэспубліканскіх недзяржаўных моладзевых арганізацыяў, большасьць якіх была нацыянальная па духу і палітычна ангажаваная (напрыклад, «Малады фронт», Задзіночанне беларускіх студэнтаў і іншыя). Дзякуючы гэтым арганізацыям моладзь далучалася да беларускасці і стварала моладзевую альтэрнатыўную субкультуру на яе аснове. Для гэтага было зроблена шмат, дастаткова згадаць курсы «Ды-джэй Адраджэння», якія ахапілі сотні людзей ва ўсёй Беларусі.

Таксама можна згадаць пра тыя адносна невялікія суполкі, якія займаліся ў большай ступені грамадскімі справамі, культурай, экалогіяй. У іх шэрагі ўлілося шмат моладзі, якая ў патрэбны момант аказвала вялікую падтрымку палітычным партыям сваім чалавечым рэсурсам — валанцёрамі і актывістамі падчас выбараў. Гэта ў значнай ступені дазваляла падвысіць мабільнасць палітычных партый, забяспечвала прыток новых сяброў у іх склад. А таксама ў нейкай ступені гэты працэс быў часткай іх «кадравай палітыкі».

Трэба зазначыць, што падобны шлях ад моладзевай арганізацыі да палітычнай партыі даволі часта прасочваецца ў біяграфіях партыйных кіраўнікоў, што сведчыць пра эфектыўнасць такой практыкі. Да таго ж гэта дазваляе захоўваць моладзь у грамадска-палітычным жыцці. Звычайна пасля некалькіх гадоў дзейнасці ў межах НДА маладыя людзі губляюць цікавасць да яе, перш за ўсё таму, што з'яўляюцца іншыя жыццёвыя прыярытэты, а таксама таму, што за некалькі гадоў працы ў НДА можна дасягнуць «столі» ў сваёй дзейнасці. У той жа час як удзел у палітычных партыях адкрывае новыя магчымасці для самарэалізацыі і дадае новыя мэты.

---

***Юрась Меляшкевіч*** *— малады палітык, кіраўнік камісіі па пытаньнях экалёгіі і наступстваў катастрофы на ЧАЭС Сойму Партыі БНФ.*

Трэба сказаць і пра вялікую ролю сямейнага выхавання, якое шмат у чым закладае ў дзецях тую мадэль паводзінаў, якая будзе рэалізоўвацца ў час сталення. Як правіла, у бацькоў з актыўнай жыццёвай пазыцыяй дзеці з большай ахвотай далучаюцца да грамадзкіх арганізацый, яны адказней ставяцца да таго, што адбываецца ў краіне, гатовыя ахвяраваць сабой для дасягнення пазітыўных зменаў. На жаль, гэта зусім не характэрныя паводзіны для большасці беларусаў. У нашых сем'ях бацькі выхоўваюць дзяцей на прынцыпах «жыць як усе» і «задавольвацца малым». Таму крытычнае стаўленне да рэчаіснасці хоць і артыкулюецца, але вельмі рэдка цягне за сабой «актыўную фазу», калі за словам ідзе справа. Тыя ж з прадстаўнікоў маладога пакалення, хто мае большыя патрэбы і гатовы энергічна шукаць спосабаў іх задавальнення, звычайна рэалізуюць сябе ў бізнесе. А правілы гульні ў беларускім бізнесе ўжо даўно вызначаныя, і ніякая грамадзянская актыўнасць не вітаецца, а палітычная ангажаванасць разглядаецца як фактар рызыкі. Дылема простая: альбо бізнес і поўная лаяльнасць уладзе, альбо палітыка і рэпрэсіі з боку рэжыму. І таму я не здзіўляюся, чаму з ліку маіх аднакласнікаў я не ведаю ніводнага, хто б абраў сабе шлях палітыка ці грамадскага дзеяча.

Наступнае, пра што хачу сказаць, гэта адказнасць. Мала людзей гатовыя браць на сябе адказнасць і весці за сабой іншых, прапаноўваць новыя шляхі развіцця краіны і пасля даваць справаздачу тым, хто галасаваў за цябе. Такая сітуацыя здарылася таму, што ўся палітыка сённяшніх уладаў накіраваная на максімальнае пазбаўленне людзей ад неабходнасці прымаць самастойныя рашэнні. Таму людзі часта ўспрымаюць неабходнасць прымаць рашэнне як цяжкі абавязак. Адказнасць, якая наступае разам з прыняццем рашэння, страшыць іх.

Але я бачу вялікую мадэрнізоўную сілу ў сённяшняй моладзі, якая зрабіла самыя гучныя і запамінальныя падзеі апошніх гадоў. Я лічу, што моладзь, якая бараніла Плошчу ў 2006 годзе, вытрымала рэпрэсіі і ціск, здолее ў бліжэйшай будучыні забяспечыць перамогу дэмакратыі ў Беларусі і зробіць нашую краіну Свабоднай.

## МІХАСЬ ПАШКЕВІЧ

Штодзень у горадзе, у метро, дзе-нідзе па працы я сустракаюся з былымі аднакласнікамі або аднакурснікамі. Іх у мяне багата — толькі ў роднай Бярозе я змяніў дзве школы з трох. Пасля — менскі Ліцэй БДУ, гістфак БДУ. Калегі па паступленню ў ЕГУ, аднакурснікі часоў узнаўлення ў БДУ, знаёмцы па алімпіядах, спартовых секцыях, курсах. Сацыяльныя сецівы таксама робяць свой унёсак — адвечнае «Здароўкі! Як справы? Усё змагаешся?». Ні для кога не сакрэт, чым я цікаўлюся й займаюся з 13 год. За невялікім выключэннем — прыблізна палову жыцця.

*Я актывіст.* Усё сваё больш-менш сталае жыцё я актыўнічаю. *Я заўсёды «выступаў», падбухторваў, нарываўся.* У садку маці пастаянна выслухоўвала заўвагі. Так, палова групы збегла купляць марозіва праз дзірку ў плоце. Здагадайцеся, хто падгаварыў. У школе мяне называлі дзёрзкім і непаслухмяным — мала хто мог пярэчыць настаўнікам. Мала хто мог мэтанакіравана зрываць урокі, прафесіянальна загаворваючы зубы і правакуючы настаўніка на жорсткі дыялог. На бацькоўскіх сходах пасля бацькі маіх аднакласнікаў доўга не маглі зразумець, чаму мая маці пасля застаецца на сур'ёзную размову — я ж быў выдатнікам. Маці штогод выслухоўвала парады, каб дома бацька «паадбіваў рогі малалетняму шкодніку». Але не выганялі — алімпіяднік-выдатнік не самы горшы вучань пры любым раскладзе.

У 13 год я перайшоў у іншую школу, там я добра вывучыў ангельскую, знайшоў новых сяброў і стаўся адным з першых «маладафронтаўцаў» у горадзе. Нас было трое. Найстарэйшаму 15. Пра рэпрэсіі толькі чулі. Чулі пра зніклых палітыкаў. Прозвішчы дзейных палітыкаў нам нічога не гаварылі. Адно з іх, праўда, назаўжды засела ў галаве — Скочка. Маціна сяброўка штосьведала пра гэтага маладафронтаўца, і таму як прыклад таго, што можа здарыцца прыводзіла гэтае імя. Карацей, баяліся вельмі, але саматужна друкавалі першыя ўлёткі, малявалі графіці і, наогул, рабілі не самыя легальныя рэчы. І жыццё ўжо імкліва несла мяне наперад да пераменаў. І праблемаў.

Чаму? Гэта ўсё Караткевіч. «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак альшанскі», «Ладдзя роспачы». «Данута» Аляксея Карпюка. «Шляхціц Завальня» Баршчэўскага. Купала. Колас. Беларуская літаратура ва ўсім яе багацці сталася адным з найулюбёнейшых прадметаў у школе. Юнацкі максімалізм пакрысе знайшоў рэчышча для самарэалізацыі. Без рускай і сусветнай прозы таксама, вядома, не абышлося. І яе, безумоўна, я чытаў значна больш, чым беларускую.

---

***Міхась Пашкевіч** — актывіст моладзевай арганізацыі АГП, адзін з асуджаных у «працэсе 14-ці».*

Аднак адпачатку ўсведамленне сябе як беларуса, як актывіста, як таго маладзёна, які проста абавязаны дзейнічаць, складвалася пад уплывам літаратуры. Калі школьныя настаўнікі толькі казалі, «як мы ў вашыя часы раслі на прыкладах літаратурных герояў», то я ўжо дзейнічаў. 13 год — гэта вельмі рана для нармальнай палітыкі. Але на той момант я падумаў — калі той жа «легендарны» Гайдар ў 16 год палком камандаваў, то ў 14 кіраваць суполкай МФ таксама нядрэнна.

Такім чынам, *першая прычына, чаму я стаўся актывістам — літаратура.* Як сказана ў Біблії, «адпачатку было Слова». І гэта было насамрэч так.

**Прэса.** Свабодная, розная, тэле- і радыё, друкаваная. З пачатку 90-х я яскрава памятаю адзін момант — бацька выпісваў больш прэсы, чым увесь пад'езд. «Белорусский рынок», «Навіны», «Частная собственность», «Свабода», «Пагоня», колькі яшчэ расейскіх, беларускіх, назвы якіх я зараз і не памятаю, плюс дзяржаўныя і абласныя. Што-што, а на інфармацыю, абавязкова з розных крыніц, бацька грошай не шкадаваў. Я любіў глядзець навіны. Таксама розныя. Але газета «Навіны» аднойчы назаўжды ўелася ў памяць. Матэрыял пра нейкія затрыманні з фотарэпартажам.

Я не вылазіў з чытальнай залы бібліятэкі. Часопісы й газеты, асабліва расейскія і ўкраінскія, палітычныя выданні. Мае аднагодкі мала цікавіліся чымсьці, апроч спорта, таму калі слухалі мяне, горача спрачаліся. Мы ўжо тады пачалі жыць у розных краінах. Але і пасля яны ўжо не так аднабакова ўспрымалі паўсядзённасць. Свабодная прэса — яна шмат чаго вартая…

**1994 год.** У той год я ўпершыню пачуў пра «вашывых блох», «спекулянтаў», «варугаў-бізнэсмэнаў».

Так ён называў майго бацьку. Бацька толькі-толькі кінуў медыцыну (быў урачом) — маладая растучая сям'я патрабавала выдаткаў. Я амаль не бачыў яго дома. Увечары стомлены з'яўляўся, засынаў, а калі я ў выпраўляўся ў школу, яго ўжо не было дома. Працалюбівы і мэтанакіраваны чалавек, бацька і на гэтым шляху стаўся паспяховым. Для мяне ён стаў прыкладам працаздольнасці. А з БТ казалі, што ён «спекулянт«. І сябры па двару казалі, што іх бацькі галасуюць за «рабацяшчэга, з народу». Мае бацькі галасавалі за Шушкевіча і Пазьняка. Абараняючы ў дваровых гутарках выбар бацькоў, я сам выявіўся больш заўзятым прыхільнікам «дэмакратаў», чым яны. Выбар бацькоў акрэсліў і мае погляды. І калі хтось — ці то ў школе, ці тое проста ў двары называў прадпрымальнікаў «спекулянтамі» — ён крыўдзіў і мяне. Так я перастаў паважаць уладу, якая зневажае сваіх грамадзян. Бацькі не звярталі на тое ўвагі. А я звяртаў. І пярэчыў.

**Гісторыя** ад юнацкай зацікаўленасці да 6 курса гістфаку. Яна сталася яшчэ адным рухавіком. Я добра ведаў і сусветную, і беларускую гісторыю. Але сам факт, як грэбліва да яе іншым разам ставіліся настаўнікі, аднакласнікі. «Гісторыя Беларусі? Ты пра што?» — і гэта здзіўляла. Зараз я глыбока перакананы, што ад таго, як у школе падаецца гуманітарны цыкл, і гісторыя ў першую чаргу — залежыць фармаванне нацыі. Стаўленне чалавека да жыцця закладваецца і праз прызму гісторыі ў тым ліку. Гэта не значыць, канешне, што, маўляў, толькі

гісторыя і ўсё. Не. Але ў гэтай краіне, дзе чытанне твораў Міколы Ермаловіча прыроўніваецца да дзівацтва, вывучэнне гісторыі ёсць адной з лакмусавых паперак для выяўлення стаўлення чалавека да палітыкі і наогул беларушчыны. Асабіста мяне само вывучэнне гісторыі Беларусі безупынна правакавала на дзейнасць. Я бачыў слушныя прыклады. Я захапляўся. І рамантызм, вынесены з урокаў літаратуры, узбагаціўся факталагічным матэрыялам. Зараз я мог не толькі крытыкаваць нешта. Зараз я мог даказаць навукова шматлікім скептыкам, чаму ў гэтай краіны ёсць будучыня.

**Паплечнікі.** Шмат хто з маіх сяброў дапамагалі мне ва ўсім. Мажліва, гэтыя першыя поспехі «партбудаўніцтва» і далі надзею на новы поспех. Усё атрымалася не зусім лёгка, канечне. Аднак у масштабах маленькага гарадку два дзесяткі актыўных юнакоў, што беспакарана наносілі графіці, раскідвалі газеты, ставілі «на вушы» школы — гэта шмат чаго варта. Зараз шмат хто з іх і думаць забыўся пра тыя гады. Але на той момант яны ў мяне паверылі. Яны і зараз пры сустрэчы апускаюць вочы, маўляў, сам усё разумееш, чаму зараз аніякай палітыкі. Але што казаць. Дзякуй і за тыя гады. Першая мая каманда была і ёсць для мяне прыкладам маленькага паспяховага «teambuilding». Першыя маленькія перамогі ўзрушвалі.

Міліцыя апускала вочы. Сваякі, родныя, сябры — я бачыў амаль адзінагалосную, хай сабе і маўклівую, падтрымку. У маёй школе ці не палова ведала, чым я займаюся. Да мяне часта падыходзілі і хлопцы больш сталага ўзросту, цікавіліся, выказвалі павагу. Як кажуць, усе ўсё разумелі. І гэта — ціхая грамадская падтрымка — яна давала сілы.

Так усё пачыналася. Гэта была, як бы мовіць, матывацыя першасная. І самая шчырая.

**Я прафесійны актывіст.** Прынамсі, апошнія пару год. І, безумоўна, матывацыя змянілася. З’явілася дадатковая, другога, так бы мовіць, узроўню. У бліжэйшай і далёкай будучыні я безумоўна бачу сябе як палітыка, як мэнэджэра-кіраўніка. І, адпаведна, саманастрой, які ў мяне ёсць, дай Бог кожнаму. Я на 100 адсоткаў упэўнены, што ўсё будзе добра. Я веру ў перамены. Можа, паступовыя. Можа, не такія відавочныя. Але яны ёсць.

Я ўпэўнены, што тыя працоўныя моманты, якія даводзіцца вырашаць, будуць мне ж самому на карысць у будучыні. Нават калі я буду займацца не палітыкай. Досвед кіравання моладзевай арганізацыяй. Досвед матывацыі іншых актывістаў. Досвед дзеяння ва ўмовах, набліжаных да баявых. Досвед напісання артыкулаў. Досвед праваабароны. Хуткае рэагаванне. Развіццё рэакцыі.

Тыдзень таму я набыў падручнік па кіраванню чалавечым рэсурсам. Гэта не першы дапаможнік, які я набыў. Я займаюся самадукацыяй як ніколі. Працуючы на звычайнай фірме, я б так не стараўся. Гэта факт.

Я ўпэўнены, што і ад маёй добра выкананай работы зменіцца расклад сілаў. Я ўпэўнены, што перфекцыянізм як паветра неабходны кожнаму кіраўніку, каардынатару. Кожны мусіць ведаць, што ягоны ўчастак работы асноўны. Ад добра выкананых дэталяў пачынае змяняцца стратэгічны расклад. Гэта таксама матыў.

Вядома, не апошнюю ролю адыгрывае прага поспеху. Шмат хто гэтага саромеецца. Чаму? Гэта цалкам натуральнае жаданне. Менавіта прага поспеху і выступае часцяком галоўным рухавіком прагрэсу. Хтосьці гэта называе славалюбства. На мой погляд, не лепшы назоў.

Я не ведаю, чаму мае аднакласнікі-аднакурснікі не сталі актывістамі. Кожнага з нас па-рознаму выхоўвалі. У кожнага з нас нават продкі розныя. У мяне быў прадзед-палітвязень. У цэнтры Бярозы дагэтуль стаяць рэшткі канцлагеру ад польскіх часоў, дзе ён сядзеў. З мясцовых мала хто сядзеў там. Большасць з неўразуменнем касавурылася на заезджых вязняў-дзівакоў, што брукавалі местачковыя вуліцы. Яму пашчасціла меней і пасля — вайна, партызанка, і новы тэрмін, ужо ў савецкім лагеры. Гэта гены. І гэта шмат што тлумачыць. Мы па рознаму глядзелі на штодзённую рэчаіснасць. Мы рознага дамагаемся ад жыцця ў прынцыпе. І гэта нармалёва.

Я не ведаю, чаму не ўсе мае аднакурснікі сталі актывістамі. Хоць шмат хто з іх быў са мной на Плошчы. Мы стаялі ў ахове Аляксандра Мілінкевіча, мы падбадзёрвалі адзін аднаго гучнымі крычалкамі, мы датрымаліся разам цягам усіх сумесных цяжкасцяў. Але пасля гэтых веснавы наплыў знік. І гэта нармалёва. І шмат каго з іх зараз у палітыку не дазавешся. Усё. У сакавіку 2006 года яны выканалі свае абавязкі перад Радзімай. Выбачайце, спадары палітыкі, больш не пойдзем. І гэта йзноў жа нармалёва. Шмат хто з іх і дагэтуль лічыць, што палітыка — гэта прыватныя гульні лідэраў. Шмат з іх і дагэтуль мяркуе, што іх папросту выкарыстоўвалі. Уласнай зацікаўленасці так і не з’явілася. Так таксама бывае. І гэта не віна тых людзей, хто іх загітаваў.

Проста ў кожнага свой шлях. Свой выбар. І потым, давайце падумаем, што было б, калі б хаця б палова нашых аднакласнікаў стала актывістамі. Мне падаецца, свет бы з’ехаў з глузду. Хтосьці ж мусіць быць звычайным абывацелем, ці не так?

## АНАЛІТЫКА

ІРЫНА ВІДАНАВА

# «Новыя СМІ» як форма моладзевага супраціву

Дзвюма найбольш пазітыўнымі і магутнымі тэндэнцыямі ў апазіцыі за апошнія некалькі гадоў было ўзнікненне «новых СМІ» і рост актыўнасці моладзі. Гэтыя тэндэнцыі пэўным чынам узаемазвязаныя, і важна зразумець характар гэтай узаемасувязі. У гэтым артыкуле я спынюся на чатырох галоўных пунктах судакранання паміж імі. Па-першае, «новыя СМІ», або інтэрнет-СМІ, — адна з вельмі нешматлікіх сфер, у якіх дэмакратычная апазіцыя яўна пераўзыходзіць рэжым. Па-другое, «новыя СМІ» — гэта сфера, у якой дамінуе і ход развіцця якой вызначае моладзь. Па-трэцяе, «новыя СМІ» — гэта не толькі перспектыўная і ўплывовая крыніца незалежнай інфармацыі, але і істотная форма актыўнасці ды супраціўлення рэжыму. І нарэшце, «новыя СМІ» — найбольш эфектыўны сродак, якім карыстаецца моладзь для залучэння як мага большай колькасці сваіх аднагодкаў шэрагі дэмакратычнай апазіцыі.

---

***Ірына Віданава*** *выкладала гісторыю ў Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце і Ліцэі пры БДУ. У 1998 г. стала галоўным рэдактарам адзінага ў Беларусі незалежнага моладзевага часопісу «Студэнцкая думка». Гісторык па адукацыі, у 2006 г. яна атрымала ступень магістра грамадзкай палітыкі са спэцыялізацыяй у мэнэджмэнце некамэрцыйных арганізацыяў і міжнароднай палітыцы ва ўнівэрсытэце Джонса Гопкінса. Падчас навучаньня ў ЗША працавала ў двух вядучых дасьледчыцкіх інстытутах. Піша артыкулы на моладзевую праблематыку, праводзіць сацыялягічныя дасьледаваньні моладзевай думкі ў Беларусі. У «ARCHE» друкаваўся яе аналіз «Апантаныя надзеяй: Беларуская моладзь пасьля выбараў 2006 г.» (10/2007).*

## НОВЫЯ СМІ ЎРАЖВАЮЦЬ

З прычыны рэпрэсій з боку рэжыму традыцыйныя друкаваныя СМІ, якія прытрымліваюцца альтэрнатыўнага пункту гледжання, зведалі істотны заняпад. Адны з іх спынілі выхад, тыражы іншых упалі ці працягваюць падаць. У той жа час папулярнасць сеткавых выданняў, у тым ліку інтэрнет-версій незалежных газет, такіх, як «Наша Ніва», няспынна расце. Заснаваная менш як два гады таму штодзённая інтэрнет-газета «Ежедневник», якая рассылаецца чытачам па электроннай пошце ў фармаце PDF, мае ўжо больш за 46 000 падпісчыкаў. Змушаныя пад ціскам рэжыму сысці ў інтэрнет, многія выданні адказалі на гэты выклік надзвычай дастойна. Яны здолелі стаць нашмат больш наватарскімі і дзейснымі, чым іх дзяржаўныя канкурэнты.

Варта толькі глянуць на дадзеныя інтэрнет-статыстыкі, каб убачыць безумоўную перавагу апазіцыйных «новых СМІ». У трыццатцы найбольш папулярных інфармацыйных вэб-вузлоў (http://top.akavita.com/Mass_Media_and_News) пятнаццаць рэсурсаў звязаныя з дэмакратычнай апазіцыяй. «Белорусские новости», «Хартыя-97» і «Белорусский партизан» больш папулярныя за дзяржаўныя медыявузлы. Сярод апошніх у памянёную трыццатку трапілі толькі «Советская Белоруссия», БелТА і «Вечерний Минск». Адзіны рэгіянальны інфармацыйны партал у спісе — «Народныя навіны Віцебска» (http://news.vitebsk.cc) — робіцца групай дэмакратычных актывістаў і журналістаў. Калі «Хартыя-97» і «Белорусские новости» ўзначальваюць сотню найбольш папулярных сайтаў у Беларусі (http://www.e-belarus.org/news/200805201.html), то з дзяржаўных рэсурсаў тут можна знайсці толькі адзін — вузел Беларускага гідраметцэнтра Pogoda.by.

Дзесяткі мясцовых няўрадавых арганізацый і незалежных газет маюць уласныя сайты і часам з'яўляюцца больш папулярнымі крыніцамі інфармацыі, чым мясцовая дзяржаўная прэса і яе вэб-старонкі. Хоць рэжыму ўдаецца кантраляваць тэлебачанне і радыё, незалежныя беларускія тэле- і радыёстанцыі вяшчаюць з-за мяжы. Інфармацыйныя сайты дзвюх з іх — радыё «Свабода» і «Еўрапейскага радыё для Беларусі» — таксама знаходзяцца ў трыццатцы найпапулярнейшых. Між тым, у ёй няма ніводнага вузла дзяржаўных электронных СМІ.

## МОЛАДЗЬ НА ПЕРАДАВОЙ

Не павінен стаць сюрпрызам той факт, што рухавіком апазіцыйных «новых СМІ» з'яўляецца моладзь. Хоць галоўныя рэдактары большасці вядучых апазіцыйных інтэрнет-старонак дасягнулі паўналецця яшчэ ў 1990-я ці раней, ядро тэхнічных і творчых работнікаў такіх рэсурсаў складае моладзь. Вэб-майстры, дызайнеры, праграмісты, фатографы, вядучыя інтэрнет-дзённікаў і рэдактары «новых СМІ» належаць пераважна да пакалення маладых.

Сярэдні ўзрост журналістаў і дыск-жакеяў «Еўрапейскага радыё для Беларусі», напрыклад, 21—22 гады; у цэлым тэхнічны персанал гэтай радыёстанцыі не старэйшы за 26 гадоў. Большасць рэгіянальных вэб-вузлоў, у тым ліку папулярныя

«Народныя навіны Віцебска», Horki.info і Zhodzina.info, робяць актывісты ва ўзросце да 30 гадоў.

Рэжым усведамляе, што прайграе інтэрнет-змаганне. Цяпер уступае ў сілу новы закон, які прадугледжвае кантроль над інтэрнетам. Таксама рэжым разумее сувязь паміж «новымі СМІ» і моладдзю. Першай судовай справай, распачатай супраць «новых СМІ», быў працэс над удзельнікамі моладзевай ініцыятывы «Трэці шлях», якія на сваёй інтэрнет-старонцы размясцілі мультфільмы з «абразай» Лукашэнкі. Гэты працэс быў ужыты як нагода для нядаўніх сакавіцкіх рэйдаў супраць беларускіх незалежных СМІ.

## НА ВАСТРЫІ ЛЯЗА

Моладзь таксама з'яўляецца рухальнай сілай для інавацый у медыясферы, дзе яна стварае унікальныя праекты і дастасоўвае найноўшыя тэхналогіі да патрэб беларуска- і расійскамоўных інтэрнет-карыстальнікаў. Адрозна ад сваіх старэйшых калег, большасць маладых беларускіх журналістаў вельмі дасведчаныя ў тэхнічных сродках мультымедыя — яны могуць рабіць рэпартажы, выкарыстоўваючы аўдыё-, відэа- і інтэрнет-тэхналогіі. Два гады таму рэдакцыя аднаго закрытага ўладамі друкаванага часопіса пачала выпускаць першы беларускамоўны мультымедыйны моладзевы часопіс, распаўсюджваючы яго на кампакт-дысках.Ператварэнне друкаванага выдання ў мультымедыйнае толькі паспрыяла росту яго папулярнасці і прывабнасці сярод моладзі, якая цягнецца да сучасных тэхналогій. Апрача тэксту і ілюстрацый, фармат кампакт-дыска дазваляе выкарыстоўваць відэа, гукавое і музычнае суправаджэнне, флэш-анімацыю. Аб'ём кожнага выпуску на кампакт-дыску таксама значна большы і ўжо не абмяжоўваецца сарака друкаванымі старонкамі. Кампакт-дыскі лёгка чытаюцца, капіююцца і распаўсюджваюцца на любым камп'ютэры, таму выданні такога роду могуць разыходзіцца ў неабмежаванай колькасці копій.

Летась група маладых аўтараў сеткавых дзённікаў і праграмістаў стварыла рэсурс 101blog.net, які аўтаматычна аналізуе каля 11 тысяч найбольш папулярных беларускіх інтэрнет-дзённікаў. Вэб-вузел дазваляе сачыць за найбольш папулярнымі навінамі, людзямі і абмеркаваннямі ў шырокай беларускай супольнасці аўтараў сеткавых дзённікаў. Маладымі актывістамі з Цэнтра інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятываў «Трэці сектар» (няўрадавая арганізацыя з Гродна) была заснаваная адна з першых беларускіх інтэрнет-радыёстанцый «Твой стыль» (http://t-styl.info).

## МАЛАДЫЯ І ВІРТУАЛЬНЫЯ

Віртуальная актыўнасць стала неад'емнай часткай беларускай рэальнасці, асабліва калі гаварыць пра сучаснае «лічбавае» пакаленне. Згодна са статыстыкай за снежань 2006 г., 32 % працаздольнага насельніцтва Беларусі рэгулярна карыстаюцца інтэрнетам. Больш як палова з гэтых людзей маладзейшыя за трыц-

цаць гадоў. Як паведамляе беларускае Міністэрства статыстыкі і аналізу, калі ў 2000 г. у Беларусі налічвалася толькі два камп'ютэры на 100 сямей, у 2007 г. гэтая лічба вырасла да 26. Для сем'яў з дзецьмі ва ўзросце да 18 гадоў гэты паказчык яшчэ вышэйшы і дасягае 40 персанальных ЭВМ на 100 хатніх гаспадарак. Доля інтэрнет-карыстальнікаў ва ўзросце ад 16 гадоў і старэйшых вырасла з 16,2 % у 2006 г. да 20,7 % у 2007-м, а колькасць уладальнікаў мабільных тэлефонаў летась перавысіла сем мільёнаў чалавек.

Несумненна, што большасць карыстальнікаў усіх гэтых высокатэхналагічных прылад складае моладзь. Паводле вынікаў апошніх сацыялагічных даследаванняў, студэнты ставяць віртуальную актыўнасць на другое месца па папулярнасці — яе апярэджвае толькі наведванне дыскатэк, клубаў і кінатэатраў. Хоць большасць маладых інтэрнет-карыстальнікаў разглядаюць глабальную камп'ютэрную сетку перш за ўсё як крыніцу забаваў, у час вандровак па ёй ім наўрад ці ўдаецца абысці ўвагай навіны і іншую сур'ёзную інфармацыю, размешчаную на беларускіх інтэрнет-парталах. Як паказала афіцыйнае сацыялагічнае апытанне студэнтаў дзвюх гомельскіх ВНУ, больш як траціна рэспандэнтаў лічаць інтэрнет сваёй асноўнай крыніцай інфармацыі.

Маладыя інтэрнет-карыстальнікі ўтвараюць жывую і ўплывовую супольнасць, якая распаўсюджвае незалежную інфармацыю сярод дзесяткаў тысяч чалавек і нярэдка фармуе грамадскую думку. Беларуская моладзь займае трынаццатае месца ў свеце сярод карыстальнікаў «Жывога журнала», маючы ў гэтай сістэме больш як 24 000 дзённікаў. Хоць многія эксперты сцвярджаюць, што шмат для каго з беларускіх аўтараў іх дзённікі з'яўляюцца забавай, у цэлым гэтая супольнасць не застаецца апалітычнай або пасіўнай. Аднымі з найбольш папулярных суполак сярод беларускіх аўтараў «Жывога журнала» з'яўляюцца By_politics (890 удзельнікаў), By_mova, якая аб'ядноўвае тых, хто прапагандуе беларускую мову ў інтэрнеце (850 удзельнікаў), By_trash, вядомы сваімі карыкатурамі і допісамі, што адлюстроўваюць беларускую рэчаіснасць у эпоху Лукашэнкі (631 удзельнік), Minsk_news (556 удзельнікаў), а таксама суполка Minsk1067, якая аб'ядноўвае тых, хто цікавіцца гісторыяй Мінска (410 удзельнікаў). Асабістыя дзённікі некаторых маладых палітыкаў, такіх, як Алесь Міхалевіч (http://michalevic.livejournal.com) ці Франак Вячорка (http://koziel.livejournal.com), маюць амаль тысячу пастаянных чытачоў кожны.

## З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ МАГІСТРАЛІ НА ПРЫЛЕГЛЫЯ ВУЛІЦЫ

Моладзь — гэта не толькі стваральная сіла апазіцыйнага інтэрнета, але і галоўныя яго напаўняльнікі і карыстальнікі. Віртуальная актыўнасць пры гэтым пераходзіць у рэальную. Моладзевыя лідэры выкарыстоўваюць сусветнае павуцінне дзеля лепшага кіравання сваімі арганізацыямі і для павелічэння ўплыву сваіх акцый у рэальным свеце. Пасля таго як у 2006 г. быў ліквідаваны намётавы лагер на плошчы Каліноўскага, моладзевыя актывісты знайшлі прытулак у разнастайных сеткавых суполках. Інтэрнет зрабіўся віртуальнай Плошчай, дзе ма-

ладыя актывісты гуртаваліся, заўзята камунікавалі і рыхтавалі новыя формы супрацiву. Сусветнае павуцінне з самага пачатку дапамагала актывістам пазбягаць міліцэйскіх кардонаў і пашырала аўдыторыю іх акцый.

Пасля сакавіцкага разгону адна з найбуйнейшых суполак «Жывога журнала» — Minsk_by — адыграла выключную ролю ў арганізацыі шматлікіх флэш-мобаў і ў многім вызначыла аблічча дэмакратычнага руху ў 2006 г. З таго часу яна стала яшчэ больш папулярнай, здабыўшы 4000 пастаянных чытачоў, але ўжо наўрад ці можа лічыцца платформай для медыяактыўнасці. Цяпер большасць экспертаў, актывістаў і аўтараў дзённікаў успрымаюць яе як месца бясконцых спрэчак паміж фанатамі розных вэб-праглядчыкаў, прыхільнікамі Пазняка і Мілінкевіча, лібераламі ды кансерватарамі і г. д. Вядучая роля ў генерацыі інтэрнет-актыўнасці перайшла да меншых суполак, вакол якіх гуртуюцца людзі з блізкімі інтарэсамі і каштоўнасцямі.

Адным з найбольш папулярных моладзевых рэсурсаў такога роду з’яўляецца сайт Generation.By. Ён арыентуецца на маладых людзей з яркай індывідуальнасцю, якія любяць свабоду, дасведчаныя ў новых тэхналогіях, добра адукаваныя і вызначаюцца практычным стаўленнем да жыцця. Замест марнавання часу на бессэнсоўныя дэбаты з апанентамі беларускамоўны праект Generation.By прапагандуе пазітыўнае стаўленне да жыцця, прапануе арыгінальныя арыентаваныя на моладзь матэрыялы, якія часта цытуюцца іншымі СМІ і інтэрнет-рэсурсамі, папулярызуе сучасную беларускую моладзевую культуру і стымулюе разнастайныя формы актыўнасці. Некаторыя з прадуктаў Generation.By, напрыклад, калекцыя эматыконаў з нацыянальным бела-чырвона-белым сцягам ці віншавальныя флэш-паштоўкі з Калядамі 2007 г. здабылі вялікую папулярнасць не толькі ў беларускай, а і ва ўкраінскай ды расійскай моладзі.

## МОСТ ПАМІЖ ВІРТУАЛЬНАЙ І РЭАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦЮ

Generation.By — адзін са шматлікіх праектаў, якія пазіцыянуюць сябе як «новыя СМІ», што не толькі існуюць у віртуальным асяроддзі, але і намагаюцца ўплываць на яго. Стваральнікі памянёнага сайта, яшчэ нядаўна студэнты, а сёння — маладыя спецыялісты, кажуць, што яны свядома пішуць не пра любую з’яву ў палітычным або сацыяльным жыцці Беларусі, а толькі пра найважнейшыя падзеі, абмінутыя ўвагай іншых СМІ, з акцэнтам на моладзевае і культурнае жыццё. Калі ў верасні 2007 г. выключылі з універсітэта і забралі ў армію Змітра Жалезнічэнку, Generation.By першы сярод «новых СМІ» выступіў з эксклюзіўнай інфармацыяй на гэтую тэму. Адрозна ад матэрыялаў іншых выданняў, тут Жалезнічэнка паўставаў не як ахвяра рэжыму, а як паспяховы малады чалавек з трывалымі маральнымі прынцыпамі — вобраз, вельмі прывабны для моладзі. Сайт маляваў яго як узор для пераймання — актыўны малады чалавек і выдатны студэнт, які не захацеў адмовіцца ад сваіх правоў, у тым ліку ад права гаварыць і атрымліваць загады ў войску па-беларуску, нягледзячы на парушэнні яго правоў як чалавека і грамадзяніна.

Два гады таму, калі з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта за паездку на канферэнцыю Еўрапейскага саюза студэнтаў адлічылі Таццяну Хому, Generation.By распачаў кампанію салідарнасці ў яе падтрымку. Гэта было не першае ў Беларусі адлічэнне паводле палітычных матываў, але ўпершыню ў абарону выключанай студэнткі распачалі шырокую інфармацыйную кампанію як на нацыянальным, так і на міжнародным узроўні. І гэтая кампанія была праведзеная сіламі моладзевых «новых СМІ». Дзякуючы намаганням студэнтаў-валанцёраў, якія пісалі пра Таццяну ў сваіх онлайн-дзённіках і перакладалі інфармацыю пра яе на замежныя мовы, Таццяніна справа заняла першыя месцы на старонках беларускіх, украінскіх, расійскіх ды шмат якіх еўрапейскіх выданняў.

Віртуальная інфармацыйная кампанія, праведзеная Generation.By, мела надзвычай рэальны ўплыў. Беларускія студэнты збіралі подпісы ў падтрымку Таццяны, а міжнародныя арганізацыі даслалі сотні лістоў рэктару універсітэта, у якім яна вучылася. Таццяну так і не аднавілі; хваля рэпрэсій сярод студэнтаў-актывістаў не спынілася. Але БДЭУ быў выключаны з Еўрапейскай асацыяцыі універсітэтаў, паслужлівыя бюракраты ўбачылі, што парушэнні законаў не праходзяць незаўважанымі, а беларускія студэнты натхніліся ідэяй працягваць барацьбу за справядлівасць. У красавіку 2006 г. студэнты БДЭУ адмовіліся ўдзельнічаць у «публічным пакаянні», якога рэктар патрабаваў ад іх таварышаў, заўважаных на сакавіцкіх дэманстрацыях. У сакавіку 2008 г. аўстрыйскія студэнты наладзілі пікет падчас канферэнцыі, у якой браў удзел рэктар БДЭУ (http://generation.by/news2267.html), у выніку чаго доктару Шымаву, перш чым пачаць даклад па праблемах эканамічнага супрацоўніцтва і палітычнага дыялогу паміж Беларуссю і Еўропай, давялося публічна тлумачыць, чаму ён адлічыў Таццяну Хому. Відэазапіс ягонага выступа з'явіўся шмат у якіх СМІ, у тым ліку на сайце радыё «Свабода». У красавіку 2008 г. рэктар Шымаў перадумаў і не стаў выключаць з універсітэта Людвісю Атакулаву — студэнтку трэцяга курса і актывістку «Маладога фронту», — пасля таго як у яе падтрымку падпісаліся 150 студэнтаў. Сёння Таццяна Хома працягвае навучанне за мяжой, адначасова займаецца праваабарончай дзейнасцю і супрацоўнічае з Generation.By.

У сакавіку 2007 г. беларускія аўтары сеткавых дзённікаў паспяхова правялі інтэрнэт-кампанію збору грошай пад заклад для Дзяніса Дзянісава — моладзевага актывіста і аднаго з лідэраў намётавага лагера, якога зняволілі за палітычную дзейнасць. У Гродне сеткавыя дзённікі сталі стартавай пляцоўкай для мабілізацыі гараджан на абарону помнікаў архітэктуры горада, што апынуліся пад пагрозай разбурэння падчас рэканструкцыі Старога горада. Група вядомых гродзенскіх інтэрнэт-карыстальнікаў збірала інфармацыю пра апошнія падзеі адносна так званай рэканструкцыі, публікавала яе ў сетцы і аператыўна арганізоўвала мірныя пратэсты каля помнікаў, якім пагражала разбурэнне, у рамках грамадзянскай кампаніі «Ратуйма Гродна!» (http://blog.grodno.net/categorias/istorija/spasem-grodno/).

Ужо праз некалькі дзён пасля арышту Андрэя Кіма, які адбыўся ў час мірнай дэманстрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў у студзені 2008 г., паўстала

суполка «Жывога журнала» ў яго падтрымку (http://community.livejournal.com/andrei_kim/). Апрача інфармацыі пра маладога лідэра, якому далі паўтара года турэмнага зняволення, фатаграфій і відэаролікаў з акцый за вызваленне палітычных вязняў у Беларусі, тут таксама быў змешчаны шэраг коміксаў з Андрэем у якасці галоўнага персанажа. Стваральнік гэтай суполкі і Андрэеў сябар так тлумачыў гэтую ідэю:

*Мы хочам, каб як мага больш людзей даведаліся, што Андрэй быў зняволены незаконна. Праз гэтыя матэрыялы мы хочам паказаць Андрэя высакародным, інтэлігентным і шчырым чалавекам, якім ён сапраўды і з'яўляецца.*

Пры дапамозе суполкі, што яднае больш як 150 удзельнікаў, яе аўтары штодзённа знаёмілі чытачоў з жыццём Андрэя ў Бабруйскай калоніі, ініцыявалі грамадскія кампаніі ў яго падтрымку, арганізоўвалі вулічныя пратэсты і паказы, а таксама прыцягвалі ўвагу грамадскасці да іншых палітычных вязняў.

Дзякуючы маладым актывістам інтэрнет у Беларусі — ужо не паралельная рэальнасць, адарваная ад штодзённага жыцця. Generation.By, напрыклад, вядомы сваімі «аўторкавымі сустрэчамі добрых людзей»: кожны другі аўторак тыя, хто сустракаецца на сайце, збіраюцца разам у рэальным жыцці. «Гэтай традыцыі ўжо амаль тры гады, — гаворыць адзін са стваральнікаў праекта. — Гэта магчымасць сустрэцца вельмі розным людзям у нефармальнай атмасферы, абмеркаваць апошнія навіны, падзяліцца цікавымі ідэямі. Часта такія абмеркаванні ператвараюцца ў новыя праекты». Адна з апошніх аўторкавых сустрэч адбылася адначасова ў Беларусі, Аўстрыі, Італіі і Нідэрландах. Маладыя беларусы цесна знітаваныя між сабой як у рэальным жыцці, так і ў інтэрнеце пры дапамозе дзённікаў, «Скайпа», сацыяльных сетак, сотавых тэлефонаў і іншых сродкаў камунікацыі. Інтэрнет пры гэтым служыць унікальным мостам паміж віртуальнай і рэальнай актыўнасцю.

## У ПРАВІНЦЫІ, АЛЕ НА СУВЯЗІ

Хоць «новыя СМІ» — гарадскі рух, які нарадзіўся ў сталіцы, маладыя актывісты па-за межамі Мінска не застаюцца ўбаку. Яны таксама ўзбройваюцца высокімі тэхналогіямі, каб дайсці да як мага большай колькасці грамадзян і апярэдзіць мясцовыя ўлады ў барацьбе за людскія сэрцы і байты. Адрозна ад мінскіх агульнанацыянальных «новых СМІ», мясцовыя інтэрнет-праекты звычайна ініцыююцца і ажыццяўляюцца не прафесійнымі журналістамі, а дэмакратычнымі актывістамі.

Некалькі месяцаў таму Горацкі райвыканкам займеў афіцыйны сайт, закліканы скласці канкурэнцыю апазіцыйнаму Horki.info, заснаванаму ў чэрвені 2007 г. Створаны маладымі няўрадавымі актывістамі, сайт Horki.info паспеў зрабіцца дынамічным і папулярным рэсурсам, які адыгрывае важную ролю ў мясцовым грамадскім жыцці. Найбольш рэйтынгавымі яго матэрыяламі за апошнія меся-

цы былі допісы пра візіт у Горкі дэмакратычнага лідэра Аляксандра Мілінкевіча, арганізаваны камандай Horki.info, а таксама артыкул пра сустрэчу мясцовай дэпутаткі парламента з выбаршчыкамі, якая адбылася пад уплывам адмысловай петыцыі, складзенай дэмакратычнымі актывістамі. На сустрэчы дэпутатцы задаваліся пытанні наконт рашэння ўладаў пабудаваць непадалёк ад Горак АЭС. Horki.info стаўся адным з ініцыятараў грамадскай кампаніі супраць будаўніцтва станцыі, сабраўшы пры гэтым больш як 1500 подпісаў. Сайт таксама служыць рупарам для маладога кандыдата ад дэмакратычнай апазіцыі. Horki.info — гэта не толькі інфармацыйная пляцоўка ў кіберпрасторы, але і частка рэальнай сеткі мясцовых НУА, палітычных партый і незалежных СМІ, якая ахоплівае шырокае кола праграм, накіраваных на развіццё масавай актыўнасці.

Самы папулярны рэгіянальны сайт — інтэрактыўная інтэрнет-газета «Народныя навіны Віцебска» — быў створаны групай маладых актывістаў з кола «зялёных». Цяпер гэты рэсурс мае некалькі тысяч чытачоў, больш як сотню RSS-падпісчыкаў і часта цытуецца агульнанацыянальнымі незалежнымі СМІ. Ён мае спецыяльнае пагадненне з найбуйнейшай рэгіянальнай газетай Віцебшчыны «Информ-банк», якая выходзіць тройчы на тыдзень тыражом 40 тысяч асобнікаў і рэгулярна перадрукоўвае матэрыялы з «Народных навін Віцебска».

Інтэрактыўны сайт з выразнай дэмакратычнай накіраванасцю, зарыентаваны на прапаганду масавай журналістыкі, стварыла група маладых актывістаў з Жодзіна. Але што больш важна, гэты партал з'яўляецца неад'емнай часткай іх няўрадавай ініцыятывы «Незалежная рэспубліка Жодзіна», ужо вядомай сваімі грамадзянскімі кампаніямі (http://www.zhodzina.info). Маладыя актывісты з Барысава таксама ўключылі «новы СМІ» ў сваю грамадзянскую кампанію. У маі 2008 г. валанцёры ініцыятывы «За чысты Барысаў» распаўсюдзілі сярод гараджан тысячы анкет, у якіх ім прапаноўвалася падзяліцца сваімі поглядамі наконт інфраструктуры (дарог, месцаў адпачынку і г. д.) двух галоўных раёнаў горада. Мяркуецца, што бліжэй да восеньскіх выбараў звароты з просьбамі наконт паляпшэння мясцовых умоваў будуць перададзеныя ў гарвыканкам. Адначасова з гэтым серыя фотарэпартажаў і артыкулаў пра кепскі стан гарадскіх раёнаў будзе публікавацца на сайце ініцыятывы (http://barysau.belarda.org/local_news/data/ic_87/1667).

Барысаўскі партал — частка унікальнай сеткі мясцовых сайтаў www.belarda.org, створанай камандай мясцовых актывістаў, пераважна не старэйшых за трыццаць пяць гадоў, з Беларускай асацыяцыі рэгіянальнага развіцця. Гэтая сетка аб'ядноўвае 90 рэгіянальных інтэрнет-старонак, якія поруч з навінамі ўтрымліваюць і такую карысную інфармацыю, як адрасы ды тэлефоны мясцовых органаў улады, пералік АЗС, звесткі пра змены ў рабоце транспарту і г. д., што робіць іх зручнай інфармацыйнай крыніцай для мясцовых жыхароў і прыцягвае ўвагу тых з іх, хто не цікавіцца палітыкай і мала ведае пра дэмакратычны рух.

## САМВЫДАТ XXI СТАГОДДЗЯ

Нягледзячы на ўсё большую папулярнасць інтэрнета і новых тэхналогій, віртуальная рэчаіснасць у Беларусі даступная яшчэ не кожнаму. Таму, каб быць эфектыўнымі, «новыя СМІ» павінны дапаўняцца некаторымі ранейшымі метадамі работы. Напрыклад, незалежная газета «Салідарнасць», якая пасля выключэння яе з дзяржаўнай сістэмы распаўсюджвання выходзіць у інтэрнэце, — піянер беларускага самвыдату XXI стагоддзя. Яе трансфармацыя з друкаванага выдання ў адзін з найпапулярнейшых сайтаў навін (http://www.gazetaby.com) спрычынілася да грандыёзных змен у структуры яе аўдыторыі. Цяпер «Салідарнасць», якую чытаюць пераважна маладыя інтэрнэт-карыстальнікі, што жывуць у гарадах, з'яўляецца інавацыйным лідэрам сярод «новых СМІ». Так, яна збіраецца распачаць выкарыстанне фармату PDA, што дазволіць яе чытачам атрымліваць свежыя навіны на свае мабільныя тэлефоны. Тым не менш, каб утрымаць за сабой ранейшае кола чытачоў — шахцёраў і рабочых Салігорска, рэдакцыя сайта штотыднёва рыхтуе выпуск у фармаце PDF, які спампоўваецца распаўсюднікамі, раздрукоўваецца на старонках А4 і раздаецца на працоўных месцах.

Каманду, якая рыхтуе папулярны сайт Zabej.info (http://www.zabej.info), аб'яднала любоў да футболу. Гэтыя юнакі і дзяўчаты выкарыстоўваюць інтэрнет для арганізацыі незалежных вулічных футбольных чэмпіянатаў. Першы з іх прайшоў у Мінску, цяпер настала чарга рэгіёнаў. Паколькі папулярнасць такіх чэмпіянатаў і колькасць задзейнічаных у іх каманд хутка вырасла (летась Zabej.info арганізаваў першы ў Беларусі жаночы чэмпіянат па футболе), маладыя актывісты пачалі выпускаць уласны бюлетэнь у фармаце PDF. Сёння гэта адно з найбольш прывабных і цікавых моладзевых выданняў у краіне. Хоць Zabej.info і аддае перавагу спорту перад палітыкай, гэтая ініцыятыва адкрыта выступае супраць дзяржаўнай сістэмы размеркавання і рэгулярна публікуе крытычныя артыкулы па розных аспектах дзяржаўнай моладзевай палітыкі.

## ЧАМУ ЎСЁ ГЭТА ВАЖНА

Сувязь «новых СМІ» і моладзі важная з наступных прычын.

- «Новыя СМІ» — з'ява будучыні, і толькі маладыя могуць сапраўды зазірнуць у яе. Таму яны ўжо лідэры ў гэтай сферы. Старэйшае пакаленне дэмакратычных актывістаў, як і ідэолагі рэжыму, толькі стараюцца паспець за імі ў віртуальным свеце.
- Дзякуючы ядру з творчай і таленавітай моладзі «новыя СМІ» выходзяць пераможцамі ў сеткавай інфармацыйнай вайне. Дагэтуль рэжыму амаль ніяк не ўдалося перашкодзіць «новым СМІ».
- Тады як «бацькі» дэмакратычнай апазіцыі наўрад ці могуць прывабіць беларускіх «сыноў», «новыя СМІ» прыцягальныя для маладых. Калі нават пакінуць убаку палітыку, ужо сам інтэрнет цікавы для моладзі. Адрозна ад перманентна раз'яднанай апазіцыі «новыя СМІ» — адна з нямногіх рэчаў у Беларусі, якая

можа аб’яднаць маладых людзей і натхніць іх. Паводле слоў стваральнікаў Generation.By, толькі некалькі ўдзельнікаў гэтай супольнасці, што налічвае некалькі соцень юнакоў і дзяўчат, належаць да нейкага палітычнага руху. Большасць складаюць музыканты, фатографы, дызайнеры, спецыялісты ў сувязях з грамадскасцю і простыя студэнты, якія хочуць зрабіць нешта новае для сябе, сустрэць цікавых людзей ды верацьб, што іх дзейнасць карысная для грамадства.

- «Новыя СМІ» ствараюць вобраз яркай і прыцягальнай беларускай апазіцыі і нонканфармісцкай моладзі. Беларуская кіберпрастора поўная экстравагантных ідэй і творчага настрою.
- Інтэрнет-суполкі — гэта ўласцівая XXI стагоддзю форма сеткавай камунікацыі і самаарганізацыі. Яны яднаюць беларусаў з розных мясцовасцей і розных сацыяльных слаёў.
- «Новыя СМІ» — гэта недарагі для апазіцыі спосаб ахапіць як мага шырэйшую аўдыторыю сярод моладзі, якая ніколі не чытае незалежнай друкаванай прэсы.
- Нарэшце, сеткавыя дэмакратычныя ініцыятывы, нават самыя дробныя, могуць натхніць тысячы юнакоў і дзяўчат, якія вандруюць па сусветным павуцінні. Некаторыя са сталых моладзевых рэсурсаў ужо нарадзілі дзесяткі падобных праектаў на рэгіянальным узроўні.

З гэтых прычынаў для сённяшніх лідэраў беларускай палітычнай апазіцыі надзвычай важна глыбей зразумець, што адбываецца з «новымі СМІ», больш увагі надаваць сваёй прысутнасці ў інтэрнэт-прасторы і ўсвядоміць уплыў гэтай прасторы на будучых лідэраў краіны. Сёння «новыя СМІ» і моладзь знаходзяцца на перадавой стварэння сучаснай беларускай гарадской культуры, якая спрыяе ўмацаванню беларускай самасвядомасці і пашырэнню ідэалаў свабоды, незалежнасці і дэмакратыі.

## ◘ АНАЛІТЫКА

ЮРЫ ДРАКАХРУСТ

# Культурныя тыпы і палітычны працэс

Падчас выбарчай кампаніі 2006 г. Аляксандар Мілінкевіч паведаміў у інтэрвію, што адным са сваіх самых выбітных дасягненьняў у жыцьці лічыць знаходку на Гарадзеншчыне магілы польскага караля. У гэтым жа інтэрвію палітык з абурэньнем апавёў, як ён на нейкім сходзе казаў пра гэтую магілу і пачуў ад адной слухачкі-беларускі: «А якое дачыненьне мае да нас той польскі кароль?»

Гэтая гісторыя падаецца вельмі паказальнай у тым сэнсе, што чыста палітычныя падзелы ў Беларусі ўзмоцненыя таксама і культурным падзелам, нават бар'ерам. Наўрад ці будзе правільным тлумачыць адсутнасьць пераменаў у краіне выключна наяўнасьцю гэтага супадзеньня палітычных і культурных бар'ераў, але пэўную, і на мой погляд значную, ролю гэтая беларуская зьява ўсё ж адыгрывае.

Часам можна пачуць меркаваньне, што ня мае вялікага значэньня, што там сабе думае пасіўная большасьць, маўляў, любыя перамены заўсёды зьдзяйсьняе меншасьць. Гэта безумоўна так — сапраўды любыя і сапраўды меншасьць. Але не наадварот, не «любая меншасьць зьдзяйсьняе перамены». На адзін прыклад, калі меншасьці гэта ўдаецца, прыпадае безьліч іншых, калі часам магутныя высілкі меншасьці проста не пакідаюць сьледу ў гісторыі, а жыцьцё ідзе зусім іншай дарогай.

---

***Юры Дракахруст** — палітычны камэнтатар, публіцыст. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» выйшла пад назвай «Сэанс чорнай магіі і яе выкрыцьцё» (6/2005). Гэты тэкст быў упершыню агучаны на канфэрэнцыі «Канфлікт пакаленьняў, або беларускія адрознасьці ў мэтах, каштоўнасьцях і стратэгіі», адбытай 3—6 чэрвеня 2008 г. у Вышэйшай школе гандлю і права імя Р. Лазарскага ў Варшаве.*

А ад чаго залежыць, калі так, а калі гэтак? Шмат ад чаго, але не ў апошнюю, калі ня ў першую чаргу — ад сувязі, суадносінаў паміж меншасьцю і большасьцю. Калі меншасьць адрозьніваецца ад большасьці адно рашучасьцю, калі ўсё ж супольнага паміж імі больш, чым адрознага, тады перамены сапраўды рэальныя. Калі ж для большасьці меншасьць — у найлепшым выпадку дзівакі, а ў найгоршым — чужакі, здараецца, як заўжды.

Калі гаварыць пра культурныя тыпы, адрознасьць якіх робіць значна больш высокімі ўласна палітычныя бар'еры, то цяжкасьці ўзьнікаюць ужо на ўзроўні назваў. Назваць адзін тып «сьвядомымі», ці беларускім, эўрапейскім ці польскім тыпам — першае вызначэньне крыўднае, іншыя не зусім дакладныя. Гэтак жа і наадварот — крэолы, расейскі, усходні тып: штосьці крыўдна, штосьці недакладна.

Так што далей пазначым першы тып як тып I, а другі — тып II. І дакладна, і не пакрыўдзіш нікога.

Гэтыя цяжкасьці з назвамі — насамрэч невыпадковыя, бо знайсьці просты крытэр, каб аднесьці асобу да таго ці іншага тыпу, даволі цяжка.

Мова? Ну ўжо пэўна не. Скажам, беларускамоўны стары вясковец зь нізкай адукацыяй зь вялікай імавернасьцю патрапіць у тып II, а малады адукаваны расейскамоўны гараджанін — зь немалой імавернасьцю будзе належаць да тыпу I. Хутчэй за ўсё, калі абмежавацца адукаванымі гараджанамі, то крытэр дзейнічае прынамсі ў адзін бок: калі беларускамоўны, адукаваны і жыве ў горадзе, то пэўна тып I.

Вера? Наўрад ці, дакладней, толькі ў адзін бок (каталік — дык хутчэй тып I), але і тое няпэўна. Некалькі гадоў таму Пётра Рудкоўскі ў артыкуле «Панская Польшча і бяспанская Беларусь» выдатна паказаў, наколькі распаўсюджаны тып II сярод беларускіх каталікоў і нават беларускай Палёніі.

Стаўленьне да расейскай культуры? Ну пэўна так, тыпы ж культурныя. Але гэты крытэр цяжка, як кажуць, апэрацыяналізаваць, іншымі словамі, які адсотак беларускіх кніжак, якія чалавек чытае, павінен быць, каб аднесьці яго да тыпу I?

Стаўленьне да самой Расеі? Ізноў крытэр хутчэй аднабаковы, стаўленьне тыпу I да ўсходняй суседкі пры спрашчэньні можна апісаць адным словам — «прэч», але ў тыпе II сустракаюцца даволі розныя варыянты стаўленьня, часам даволі далёкія ад адчуваньня еднасьці.

Стаўленьне да Эўропы? Ізноў жа аднабаковы крытэр. Тып I, зразумела, складаецца з «эўрабеларусаў» амаль цалкам, але праэўрапейскія памкненьні даволі распаўсюджаныя і сярод тыпу II.

У гэтым сэнсе цікава параўнаць, як ставяцца да эўраінтэграцыі грамадзяне Беларусі і Расеі.

### Дынаміка адказаў на пытаньне «На вашу думку, ці павінна Беларусь стаць сябрам Эўрапейскага Зьвязу?» (%)

| Варыянт адказу | Сьнежань 2002 | Сакавік 2003 | Сакавік 2005 | Травень 2007 |
|---|---|---|---|---|
| Павінна | 61 | 56 | 53 | 34 |
| Не павінна | 11 | 12 | 44 | 49 |

Крыніца: Апытаньні НІСЭПД (www.iiseps.org)

### Дынаміка адказаў на пытаньне «Расея не зьяўляецца сябрам Эўрапейскага Зьвязу. Ці павінна Расея імкнуцца да сяброўства ў ЭЗ?» (%)

| Варыянт адказу | Сакавік 2001 | Травень 2002 | Чэрвень 2003 | Лістапад 2003 | Люты 2005 | Чэрвень 2005 | Сакавік 2007 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Павінна | 59 | 52 | 73 | 55 | 51 | 48 | 36 |
| Не павінна | 19 | 18 | 10 | 15 | 23 | 26 | 26 |

Крыніца: Фонд «Общественное мнение» («Грамадзкая думка») (www.fom.ru)

Няцяжка ўбачыць, што ўзроўні праэўрапейскіх (і антыэўрапейскіх) настрояў у дзьвюх краінах даволі блізкія, яны нават мяняюцца сынхронна.

У гэтым сэнсе можна меркаваць, што мэханізм праэўрапейскіх настрояў прадстаўнікоў беларускага тыпу II падобны да мэханізму, які фармуе настроі іх расейскіх аднадумцаў.

Але вернемся да апрабаваньня магчымых крытэраў.

Стаўленьне да гісторыі, у прыватнасьці, да ВКЛ і БНР? Так, як паказвае той жа прыклад зь няўдзячнай слухачкай Мілінкевіча. Але ў сувязі зь нядаўнімі зьменамі ўрадавай палітыкі ў гістарычнай галіне (адносна ВКЛ — ужо некалькі гадоў, адносна БНР — зусім нядаўна) тут адрозьненьне хутчэй у інтэнсіўнасьці стаўленьня: для тыпу I, скажам, 25 Сакавіка — гэта сьвятое, для тыпу II — у найлепшым выпадку ўсяго толькі прымальнае.

Нарэшце неблагім, аднак ізноў жа аднабаковым крытэрам зьяўляецца стаўленьне да Другой сусьветнай вайны.

Іншымі словамі, дакладнага простага крытэру прыналежнасьці беларусаў да адзначаных культурных тыпаў, здаецца, няма. Тым ня менш існуюць даволі дакладныя сыстэмы знакаў, пры дапамозе якіх людзі вызначаюць сваіх і чужых.

У якасьці ілюстрацыі гэтага мне прыгадваюцца выступы Аляксандра Мілінкевіча па ТБ і радыё падчас перадвыбарнай кампаніі, якія ён рабіў пераважна на расейскай мове. Я не пра тое, ці правільна, я пра тое — чаму? Хто ў Беларусі не разумее беларускай мовы? Калі такія і ёсьць, то наўрад ці выбар мовы выступаў тлумачыўся іх патрэбамі. Проста мова ў такім кантэксьце (ня мова сама па сабе, а мова адказнага палітычнага выступу адукаванага гараджаніна) — гэта метка прыналежнасьці да пазначаных культурных тыпаў. І пэўна Аляксандар Мілінкевіч не захацеў у вачах выбаршчыкаў адназначна заганяць сябе ў тып І.

Паколькі тэма нашай канфэрэнцыі — разрыў пакаленьняў, то дазволю сабе прывесьці зьвесткі сацыялягічных апытаньняў, якія паказваюць, як разьмяркоўваюцца паміж гэтымі тыпамі розныя пакаленьні беларусаў. Дакладней, размова ідзе пра некаторыя з прыгаданых вышэй частковых крытэраў прыналежнасьці да гэтых тыпаў.

### Якой мовай вы пераважна карыстаецеся ў побыце?

| Узрост | Беларуская (8 %) | Расейская (52 %) | Беларуская і расейская (16 %) | Зьмяшаная (23 %) | Расейская, «на гэтай мове я размаўляю зь дзяцінства» (38 %) |
|---|---|---|---|---|---|
| **18—29** | 3 | 73 | 12 | 10 | 56 |
| **30—39** | 7 | 64 | 14 | 14 | 46 |
| **40—49** | 3 | 58 | 17 | 20 | 44 |
| **50—59** | 6 | 47 | 17 | 29 | 29 |
| **+60** | 14 | 27 | 19 | 39 | 18 |

Крыніца: Апытаньне НІСЭПД, кастрычнік-лістапад 2006 г., 1527 апытаных (www.iiseps.org)

Як відаць, паводле крытэру мовы моладзь — найбольш далёкая ад тыпу І група. Навідавоку амаль лінейная залежнасьць: чым старэйшая ўзроставая кагорта, тым болей у ёй беларускамоўных. Уражваюць зьвесткі з апошняга слупка табліцы — гэта адсотак тых, хто адзначылі, што гавораць у побыце па-расейску, і пры гэтым назвалі яе мовай, на якой гавораць зь дзяцінства. Сярод моладзі такіх — больш за палову.

А вось што да стаўленьня да гістарычных постацяў, фактычна, што да вобразу гісторыі, то тут карціна выглядае зьмяшанай, контравэрсійнай. У наступнай табліцы прыводзяцца зьвесткі толькі па самай малодшай і сумарна па дзьвюх найстарэйшых групах.

**Якія зь пералічаных палітыкаў выклікаюць у вас найбольшыя сымпатыі, адпавядаюць вашаму ідэалу палітыка?**
(Ня больш за тры адказы, %)

| | **Усе апытаныя** | **18—29 гадоў** | **Ранг** | **Старэйшыя за 49 гадоў** | **Ранг** |
|---|---|---|---|---|---|
| Уладзімер Пуцін | 39 | 42 | 1 | 35 | 3 |
| Пётар Машэраў | 33 | 22 | 3 | 38 | 1 |
| Пётар I | **31** | **41** | 2 | **23** | 4 |
| Аляксандар Лукашэнка | **21** | **6** | 12 | **36** | 2 |
| Кацярына II | **15** | **21** | 4 | **11** | 7 |
| Леанід Брэжнеў | 13 | 5 | 13 | 18 | 5 |
| Кастусь Каліноўскі | 11 | 14 | 5 | 8 | 9 |
| Іосіф Сталін | 9 | 8 | 8 | 13 | 6 |
| Міхаіл Гарбачоў | 9 | 7 | 9—10 | 11 | 8 |
| Уладзімер Ленін | 9 | 7 | 9—10 | 4 | 11 |
| Князь Вітаўт | **7** | **12** | 6 | **3** | 13 |
| Леў Сапега | **7** | **11** | 7 | **4** | 12 |
| Мікіта Хрушчоў | 7 | 6 | 11 | 5 | 10 |

Крыніца: Апытаньне НІСЭПД, чэрвень 2004 г., 1508 апытаных (www.iiseps.org)

Моладзь сымпатызуе ўласна беларускім героям (Каліноўскаму, Сапегу, Вітаўту) значна больш, чым насельніцтва ў цэлым, і ўжо тым больш, чым людзі сталага веку. Але і героі расейскай гісторыі, ды ня проста героі, а якім ВКЛ «удзячнае» сваім разбурэньнем, таксама выклікаюць у беларускай моладзі большыя сымпатыі, чым і ў людзей старэйшых за 49 гадоў, і ў выбарцы ў цэлым.

Ну і нарэшце, спрадвечная беларуская дылема: Эўропа — Расея. Тут сувязь моцная, відавочная і адназначная: чым маладзейшыя — тым бліжэйшыя да Эўропы і далейшыя ад Расеі.

**Разьмеркаваньне паводле ўзросту адказаў на пытаньне «На ваш погляд, ці павінна Беларусь стаць сябрам Эўрапейскага Зьвязу?» (%)**

| Варыянт адказу | 18—29 | 30—39 | 40—49 | 50—59 | +60 |
|---|---|---|---|---|---|
| Павінна (35 %) | 55 | 40 | 38 | 29 | 16 |
| Не павінна (35 %) | 20 | 29 | 39 | 44 | 47 |

**Разьмеркаваньне паводле ўзросту адказаў на пытаньне «Калі б сёньня адбыўся рэфэрэндум пра аб'яднаньне Беларусі і Расеі, як бы вы прагаласавалі?» (%)**

| Варыянт адказу | 18—29 | 30—39 | 40—49 | 50—59 | +60 |
|---|---|---|---|---|---|
| За (36 %) | 26 | 28 | 40 | 36 | 48 |
| Супраць (42 %) | 50 | 45 | 42 | 42 | 32 |

**Разьмеркаваньне паводле ўзросту адказаў на пытаньне «Калі б давялося выбіраць паміж аб'яднаньнем Беларусі з Расеяй і ўступленьнем Беларусі ў Эўразьвяз, чаму б вы аддалі перавагу?» (%)**

| Варыянт адказу | 18—29 | 30—39 | 40—49 | 50—59 | +60 |
|---|---|---|---|---|---|
| Аб'яднаньню з Расеяй (45 %) | 28 | 41 | 48 | 54 | 58 |
| Уступленьню ў Эўразьвяз (33 %) | 55 | 39 | 33 | 24 | 16 |

Крыніца: Апытаньне НІСЭПД, травень 2008 г., 1531 апытаны (www.iiseps.org)

Калі паглядзець на ўсе прыведзеныя табліцы разам, то зь іх зусім не вынікае, што прадстаўнікі культурнага тыпу I сустракаюцца сярод беларускай моладзі значна часьцей, чым сярод старэйшых пакаленьняў. Паводле адных чыньнікаў — так, паводле іншых — з дакладнасьцю да наадварот.

На выкладзеныя мной зьвесткі цалкам дарэчны контраргумэнт са сфэры практычнай палітыкі: ну а якія такія масы народу прыцягнулі ў Беларусі тыя, хто спрабаваў працаваць, кажучы мовай гэтага дакладу, на тып II — ад «Руху дэмрэ-

формаў» пачатку 1990-х да Аляксандра Казуліна, які і паводле афіцыйных, і паводле незалежных дадзеных набраў у 2006 г. менш, чым Мілінкевіч, і да зусім ужо камічных сваёй малалікасьцю прарасейскіх мітынгаў, якія ладзілі апошнія гады Сяргей Скрабец і Валер Фралоў? Іх эфэктыўнасьць аказалася значна меншая, чым эфэктыўнасьць палітычных сілаў, якія працавалі на і з тыпам I.

Але гэта сьведчыць толькі пра тое, што акрамя адсутнасьці культурнага бар’еру, акрамя прыналежнасьці да даміноўнага тыпу, патрэбныя яшчэ некаторыя палітычныя здольнасьці. У аднаго палітыка, якога, на жаль, усе мы ведаем, у 1994 г. такія здольнасьці знайшліся. І калі тып II будзе заставацца ягонай вотчынай, то баюся, што дэманстраваць гэтыя здольнасьці на прэзыдэнцкай пасадзе яму давядзецца доўга. Доўга, апроч іншага, яшчэ і таму, што культурныя тыпы паводле змоўчаньня аказваюцца разьмеркаваныя паміж ім і ягонымі палітычнымі апанэнтамі.

Можна, зразумела, спадзявацца, што дзякуючы плённай культурніцкай і палітычнай працы з прыходам новых пакаленьняў зьменяцца суадносіны «моцы» культурных тыпаў у грамадзтве, тып I стане даміноўны, што прынясе перамогу ягоным палітычным прадстаўнікам. Аднак прыведзеныя вышэй зьвесткі ня вельмі дазваляюць спадзявацца на тое, што гэта спраўдзіцца.

АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ

# Пакаленьні ў Беларускім Народным Фронце

Шмат унутраных фактараў уплываюць на разьвіцьцё палітычных партый. Пакаленьні — адзін з такіх фактараў.

Партыя БНФ бярэ свой пачатак у 1988 г. ад Аргкамітэту Беларускага Народнага Фронту за перабудову «Адраджэньне».

Паколькі дысыдэнцкі рух у Беларусі быў вельмі слабы, то мы можам канстатаваць адсутнасьць «раскручаных» апазыцыйных палітычных фігураў у незалежным руху канца 1980-х. Так, у стварэньні новых лідэраў апазыцыі ўвогуле, і БНФ у прыватнасьці, асноўная роля належала афіцыйным савецкім СМІ. Яшчэ да таго, як Зянон Пазьняк узначаліў Аргкамітэт БНФ, у сродках масавай інфармацыі пачалася вялікая кампанія супраць так званых «нефармалаў». Пры гэтым найбольш пісалі пра моладзевыя групы «Талака» і «Тутэйшыя». На канец 1980-х прозьвішчы лідэраў «Талакі» Вінцука Вячоркі і Сяргея Вітушкі былі ня менш пазнавальныя, чым прозьвішча Пазьняка. Можна сказаць, што пакаленьне талакоўцаў зажыло ў публічнай сьвядомасьці раней за пакаленьне Пазьняка.

Напярэдадні заснаваньня Аргкамітэту БНФ адбывалася ўнутраная канкурэнцыя паміж дзьвюма плынямі за права стварыць БНФ. Першыя плынь была прадстаўленая групай творчай інтэлігенцыі (зь якой найбольшую вядомасьць атрымала група мастакоў «На паддашку», па назьве майстэрні, якая знаходзілася на гарышчы аднаго з будынкаў у цэнтры сталіцы, дзе тая група зьбіралася) і прадстаўнікамі нефармальных моладзевых арганізацый, другая — расейскамоўнай лібэральнай інтэлігенцыяй з клюбу «Современник». Прадстаўнікі моладзевых

***Алесь Міхалевіч** — папулярны палітык. Да свайго нядаўняга выключэньня займаў пасаду намесьніка старшыні ПБНФ.*

арганізацый падтрымалі вылучэньне на першую ролю Зянона Пазьняка, які быў на дваццаць гадоў старэйшы за іх і карыстаўся павагай за прынцыповую беларускамоўнасьць і дзеяньні ў абарону гістарычнага цэнтру Менску.

Як выявілася, лідэры «Тутэйшых» і «Талакі» ня мелі амбіцый займаць першыя ролі, хаця, як ужо адзначалася, былі пазнавальнымі асобамі дзякуючы савецкай прапагандзе. Гэта быў момант, калі лідэры «пакаленьня «Талакі» (так будзем надалей называць гэтае пакаленьне народжаных пры канцы 1950-х — у першай палове 1960-х) падтрымалі старэйшага, але ідэйна блізкага Зянона Пазьняка, і страцілі магчымасьць на атрыманьне кантролю над новай палітычнай сілай.

На першым устаноўчым зьезьдзе БНФ «Адраджэньне» ў Вільні старшынём і двума намесьнікамі былі абраныя прадстаўнікі пакаленьня, якое далей будзем умоўна называць пакаленьнем 1940-х. (Зянон Пазьняк, Юры Хадыка і Міхась Ткачоў былі народжаныя або незадоўга перад пачаткам Другой сусьветнай вайны, або падчас яе.) Прадстаўнікі моладзевых арганізацыяў занялі важныя тэхнічныя, але не публічныя пасады, і перасталі фігураваць у дзяржаўнай прэсе, няхай нават і ў адмоўным кантэксьце. Лідэры пакаленьня «Талакі» зусім перасталі зьяўляцца ў інфармацыйнай прасторы, асабліва пасьля таго, як ніхто з гэтага пакаленьня ня быў абраны ў Вярхоўны Савет 12-га склíканьня (хоць умоўна да пакаленьня «Талакі» можна аднесьці Юрася Беленькага і Сяргея Навумчыка).

Пра ролю талакоўцаў на пачатку стварэньня БНФ згадвае першы старшыня Аргкамітэту БНФ Васіль Якавенка:

*Увесь Аргкамітэт напачатку ніхто не зьбіраў. Зьбіралася толькі група ініцыятыўных хлопцаў з моладзевага аб’яднаньня «Талака». Яны-та неўзабаве і пачалі вывешваць на дамах улёткі ад імя Народнага Фронту*[1].

Можна з упэўненасьцю сказаць, што ў тым, што Народны Фронт стаў нацыянальнай сілай, а ня проста дэмакратычным рухам, вырашальная роля належала прадстаўнікам «Талакі», якія сваімі дзеяньнямі стварылі для БНФ імідж незалежніцкага антыкамуністычнага руху.

На доўгі час увага сродкаў масавай інфармацыі была прыкаваная да дэпутатаў Вярхоўнага Савету, а былыя талакоўцы выконвалі тэхнічныя ролі ў БНФ (напрыклад, Віктар Івашкевіч быў адказным сакратаром Управы БНФ, Вінцук Вячорка — сакратаром Управы, Алесь Бяляцкі — кіраўніком адной з раённых арганізацый у Менску). Пры гэтым пасьля пераходу ў БНФ кіраўнікоў «Талакі» апошняя фактычна самараспусьцілася, а тым самым прыпыніўся актыўны прыток у нацыянальны рух новых маладых людзей. Былыя лідэры «Талакі» апынуліся ў новай для сябе сытуацыі — яны сталі партыйнымі функцыянэрамі, пры гэтым сотні моладзевых актывістаў сышлі ў сваё прыватнае жыцьцё.

[1] Васіль Якавенка. Крушэнне на ростані: Эсэ, артыкулы, гутаркі. Мінск: РУМЦ ФВН, 2002. С. 256.

Учорашнія лідэры сталі звычайнымі непублічнымі функцыянэрамі, а рэкрутацыя новых фронтаўскіх актывістаў адбывалася выключна пад прозьвішча Зянона Пазьняка.

Так працягвалася да 1995 г., калі Віктар Івашкевіч, які выконваў найважнейшую тэхнічную функцыю ў партыі (адказны сакратар зьяўляецца кіраўніком выканаўчай структуры партыі), ціха сышоў з партыйных пасадаў на знак нязгоды з палітыкай Зянона Пазьняка. Трэба зазначыць, што значная частка пакаленьня на пасадах засталася, як, напрыклад, Вінцук Вячорка, які на зьезьдзе ў 1997 г. быў абраны намесьнікам старшыні.

Ад'езд Зянона Пазьняка істотна спрасьціў талакоўцам прыход да ўлады ў Партыі БНФ. Былыя талакоўцы выстаўлялі супрацу зь іншымі дэмакратычнымі сіламі як асноўную магчымасьць для зьмены сытуацыі ў краіне. Таму цікавым фактам зьяўляецца абвяшчэньне пра супрацу паміж актывістамі аднаго пакаленьня з розных партый. 31 жніўня 1999 г. сем палітыкаў — Зьміцер Бандарэнка, Алесь Бяляцкі, Вінцук Вячорка, Павал Данэйка, Віктар Івашкевіч, Анатоль Лябедзька і Мікалай Статкевіч — абвясьцілі аб далейшай шчыльнай супрацы, у тым ліку ў падрыхтоўцы першага «Маршу Свабоды». Журналісты назвалі іх палітыкамі «новай хвалі», у альтэрнатыву палітыкам хвалі старой — Зянону Пазьняку, Станіславу Багданкевічу ды іншым.

З фронтаўскіх кіраўнікоў у працэсе ўзялі ўдзел Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч і Алесь Бяляцкі, якія праз колькі месяцаў былі абраныя старшынём БНФ і двума намесьнікамі. Зь іншых падпісантаў Анатоль Лябедзька з Паўлам Данэйкам неўзабаве ўзначалілі АГП, а Мікалай Статкевіч на той момант ужо ўзначальваў Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю «Народная грамада». Аднак прэзыдэнцкія выбары 2001 г. паказалі, што рэальным апазыцыйным палітычным працэсам працягвалі кіраваць старэйшыя людзі — такія, як Васіль Лявонаў ці Сямён Домаш. Пры гэтым «новая хваля» ня здолела дамовіцца аб супольным кандыдату ў прэзыдэнты, і, як вынік, і ў 2001-м, і ў 2006-м кандыдатамі ў прэзыдэнты станавіліся людзі старэйшага пакаленьня.

Зьезд Партыі БНФ 1999 г. можна аналізаваць у генэрацыйных катэгорыях. Зянону Пазьняку супрацьстаяў Вінцук Вячорка, былы кіраўнік «Талакі». Аснову каманды, якая стаяла за ім, складалі асобы пакаленьня «Талакі» — Віктар Івашкевіч, Алесь Бяляцкі ці Вячаслаў Сіўчык. Хаця можна, зразумела, назваць і выключэньні: каманду талакоўцаў актыўна падтрымліваў Юрась Хадыка, чалавек пакаленьня 1940-х, а за Зянона Пазьняка выступаў Юрась Беленькі, былы талаковец і дэпутат Вярхоўнага Савету.

Галоўным вынікам зьезду Партыі БНФ 1999 г. стаў прыход да ўлады ў БНФ пакаленьня талакоўцаў. Дзеля таго, каб перамагчы на зьезьдзе, талакоўцы шукалі падтрымкі сярод людзей розных пакаленьняў. Большасьць «Маладога фронту» стала на іх бок, у выніку чаго яшчэ ў 1999 г. Павал Севярынец быў абраны намесьнікам старшыні Партыі БНФ. Адрозна ад Зянона Пазьняка, які доўгі час блякаваў пераход талакоўцаў у ранг публічных палітыкаў, Вячорка ўжо на старце быў змушаны даць месца ў публічнай прасторы маладзейшым.

Аднак адначасова былыя талакоўцы пачалі разглядаць сваіх маладзейшых калегаў з так званага пакаленьня «Маладога фронту» як патэнцыйных канкурэнтаў, якім прапаноўваліся месцы тэхнічных супрацоўнікаў (акурат такім чынам і Зянон Пазьняк разглядаў талакоўцаў). Варта згадаць, што рэакцыя кіраўнікоў Партыі БНФ у 2001 г. на рашэньне Аляксея Янукевіча балятавацца ў намесьнікі старшыні партыі была крайне нэгатыўная. Толькі на зьезьдзе 2003 г. Вінцук Вячорка пагадзіўся прапанаваць прадстаўніка «пакаленьня «Маладога фронту» Аляксея Янукевіча ў свае намесьнікі, прычым гэта было зроблена пад моцным ціскам з боку гэтага пакаленьня (у тым жа 2003 г. намесьнікам старшыні партыі насуперак волі старшыні БНФ Вінцука Вячоркі быў абраны іншы прадстаўнік пакаленьня «Маладога фронту» Алесь Міхалевіч). Да таго ж дэлегатам зьезду трэба было патлумачыць разыходжаньне з харызматычным Паўлам Севярынцам, а гэта можна было зрабіць толькі праз дэманстрацыю наяўнасьці «ўласнай» моладзі.

Да 2007 г. пакаленьне «Маладога фронту» набыло значны палітычны досьвед, а таксама атрымала няхай невялікія, але перамогі. Былы намесьнік старшыні «Маладога фронту» Юрась Губарэвіч на мясцовых выбарах 2003 г. у Белаазерску атрымаў разам з камандай большасьць у гарадзкім савеце. Сяргей Антусевіч у Горадні стаў дэпутатам гарсавету і адным з кіраўнікоў Незалежнага прафсаюзу. Сяргей Салаш стаў вельмі папулярнай асобай у Барысаве. Дзясяткі прадстаўнікоў пакаленьня стварылі пасьпяховыя і папулярныя няўрадавыя арганізацыі. У рэгіянальных штабах Аляксандра Мілінкевіча падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г. прадстаўнікі пакаленьня «Маладога фронту» займалі вырашальныя пазыцыі.

Зьезд Партыі БНФ у 2007 г. канстатаваў наяўнасьць унутранага канфлікту паміж пакаленьнем талакоўцаў і пакаленьнем «Маладога фронту». Пры гэтым, як ужо адзначалася, некаторыя прадстаўнікі пакаленьня «Маладога фронту» зьяўляюцца часткай уладнай групы, хаця выказваньні Аляксея Янукевіча, аднаго з такіх прадстаўнікоў, аб намеры балятавацца на старшыню БНФ, сьведчаць пра жаданьне стаць самастойнай уплывовай фігурай, сыходзячы зь ценю былых талакоўцаў.

Пры гэтым пакаленьне «Маладога фронту» прадстаўленае ня толькі ў Партыі БНФ. Існуюць яшчэ дзьве партыі, якімі сёньня кіруюць ягоныя прадстаўнікі, — незарэгістраваная Беларуская хрысьціянская дэмакратыя і зарэгістраваная Партыя зялёных Алега Новікава. Пакаленьню «Талакі» не ўдалося ўзяць уладу ў краіне. Палітыкі «новай хвалі» сталі старшынямі сваіх партый, але істотным чынам не зьмянілі сытуацыі ў дзяржаве. Ім вельмі хочацца надалей захоўваць першыя ролі ў апазыцыі, але іх сур'ёзна падціскаюць прадстаўнікі пакаленьня «Маладога фронту». Дзесьці, як у Партыі БНФ, праз унутрыпартыйную канкурэнцыю, а дзесьці, як у выпадку з старшынём АГП Анатолем Лябедзькам, падчас выбараў у Палату прадстаўнікоў, дзе яму супрацьстаяў малады і дынамічны незалежны кандыдат Алесь Лагвінец.

## АНАЛІТЫКА

ВЯЧКА СТАНКЕВІЧ

# Новая хваля эміграцыі: розныя мэты і каштоўнасьці

Да эміграцыйных хваляў зь Беларусі, як правіла, прычыняліся буйныя гістарычныя падзеі і спадарожныя ім эканамічныя вынікі. Такімі падзеямі былі дзьве сусьветныя вайны, а ў наш час — распад Савецкага Саюзу. У гэтым артыкуле я сьцісла закрану ранейшыя хвалі і больш падрабязна спынюся на параўнаньні новых эмігрантаў зь іхнымі папярэднікамі. На заканчэньне я выкажу некалькі прапановаў адносна таго, як можна было б зьмякчыць пераходныя працэсы ў эміграцыйным асяродзьдзі.

Хоць жыхары Беларусі эміґравалі шмат у якія краіны Эўропы і Паўночнай Амэрыкі, я ў гэтым артыкуле засяроджуся на прыбышах у Злучаныя Штаты Амэрыкі. Менавіта пра іхныя жыцьцёвыя абставіны я найбольш ведаю.

### РАНЬНІЯ ЭМІГРАНТЫ

Першыя эмігранты зь Беларусі дасягнулі Новага сьвету яшчэ ў XVII ст. Тады гэта былі, аднак, толькі паасобныя перасяленцы, а не вялікія групы ці хвалі імігрантаў. У большай колькасьці апошнія пачалі прыбываць у ЗША ў другой палове XIX ст. Свайго піку гэты працэс дасягнуў на пачатку XX ст. Паколькі землі сёньняшняй Рэспублікі Беларусь у 1795 г. поўнасьцю ўвайшлі ў склад Расейскай імпэрыі і заставаліся пад уладай гэтай шматнацыянальнай дзяржавы аж да Першай сусьветнай вайны, гэтыя імігранты ў адпаведных дакумэнтах чась-

***Вячка Станкевіч** — палітык, грамадзкі дзяяч, старшыня рады Беларуска-амэрыканскага задзіночаньня.*

цей за ўсё пазначаліся як расейцы ці як прыбышы з Расеі. Што да веравызнаньня, яны былі пераважна праваслаўныя (вернікамі Расейскай праваслаўнай царквы) і рыма-каталікамі. У канцы XIX — пачатку XX ст. назіраўся вялікі прыток габрэйскіх імігрантаў зь беларускіх земляў, што ўваходзілі ў так званую «рысу аселасьці».

Значная частка беларускіх імігрантаў асядала ў буйных гарадах на Ўсходнім узьбярэжжы, а таксама ў цэнтры ЗША. Яны гуртаваліся вакол ужо наяўных там рэлігійных суполак, сацыяльных і гандлёвых арганізацый. Многія тамтэйшыя праваслаўныя цэрквы былі заснаваныя пры спрыяньні расейскага імпэрскага ўраду, і іх прыхаджане лічыліся прыналежнымі да «рускай веры». Беларускія каталікі далучаліся да існуючых, пераважна польскіх, рымска-каталіцкіх прыходаў. Сацыяльныя арганізацыі — так званыя «зямляцтвы», у якія імігранты гуртаваліся паводле месца свайго паходжаньня, — дапамагалі новым перасяленцам у іх першых кроках на новай зямлі. Гэтыя арганізацыі паступова занепадалі па меры таго, як пазьнейшыя пакаленьні імігрантаў асыміляваліся амэрыканскім грамадзтвам.

Што да памераў гэтай першай вялікай хвалі імігрантаў зь беларускіх земляў, то існуюць розныя ацэнкі. Паводле агульных прыкідак, яна налічвала звыш 1 мільёна чалавек. Паводле свайго сацыяльнага стану гэта былі пераважна сяляне, зь невялікай доляй дробных купцоў і рамесьнікаў. Працяглая несамастойнасьць земляў, на якіх яны жылі да перасяленьня, і часьцяком нізкі ўзровень адукацыі спрыялі таму, што іх нацыянальная сьвядомасьць была невыразная. У залежнасьці ад сваёй рэлігійнай прыналежнасьці яны, як ужо згадвалася вышэй, далучаліся да расейскіх ці польскіх нацыянальных суполак. Габрэйскія імігранты зь беларускіх тэрыторый гуртаваліся вакол сынагог і таксама ўтваралі свае зямляцтвы.

## ПАСЬЛЯВАЕННАЯ ХВАЛЯ

У адрозьненьне ад сваіх папярэднікаў, якія пакідалі родныя землі з прычыны эканамічных цяжкасьцяў або рэлігійнага ўціску, сярод людзей, што іміґравалі ў ЗША пасьля Другой сусьветнай вайны, былі пераважна ўцекачы ад Чырвонай Арміі, а таксама былыя прымусовыя работнікі і вязьні канцэнтрацыйных лягераў у Нямеччыне. Пажыўшы пад камуністычнай тыраніяй, яны не хацелі рэпатрыяцыі ў Савецкі Саюз. Некалькі гадоў пасьля вайны яны заставаліся ў лягерах для перамешчаных асобаў у Заходняй Нямеччыне і Аўстрыі. Іх палітычная і нацыянальная сьвядомасьць, як і ўзровень адукацыі, былі дастаткова высокія. У лягерах для перамешчаных асобаў яны нацыянальна арганізоўваліся, утвараючы ўласныя рэлігійныя, асьветніцкія і палітычныя антыкамуністычныя структуры. Гэтая арганізаванасьць і тое, што сярод імігрантаў былі пераважна маладыя сем’і зь дзецьмі, заахвочвалі перасяленцаў да заснаваньня ў Паўночнай Амэрыцы ўласных суполак. Да апошніх належалі прыходы Беларускай праваслаўнай царквы, наваўтвораныя сацыяльныя і культурныя арганізацыі, уласныя пэрыядычныя выданьні і нядзельныя школы. Як і імігранты першай хвалі, пасьлява-

енныя перасяленцы асядалі пераважна на ўсходзе і ў цэнтры краіны, пазьней перяжджаючы таксама ў цяплейшыя Флорыду і Каліфорнію.

Гэтыя імігранты стварылі шэраг адносна пасьпяховых і разгалінаваных арганізацый. Сьведчаньнем іхнае энэргічнасьці і гатоўнасьці змагацца за свабоду і дэмакратыю на радзіме стала іх жывая прэса і актыўная кнігавыдавецкая дзейнасьць. Ключавымі падзеямі іх грамадзкага жыцьця зрабіліся штогадовыя сьвяткаваньні гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці ў 1918 г. і іншых важных датаў беларускай гісторыі. Настойліва лабіюючы свае інтарэсы і ведучы разнастайную палітычную ды культурную дзейнасьць, яны намагаліся інфармаваць амэрыканскую грамадзкасьць пра Беларусь. (У параўнаньні з пазьнейшай хваляй пасьляваенныя імігранты былі больш аднароднай супольнасьцю з пэўнымі агульнымі каштоўнасьцямі і мэтамі.) Празь нейкі час да іх пачалі далучацца іншыя беларускія пасьляваенныя эмігранты, якія сьпярша пасяліліся былі ў Вялікай Брытаніі, Францыі, Бэльгіі і краінах Паўднёвай Амэрыкі. Аднак адсутнасьць прытоку новых імігрантаў зь Беларусі, якія знаходзіліся ў палоне савецкай імпэрыі за жалезнай заслонай, прыводзіла да паступовага зьмяншэньня колькасьці і аслабленьня актыўнасьці амэрыканскіх беларусаў. Іх могілкі разрасталіся, а наступныя пакаленьні моцна закранала паступовая асыміляцыя.

## СТРАКАТАСЬЦЬ АПОШНЯЙ ХВАЛІ

У пачатку 1990-х гг., пасьля распаду Савецкага Саюзу, пачалася чарговая хваля іміграцыі, якая спачатку была немаштабнай. Некаторыя з новых імігрантаў далучаліся да ўжо існых беларуска-амэрыканскіх арганізацый, іншыя раствараліся ў шырокай расейскамоўнай супольнасьці. Пазьней, пасьля пашырэньня на постсавецкія краіны амэрыканскай іміграцыйнай лятарэі і пагаршэньня эканамічнага становішча ў Беларусі, колькасьць імігрантаў значна павялічылася, што дало падставы гаварыць пра новую хвалю.

Заходнія краіны сталі магнітам і для тых, хто баяўся перасьледу за сваю антыўрадавую палітычную дзейнасьць, удзел у дэмакратычных дэманстрацыях ці нават сяброўства ў незарэгістраваных няўрадавых арганізацыях. Шмат хто прасіў палітычнага прытулку, каб атрымаць магчымасьць жыць і працаваць ва ўпадабанай краіне. Студэнты, адлічаныя з ВНУ за сваю палітычную ці праваабарончую дзейнасьць, далучаліся да эміграцыйнай хвалі для працягу свайго навучаньня за мяжой. Найбольшую групу ўсё ж складалі тыя, хто пакідаў Беларусь з эканамічных прычынаў.

За апошняе дзесяцігодзьдзе гэтыя эканамічныя эмігранты сталі значнай часткай сусьветнай беларускай дыяспары. Часамі яны адчуваюць патрэбу далучыцца да старых імігрантаў у справе сьвяткаваньня нацыянальных урачыстасьцяў ці зь нейкіх іншых прычынаў, але ў цэлым больш камфортна пачуваюцца ў межах шырэйшай постсавецкай расейскамоўнай супольнасьці, накшталт насельнікаў раёну Брайтан-Біч у Нью-Ёрку і аналягічных раёнаў у іншых гарадах. Так сталася галоўным чынам у выніку працяглай русіфікацыі: адукацыю гэтыя пе-

расяленцы атрымлівалі ў асноўным на расейскай мове. Апроч таго, доўгае ўзьдзеяньне камуністычнай атэістычнай ідэалёгіі зрабіла многіх зь іх нявернікамі ці «намінальнымі вернікамі». А паколькі дзейнасьць дыяспары ў немалой ступені працякае ў рэлігійных асяродках, яны лічаць за лепшае трымацца ўбаку ад яе. У выніку эканамічныя імігранты, як правіла, не ўступаюць у наяўныя беларускія арганізацыі, а жывуць пераважна сямейным клопатам. Некаторыя зь іх падтрымліваюць цесныя кантакты са сваімі сваякамі і сябрамі ў Беларусі, іншыя толькі зрэдку наведваюць радзіму. Гэты вялікі сэгмэнт эмігранцкай супольнасьці застаецца за межамі арганізаванай дыяспары і, такім чынам, па-за рамкамі гэтага артыкулу.

## «ДАЛУЧЭНЦЫ» І ІНШЫЯ

Астатнія імігранты і (або) палітычныя ўцекачы падзяляюцца на дзьве асноўныя катэгорыі — тых, хто далучаецца да існых арганізацыяў, і тых, хто ўважае за лепшае заснаваць свае ўласныя. У адрозьненьне ад эканамічных імігрантаў, яны захоўваюць цікавасьць да сытуацыі ў Беларусі і робяць захады ў падтрымку свабоды і дэмакратыі на радзіме.

Некаторыя зь іх уступаюць у грамадзкія, культурныя, навуковыя і палітычныя арганізацыі, а таксама далучаюцца да шматлікіх беларускіх цэркваў. Шмат у якіх выпадках іхная абазнанасьць у кампутарах і карыстаньне інтэрнэтам спрыяе мадэрнізацыі закасьнелых структураў, дазваляе ўмацаваць ці замяніць іх друкаваныя органы прывабнымі сучаснымі інтэрнэт-бачынамі. Многія з маладых імігрантаў пераймаюць лідэрства ў такіх арганізацыях па меры адыходу ад справаў старога кіраўніцтва, што часам прыводзіць да зьменаў у характары і мэтадах дзейнасьці такіх арганізацыяў і структураў. З пункту гледжаньня «вэтэранаў», якія схільныя забыць пра свае ўласныя даўнейшыя ўнутраныя канфлікты, навічкі менш здольныя да супольнай і зладжанай працы ў калектыве і насілу ідуць на кампрамісы дзеля супольнай карысьці. Гэта расцэньваецца некаторымі назіральнікамі як вынік выхаваньня ў аўтарытарнай атмасфэры Савецкага Саюзу. Аднак ёсьць падставы меркаваць, што, апынуўшыся пад уплывам больш лібэральных заходніх каштоўнасьцяў, найбольш адказныя зь іх у будучыні прынясуць усё ж карысьць беларуска-амэрыканскім грамадзкім і рэлігійным арганізацыям.

Іншыя дзеячы, маладзейшыя і, магчыма, больш спрактыкаваныя, лічаць дзейныя беларускія структуры састарэлымі і недастаткова дынамічнымі. Так, паводле словаў аднаго актывіста,

*цяперашняя дыяспара больш засяроджваецца на арганізацыі сьвятаў, вечарынаў і да таго падобных падзеяў. Мы ж прапануем новую мадэль дыяспарнай дзейнасьці, заснаванай на арганізацыі неабходных (праваабарончых і палітычных) кампаніяў і камунікацыі праз інтэрнэт. Тут ужо неістотна, знаходзімся мы ў Вашынгтоне, Флорыдзе або Каліфорніі. Жывучы ў Злучаных Штатах, зусім не абавязкова ўступаць у мясцовыя арганізацыі; мы можам далучыцца*

*(праз інтэрнэт) да брусэльскіх, парыскіх ці любых іншых, якія нас зацікавяць. Я не магу сказаць, што я амэрыканскі беларус, хутчэй я беларус глябальнай дыяспары.*

Разважыўшы больш цьвяроза, можна засумнявацца, ці доўга пражыве такая вера ў віртуальныя кантакты бяз тых ці іншых рэальных сувязяў і супрацы.

Кіруючыся сваёй канцэпцыяй віртуальнай арганізацыі, такія актывісты засноўваюць вялікую колькасьць вэб-сайтаў, інтэрнэт-дзёньнікаў і чатаў. Некаторыя зь іх бяруць на сябе клопат аб пошуку сродкаў, неабходных для іх падтрымкі і разьвіцьця, другія займаюцца гэтым на хвалі энтузіязму, які, на жаль, хутка згасае. Трэція, падаўшы заяўку на грант і атрымаўшы фінансавую падтрымку для стварэньня вэб-сайту, аказваюцца няздольнымі як сьлед выканаць свае абяцаньні і ўрэшце зьнікаюць з далягляду, як толькі выдзеленыя грошы канчаюцца. (Рыхтуючы гэты артыкул, я прагледзеў некалькі такіх сайтаў. На адным я ўбачыў толькі аб'яву аб продажы дамэннага імя, другі ж, хоць і разьмяшчаўся па старым адрасе, цяпер прапагандаваў не дэмакратыю, а парнаграфію.)

Некаторыя прадпрымальныя новапрыбышы ідуць далей за стварэньне сайтаў. Яны засноўваюць, і часам нават рэгіструюць, цэлыя арганізацыі зь мінімальнай колькасцю ўдзельнікаў, але як мага гучнейшымі назвамі, накшталт Зьвязу беларускіх палітычных уцекачоў, Беларуска-эўрапейскага задзіночаньня, Беларускага моладзевага руху Амэрыкі, Зьвязу беларусаў замежжа і г. д. Пад такімі назвамі ім удаецца атрымліваць гранты на тыя ці іншыя спэцыфічныя праекты або пасьпяхова зьбіраць ахвяраваньні на сваю шматстайную дзейнасьць. У некаторых выпадках яны ня толькі канкуруюць зь іншымі, больш аўтарытэтнымі арганізацыямі і структурамі, але і прыпісваюць сабе ў сваіх рэклямных матэрыялах (асабліва на ўласных вэб-сайтах) практычна ўсё беларускае прадстаўніцтва ў тым ці іншым рэгіёне.

Нарэшце, трапляюцца сярод новых імігрантаў і людзі з больш цёмнымі намерамі. Яны ахвотна ўступаюць у існыя арганізацыі і прыкладаюць усе намаганьні, каб стаць іх паважанымі сябрамі. Іх вонкавая адданасьць справе беларускай дэмакратыі дазваляе ім заваяваць давер старэючых лідэраў. У выніку яны апынаюцца на кіроўных пасадах, пасьля чаго маскі зрываюцца і робіцца зразумелай іхная прыхільнасьць да дыктатуры, а таксама спробы пераняць кіраўніцтва ў арганізацыі. Адна такая спроба, якая ледзь не завяршылася посьпехам, мела месца ў нью-ёрскай супольнасьці.

Паводле словаў аднаго з вышэй згаданых новапрыбышоў, галоўнае адрозьненьне паміж старой і новай дыяспарамі палягае ў жаданьні маладых імігрантаў урэшце вярнуцца ў Беларусь. Між тым, трэба адзначыць, што якраз вяртаньне было галоўнай мэтай прадстаўнікоў старой дыяспары паўстагодзьдзя таму. Даўгавечнасьць камуністычнага таталітарнага кіраваньня перашкодзіла рэалізацыі гэтай мэты. Што ж, паглядзім, ці не паўторыцца гэты сцэнар сёньня, калі панаваньне дыктатарскага рэжыму ў Беларусі зацягнецца.

## ВЫСНОВЫ

Што трэба зрабіць для таго, каб перадача эстафэты ад пасьляваенных імігрантаў да нашых сучасьнікаў прайшла як мага больш бязбольна? Мабыць, галоўнай перашкодай гэтаму ў свой час сталася трываласьць савецкага рэжыму ў Беларусі. Ён панаваў там амаль пяцьдзясят гадоў пасьля вайны — на працягу жыцьця двух пакаленьняў. Першыя лідэры пасьляваеннай хвалі імігрантаў даўно адышлі, а іх наступнікі, якія яшчэ жывуць, ужо самі ў паважных гадах, што стварыла сур’ёзны разрыў пакаленьняў паміж старымі і новымі імігрантамі. Гэты разрыў цяжка пераадолець бяз тых ці іншых выдаткаў, але ўдалыя прыклады ўсё ж ёсьць. Для таго каб дасягнуць посьпеху ў гэтай справе, трэба шукаць добрасумленных пэрспэктыўных лідэраў сярод маладых імігрантаў, але не надаваць ім адразу ключавых пасадаў, а спачатку цярпліва вучыць прынцыпам дэмакратычнага кіраваньня. У выніку такое навукі могуць з часам паўстаць каштоўныя прафэсіяналы і адказныя палітычныя лідэры, якія ў патрэбны момант вернуцца ў Беларусь, каб дапамагчы адукаваць тамтэйшае грамадзтва і прывесьці краіну да незалежнасьці, заснаванай на прынцыпах дэмакратыі, павагі да законаў і правоў чалавека, як гэта сталася ў суседніх прыбалтыйскіх дзяржавах.

Якія захады ў гэтым кірунку прадстаўнікі беларускай дыяспары ў ЗША робяць ужо цяпер? У прыватнасьці, яны дапамагаюць некаторым новым імігрантам асвоіцца на новым месцы, сустракаючы іх у аэрапортах і праводзячы да першых кватэраў. Наступны крок — дапамога ў атрыманьні карткі сацыяльнага забесьпячэньня, неабходнай для працаўладкаваньня. Затым маладыя іміграньты могуць быць азнаёмленыя зь мясцовымі беларускімі арганізацыямі і царкоўнымі парафіямі. Пэўная апека надаецца тым, хто шукае палітычнага прытулку. Адразу пасьля пасяленьня на новым месцы ім дапамагаюць навязаць кантакты зь мясцовымі і фэдэральнымі органамі ўлады. Новапрыбылыя, у сваю чаргу, ставяць на службу заапекаваным над імі арганізацыям свае прафэсійныя навыкі, а таксама павялічваюць масавасьць дэманстрацый у падтрымку дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Такое ўзаемакарыснае супрацоўніцтва ўмацоўвае існыя арганізацыі, а таксама забясьпечвае выхаваньне наступнага пакаленьня лідэраў дыяспары.

# ГІСТОРЫЯ

ВІКТАР ЖЫБУЛЬ

# Футурыстычная мара беларусаў

## Дзейнасьць «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны» ва ўспамінах і дакумэнтах

Літаратурна-мастацкая плынь футурызм у нашай сьвядомасьці асацыюецца альбо з жоўтай кофтай Маякоўскага, альбо з «завумнымі» вершамі Кручоных і словатворчасьцю Хлебнікава, альбо з жывапісам Ганчаровай, Ларыёнава, Малевіча, альбо — калі зірнуць далёка на Захад — з ваяўнічым тэхнакратызмам Марынэцці. Зрэшты, акрамя Расеі ды Італіі, футурыстычныя групоўкі былі таксама ва Ўкраіне, у Польшчы ды ў іншых краінах.

А што мы ведаем пра футурызм у Беларусі? У энцыкляпэдычных даведніках расповед пра гэта пабудаваны звычайна наступным чынам: напачатку — згадкі пра гастролі расейскіх футурыстаў у Менску, пра ацэнкі футурызму ў беларускай (але расейскамоўнай) прэсе пачатку XX ст., потым — пра малевічаўскі УНОВИС і віцебскую школу мастацкага авангарду і нарэшце — адсылка да дзейнасьці «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», часам са згадкаю прозьвішчаў некаторых яе ўдзельнікаў: *«Асобныя рысы паэтыкі ф[утурызму] ўласьцівы творчасьці маладых бел[арускіх] паэтаў П. Шукайлы, Я. Відука (Я. Скрыгана) і інш.»*[1]. Сёньня, у кантэксьце інтарэсу да агульнаэўрапейскіх авангардысцкіх пошукаў, «Літкамуна» (менавіта так найчасьцей скарачаецца назва аб'яднаньня) цікавіць нас перадусім як першая (і апошняя) у Беларусі літаратурная арганізацыя, узьніклая на футурыстычнай аснове, паводле скіраванасьці блізкая расейс-

---

*__Віктар Жыбуль__ — пісьменьнік, гісторык літаратуры. Сёлета ў выдавецтве «Галіяфы» выйшла кніга яго паэзіі «Забі ў сабе Сакрата!» (сумесна зь Верай Бурлак).*

каму «Лефу» («Левому фронту искусств») і ўкраінскай «Новой генерації». Суполка «з арыентацыяй на стварэньне «левага» — футурыстычнага, калі ня «фронту», дык хоць «флянгу» беларускае літаратуры»,[2] — так ахарактарызаваў «Літкамуну» вядомы крытык Антон Адамовіч.

Да нядаўняга часу асноўнымі крыніцамі інфармацыі пра дзейнасьць «Літкамуны» былі два нумары часопісу «Росквіт», выдадзеныя суполкай, а таксама ўспаміны Яна Скрыгана (найбольш поўна прадстаўленыя ў апошнім выданьні яго выбраных твораў (Беларускі кнігазбор, 2005)) і часткова — некаторых іншых літаратараў (Юркі Віцьбіча, Рыгора Крушыны, Барыса Мікуліча). Непасрэдныя дакумэнты суполкі лічыліся страчанымі, але два гады таму высьветлілася, што яны цудам захаваліся, нягледзячы на ўсе нягоды часу. Знайшліся яны ў Маскве, у кватэры на Вялікай Паштовай вуліцы, дзе апошнія гады жыў былы кіраўнік «Літкамуны» Паўлюк Шукайла (1904—1939), і дзе цяпер жыве зь сям'ёй ягоная дачка Натальля Яфімава.

Якім жа чынам дайшлі да нас дакумэнты суполкі? У 1938 г., незадоўга да арышту Шукайлы, ягоная былая жонка Марыля Лягеева склала мужавы рукапісы на дно вялікага плеценага каша, а зьверху зваліла кучу бруднай бялізны. Бялізна выглядала так непрэзэнтабэльна, што чэкісты, якія неўзабаве прыйшліператрэсьці кватэру, пагрэбавалі нават зазірнуць у гэты кош і пайшлі ні з чым. А рукапісы так і праляжалі ў кашы амаль семдзесят гадоў, пакуль аўтар гэтых радкоў не пацікавіўся ў нашчадкаў пісьменьніка, ці не захавалася ў іх хоць што-небудзь, зьвязанае з жыцьцём Паўлюка Шукайлы.

У знойдзеным паэтавым архіве дакумэнты «Літкамуны» — бадай і ёсьць тое, што падаецца нам найбольш цікавым і каштоўным[3]. Гэта пераважна пратаколы сходаў арганізацыі пэрыяду, ахопленага студзенем — траўнем 1928 г., грашовыя справаздачы, а таксама акт аб ліквідацыі суполкі й некалькі асобных дакумэнтаў ранейшага пэрыяду. Усе яны даюць больш поўнае ўяўленьне пра склад аб'яднаньня, атмасфэру ў ім, праліваюць сьвятло на творчыя пляны ўдзельнікаў, распавядаюць пра іх эстэтычныя прыхільнасьці. Тым болей цікава супаставіць інфармацыю, адлюстраваную ў дакумэнтах, зь вядомымі ўспамінамі сяброў суполкі й іх сучасьнікаў — каб мова афіцыйных пратаколаў дапаўняла мэмуарны тэкст і наадварот. Гэта дапаможа нам аднавіць і прадставіць як мага больш падрабязна хроніку дзейнасьці «Літкамуны» ад пачатку і да канца яе існаваньня. Для ўсёй паўнаты карціны аўтар гэтай публікацыі скарыстаў і іншыя зьвесткі, выяўленыя ў фондах Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь (НАРБ) і Беларускага Дзяржаўнага архіву-музэю літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ).

Пачаць, напэўна, варта зь перадгісторыі. Непасрэднаму нараджэньню арганізацыі папярэднічаў шэраг падзей у жыцьці яе будучых удзельнікаў — падзей (і далёка не заўсёды зьвязаных зь літарату-

[1] Конан У. М. Футурызм // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 16. Мінск: БелЭН, 2003. С. 509.

[2] Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры. Менск: Выдавец Зьміцер Колас, 2005. С. 1030.

[3] Акрамя іх захаваліся, напрыклад, дакумэнты, зьвязаныя з працаю П. Шукайлы ў Маскве і Ленінградзе (уключаючы стэнаграмы пасяджэньняў кінасэкцыі Дзяржаўнай акадэміі мастацтвазнаўства), фрагмэнты ягоных артыкулаў і тэкстаў лекцый, некалькі вершаў (у тым ліку напісаныя парасейску незадоўга да арышту) і інш.

рай), безь якіх суполка, можа, і не ўтварылася б у тым выглядзе, у якім яна засталася ў летапісе айчыннага пісьменства.

## 1. «ЧОРТ ВЕДАЕ, ЯК ХОЧАЦЦА...», АЛЬБО ТУРБОТЫ ПРАВІНЦЫЙНЫХ МАЛАДНЯКОЎЦАЎ

Як вядома, «Літкамуну» арганізавалі маладыя пісьменьнікі, якія павыходзілі з «Маладняка». Адзін з заснавальнікаў гэтай суполкі Ян Скрыган (1905—1992; у 1920-я гг. больш вядомы пад псэўданімам Янка Відук) быў невысокага меркаваньня аб прычынах яе ўтварэньня, вытлумачваючы іх банальнымі амбіцыямі, танным жаданьнем самавызначыцца:

*Арганізацыя гэта заснавалася не ад духу часу і творчай патрэбы, а ад зухаватасьці і пратэсту: «Ах, вы нас у «Маладняку» не прызнаеце? Ну дык мы зробім сваё згуртаваньне»*[4].

Але ж якія падставы былі ў «Маладняка» не прызнаваць гэтых амбітных юнакоў? І супраць чаго тыя, у сваю чаргу, пратэставалі? Што ж дало штуршок для стварэньня новай суполкі з гучнай і шматабяцальнай для таго часу назвай — «Беларуская Літаратурна-Мастацкая Камуна»? Адказы на гэтыя пытаньні паспрабуем пашукаць у мэмуарах таго самага Яна Скрыгана — балазе, менавіта ён першым з будучых «літкамунаўцаў» у канцы 1926 г. апынуўся за бортам «Маладняка». А гісторыя — у выкладцы пасталелага Скрыгана — такая: ён, тады яшчэ малады паэт Янка Відук, даслаў з Расонаў у Менск кіраўніцтву «Маладняка» сшытак сваіх вершаў. Толькі неўзабаве яму іх вярнулі: Алесь Дудар напісаў, што вершы слабыя. Расчараваны Відук спаліў сшытак, а Дудару напісаў паштоўку, як ён потым сьцьвярджаў, *«не зусім згаджаючыся зь яго ацэнкай «новай плыні»*. Пачаўшы разважаць, якой мае быць новая «рэвалюцыйная паэзія», Відук задумаўся і сам не заўважыў, як *«скрэмзаў усю паштоўку рознымі завітушкамі, жаночымі галоўкамі, чорцікамі. Але перапісваць ня стаў»*[5]. Вось пасьля гэтага і прыйшло яму паведамленьне, што ён выключаны з «Маладняка» за хуліганства.

Пішучы свае мэмуары, Ян Скрыган пра нешта пасаромеўся, а пра нешта, мабыць, і проста забыўся згадаць. Палеміка з Дударом і размалёўваньне паштовак — яшчэ недастатковая падстава, каб палічыць гэта за хуліганства і выключыць маладога здольнага паэта з творчай арганізацыі. Справа выглядала насамрэч куды больш сур'ёзна.

Паштоўка была толькі адным зьвяном у ланцугу доўгага і бясплённага ліставаньня Янкі Відука, які жыў тады ў невялічкіх Расонах, з Цэнтральным Бюро «Маладняка» — перапіскі, што адбывалася цягам лета — восені 1926 г. На першыя два лісты (яны не захаваліся) кіраўніцтва паважанай літаратурнай суполкі ніяк не адрэагавала, і ў наступным, трэцім (ад 20 жніўня), Відук выказаў сваё расчараваньне з нагоды «маўчаньня» яшчэ пакуль што «самай дарагой» для яго арганізацыі й прывёў як прыклад Слуцкую філію (якой кіраваў Паўлюк Шукайла), дзе і *«пратакол атрымаеш ды штонебудзь спазнаеш»*, і *«азнаёмісься са становішчам»*... Заканчваўся ліст словамі: *«Можа, зараз у Менску буду. Чорт ведае,*

[4] Скрыган Я. Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2005. С. 59.

[5] Тамсама. С. 57—58.

*як хочацца...»*[6]. Напэўна, якраз пасьля гэтага Відуку і вярнулі ягоны сшытак зь вершамі, бо 17 верасьня ён паслаў тую самую скрэмзаную «чорцікамі» й «жаночымі галоўкамі» (між іншым, ня толькі галоўкамі!) паштоўку. Толькі вось ніякай «нязгоды з ацэнкай «новай плыні» там няма, а ёсьць зноў жа нараканьні на няўвагу да правінцыйных аўтараў *(«глас вопиющего в пустыне»... вядома, гіне»)* і кпінкі на адрас менскіх маладнякоўцаў. Калі ў мінулым лісьце ён назваў іх проста «добрымі парасятамі», то цяпер зусім не саромеўся ў выразах. Так, пачаў ён свой зварот словамі *«Здаровы дудары, Зарэцкія, Дубовікі і розныя такія шмэндрыкі!»*, а закончыў яшчэ больш нястрымана-эмацыйна: *«Усё глупства. К[…]най мацяры — бу-ух! Амінь. Бывайце, застаюся сукін сын Відук»*. І на палёх як бы між іншым заўвага: *«Знаеце, хлопцы, — хачу ажаніцца як бабцю дрыпцю»*[7].

Пакуль прадстаўнікі маладнякоўскага кіраўніцтва чухалі патыліцы, думаючы, як бы на такое адрэагаваць, Янка Відук таксама, напэўна, вырашыў паразважаць і даслаць яшчэ адзін ліст — толькі на гэты раз з падрабязным тлумачэньнем сваёй крыўды. Мы нават можам скласьці ўяўленьне пра стылістыку і скіраванасьць вершаў з таго «забракаванага» і спаленага аўтарам сшытка. Напэўна, зачапіўшыся за Скрыганова выказваньне пра «рэвалюцыйную паэзію», якая «выкрывае нешта новае», Янка Казека[8], а ўсьлед за ім і Лада Алейнік[9] вырашылі, што гэтыя творы былі футурыстычныя. Аднак зьмест Відуковага ліста ў ЦБ «Маладняка» ад 28 верасьня 1926 г. сьведчыць пра іншае. Футурызм маладога Янку Відука тады яшчэ не цікавіў, як не цікавіў і раней *(«Мяне ніколі не цягнула душой да футурызму»*, — прызнаўся ён у аповедзе пра свой слуцкі пэрыяд жыцьця). А вось «Ясеніным у квадраце» яго назваць пасьпелі ўжо. Відук абураўся, адкрыта выказваючы ў дачыненьні да больш пасьпяховых калегаў творчую рэўнасьць: *«Калі Пушчы і іншых друкуюцца вершы ясенінскага тыпу і тыпу супроць грамадзкага, дык выбачайце, калі ласка, хіба ж на яго няма «Вашае» цэнзуры»*. Разам зь лістом будучы літкамунавец дасылаў яшчэ нейкі «матэрыял для зборніка» (у архіве не захаваўся) і даволі катэгарычна заяўляў: *«калі мой хоць адзін верш не падыходзіць па ідэалёгіі і зьместу, дык тады трэба спаліць усю Vity»*[10], маючы на ўвазе другі зборнік (1926) Язэпа Пушчы. (Усё ж «футурызм» і «вершы ясенінскага тыпу» — рэчы абсалютна розныя, а ў нейкім сэнсе нават супрацьлеглыя.) Акрамя таго, паэт ізноў уздымаў праблему няўважлівасьці ЦБ «Маладняка» да правінцыйных аўтараў, і трэба сказаць, праблему даволі актуальную, нават вострую. На прыкладзе гісторыі зь Янкам Відуком мы можам пабачыць слабыя месцы «Маладняка»: спрабуючы манапалізаваць літаратурнае жыцьцё ў Беларусі, арганізацыя набрала ў свае шэрагі некалькі сотняў сяброў, кандыдатаў у сябры і прыхільнікаў, а вось даваць ім усім належныя рэкамэндацыі й кансультацыі, праводзіць сярод іх літаратурную вучобу магчымасьць была далёка не заўсёды,

[6] БДАМЛіМ. Ф. 225. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 43.
[7] Тамсама. Арк. 46.
[8] Гл.: Казека Я. Пра тое, што помніцца: Шукальнік скарбаў слова // Полымя. 1997. № 12. С. 196—197.
[9] Гл.: Алейнік Л. Кругі лёсу і творчасці Яна Скрыгана // Роднае слова. 2005. № 10. С. 8.
[10] БДАМЛіМ. Ф. 225. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 55адв.



Зьлева направа: Сьцяпан Сямашка, Паўлюк Шукайла, Пятрусь Броўка, Янка Відук. Полацак, жнівень 1927




«Росквіт», № 1.
Вокладка. Мастак Анатоль Тычына.
1927




«Росквіт», № 2. Вокладка.
Мастак Уладзімер Бохан. 1928

Кадр дасі новага беларускага баявіка з жыцьця цэнтральнай прэсы, вытворчасьць невядомых. Галоўныя асобы ніжэй адзначаны. Аб рэжысуры ў наступным нумары.




«Башня молчания». Карыкатура. Мастак Уладзімер Бохан. 1928

асабліва ў правінцыі. Толькі ж даводзіў свае просьбы і скаргі малады паэт часам даволі гарэзьліва. На гэты раз будучы футурыст закончыў свой ліст наступнаю тырадаю:

*Гоп, гоп, гоп*
*гэй, гэй, гэй*
*тра-ля-ля*
*лю, лю-лю*
*ф-і-і-і-й-й-ф-і-т! — панёс*[11].

Паўлюк Шукайла, які тады часта бываў у Менску, падтрымліваў зь сябрам сувязь, таму Відук быў у курсе асноўных маладнякоўскіх справаў, тым болей, тых, якія датычыліся непасрэдна яго. Як высьветлілася, Алесь Дудар пабачыў у лістох расонскага паэта асабістую абразу і нават «напад» на свой аўтарытэт (ужо ня кажучы пра зьнявагу арганізацыі), а самаго Відука пачалі лічыць ледзьве не вар'ятам — прынамсі, «дуракаватым», і вырашылі выключыць са складу аб'яднаньня. Карацей кажучы, менскія маладнякоўцы пакрыўдавалі: маўляў, Відук *«нас бачыў раз, мы зь ім агульнага нічога ня маем, ня ведаем яго, а ён...»*[12]

Відука таксама моцна зачапіла такая рэакцыя, але канфліктаваць з «Маладняком» ён не зьбіраўся. Наадварот, 2 кастрычніка ён напісаў доўгі ўсхвалявана-разгублены (і апошні з гэтае сэрыі) ліст, дзе ў шматслоўных фразах выбачаўся за сваю «таварыскую, проста-маладнякоўскую адкрытку», «нявінную простую шутку», прасіў зьняць зь яго шыльду «дуракаватага», даць «належнае пісьмовае тлумачэньне справы» і чарговы ўжо раз казаў пра недахоп крытычнай увагі да маладнякоўцаў-правінцыялаў[13]. Але, сам таго не жадаючы, паэт гэтым сваім лістом толькі падклаў саломы ў агонь: прачытаўшы пісьмо, сябры Цэнтральнага Бюро 6 кастрычніка ўзялі й сапраўды выключылі Відука з «Маладняка» (пра што сьведчыць адпаведны вэрдыкт у левым верхнім куце першай старонкі) — як мы ўжо ведаем, «за хуліганства». І толькі цяпер, калі пісаць яшчэ якія-кольвек лісты маладнякоўскаму кіраўніцтву было ўжо бессэнсоўна, Відук, для якога ўрокі шукайлаўскай школы не прайшлі дарэмна, рэзка зьмяніў літаратурную арыентацыю. Ягоны чарговы верш «Пэрлы дзён» напісаны лесьвічкай і адлюстроўвае новыя для паэта настроі — задзірысты выклік грамадзе (перадусім літаратурнай) + бязьмежную самазахопленасьць:

*Мой жыцьцяцьвет*
*ня стане жоўталісьцем,*
*і не сьпяе*
*сымфонію мне ростань.*
*Я не хачу*
*узьлезьці на узвышша —*
*няхай само*
*узвышша мяне просіць...*[14]

Алюзія тут празрыстая: «Калі гара не ідзе да Магамэта, дык Магамэт пойдзе да гары»... Верш датуецца 15 кастрычніка 1926 г. Думаецца, менавіта ад гэтай даты і трэба адлічваць пачатак шляху Відукафутурыста. *«Я не хачу узьлезьці на узвышша...»* Не, наўрад ці малады паэт намякаў на літаратурнае аб'яднаньне «Ўзвышша»: яно тады было «нованаро-

[11] БДАМЛіМ. Ф. 225. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 55.
[12] Тамсама. Арк. 50.
[13] Тамсама. Арк. 51.
[14] Наддзьвіньне. Полацак: Выд. Полацкай філіі «Маладняка», 1926. С. 72.

джанае» і яшчэ не пасьпела шырока заявіць пра сябе. Але пэўны прыклад узвышэнцаў «Літаратурная Камуна» ўсё ж скарыстала. Прыклад, вядома ж, не эстэтычны, а арганізацыйны: маўляў, яны павыходзілі з «Маладняка» і ўтварылі сваю суполку, і мы зробім тое самае.

Цікава, што верш, напісаны паэтам, можна сказаць, з нагоды ягонага выключэньня з «Маладняка», быў вельмі хутка апублікаваны ў выданьні, якое ўбачыла сьвет пад шыльдаю гэтай арганізацыі, — у альманаху «Наддзьвіньне» Полацкай філіі «Маладняка»[15]. Гэта ў Менску да Відука маглі ставіцца скептычна ці абыякава, на Полаччыне ж ён быў каштоўны і незаменны кадар, адзін з тых, хто рухаў тамтэйшае літаратурнае жыцьцё. Да таго ж, па ўсім відаць, выключэньне з «Маладняка» зусім не азначала забарону друкавацца ў яго рэгіянальных выданьнях.

Выступіў у «Наддзьвіньні» і Паўлюк Шукайла — з грамадзянска-патрыятычным вершам «На Беларусі», лірычным прысьвячэньнем «Марыльцы», а таксама невялікім урыўкам з аповесьці «Аднойчы вясною...».

У той час, калі пісаліся ўсе гэтыя творы, рэальнае жыцьцё і Відука, і Шукайлы было напоўненае даволі небясьпечнымі авантурамі. І тут мела месца ня толькі эпісталярнае высьвятленьне дачыненьняў з маладнякоўскім кіраўніцтвам, але яшчэ і прыгоды на працоўным фронце. У мэмуарах Ян Скрыган піша пра свае службовыя справы коратка:

*Намысьліў ехаць у тыя ж Расоны. Тым больш што Шукайла зваў у лістах: абавязкова прыяжджай, работа знойдзецца...*

*Я працаваў загадчыкам нардому. Ён мясьціўся... у залі колішняй царквы. Гэты час я вельмі люблю, мне здаецца, што тады мы многа рабілі і дружна жылі — рабаціністы сакратар Макар Шалай, загадчыкі аддзелаў Ліда Іванова, Паўлючэнка, Ткачэнка.*

*Мяне пасылалі па сёлах праводзіць сходы, наладжваць культработу, рабіць даклады, асабліва па міжнародным становішчы. Езьдзіць надта не было на чым, найбольш хадзіў пехатою*[16].

Пасталелы пісьменьнік, які да таго ж прайшоў рэпрэсіі, не апісаў усіх падрабязнасьцяў свайго працаўладкаваньня, бо гэта відавочна не адпавядала ўяўленьням партыйнае маралі і яшчэ ў 1960-я гады (калі пісаўся разьдзел успамінаў «Сьвітанак») успрымалася як элемэнт крыміналу.

Рэч у тым, што загадчыкам раённага народнага дому (агітпрапу) у 1920—1930-я гг. мог стаць толькі член камуністычнае партыі. Янка Відук жа быў ня толькі беспартыйны, але й нават лічыўся «сынам кулака»[17], таму шлях у нардом яму быў закрыты. Спроба падаць заяву аб уступленьні ў камсамол посьпехам не закончылася. Відуку адмовілі: маўляў, чалавек новы, ні ў чым яшчэ сябе ня выявіў. Але Паўлюк Шукайла пачаў старанна дапамагаць таварышу. Па ягонай падказцы Відук падаў заяву адразу ў партыю. І, як ні дзіўна, райкам зацьвердзіў яго ў званьні кандыдата партыі (хоць, зь іншага боку, што тут дзіўнага, калі чулы да сяброў і вынаходлівы Шукайла менавіта ў тым райкаме і працаваў). А паводле тагачаснага ста-

[15] Тамсама зьмешчаны і яшчэ адзін тагачасны верш Я. Відука — «Зь лейцамі сьвежых дум».

[16] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 55—57.

[17] Пазьней яго бацькі былі арыштаваныя і высланыя пад Котлас, дзе і загінулі.

туту, кандыдаты партыі, маладзейшыя за 23 гады (Відуку на той момант быў 21 год) аўтаматычна зьяўляліся членамі камсамолу — не падкапаесься! Толькі ў акруговым камітэце партыі ад прыёму ў кандыдаты партыі ўстрымаліся — бо не было рэкамэндацыі райкаму камсамолу. У выніку Відука не зацьвердзілі ні там, ні там, але Шукайла рабіў усё магчымае, каб на паперках Янка выглядаў існцінным камсамольцам і камуністам. Дый сам ён ва ўжо цытаваным вершы «Пэрлы дзён» пісаў: *«Мая душа і сіла ў камсамоле...»*

Пакуль цягам восені 1926 г. дакумэнты блукалі паміж некалькімі ўстановамі, беспартыйнага Відука прызначылі загадчыкам агітпрапу райкаму камсамолу. На ўсе катэгарычныя прапановы вышэйшых інстанцый адхіліць Відука ад працы ў райкаме КСМ Шукайла адказваў прыкладна наступнае: думайце, як заўгодна, а мы Відука пакідаем у агітпрапе камсамолу[18].

Уся гэтая гісторыя пра «нечуванае ў гісторыі Камсамолу прызначэньне» нарабіла столькі шуму, што патрапіла нават на перадавіцу маскоўскай газэты «Комсомольская правда» ў выглядзе фэльетону Ільлі Ліна «Где охотник?».

*Пока суд да дело, пока бумаги о замечательной личности Видука порхают из района в округ и обратно, сей талантливый юноша упорно взбирается по лестнице славы,*[19]

— пісаў фэльетаніст. Дасталося і Шукайлу — *«охотнику порадеть родному человечку»*.

Нядзіва, што партыйнае кіраўніцтва ўсур'ёз зацікавілася свавольным сакратаром райкаму. Пакуль Шукайла ўдзельнічаў у працы Полацкае філіі «Маладняка», выступаў на яе сходах з дакладамі кшталту «Літаратура і рэвалюцыя»[20], Цэнтральная кантрольная камісія Камуністычнай партыі завяла на яго справу. Праз тры месяцы, 6 красавіка 1927 г., справа была агучаная на парткалегіі. Акрамя прасоўваньня беспартыйнага сябра ў камсамол і партыю, Шукайла (цяпер ён быў ужо сакратаром Нацыянальнай камісіі ў Полацку) абвінавачваўся і яшчэ па некалькіх пунктах, а менавіта:

*У замаху ўтварыць склоку ў арганізацыі шляхам пасылкі лісту адк. сакратару другога раёну КПБ з прызывам павесьці барацьбу супроць бюро Акругкому КП(б)Б па пытаньню кіраваньня партарганізацыяй, г. зн. супроць партыйцаў, прысылаемых Акругкомам для работы ў Райком, называючы апошніх авантурыстамі;*

*У грубасьці і нетактычнасьці пры абхаджэньні з супрацоўнікамі Райкаму і РВК, а таксама на пасяджэньні АКК;*

*У хвальбе і кічлівасьці сваёй работай у падпольлі*[21].

У выніку пастанавілі:

*1. Вынесьці т. Шукайла строгі выгавар, за замах утварэньня склокі.*

*2. Адазваць яго з работы ў Полацкай арганізацыі.*

[18] Лин И. Где охотник? // Комсомольская правда. 1927. 5 января. С. 1.

[19] Лин И. Где охотник? // Комсомольская правда. 1927. 5 января. С. 1.

[20] Даклад з такой назвай быў прачытаны П. Шукайлам 15 студзеня 1927 г. у памяшканьні Полацкага пэдагагічнага тэхнікуму.

[21] НАРБ. Ф. 15п. Воп. 55. Спр. 5492. Арк. 58.

*3. Зьняць т. Шукайла з партыйнай кіруючай работы тэрмінам на 2 г.*[22]

## 2. ПЕРАД «ЗАБРУДЖАНАЙ ЛУЖАЙ»

Падобна, што ўсе гэтыя санкцыі не напалохалі няўрымсьлівага паэта. Наадварот, атрымаўшы забарону працаваць на Полаччыне і выключаны з «Маладняка», ён разам з жонкай Марыляй (на той час цяжарнай) і яе малодшай сястрой Еўфрасіньняй перабраўся не куды-небудзь, а ў беларускую сталіцу, дзе ўладкаваўся на пасаду навуковага супрацоўніка Інстытуту беларускай культуры. Уладкаваўся, так бы мовіць, авансам, бо ня меў вышэйшай адукацыі. Але выправіць гэтую хібу Паўлюк намерваўся ў найбліжэйшай будучыні: увосень ён зьбіраўся паступіць у БДУ, на літаратурнае аддзяленьне пэдагагічнага факультэту, і падахвочваў да гэтага сяброў-паплечнікаў — каб ніхто не асьмеліўся папракнуць іх, стваральнікаў новага мастацтва, у браку адукацыі! І, вядома ж, Паўлюк Шукайла не марудзячы ўключыўся ў менскае літаратурнае жыцьцё, куды больш бурлівае й насычанае, чым правінцыйнае. Зьявілася магчымасьць праявіць сябе не за трывіяльным сакратарскім сталом, а ў літаратурным працэсе, якому яўна не хапала чагосьці — ня проста гучнага, а шкваліcтага й выбуховага. Беларуская футурыстычная суполка — вось тая незапоўненая ніша, якую даўно марыў заняць Шукайла, і, падобна, у Менску былі створаныя ўсе ўмовы, каб мару гэтую рэалізаваць. Ён спадзяваўся знайсьці тут сабе аднадумцаў — калегаў па футурыстычным цэху, і пачаў навязваць патрэбныя кантакты, а заадно абдумваў ідэйна-эстэтычную канцэпцыю будучай арганізацыі. Толькі вось футурысты нават у сталіцы ўпарта не знаходзіліся: адны працавалі ў зусім іншай творчай манеры, іншыя не жадалі пакідаць «Маладняк» дзеля нейкай пакуль яшчэ няяснай і прывіднай арганізацыі. Шмат хто, асабліва з паэтаў вясковага паходжаньня, ня мог прыняць і зразумець футурызму ўвогуле.

Тым часам Янка Відук, які перайшоў на пасаду адказнага рэдактара газэты «Чырвоная Полаччына», старанна вывучаў полацкі літаратурны асяродак — таксама на прадмет патэнцыйных удзельнікаў футурсуполкі. І таксама сутыкаўся зь цяжкасьцямі, бо і знаёмыя яму палачане ня надта падыходзілі на ролі «ультралевых» літаратараў. Разгубленаму Відуку даводзілася адшукваць ужо нават і не футурыстаў, а хоць каго-небудзь, хто згадзіўся б далучыцца да суполкі. Некаторых даводзілася ўгаворваць даволі доўга. Вось што, напрыклад, пісаў Відук Шукайлу ўлетку 1927 г. пра паэтку (між іншым, даволі таленавітую) Ганну Брэскую:

*На Брэскую таксама спадзявацца нечага. Слабая, і настрой яе ня наш. Хоць гэта нічога — паправілася б. Але ж яна згодзіцца да таго часу, пакуль ня будзе аформлена «Л[ітаратурная] камуна», бо яна ж — с а м а с т о й н а я ў літаратурным сэнсе. А пасьля — яна згодзіцца. Я зь ёю яшчэ пагаманю*[23].

[22] НАРБ. Ф. 15п. Воп. 55. Спр. 5492. Арк. 58.

[23] Архіў Паўлюка Шукайлы летась быў перададзены ў Беларускі дзяржаўны архіў-музэй літаратуры і мастацтва. Тут і далей вытрымкі зь лістоў Я. Відука і П. Броўкі, а таксама дакумэнтаў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны» прыводзяцца паводле гэтай крыніцы: БДАМЛіМ. Ф. 55/252. Воп. 1 (неапрацаваны).

Разлікі Відука не апраўдаліся: Брэская ў «Літкамуну» так і не ўступіла. Але працытуем той самы ліст далей: *«Макару зараз напішу ліст, каб таксама слаў заяву — праўда?»* Гаворка ідзе пра Макара Шалая (сапр. Шалаеў; 1906—1937), які рабіў першыя крокі ў крытыцы і неўзабаве сапраўды далучыўся да суполкі. Акрамя яго, у «Літкамуну» ўвайшоў Сяргей Мялешка (1901—1938) — загадчык Полацкага краязнаўчага музэю, гісторык, які меў да літаратуры вельмі ўскоснае дачыненьне і які нейкі час спрабаваў перакваліфікавацца ў крытыка. Спачуваў «футурыстам» і малады, тады яшчэ ня ўвенчаны ляўрамі паэт, адказны сакратар «Чырвонай Полаччыны» Пятрусь Броўка (1905—1980). У той час ён шмат дапамагаў літкамунаўцам, але сам заставаўся пакуль сябрам «Маладняка». З-за працоўных абставінаў ён пакуль ня мог пакінуць Полацку і фактычна разрываўся паміж дзьвюма літаратурнымі арганізацыямі.

27 ліпеня 1927 г. П. Броўка зьвяртаўся ў лісьце да П. Шукайлы:

*Пішу шмат. Пераважна лірыка, але побач выкідваюцца іншы раз і сацыяльныя матывы. Хутка выдаем другі зборнік* [Маецца на ўвазе «Росквіт» — выданьне Полацкай філіі «Маладняка»; ня блытаць з аднайменным часопісам «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны». — **В. Ж.**]. *Запрашаем прыняць удзел цябе. Дасылай вершы ці апавяданьне. Я яшчэ цьвёрда стаю на «маладняковускім» грунце, але што патрэбна дапамагчы ў адносінах стварэньня Вашай філіі, дапамагу. Працаваць будзем разам. Мэта ж адна? — Беларусь. І як я, так і Вы, мы ня ворагі Беларушчыны і робім адну справу і будзем рабіць. Усё, што будзе залежаць ад мяне, зраблю. Думаю, што Вы знойдзеце сапраўдны шлях беларускай літаратуры, па якім шмат хто пойдзе за вамі. Жадаю найлепшага посьпеху ў працы.*

Падтрыманьне стасункаў Паўлюка Шукайлы з полацкімі сябрамі не абмяжоўвалася адной перапіскай. Часам, калі выпадала некалькі вольных дзён, паэт прыяжджаў на Полаччыну, сустракаўся з таварышамі, абмяркоўваў будучыя справы. У адзін з такіх прыездаў ён сфатаграфаваўся на памяць зь Петрусём Броўкам, Сьцяпанам Сямашкам (тадышнім рэдактарам газэты «Чырвоная Полаччына») і Янкам Відуком, а тыя напісалі на адвароце фатакарткі свае сяброўскія прысьвячэньні. Здымак гэты захаваўся ў Шукайлавым сямейным архіве, праўда, яго адваротны бок моцна выцьвіў і пажоўкнуў, таму расчытаць надпісы на ім даволі няпроста. Найменш расчытаных словаў апынулася ў прысьвячэньні Петруся Броўкі:

*Дарагому братку Паўлюку.*
*Добра* [фрагмэнт тэксту неразборлівы. — **В. Ж.**] *у жыцьці і надалей мы былі так зьяднанымі, як пройдзе час! А гэта безумоўна варта. Беларусь бацькаўшчына, а мы яе верныя сыны. Пяі ж браток заўсёды пра роднае і дарагое.*
*Пятрусь Броўка.*
*18/VIII-27 г.*

Самы лякапічны быў Сьцяпан Сямашка:

*Таму, хто шмат і шмат зрабіў для вольнай бацькаўшчыны нашай, — я гэтыя радкі пішу. 18/VIII-27 г. Сьцяпан Сямашка.*

І, нарэшце, найбольш доўгі — і паэтычны — надпіс пакінуў Янка Відук:

***Паўлюку***

*Ня ведаю,*
*чаму так сэрца б'еццa,*
*калі пачую* [2 словы неразборліва. — **В. Ж.**],
*бо ў нашых дзён няспынным бегу*
*ты волат,*
*ты бадзёрасьцю гарыш.*
*Сустрэліся.*
*Разойдземся.*
*Забудзем*
*драбніцы непрыкметнага жыцьця,*
*а нашыя прыгожыя прэлюдыі*
*не дакрануцца забыцьця*
*і сьвежасьці вясновае ня згубяць.*
*Я многае хачу сказаць.*
*Пачаў,*
*а дагаворыць сама дружба.*
*Паўлюк,*
*«вялікімі» забруджаная лужа*
*наш не супыніць шаг.*

*Я. Відук.*
*18/VIII-27 г.*

Апошнія радкі верша сьведчаць пра тое, што акурат напярэдадні ўтварэньня «Літкамуны» сябры знаходзіліся ў неблагой «футурыстычнай» творчай форме, ваяўнічым настроі, і былі гатовыя ў любы момант абрынуць сваю энэргію на «вялікіх», якія «забрудзілі лужу» беларускай літаратуры.

І вельмі хутка літкамунаўцы сапраўды паказалі сябе. Не прайшло і двух тыдняў, як са старонкі газэты «Зьвязда» (за 28 жніўня) абвяшчалася: *«Ужо напалову афіцыйна існуе «Літаратурная камуна»*. А празь месяц, 27 верасьня, тая самая газэта пісала пра «Камуну» як пра афіцыйную творчую арганізацыю, сябрамі-заснавальнікамі якой былі пазначаныя Апанас Атава (Кананові́ч)[24], Уладзімер Варава[25], Янка Відук (Скрыган), Алесь Гародня[26], Сяргей Мялешка, Макар Шалай, Паўлюк Шукайла. Яны, а таксама прыняты ў наваствораную суполку 15 верасьня Рыгор Казак (будучы вядомы паэт-эмігрант Рыгор Крушына, 1907—1979)[27], і склалі касьцяк «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны»[28].

*Цяпер дык я проста дзіўлюся, як мы асьмеліліся з такім актывамісьці да ўраду і прасіць, каб нас зацьвердзілі як творчую арганізацыю,* — прыгадваў Ян Скрыган. — *Мы ледзьве набралі дзесяць чалавек* [насамрэч сяброў-заснавальнікаў пазначана сем, што і было дастатковай колькасьцю. — **В. Ж.**], *патрэбных па статуце, загадзя ведаючы, што добрая палавіна зь іх уключана ў сьпісак толькі дзеля нормы. І з гэтым сьпіскам пайшлі да старшыні Саўнаркому таго часу Мікалая Галадзеда. Гэта на плошчы Свабоды, у будынку, дзе цяпер музычная школа, і ў пакоі, дзе вісіць таблічка «клясу № 1». Праўда, пасьля надбудовы там усё, здаецца, парушана.*

*Галадзед сядзеў за шырокім сталом, у ваеннай гімнасьцёрцы, з гладка зачэса-*

[24] Атава Апанас (1902—1961) — паэт, раней уваходзіў у Слуцкую філію «Маладняка».

[25] Варава Ўладзімер (1896—1929) — празаік, у мінулым — паплечнік П. Шукайлы па заходнебеларускім падпольлі й па працы ў слуцкай акруговай газэце «Вясковы будаўнік». Загінуў ад рук злачынцы — як тады пісалі, «контрарэвалюцыянэра» Насуты.

[26] Гародня (Функ) Алесь (1899—1944) — празаік і крытык. Рэпрэсаваны, памёр у зьняволеньні.

[27] Заява Рыгора Казака старшыні «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны» захоўваецца ў фондзе П. Шукайлы: БДАМЛіМ. Ф. 55/252. Воп. 1 (неапрацаваны).

[28] Апанас Атава і Сяргей Мялешка ў сходах суполкі амаль ня ўдзельнічалі: яны жылі, адпаведна, у вёсцы Пласток на Любаншчыне і ў Полацку, дзе і прапагандавалі дзейнасьць «Літкамуны».

*ньмі назад валасамі. Ва ўсёй яго пастаці, прамой, акуратнай, адчувалася прастата і ўнутраная дысцыпліна. Толькі не стасавалася з прастатой дзелавітасьць, зь якой ён адразу неяк усё бачыў і разумеў. Прагледзеўшы наш сьпісак, ён запытаўся:*

*— Усе пішуць? Усе пісьменьнікі?*

*— Будуць пісаць, Мікалай Мацьвеевіч, — адказаў Шукайла. — Гэта ўсё новыя, маладыя сілы.*

*— Бачу, — сказаў Галадзед і ўсьміхнуўся. — Думаеце, ваша аб'яднаньне патрэбна літаратуры?*

*— Абавязкова! — Шукайла цьвёрда ткнуў у падлогу кіем і сьцяў губы, што азначала таксама, што ён гаворыць бясспрэчную ісьціну. — Рэвалюцыйная літаратура павінна шукаць новых шляхоў. Мы будзем змагацца супроць усякай традыцыйнай гнілаты і сэнтымэнтальнага мяшчанства. Мы — за росквіт жыцьця!*

*Такая агульная дэклярацыя нічога не гаварыла пра наша творчае аблічча. На адну хвіліначку я ўбачыў ваганьне, калі Галадзедава рука ўзяла і крутнула ў пальцах асадку. Ён падпісаў наш сьпісак.*

*— Паспрабуйце. Пабачым, — сказаў ён, палажыўшы асадку.*

*Цяпер настала самае цяжкае — грошы. Бо што значыць аб'яднаньне без свайго друкаванага органу? Нам трэба часопіс. Але Галадзед, мабыць, гэта прадбачыў.*

*— Колькі? — папытаўся ён.*

*Мы паказалі калькуляцыю на рэгулярнае штомесячнае выданьне.*

*— Не, пакуль што дам толькі на адзін нумар. А там пабачым, што ў вас выйдзе.*

*Тут жа ён выклікаў маладога высокага чалавека і распарадзіўся з асабістага фонду выдаць «Літкамуне» дзесяць тысяч рублёў*[29].

Відаць, пасьля шматлікіх інфляцый і дэнамінацый савецкага рубля Ян Скрыган недакладна назваў выданую футурыстам суму. Мяркуючы па разьліковых справаздачах «Літкамуны», на першы нумар «Росквіту» саўнаркам выдаў ня дзесяць тысяч, а толькі 1800 рублёў (без уліку яшчэ некалькіх атрыманых пазьней і меншых субсыдый ад іншых дзяржаўных установаў). Але і гэта для таго часу былі вялікія грошы. Тут бліжэй да ісьціны апынуўся Сяргей Грахоўскі, які, распавядаючы Леаніду Маракову пра Шукайлу і яго «Літкамуну», згадаў пра «дзьве тысячы».

Гэты час Паўлюк Шукайла быў, відаць, так заняты арганізацыйнымі й сямейнымі справамі, што згадаў пра свой намер паступіць у БДУ запозна: прыёмная камісія закончыла сваю працу, ужо поўным ходам ішлі заняткі, а Паўлюк яшчэ нават дакумэнтаў не падаў! Але ня ўсё было страчана. Памятаючы пра свой зусім нядаўні вопыт хаджэньня па высокіх інстанцыях, ён і тут вырашыў скарыстаць усю сваю напорыстасьць і нават нахабства — проста пайшоў на прыём да народнага камісара асьветы БССР Антона Баліцкага і ўручыў яму заяву наступнага зьместу:

*Імкнучыся пашырыць, паглыбіць і сыстэматызаваць свае веды, прашу Вашага распараджэньня аб залічэньні мяне студэнтам 1 курсу літаратурнага аддзяленьня пэдфаку БДУ.*

*Разам з гэтым прашу вызначыць на ўсей час вучобы належную матэр'яльную забясьпечанасьць для мяне і сям'і, якая*

[29] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 60.

*складаецца з трох асоб.*

*Своечасова аб прыёме заяву ў камісію падаць ня меў магчымасьці.*

*Пры гэтым далучаю: 1) анкету; 2) вайсковую кніжку; 3) пасьведчаньне аб адукацыі; 4) 2 фот. карткі; 5) даведку аб стане здароўя.*

*П. З. Шукайла.*

*Менск, 27/IX-1927 г.*[30]

І што ж? Ваяўнічага паэта залічылі ў студэнты БДУ. Тады Шукайла замовіў слоўца і за свайго сябра Макара Шалая, які, прыехаўшы ў Менск, часова спыніўся ў яго і таксама «ня змог своечасова падаць заявы па незалежных ад яго прычынах». А дзеля большай упэўненасьці 3 кастрычніка 1927 г. Паўлюк выпісаў яму хадайніцтва на фірмовым блянку Ўсебеларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны, дзе назва суполкі была надрукаваная буйнымі чырвонымі літарамі:

*Беларуская літ.-маст. Камуна хадайнічае перад НКА аб залічэньні правадзейнага сябра Камуны т. Шалаева студэнтам БДУ, на літар. аддзяленьне.*

*Старшыня П. З. Шукайла*[31].

Добры і спагадлівы Баліцкі задаволіў і гэтую просьбу. Разам з Шукайлам і Шалаём паступіў у БДУ і Янка Відук[32]. Безумоўна, пэрспэктыва ня толькі набыць адукацыю, але й замацавацца ў сталіцы вельмі вабіла. Толькі ж маладыя літкамунаўцы наўрад ці шмат думалі пра навучаньне. Іх жыцьцё было напоўненае літаратурнымі вечарынамі (нярэдка — са скандаламі), праходзіла яно ў спрэчках, як з прадстаўнікамі іншых суполак, так і паміж сабою.

Паўлюк Шукайла зь сям'ёю жыў тады паблізу Вайсковых могілак — *«як тады здавалася, на далёкай, можна сказаць, ужо загараднай Чырваназорнай вуліцы, у новым, толькі што пастаўленым драўляным доме — гаспадар здаў яго кватаранту на абжытак»*[33]. На той час паэт стаў ужо бацькам — 7 верасьня ў яго нарадзілася старэйшая дачушка Дзіва. А вось уласнай мэбляю маладая сям'я пакуль яшчэ не абзавялася — у доме стаялі толькі абедны стол, ложак і два крэслы. Таму сходы «Літкамуны» й пасяджэньні рэдкалегіі «Росквіту» адбываліся ў сьціплай і не зусім «афіцыйнай» абстаноўцы: пісьменьнікі

*расьсцілалі на падлозе свае сьвіткі, кажухі ці плашчы, лажыліся наўкруга, у галавах клалі чыю-небудзь шырокую папку, каб на ёй можна было раскладаць рукапісы, і пачыналі абмяркоўваць. Толькі адзін Шукайла, як гаспадар і наш кіраўнік, сядзеў за сталом на крэсьле,*[34]

— прыгадваў Ян Скрыган.

На жаль, пратаколаў сходаў і пасяджэньняў «Літкамуны» за 1927 г. (верасень-сьнежань) у архіве П. Шукайлы не

[30] НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 9375. Арк. 1.

[31] НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 9375. Арк. 6.

[32] У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (Ф. 205. Воп. 1. Спр. 259. Арк. 154) захавалася сакрэтная запіска Антона Баліцкага рэктару БДУ Уладзімеру Пічэту ад 28.09.1927 з просьбаю залічыць сяброў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны» Паўлюка Шукайлу і Янку Відука, а таксама Алеся Адамовіча на пэдагагічны факультэт унівэрсытэту. Аўтар шчыра дзякуе Віталю Скалабану за гэтую інфармацыю.

[33] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 247.

[34] Тамсама. С. 247—248.

захавалася. Магчыма, яны й не дакумэнтаваліся. Пра дзейнасьць суполкі гэтага пэрыяду можна даведацца зь некаторых публікацыяў у пэрыёдыцы, са зьместу першага нумару часопісу «Росквіт», зь перапіскі тагачасных беларускіх літаратараў, з ужо неаднойчы цытаваных успамінаў Я. Скрыгана... Словам, сякое-такое ўяўленьне складсці можна.

У той час удзельнікі «Літкамуны» бралі чынны ўдзел у літаратурных суботніках, творчых вечарынах і паводзілі там сябе даволі кідка і эпатажна, падкрэсьліваючы сваю «футурыстычнасьць» ня толькі гучным паэтычным словам, але таксама вопраткаю і паводзінамі:

*Памятаючы прыклад футурызму, што трэба нечым вылучацца, мы хадзілі бадай што ўсе з кіямі і ў капелюшах, што на той час было навіною. Трымалі сябе ваяўніча і задзёрыста. На літаратурных вечарах і дыспутах чыталі крыклівыя вершы, траха не хапаліся загрудкі ў спрэчках. Я гавару «мы» вельмі ўмоўна, бо ўсё гэта за нас рабіў Шукайла. Мы былі як фон: калі было трэба — мацней крычалі і грукалі ў падлогу кіямі,*[35]

— прыгадваў Ян Скрыган. Грукат літкамунаўскіх кіёў надоўга запомніў расейскі паэт Міхаіл Сьвятлоў, які чарговы раз прыехаў у Менск і зладзіў свой літаратурны вечар. *«Шукайлаўцы зьявіліся ў поўным сваім складзе і літаральна затукалі Сьвятлова»,* [36] — распавядае Юрка Віцьбіч. Чым жа аўтар знакамітай «Гренады» так не дагадзіў авангардна настроеным беларусам? Хутчэй за ўсё, манерак чытаньня. Сьвятлоў, як вядома, чытаў свае вершы манатонна і невыразна, а для Шукайлы ўменьне паднесьці публіцы ўласныя творы было ці не важнейшым за іх мастацкую якасьць.

Праз пару гадоў Кандрат Крапіва ў паэме-казцы «Хвядос Чырвоны Нос» напіша ад імя свайго галоўнага героя:

*— С-л-у-ц-а-к. Смачныя бязь меры*
*Тут расьлі калісьці бэры.*
*Тут спазнаўся юнаком*
*Я з Шукайлам Паўлюком.*
*Эх і голас! Эх і постаць!*
*Ён узор клясычны даў нам...*
*Часам можна палкай тоўстай*
*Пракладаць дарогу к ляўрам*[37].

Да кіёў Паўлюк Шукайла адчуваў асаблівую цікаўнасьць. Іх было ў яго некалькі. Калі паэту надаралася бываць у іншых краёх, ён лічыў за добрую справу набыць там кій мясцовай вырабкі й прывезьці яго на радзіму — у якасьці сувэніру. «Палка тоўстая» сапраўды і вельмі пасавала Шукайлу зь яго скандальна-футурыстычным іміджам, і служыла надзейным сродкам для пераконваньня апанэнтаў. Але сродкам усё ж дадатковым. Высокі, элегантны, з грывою сьветлых валасоў і гучным раскацістым голасам, а ў дадатак — чалавек імпульсіўны і часам нястрыманы, Паўлюк Шукайла быў здольны зрабіць уражаньне і з кіем, і бяз кія.

[35] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 61.

[36] Юрэвіч Л. Архіўная кніга. Нью-Ёрк: БІНіМ, 1997. С. 376.

[37] Крапіва К. Хвядос Чырвоны Нос: Казка. Менск: ДВБ, 1931. С. 66. У пазьнейшых перавыданьнях, у тым ліку і ў апошнім Зборы твораў К. Крапівы, згадкі пра некаторых рэпрэсаваных пісьменьнікаў, у тым ліку Шукайлу, былі прыбраныя, а самі героі паэмы асуджаныя на доўгае забыцьцё.

Ягоныя «сногосшибательные» (па вызначэньні літаратара Міхаіла Гольдберга) выступы на вечарынах, сходах і літаратурных суботніках, дзе ён называў творчасьць старэйшых калегаў «трухлявым звонам», а маладзейшым пасьлядоўна «перамываў костачкі», нярэдка выклікалі ў прысутных хвалю то сьмеху, то абурэньня, але часам прымушалі й задумацца[38]. Трэба сказаць, што на ваяўнічыя выступы літкамунаўцаў прадстаўнікі іншых творчых аб'яднаньняў адказвалі ўзаемнасьцю. Напрыклад, падхапіўшы сьцьверджаньне маладнякоўца Алеся Дудара пра «адсутнасьць публікацый Шукайлы», узвышанец Сяргей Дарожны вырашыў «выправіць сытуацыю» і пачаў разносіць па рэдакцыях вершы, напісаныя нібыта Шукайлам, а насамрэч — пародыі кшталту *«Выйду я на сенажаць / Ды з нагана ў жабу — бац!»*[39]. Гэтае двухрадкоўе набыло вялікую вядомасьць у літаратурным асяродку і доўгі час сапраўды прыпісвалася Шукайлу. Вершык пра наган і жабу прасачыўся і ў асобныя нават хрэстаматыйныя творы. Яго, напрыклад, згадаў Мірон, адзін зь юных герояў аповесьці Янкі Маўра «Палескія рабінзоны», а другі, Віктар, яму адказаў, што паэт, які напісаў такое, мусіць, быў галодны[40].

Вось так, дзякуючы кпінам калегаў па пяры, Шукайла стаў знакаміты як аўтар двух радкоў, якія насамрэч належалі не яму. Тады, у час існаваньня «Літкамуны», ён набыў рэпутацыю «літаратурнага клоўна» (так яго ахарактарызаваў Максім Лужанін у лісьце да Паўлюка Труса[41]), а створаную ім суполку сучасьнікі праз шмат гадоў параўноўвалі не інакш як з «тэатрам Райкіна»[42]. Але ён памятаў, як ставіліся да футурыстаў іх эстэтычныя апанэнты, асабліва прыхільнікі клясычных традыцыяў, і быў гатовы да ўсяго.

## 3. «РОСКВІТ», № 1: ЎІТМЭН НЕ ЎРАТАВАЎ

Цягам лістапада-сьнежня 1927 г. літкамунаўцы складалі першы нумар свайго часопісу і паралельна распрацоўвалі статут, які мусіла мець кожная зарэгістраваная творчая арганізацыя. Сёньня гэты дакумэнт яскрава тлумачыць некаторыя рэчы. Чаму, напрыклад, суполцы далі менавіта такую, а ня іншую назву? У камуне як такой Шукайла і яго сябры бачылі «найбольш дасканалую форму чалавечага агульнажыцьця», паводле якой будзе жыць увесь сусьвет. І менавіта за такі ідэал пабудовы грамадзтва яны й вырашылі змагацца літаратурна-мастацкімі сродкамі ці, інакш кажучы, «прымаць удзел у жыцьцебудаўніцтве». Нездарма Антон Адамовіч пісаў, што камунізм, які спавядалі шукайлаўцы, быў «хутчэй утапічны, чым бальшавіцкі» і спалучаўся з «футурызмам» «лефаўскага» тыпу, а таксама з ідэяй, адлюстраванай у адным з асноўных дэвізаў аб'яднаньня: «літаратура й мастацтва як сродак росквіту жыцьця»[43].

[38] Падрабязьней пра гэта пісалася ў артыкуле: Жыбуль В. Два галоўныя скандалісты 20-х: Да 100-х угодкаў Алеся Дудара і Паўлюка Шукайлы // ARCHE. 2004. № 3. С. 70—77.

[39] Гл. тамсама.

[40] Гл.: Маўр Я. Збор твораў у 4 т. Т. 4. Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. С. 123.

[41] Трус П. Выбраныя творы. Мінск: Беллітфонд, 2000. С. 285.

[42] Звонак А. Разбітыя скрыжалі лёсу // Першацвет. 1995. № 6. С. 104.

[43] Гл.: Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры. С. 911.

21 сьнежня 1927 г. Статут быў зацьверджаны намесьнікам народнага камісара ўнутраных справаў БССР Кролем, а пазьней апублікаваны ў другім нумары «Росквіту»[44].

Эстэтычная праграма суполкі, адлюстраваная ў Статуце мінімальна, найболыш поўна была раскрытая ў дакладзе Паўлюка Шукайлы «Аб задачах «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», прачытаным на адным са сходаў арганізацыі прыкладна тады ж, у лістападзе-сьнежні 1927 г. (пасьля абвастрэньня канфлікту паміж літкамунаўцамі й Паўлюком Трусом). Захаваўся толькі плян гэтага дакладу, але нават ён дапамагае зразумець асноўныя ідэйна-мастацкія пастуляты арганізацыі, тым болей, што ніякіх апублікаваных маніфэстаў яе не захавалася[45]. Мае сэнс прывесьці дакумэнт цалкам:

***Плян дакладу Паўлюка Шукайла Аб задачах «Белар[ускай] Літ[аратурна]-Маст[ацкай] Камуны»***

*1. Для чаго мы зарганізаваліся*

*Атрад пралетарліту ў яго змаганьні за Росквіт на фронце мастацтва.*

*2. Не дэкларацыяй, а творчасьцю*

*— Мы не пралетарыі з патэнтам, а пралетарыі па мэтаімкненьню.*

*3. Форма і зьмест*

*— мастацтва як сродак жыцьцябудаўніцтва*

*— мэтаімкненьне*

*— форма сугучная зьместу*

*роль эпохі*

*— аб мастацтве для мастацтва і пустазвонстве*

*Allo жыцьцё*

*— Allo рытм жыцьця*

*— Прэч традыцыі законаў рыфмы і яе плецяняў.*

*Аб — Я — і Мы*

*Разьбіваем радкі — руйнуем конаны традыцый літаратурнай багемы*

*Аб вобразнасьці (мат[эрыяльная] і канкр[этная])*

*Для каго пішам*

*Супроць літаратурнай спэкуляцыі*

*(факты: Бабруйск, Голубь;*

*Трус і ЛітКамуна)*

*Супраць переваги статыкі над дзеяй і развважаньняў аб псыхалягічнасьці.*

*4. Аб выкарыстаньні старога матэрыялу*

*Толькі як архіў творчасьці, які адбіваў твар адцьвіўшай эпохі.*

*Перанясеньне старога ў новае, усё адно што сеяць лапухі там, дзе павінны расьці кветкі жыцьцёвага росквіту.*

*5. Аб тоўстых кнігах, паэзіі і цаліне бяз сокаў*

*Кніга ў ногу з эпохай*

*Мала добраю выведзенай схемы — патрэбен жывы чалавек*

*6. Аб тэатр[альным] і кінамастацтве*

*За прагрэс — рэвалюцыю формы — за агітацыю на будаваньне новага жыцьця, супроць прыладарства (прыспасабленства)*

*7. Архітэктура*

*(тое самае)*

*8. За рэарганіз[ацыю] выяўленчага мастацтва (фотамаляўніцтва)*

Як і можна было чакаць, гэтыя тэзісы сугучныя адпаведным пастулятам расейскіх лефаўцаў, якія бачылі ў мастацтве «будаваньне жыцьця», агітавалі за стварэньне пралетарскага мастацтва

[44] Гл.: Статут Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны // Росквіт. 1928. № 2. С. 79.

[45] Пэўныя элемэнты маніфэсту ўтрымлівае таксама артыкул П. Шукайлы «Літаратурнае сёньня». Пра дэклярацыю, напісаную ім увесну 1928 г., гаворка пазьней.

(*пролетискусства*), палітычную падкаванасьць мастака, імкнуліся падняць мастацтва да «найвышэйшай працоўнай катэгорыі», «объединить фронт для взрыва старья, для драки за охват новой культуры», кажучы пра свае задачы, заклікалі «адкінуць прыліплае мінулае»[46]. Але сама антытрадыцыяналісцкая прырода адмаўленьня, уласьцівая авангарднаму мастацтву ўвогуле, у расейскіх лефаўцаў і іх беларускіх калегаў, літкамунаўцаў, мела розны характар і розную генэалёгію.

Лефаўцы лічылі сябе непасрэднымі прадаўжальнікамі й разьвівальнікамі некаторых уласных футурыстычных ідэяў, упершыню выказаных яшчэ ў 1910-я гг., але ставіліся да іх ужо даволі крытычна. У 1928 г. яны пісалі:

*Футурыстычны эпатаж — запалохваньне абывателя трукам, — што было добрым тактычным прыёмам для сьцьвярджэньня новых мастацкіх густаў у дарэвалюцыйны час, у наш час можа стацца пустым хуліганствам, падтрымліваць якое шкодна*[47].

Маладзейшыя і яшчэ недастаткова спрактыкаваныя ў паэтычных вышуках літкамунаўцы ўсе прыйшлі ў літаратуру ўжо ў савецкі час, праз адсутнасьць папярэдняй футурыстычнай глебы ў беларускай літаратуры, і, калі трымацца лёгікі расейскіх лефаўцаў, адразу пачалі з «хуліганства»[48]. Свой адмаўленчы патас яны скіроўвалі найперш супраць прадстаўнікоў «літаратурнай багемы»[49], якія, на думку беларускіх футурыстаў, займаліся «пустазвонствам», эксплюатавалі «стары матэрыял» і ішлі «не ў нагу» з эпохай[50]. Стаўленьне ж да прадстаўнікоў старэйшага літаратурнага пакаленьня было амбівалентнае: называючы творчасьць Цішкі Гартнага «цалінай бяз сокаў», лідэр «Літкамуны» апублікаваў у «Росквіце» ў цэлым станоўчы артыкул Міхайлы Піятуховіча пра творчасьць гэтага пісьменьніка[51].

[46] За что борется Леф? // ЛЕФ: Журнал левого фронта искусств. 1923. № 1. С. 6.

[47] Нам пишут: О «Новом Лефе» и «Новой генерации» // Новый Леф. 1928. № 9. С. 46.

[48] Прывядзём непасрэднае выказваньне прадстаўнікоў Лефа, якія, з усяго відаць, з творчай практыкай літкамунаўцаў у 1927—1928 гг. знаёмыя не былі: «Мяркуем, што футурыстычныя прыёмы працы, што захаваліся ня толькі ва ўкраінскіх Лефаў, але і грузінскіх (ходзяць чуткі, што і ў беларускіх), існуюць толькі па інэрцыі, а не таму, што ў іх ёсьць якаясь патрэба» (Нам пишут: О «Новом Лефе» и «Новой генерации» // Новый Леф. 1928. № 9. С. 46).

[49] Да іх літкамунаўцы адносілі, напрыклад, Валер'я Маракова, Паўлюка Труса, Сяргея Дарожнага, Тодара Кляшторнага, Язэпа Пушчу, Алеся Дудара і інш.

[50] Цікава параўнаць асобныя вобразы-канцэпты праграмных выступленьняў у беларускіх літкамунаўцаў і футурыстаў іншых краін. Калі расейскія «будетляне» ў 1910-я гг. уяўлялі сучаснасьць у выглядзе параходу і вырашалі, каго зь яго кінуць, а каго, магчыма, пакінуць, то літкамунаўцам імпанавалі ўжо іншыя, але тым ня менш сутнасна блізкія мэтафары й алегорыі. Паўлюк Шукайла разглядаў сучаснае яму жыцьцё як «грамыхаючы трамвай, які ліжа вуснамі сталёвых губ сталёвыя рэйкі, п'е сокі электрыкі, ператварае ў кроў і ў яе хваляваньнях імчыцца наперад» (Шукайла П. Літаратурнае сёньня // Росквіт. 1928. № 2. С. 50).

[51] Захаваліся сьведчаньні Рыгора Крушыны пра тое, што ў прысутнасьці Я. Купалы і Я. Коласа П. Шукайла дапускаў фразы кшталту «Сучаснасьць выкіне старое на сьметнік», але іншым разам любіў з захапленьнем, артыстычна дэклямаваць вершы абодвух клясыкаў. Гл.: Крушына Р. Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2005. С. 279.

Некаторыя тэзісы дазваляюць інакш зірнуць і на творчую практыку самаго П. Шукайлы, якога неаднойчы крытыкавалі, напрыклад, за каструбаваты сынтаксіс, неўпарадкаваны рытм і слабыя, надта прыблізныя рыфмы. Выходзіць, што паэт ужываў іх наўмысна як прыёмы эпатажу — «ламаў законы рыфмы і яе плецяняў» , «руйнаваў кананы традыцый» і г. д.

Асобныя рэчы, аднак, тут застаюцца няясныя. Так дагэтуль і невядома, якой менавіта «літаратурнай спэкуляцыяй» займаўся бабруйскі паэт Сьцяпан Голуб і як стасуюцца паміж сабой пункты 3 і 5: атрымліваецца, што паводле Шукайлы паказ жывога чалавека мусіць выключаць «разважаньні аб псыхалягічнасьці»?

Зьвяртае на сябе ўвагу інтарэс П. Шукайлы да іншых відаў мастацтва, за «рэарганізацыю» якіх ён выступаў, — да тэатру, кіно[52], архітэктуры, выяўленчага мастацтва. Само афіцыйнае азначэньне «Камуны» («літаратурна-мастацкая», а ня проста «літаратурная») дае зразумець, што суполка меркавала не абмяжоўвацца толькі літаратурай, а была адкрытая для супрацоўніцтва з мастакамі. І сапраўды, як пабачым далей, з арганізацыяй быў зьвязаны вядомы графік Анатоль Тычына (1897—1986), а Ўладзімер Бохан (1905—1940-я) і Алена Пук (1905 [паводле афіцыйных дакумэнтаў 1907] — 1986) былі яе праўдзейнымі сябрамі. Але шырока прадставіць «левае» выяўленчае мастацтва на старонках свайго выданьня — «Росквіту» — «Літкамуне» так і не ўдалося.

Ужо падчас падрыхтоўкі першага нумару атмасфэра ў суполцы была неспакойная і напоўненая палемікай. Аказалася, што згуртаваныя ў «Літкамуну» маладыя пісьменьнікі абсалютна па-рознаму бачылі свае задачы ў літаратуры. Некаторых сяброў ахапіла разгубленасьць, яны быццам адчулі, што «патрапілі не туды»:

*Памятаю, у Шукайлы, на яго пустой кватэры па Чырваназорнай вуліцы, парасьсьцілаўшы паліты і кажухі, мы ляжалі на падлозе, перабіралі рукапісы, крэмсалі і спрачаліся. І патроху пачыналі цьверазець. Нешта ў душы было неспакойна. Мы бачылі, што вайну абвяшчаем сур'ёзную, а шаблі ў нас з трэсак. Дзеля чаго мы ўсё гэта робім? Чаго хочам? Хто і дзе нашы ворагі? Навошта і каму гэта трэба? І да чаго дойдзем? Дарогі гэтай ніхто з нас ня бачыў*[53].

Першы нумар «Росквіту» выйшаў на пачатку студзеня 1928 г. На вокладцы, аформленай мастаком Анатолем Тычынам, на фоне сымбалічнага выбуху намаляваныя розныя атрыбуты вясковай і гарадзкой працы, уласьцівыя новай эпосе: серп і молат (але ня злучаныя, як на савецкім гербе, а паасобку), колас, заводзкі комін, нафтавыя вышкі, хмарачосы і іншае. Згодна са справаздачай аб грашовых даходах і выдатках, мастак атрымаў за працу над вокладкай 20 рублёў.

Пасярод тытульнага ліста буйным шрыфтам быў набраны ляканічны лёзунг *«Не дэклярацыяй, а творчасьцю»*, а сама творчасьць прадстаўленая вершамі Паўлюка Шукайлы («Ім…», «Эй, націсьнем, хлопцы!», «Паравоз», «Аднаму з Заходняй Беларусі», «Я іду наперад!», «Сястрыцы Любе»), Янкі Відука («Хто там ма-

[52] Пераехаўшы ў Маскву, а потым у Ленінград, П. Шукайла ў 1933 г. стаў прафэсарам кіназнаўства. Акрамя гэтага, ён спрабаваў сябе як сцэнарыст.

[53] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 61.

рудзіць?», «Салют вуліцы»), Апанаса Атавы («Ганя», «Ноч»), Язэпа Сукалы («Зімовай ночкай»), Уладзімера Прыбыткоўскага («Літаратура ў прыгоне…»), Зосі Палын («Бывайце здаровы…»), Рыгора Казака («Сучаснай песьняй», «У вагоне», «Восень — ня сум») і Петруся Броўкі («Чую звон…»), аповесьцю Алеся Гародні «Варта на Рэйне», апавяданьнем Я. Відука «Памятнае», фэльетонам Уладзімера Варавы «Падхалім» (пад псэўданімам Дзядок). Разьдзел крытыкі склалі артыкулы «Аб даўніх традыцыях і сучасным культурным будаўніцтве» М. Бухарына, «Творчасьць Цішкі Гартнага» Міхайлы Піятуховіча, «Літаратурнае сёньня» П. Шукайлы. Быў зьмешчаны і Статут арганізацыі.

Паводле словаў Я. Скрыгана, пры стварэньні «Росквіту» Шукайла і таварышы арыентаваліся на ўкраінскі часопіс «Нова генерація» (рэдактарам яго быў вядомы паэт-футурыст Міхайль Сэмэнко). Акрамя твораў украінскіх паэтаў і празаікаў (пераважна левага кірунку) у ім друкаваліся перакладныя творы замежных аўтараў, якія на той момант лічыліся прагрэсіўнымі. «Росквіт» таксама адзначыўся ў гэтай галіне, апублікаваўшы ў сваім першым нумары «Песьню пра радасьць» («A Song of Joys») амэрыканскага паэта Ўолта Ўітмэна (1819—1892) ва ўдалым перакладзе А. М. (Аркадзя Мардвілкі, які, зрэшты, да «Літкамуны» не належаў). Трэба адзначыць, што ўвагу расейскіх футурыстаў творчасьць Ў. Ўітмэна пачала прыцягваць яшчэ амаль на два дзесяцігодзьдзі раней: у паэзіі адных зь іх (Велімір Хлебнікаў) часам адчуваецца ўплыў амэрыканскага паэта, іншыя (Іван Орэдзеж, эга-футурысты) стваралі нават усьвядомленыя насьледаваньні Ўітмэну. Таму ўвага беларускіх лефаўцаў да ягонай творчасьці таксама не выпадковая. Ня дзіва, што ў 1920-я гг. А. Мардвілка і Ю. Гаўрук перастварылі па-беларуску яшчэ некалькі твораў Ўітмэна.

Але якасны пераклад замежнага творцы не ўратаваў часопіс ад насьмешак і кпінаў. Яшчэ да выхаду «Росквіту» некаторыя літаратары былі настроеныя супраць яго рэзка нэгатыўна: *«Гэта будзе ня зборнік, а хаўтура»*,[54] — пісаў Паўлюк Трус у лісьце да Пятра Глебкі. *«Гэта нейкі кашмар, а не паэзія... прыклад літаратурнай непісьменнасьці і бяздарнасьці»*,[55] — пагаджаўся з Трусом Глебка, калі часопіс ужо выйшаў. Зьяўленьне «Росквіту» ня выклікала рэзанансу ў літаратурным асяродку. Характэрна, што часопіс быў праігнараваны крытыкай: з усіх выданьняў рэцэнзію на «Росквіт» надрукаваў толькі «Аршанскі маладняк». У вершах Шукайлы крытыку Алесю Аляксееву кінуліся ў вочы слабыя рыфмы і суб'ектывісцкі падыход да распрацоўкі тэмаў, у Відука — занадта відавочны ўплыў Ясеніна (і гэта пры тагачасным імкненьні аўтара выглядаць футурыстам), у Атавы і Казака — недахопы ў галіне стылістыкі і вобразнасьці. Агульны лейтматыў усіх вершаваных твораў часопісу крытык вызначыў як «Я іду наперад, я малады, я бадзёры». На думку А. Аляксеева, *«з выхадам часоп<ісу> «Росквіт» № 1, новае літаратурнае згуртаваньне ня выявіла свайго сталага твару»*[56].

[54] Трус П. Выбраныя творы. С. 257.

[55] Тамсама. С. 288—289.

[56] Аляксееў А. «Росквіт» № 1 // Аршанскі Маладняк. 1928. № 7. С. 108.

## 4. МІХАЙЛАЎСКАЯ, 7

На самым пачатку 1928 г. Паўлюк Шукайла зь сям'ёю перабраўся на іншую кватэру — па вуліцы Міхайлаўскай (цяпер Кірава), 7, што каля вакзалу. Новае жытло кіраўнік «Камуны» абсталяваў шыкоўнай мэбляю з канфіскаванага панскага маёнтку, а на кніжных паліцах разьмясьціў багатую бібліятэку. (Пазьней ён перавёз гэтую мэблю — шафу, стол, крэслы — у Маскву; яна і дасюль стаіць у яго кватэры, дзе цяпер жывуць яго нашчадкі.) І мэбля, і бібліятэка былі закупленыя Шукайлам на дзяржаўныя сродкі, субсыдаваныя на патрэбы рэдакцыі. А паколькі рэдакцыя мясьцілася непасрэдна ў памяшканьні кватэры (адрас «Міхайлаўская, 7» пазначаны на абодвух нумарох часопісу «Росквіт»), то кіраўнік «Літкамуны» забіў двух зайцоў, абсталяваўшы адначасова і рэдакцыю, і ўласнае жытло. Гэты ўчынак спарадзіў у грамадзе хвалю ня надта станоўчых эмоцый: ад сяброўскіх кпінак да асуджэньня і прыцягненьня да адказнасьці Парткалегіяй ЦКК. Але гэта будзе потым.

А пакуль што кватэра на Міхайлаўскай ператварылася ў своеасаблівы штаб беларускага футурызму: да Шукайлы стала лягчэй дабірацца яго таварышам, пасяджэньні «Літкамуны» пачалі адбывацца больш рэгулярна. Ян Скрыган прыгадваў:

*Часьцей пачалі бываць і прыхільнікі Літкамуны — і мянчане, і пэрыфэрыйнікі — з Горы-Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі — Алесь Вечар, Прыбыткоўскі, Юрка Гаўрук, Аркадзь Куляшоў і Юрка Лявонны прыглядаліся да нас з асаблівым цікаўствам, зь нейкаю зычлівfinally насьцярогаю. Часьцей забягаў і Гародня, балазе гэта было па дарозе да мяне*[57].

Менавіта гэты пэрыяд дзейнасьці «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны» найболыш поўна адлюстраваны ў тых дакумэнтах суполкі, якія цудам зьберагліся ў архіве паэта.

Першы зь іх паводле храналёгіі — «Пратакол агульнага сходу Менскай філіі аб'яднаньня Бел[арускай] Літ[аратурна]-Маст[ацкай] Камуны». Гэты дакумэнт не датаваны, але па ўсім відаць, што сход адбыўся паміж выхадам першага нумару «Росквіту» (студзень) і 10 лютага 1928 г.[58] У зьмесьце пратаколу выразна адбіліся ўсе праблемы, якімі была ахопленая ў той час суполка. Так, Паўлюк Шукайла, зачытваючы новы даклад «аб чарговых задачах работы аб'яднаньня», пачаў адразу ж з таго, што спыніўся «на некаторых непаразуменьнях паміж некаторымі сябрамі аб фармальна-мастацкіх баках творчасьці зьмешчанай у першым нумары «Росквіту»:

*Асобныя таварышы праявілі сваю несьвядомасьць і аднабокасьць у сваіх развважаньнях: нам трэба заўсяды памятаць, што паміж формай і зьместам твору ня можа быць расчляненьня. Першае і другое, як асобныя дзьве самастойныя рэчы разглядаемо быць ня можа.*

[57] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 250.

[58] На адваротным баку дакумэнту — чарнавік датаванага 10 лютага пасьведчаньня, выдадзенага Макару Шалаеву, у тым, што ён упаўнаважаны для работы па зборы падпісчыкаў на часопіс «Росквіт» і «пастаноўкі як дакладаў-лекцый, так і гутарак па папулярызацыі творчасьці і ідэй літаратурнага згуртаваньня».

Далейшыя тэзісы Шукайлавага дакладу сьведчаць пра няпростыя ўзаемаадносіны «Літкамуны» як зь іншымі тагачаснымі творчымі арганізацыямі, так і з чытацкай аўдыторыяй, за якую паміж літаратурнымі суполкамі адбывалася сапраўднае змаганьне:

*У даным выпадку,* — казаў Шукайла, — *мы першым і галоўным чынам павінны разьлічваць на чытача, чытача масавага, прынімая пад увагу яго культурны ўзровень, а пагэтаму наша творчасьць як па зьместу, так і па форме [павінна] адбіваць сучаснае новае жыцьцёбудаўніцтва. Стаўшы на такі погляд, мы бясспрэчна будзем мець шмат цяжкасьцяў, улічвая шэраг рэальных маючыхся на гэтым шляху супярэчнасьцяў: першае, што нам самім патрэбна шмат вучыцца, другое, гэта ў шмат выпадках варожыя адносіны да нас такіх існуючых арганізацый, як «Полымя», часткаю «Ўзвышша» і часткаю «Маладняк».*

«Шмат вучыцца» Шукайла раіў *«на грунце маючыхся вызначаных Камуніст[ычнай] партыяй задач у літаратуры марксісцкай крытыкі»*, а што да «варожых адносінаў» калегаў — *«уразумець, што мы не зьяўляемся «першасортнымі» ўва ўсіх адносінах на беларускай літаратуры, як ня можам к гэтаму прылічыць нікога і з другіх аб'яднаньняў»*. Казаў кіраўнік «Літкамуны» і пра стварэньне прыхільніцкіх гурткоў, і пра павышэньне колькасьці падпісчыкаў, і пра выпуск наступных нумароў «Росквіту»... *«Па дакладу было 18 пытаньняў, на якія т. Шукайла даў адпаведныя адказы».*

Не абышлося й бяз спрэчкі, якую распачаў Алесь Гародня. Спрэчка датычылася «фармальных бакоў» літкамунаўскае творчасьці і, адчуваецца, была далёка ня першая. Тут, прыгадваючы ўспаміны Я. Скрыгана, мы яшчэ раз пераконваемся, што ў суполцы ідэйна-эстэтычнага адзінства ўвогуле не было, і даведваемся, што Шукайлавы погляды на мастацтва не падзяляла *большасьць* сяброў «Літкамуны». Прынамсі, так імкнуўся падаць праблему А. Гародня:

*Існуючая тэндэнцыя шмат нашых членаў падражаньня па форме ня можа вычэрпваць левы напрамак нашай творчасьці па форме. Пагаджацца на 100 % з Маякоўскім мы ня можам. У адносінах да сувязі з другімі аб'яднаньнямі мы павінны ўзяць рашучы напрамак — ніякіх літ. аб'яднаньняў на Беларусі для нас не існуе, мы маем справу з асобнымі пісьменьнікамі. Нашы адносіны з асобнымі пісьменьнікамі павінны грунтавацца на: мы павінны знаходзіць станоўчае ў яго творчасьці і падтрымовываць не ўзірая на яго, як на чалавека. Літаратурная камуна зараз хварэе пануючай у яе гурткоўшчынай. Пытаньне аб новых сябрах павінна стаяць так: усі пісьменьнікі блізкія да нас павінны намі прымацца на агульных сходах.*

Цікава, што на тым сходзе прысутнічаў і яшчэ адзін даўнейшы Шукайлаў сябар і паплечнік, а на той момант — кіраўнік сэктару друку ЦК КПБ(б) Алесь Адамовіч, які спачатку быў запісаны нават у прэзыдыюм як «ісьцінны член камуны», але потым выкрасьлены. Выступаючы, ён прадставіўся «чытачом» і свае развагі прысьвяціў праблеме менавіта чытацкай аўдыторыі «Росквіту», якую ён бачыў галоўным чынам у вясковай і гарадзкой інтэлігенцыі.

*Вы павінны пачатую справу выхаваньня інтэлігенцыі... даводзіць да канца,* — казаў А. Адамовіч, — *Мажлівыя небясьпекі могуць быць. Далейшы курс*

*палітычны павінен быць пралетарскім, але вы павінны памятаць асаблівасьць Беларусіі, тэй кантынгент чытачоў, зь якім вы будзеце мець [справу], ён не пралетарскі, але агульны ход рэвалюцыі у даным выпадку вам садзейнічае.*

Пры канцы сходу была складзеная рэзалюцыя, у якой літкамунаўцы сфармулявалі «першачарговыя задачы згуртаваньня». Нягледзячы на ўсе папярэднія спрэчкі, даклад Паўлюка Шукайлы быў у цэлым ухвалены таварышамі па суполцы: *«Агульны сход Менскай групы Бел. Літ.-Маст. Камуны прызнае ўстаноўку і напрамак дакладу цалкам правідловымі»*, — гаварылася ў рэзалюцыі. На тым самым сходзе літкамунаўцы акрэсьлілі і «першапачатковыя задачы згуртаваньня», куды ўваходзіла «работа над папулярызацыяй» ня толькі «творчасьці аб'яднаньня», але й «літаратурнага напрамку» (як можна зразумець — футурызму ў лефаўскім варыянце) — дзеля гэтага меркавалася ствараць у акругах і раёнах гурткі прыхільнікаў.

Рашэньні вышэйзгаданага сходу пачыналі ўвасабляцца ў жыцьцё. Як сьведчыць хроніка «Ў Літаратурнай Камуне» («Росквіт». № 2), гурткі прыхільнікаў (пераважна са студэнцкай і сялянскай моладзі) рэальна былі створаныя пры Полацкім і Магілёўскім пэдтэхнікумах, у вёсках Пласток на Случчыне і Расоны на Полаччыне. Плянавалася стварэньне аналягічных гурткоў таксама ў Дрысе, Слуцку і Менску (пры Белдзяржунівэрсытэце). Кіравалі гурткамі праўдзейныя сябры Камуны: у Полацку, напрыклад, кіраўніком гуртка быў С. Мялешка, а ў Пластку — А. Атава, які там жыў і працаваў настаўнікам у школе.

Але пакуль іншыя ўдзельнікі суполкі займаліся такой вось арганізацыйна-адукацыйнай дзейнасьцю, Алесь Гародня працягваў расхістваць «Літкамуну» знутры, ствараючы ў ёй канфліктную атмасфэру, і спрэчкі, ініцыяваныя ім, набывалі не такі ўжо і бяскрыўдны характар, пра што сьведчыць пункт в вышэйзгаданай рэзалюцыі:

*З мэтай забесьпячэньня і на далей у згуртаваньні адзінства на грунце ўнутранай дэмакратыі і дысцыпліны, сход лічыць зусім немагчымым наліччa фактаў з боку асобных сяброў згуртаваньня вынясеньня ўнутраных пытаньняў жыцьця арганізацыі (часам нават калі няма яшчэ рашэньня калектыву) на абмеркаваньне вуліцы. Адначасова сход катэгарычна канстатуе абсурднасьць довадаў А. Гародні ў гэтым напрамку (гавару што хачу, як хачу і з кім хачу аб справах згуртаваньня ці аб асобных членах) як фак[т] неразуменьня ім элемэнтарных арганізацыйных прынцыпаў згуртаваньня і ў выніку гэтага грубае парушэньне дысцыпліны.*

Вось у такіх умовах, ускладненых унутранымі рознагалосьсямі й канфліктамі, і праходзіла праца суполкі. Адбывалася гэта, з аднаго боку, у даволі нефармальнай атмасфэры (не забываймася, што зьбіраліся «літкамунаўцы» проста ў кватэры П. Шукайлы), але, як і ў іншых афіцыйна зарэгістраваных арганізацыях, сходы праходзілі з абмеркаваньнем твораў — усё пратакалявалася й падшывалася ў асобную справу. Паколькі амаль усе наступныя пратаколы захаваліся, прычым з пазначэньнем адпаведных датаў, то можна прасачыць, чым жыла «Літаратурная Камуна» ў пэрыяд зь лютага да траўня 1928 г., у прыватнасьці, як ішла падрыхтоўка другога нумару «Росквіту».

Такім чынам, 2 лютага 1928 г. «Беларуская Літаратурна-Мастацкая Камуна» —

у складзе Макара Шалаева, Алеся Гародні, Паўлюка Шукайлы, Рыгора Казака, Янкі Відука, Уладзімера Бохана (мастака) і Ўладзімера Варавы — сабралася на свой чарговы сход. Разглядалі заявы новых удзельнікаў: маладым паэтам Зьмітру Новіку-Ліпнёваму і Алесю Чымбуру прапанавалі ўступіць толькі ў гурток прыхільнікаў, а вось «мастачку Пук» пастанавілі *«залічыць у праўдзейныя сябры»* і *«запрапанаваць падаць пісьмовую заяву і ўсе неабходныя дакумэнты»*. (Значыцца, мастакі ў «Літкамуне» сапраўды вельмі віталіся!)

Сёньня, напэўна, мала хто ведае, што згаданая «мастачка Пук» — ня хто іншая, як будучая вядомая мастацтвазнаўца Алена Аладава, жонка ня менш знакамітага кампазытара Мікалая Аладава. У той час рэалізоўваць мастакоўскія здольнасьці ёй даводзілася ня ў жывапісе ці графіцы, а найчасьцей — у чарцёжнай справе[59]. Каля прозьвішча Пук у пратаколе пазначана: *«інфарм[ацыя] т. Шукайлы»*. Значыцца, ён асабіста прапанаваў маладой мастачцы ўступіць у суполку. Сам факт знаёмства Пук і Шукайлы не выклікае зьдзіўленьня: яны абодва на той момант вучыліся на пэдагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, але на розных курсах і аддзяленьнях. Здавалася, у «Літкамуне» Алена Пук упершыню атрымала шанец па-сапраўднаму спрычыніцца да выяўленчага мастацтва, але так і не пасьпела: пасьля 2 лютага ейнае прозьвішча ў дакумэнтах суполкі ня згадваецца.

Другі нумар «Росквіту» меркавалі выдаць у першай палове сакавіка, творы прадставіць адпаведна — да 12 лютага, прычым кожны зь іх грунтоўна разглядаўся на сходзе:

*А. Атавы — «Дарогаю», «Працоўнаму веку» — прыняць да друку. Казака — прозу, прымаючы пад увагу, што пісана на сьпех — перапрацаваць, пасьля зачытаць. Варавы — «Начальства» — аддаць аўтару на невялічкую перапрацоўку. Гародні — «Творчасьць А. Александровіча» — артыкул у такой рэдакцыі не друкаваць.*

Акрамя гэтага, спрабавалі паставіць на месца галоўнага завадатара ўсіх унутрыарганізацыйных канфліктаў:

*Слухалі: неэтычныя адносіны т. Гародні да сяброў згуртаваньня.*

*Пастанавілі: т. Гародні зрабіць папярэджаньне аб тым, што адносіны, якія наглядаліся на папярэдніх сходах, немагчымыя. У далейшых адносінах да сяброў згуртаваньня, якія наглядаліся і да гэтага часу, — паставіць пытаньне аб яго выключэньні.*

Ілюстраваньне часопісу вырашылі даручыць мастакам У. Бохану, А. Пук і У. Вараву (апошні, як высьвятляецца, акрамя літаратурных здольнасьцяў меў яшчэ й мастацкія — нездарма быў рэдактарам насьценгазэты ў Акруговым зямельным аддзеле, дзе працаваў старэйшым торфмайстрам).

Наступны сход «Літкамуны» адбыўся 23 лютага. Ён адметны тым, што на ім абмеркавалі пошукі новага тэхсупрацоўніка, набыцьцё друкарскай машынкі й радыёпрыёмніка і... аднагалосна прынялі

[59] Падрабязьней гл.: Жибуль В. Участие Елены Пук (Аладовой) в творческих объединениях 1920-х годов // Елена Аладова. Музей — ее судьба: Воспоминания, документы, исследования / Сост. Б. Крепак, В. Прокопцов, Н. Усова. Минск: Мастацкая літаратура, 2006. С. 291—295.

ў правадзейныя сябры будучага народнага паэта Петруся Броўку — як пазначана ў пратаколе, «былога сябра «Маладняка». Праўда, сам Броўка на гэтым сходзе не прысутнічаў — як і на ўсіх наступных: тады ён жыў яшчэ ў Полацку[60]. Цікава, але ў мэмуарных крыніцах згадваецца ягоны ўдзел у працы рэдкалегіі літкамунаўскага часопісу. Гэта наводзіць на думку, што ў Менску Броўка калі-нікалі бываў:

*...З другога нумару «Росквіту» паэзія ляжала фактычна на Броўку,* — прыгадваў Ян Скрыган, хоць у пратаколах адказным за паэзію пазначаны менавіта ён сам. — *У той час яна таксама была розная, можа, нават у большай ступені, як цяпер. І лірычная, на вясковай мэлядычнай якасьці, і грамабойна-ўрбаністычная, так званая наватарская. Апошняя больш пасавала да нашага футурыстычнага накірунку, але Броўка прыкладаў многа намаганьняў, каб у вершах аставаліся і душа, і ласка, і мэлёдыя. Вядома, не без сутычак, і часта вельмі вострых, з Шукайлам. Тут якраз месца сказаць — Шукайла ня быў гняўлівы ці помсьлівы. Ён быў чулы, спагадлівы, чалавечны*[61].

Як можна меркаваць па «Хроніцы» часопісу «Маладняк» (1928, № 4, рубрыка «Прыёмы і выключэньні»), Броўка пакінуў «Маладняк» абсалютна добраахвотна:

*Цэнтральнае Бюро «Маладняка» па заяве выключыла са складу «Маладняка» сябра Полацкай філіі — Броўка, і па прадстаўленьню Менскай філіі — Мік. Дубовіка.*

Незвычайнай падзеяй для менскага культурнага жыцьця стаў прыезд 24 лютага 1928 г. вядомага японскага пісьменьніка Ўдзяку Акіта (сапраўднае прозьвішча Такудзо, 1883—1962), які тады падарожнічаў па СССР і на запрашэньне Беларускай сэкцыі міжнароднай сувязі эспэрантыстаў наведаў Беларусь. Удзяку спачуваў сацыялістам, у той час зарэкамэндаваў сябе як «піянэр левых плыняў у японскім тэатры», і, натуральна, яму было цікава сустрэцца зь літкамунаўцамі.

*Памятаю японскага пісьменьніка Акіта Такудзо (Удзяку),* — прыгадваў Ян Скрыган, — *кароценькага, жвавага, бронзавага ад свайго ўсходняга сонца, з тварам, пабітым на танюсенькія маршчынкі. Гэта было ў часы «Літкамуны», і нам вельмі імпанавала, што ён, левы, у першую чаргу завітаў да нас, таксама «левых»*[62].

Паколькі перакладчыка зь японскай мовы знайсьці было праблематычна, гутарка з Удзяку Акіта вялася на мове эспэранта, выдатным знаўцам якой зьяўляўся адмыслова запрошаны журналіст і крытык Зьміцер Сьнежка. Мяркуючы па водгуку замежнага госьця, Акіта таксама атрымаў прыемныя ўражаньні ад гэтай сустрэчы:

*Я застаўся вельмі рад, што ў Менску ўбачыў і пазнаёміўся з найбольш пра-*

[60] Выяўленыя дакумэнты «Літкамуны» дазваляюць падкарэктаваць недакладнасьці, дапушчаныя, напрыклад, у публікацыі: Жыбуль В. Футурыст Пятрусь Броўка // ARCHE. 2005. № 5. С. 254—260.

[61] Тамсама. С. 223.

[62] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 66.



Паўлюк Шукайла і Ўдзяку Акіта. Менск, 25 лютага 1928



Японскі пісьменьнік Удзяку Акіта сярод сяброў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны». Зьлева направа, ніжні шэраг: Паўлюк Шукайла, Удзяку Акіта, Алесь Гародня, Рыгор Казак; верхні шэраг: Макар Шалай, Янка Відук, Уладзімер Бохан (?), Уладзімер Варава. Менск, 25 лютага 1928



Калектыў рэдакцыі слуцкай акруговай газэты «Вясковы будаўнік». Другі зьлева — Янка Відук, чацьверты — Паўлюк Шукайла, пяты — Уладзімер Варава. Лістапад 1925



Пахаваньне Ўладзімера Варавы. Ля труны — удава пісьменьніка Ганна Варава і Паўлюк Шукайла. Менск, 5 траўня 1929

*грэсіўнай літаратурнай плыняй — левым фронтам беларускай літаратуры — «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камунай». Я заўважыў, слухаючы вершы маладых беларускіх лефаўцаў, нешта агульнае для лефаў усіх краін: Японіі, Расеі, Беларусі і інш.*[63]

Перабываньне Ўдзяку Акіта ў Менску шырока асьвятлялася ў прэсе, яно стала знакавай падзеяй у гісторыі беларуска-японскіх культурніцкіх кантактаў. У тагачасных часопісах зьявіліся некалькі аглядных артыкулаў пра тагачасную японскую літаратуру, а таксама пераклад п'есы Ўдзяку Акіты «Скок шкілетаў» («Полымя». 1928. № 10). Японскі драматург прабыў у Беларусі каля тыдня.

7 сакавіка на пасяджэньні суполкі, акрамя пастаянных удзельнікаў Шукайлы, Відука, Шалаева і Казака[64], прысутнічалі таксама двое навічкоў — *«Запрошаныя: Валынец і Казлоўскі»*. Менавіта Янка Валынец стаў тым самым тэхпрацаўніком, у якім адчула патрэбу рэдакцыя «Росквіту». Што да Казлоўскага, дык адсутнасьць ініцыялаў у спалучэньні з распаўсюджаным прозьвішчам робіць для дасьледчыка не найлепшую паслугу. Ня выключана, што на пасяджэньне быў запрошаны ня хто іншы, як паэт Віктар Казлоўскі, чые вершы пачатку 1930-х гг. яшчэ зазнаюць уплыў футурызму і канструктывізму...

Літкамунаўцы абмеркавалі і ўхвалілі да друку аповесьць «Затокі ў бурах» Янкі Відука і артыкул «Паэты і пісьменьнікі Полаччыны» Макара Шалая, а апавяданьне «Прапіты падарунак» Рыгора Казака вырашылі друкаваць толькі «пасьля апрацоўкі і калі будзе большасьць галасоў». Як бачым, збор матэрыялаў для «Росквіту» зацягнуўся прыкладна на месяц.

## 5. ДРУГІ «РОСКВІТ»

Роўна праз тыдзень літкамунаўцы працягнулі разгляд твораў. Заключэньні выносілі самыя розныя: адны рэчы было вырашана адразу ж безагаворачна друкаваць (артыкул М. Шалая, вершы П. Броўкі і Я. Відука), другія — «друкаваць, калі да часу друкаваньня не дашлецца лепшага» (апавяданьне Ю. Лявоннага), і, урэшце, чацьвёртыя — «не друкаваць, бо зьместава і фармальна не падыходзіць» (апавяданьне М. Нікановіча). Крытыку сустрэў нават працяг артыкулу самаго Шукайлы «Літаратурнае сёньня». Аказваецца, яго тэкст напачатку быў напісаны як літаратурны партрэт Язэпа Пушчы, да якога кіраўнік «Літкамуны» меў вельмі неадназначнае стаўленьне. *«Трэба характарызаваць не партрэт, а літ. групу»*, — параілі П. Шукайлу паплечнікі й пастанавілі: *«не друкаваць»*.

Ужо крыху расчараваны Шукайла працягнуў сход, закранаючы «тэхнічныя пытаньні выдавецтва» — шаржы й вокладку. Але й тут яго чакала грозная абструкцыя з боку сяброў па аб'яднаньні. Рэч у тым, што, як мы ўжо згадвалі, крытыка сустрэла выхад першага нумару «Росквіту» збольшага абыякава. Гэта вельмі абурыла і зачапіла гонар літкамунаўцаў — яны палічылі такое ігнараваньне за змову і вырашылі адказаць на яе маленькай мастацкай помстай. Уладзімер Бохан намаляваў карыкатуру «Башня молчания» з шаржамі на рэдактараў тагачасных найбуйнейшых газэт і часопісаў.

[63] Удзяку Акіта. Уражаньні аб Беларусі // Росквіт. 1928. № 2. С. 49.

[64] Унізе аркуша пад пратаколам стаіць і подпіс А. Гародні, які, напэўна, на пасяджэньне спазьніўся.

*З гэтай вежы, на ўсёй яе вышыні, то з акна, то проста са сьцяны, у маўклівай і змоўніцкай позе выступала чыянебудзь фігура ці абліччa: тыя, хто быў вінаваты ў маўчаньні,*[65]

— так апісваў карыкатуру Ян Скрыган. Там былі намаляваныя, у прыватнасьці, Уладзімер Жылка (газэта «Зьвязда»), Адам Бабарэка (часопіс «Узвышша»), Анатоль Вольны (газэта «Савецкая Беларусь»), Радзівон Шукевіч-Трацьцякоў (газэта «Беларуская вёска»), Цішка Гартны (часопіс «Полымя»)... Акрамя гэтага, на Цішку Гартнага рыхтаваўся да друку яшчэ адзін шарж, які большасьці літкамунаўцаў падаўся занадта абразьлівым, тым болей, што Гартнага яны лічылі дужа паважаным творцам, амаль клясыкам. Але Паўлюк Шукайла настойваў, каб шарж усё ж такі зьмясьцілі. Ягоныя ж таварышы пратэставалі, заяўляючы, што гэта *«супярэчыць нашай і агульнай палітыцы ў пытаньні літаратуры»*. Накал спрэчкі дасягнуў такога апагею, што нават неўтаймаваны Шукайла ня вытрымаў і тэрмінова падаў заяву

*аб зьняцьці яго з абавязкаў старшыні аб’яднаньня і рэдактара, што грунтуецца на страце яго аўтарытэтнасьці між сяброў Літ.-Маст. Камуны.*

Удзельнікі суполкі не чакалі такога павароту і прапанавалі П. Шукайлу

*застацца старшынёю аб’яднаньня, а ў рэдактарстве — вызначыць рэдкалегію ў ліку 5 (пяці) асоб, старшынёю якой заставіць таксама т. Шукайлу.*

Наконт рэдкалегіі меркаваньні разьдзяліліся: двое сяброў выступілі супраць, а сам Шукайла ўвайсьці ў рэдкалегію адмовіўся і нават упершыню за гісторыю суполкі не паставіў пад пратаколам свайго подпісу побач са словам «Старшыня».

Тым ня менш, у «Літкамуны» было запланавана некалькі творчых мерапрыемстваў, і ламаць гэтыя пляны нікому не хацелася. Ужо на наступны дзень (15 сакавіка) літкамунаўцы сабраліся, каб абмеркаваць праграму свайго выступленьня на радыёстанцыі, што мелася адбыцца 19 сакавіка. З пратаколу даведваемся, якія менавіта творы літкамунаўцы зьбіраліся агучыць (і найхутчэй, агучылі) на ўсю краіну:

*Пастанавілі: Чытаць вершы: Броўкі Петруся: «Даўнейшае» і «Дайце новую музыку» — чытае М. Шалай. Вершы Казака Р. «У падвячорку» і «Ў вагоне» — чытае сам. Вершы Атавы «Працоўнаму веку» — чытае Гародня. Вершы Шукайлы «Сястрыцы Любе» — чытае сам. Вершы Відука «Галоп» і «Наборшчык» — чытае сам. — Збор для рэпэтыцыі 18-га сакавіка, а 6 гадз. у рэдакцыі «Росквіт».*

Падобна «Маладняку», «Літкамуна» плянавала выданьне сваёй кніжнай сэрыі. Для яе ўжо былі падрыхтаваныя рукапісы паэтычных зборнікаў А. Атавы (назва невядомая), Я. Відука («Вітрына»), П. Шукайлы («Акорды дзён»). Таксама ў наступных нумарох «Росквіту» меркавалася публікацыя аповесьці Шукайлы «Бацька Булак-Балаховіч», артыкул прафэсара Нізяна-Ляхоўскага пра творчасьць М. Зарэцкага.

[65] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 151.

Поўным ходам ішла і праца над часопісам. Уладзімер Бохан[66] намаляваў два варыянты вокладкі, зь якіх выбралі кампазыцыю зь сініх, чорных і белых палосаў, што разыходзяцца паўкругам. Літкамунаўскім крытыкам было даручана напісаць рэцэнзіі на наступныя выданьні: на аповесьць Алеся Гародні «На крэсах» — Макару Шалаю, на кнігу паэзіі Ўладзімера Жылкі «З палёў Заходняй Беларусі» — Алесю Гародню і на часопіс «Полымя» (1928. № 1) — Шалаю і Гародню разам. Акрамя таго, Алесь Гародня ў пары зь Янкам Відуком меліся хутка, за пяць дзён, перакласьці з расейскае мовы апавяданьне «Вольніца» Арцёма Вясёлага — «і зьмясьціць у 2-м нумары, калі будзе тэхнічная магчымасьць». Што ж мелася на ўвазе пад «тэхнічнай магчымасьцю»?

Рэч у тым, што ў арыгінале апавяданьне ўтрымлівае шэраг не заўсёды простых для друку асаблівасьцяў: наўмыснае чляненьне на адвольныя пэрыяды, манерную разьбіўку словаў па радкох, пропуск знакаў прыпынку, неапраўдана шырокае выкарыстаньне выклічнікаў. Але самым вырашкаваным падаваўся тэкставы фрагмэнт, выдрукаваны ў форме трохкутніка, які пашыраецца ўніз. Як вядома, у 1920-я гг. жыцьцё і творчасьць Арцёма Вясёлага былі зьвязаныя зь літаратурнымі групоўкамі вельмі featureнага кшталту, у тым ліку і зь «Лефам». Апавяданьне «Вольніца», упершыню надрукаванае ў часопісе «Леф» (1924. № 1), якраз і зьявілася тым творам, дзе ўплывы лефаўскіх фармальных пошукаў праявіліся найбольш яскрава. Дзякуючы гэтаму апавяданьню слынны паэт-футурыст Аляксей Кручоных заўважыў і ўхваліў у творчасьці маладога пісьменьніка менавіта «завум»[67].

Пераклаў апавяданьне ўрэшце адзін Янка Відук (Алесь Гародня ў часопісе як перакладчык не пазначаны). Літкамунаўцы не былі ўпэўненыя, што ў іх атрымаецца захаваць у «Вольніцы» такія досыць выштукаваныя графічныя дэталі, асабліва трохкутнік. Але наборшчык даў рады — і апавяданьне ў «Росквіце» (1928. № 2) глядзелася ня горш, чым яго арыгінал у «Лефе».

Мабыць, адчуваючы крызіс уласных творчых сілаў, літкамунаўцы спрабавалі завабіць у свае шэрагі Андрэя Александровіча — паэта авангарднай скіраванасьці, таксама, дарэчы, вядомага сваімі экспэрымэнтальнымі графічна-візуальнымі вершамі. Гародня напісаў пра Александровіча артыкул, у якім нават перахваліў апошняга і пасьля абмеркаваньня быў вымушаны «ўнесьці ў яго элемэнты адмоўнасьці ў творчасьці А. Александровіча» (артыкул, зрэшты, так і ня быў зьмешчаны). Літкамунаўцы хацелі нават перадрукаваць у «Росквіце» скандальна вядомую Александровічаву паэму «Цені на Сонцы», акурат толькі што апублікаваную ў «Полымі» *(«калі ён* [Александровіч] *згодзіцца даць яе»)*, але ўсё ж такі адмовіліся ад гэтай ідэі. Так і не пасьпеў Александровіч ніяк спрычыніцца да «Літкамуны», хоць ён, здавалася б, на ролю «камуніста-футурыста» выдатна падыходзіў, і нават вокладкі першага (1930) і другога (1931) выданьняў «Ценяў на Сонцы» выйшлі ў авангардысцкім — у нечым блізкім да супрэматызму —

[66] У далейшым У. Бохан самавыяўляўся як скульптар. Стварыў скульптуры «Пралетар», «Партызан» і інш. Загінуў на фронце ў час Другой сусьветнай вайны.

[67] Гл.: Никанович Б. В. Артем Веселый и литературные группировки 20-х годов // Вестник Белорусского университета. Сер. 4. 1971. № 3. С. 32.

аздабленьні мастака Барыса Малкіна.

На памяць пра нядаўнюю сустрэчу з Удзяку Акіта літкамунаўцы вырашылі ў часопіс *«клішэ даць: групу з 6-ці чалавек»*. Гэты фатаздымак зь першай старонкі «Росквіту» даволі часта перадрукоўваецца як ілюстрацыя да публікацый пра літаратурнае жыцьцё 1920-х гг. На ім можна пабачыць Шалая, Шукайлу, Удзяку Акіта, Гародню, Відука і Вараву. Аднак у архіве кіраўніка «Літкамуны» захаваўся яшчэ адзін, да нядаўняга часу невядомы, здымак, на якім акрамя гэтых шасьцярых прысутнічаюць яшчэ два маладыя чалавекі. У адным зь іх — тым, што глядзіць спадылба на пярэднім пляне справа — можна пазнаць Рыгора Казака (Крушыну), а вось другі, той, што справа ад Янкі Відука, — хутчэй за ўсё, літкамунаўскі мастак Уладзімер Бохан, аднак мы ня можам сьцьвярджаць гэта з пэўнасьцю, бо аніводнага іншага здымка У. Бохана нам пакуль, на жаль, адшукаць не ўдалося.

На час афармленьня рэдкалегіі таварышы прымірыліся з Шукайлам. У яе склад пастанавілі абрацЬ: *«Шукайла — аднагалосна; Варава — аднагалосна; Гародня — два за і два супроць* [Як бачым, палова ўдзельнікаў «Літкамуны» яго падтрымлівала, а палова — не. — **В. Ж.**]; *Шалай — аднагалосна і Відука — аднагалосна»*. Старшынём рэдкалегіі, натуральна, абралі Шукайлу. Разьмеркавалі й працоўныя абавязкі. Пастанавілі:

*Тэхнічна-выдавецкія справы даруч[ыць] т. Гародні; веданьне прозай — Вараве і Відуку, веданьне вершамі — Відуку, веданьне крытыкай — Шалаю.*

Гэта не стыкуецца з пазьнейшымі сьцьвярджэньнямі Я. Скрыгана, які пісаў: *«У нас не было ніякіх штатных адзінак, ні рэдкалегіі, ні рэдакцыі, ні жанравых аддзелаў...»*[68] Напэўна, разьмеркаваньне абавязкаў мела даволі ўмоўны характар, і Скрыган не надаваў гэтаму вялікага значэньня.

Наступны пратакол чамусьці ня мае нумару — сход адбыўся 29 сакавіка 1928 г. На ім прысутнічалі чацьвёра: П. Шукайла, У. Варава, М. Шалай і Р. Казак. Як відаць, нумар быў ужо амаль складзены, але Варава ці не ў апошні момант даў у яго выпраўлены варыянт свайго фэльетону «Начальства». Сябры ўхвалілі твор і вырашылі «друкаваць фэльетон у мастацкім аддзеле пры наліччы месца ў часопісе» (месца знайшлося). У той час «Камуна» пачала рыхтавацца да буйнамаштабнага мерапрыемства — «усебеларускага сходу (зьезду) аб’яднаньня», прызначанага на 29 красавіка. Зьезд меркавалася сумясьціць зь літаратурнай вечарынай.

Але раскол у ядры «Камуны» дасягнуў найвышэйшага пункту: Алесь Гародня і Янка Відук вырашылі пакінуць арганізацыю і падалі заявы аб выхадзе. Сваю прапанову выказаў Уладзімер Варава:

*Дзеля таго, што, як відаць, з пададзеных тт. Гародняй і Відуком заяў, паведамленьне іх аб выхадзе з згуртаваньня базіруецца на асабістых узаемаадносінах з старшынёю і што гэтыя ўзаемаадносіны павінны быць разьвязаны агульным сходам — паведаміць іх, што справа гэтая будзе разьбірацца на агульным сходзе і толькі тады, калі яны ня зьявяцца, выключыць.*

[68] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 223.

Гэтую прапанову прынялі аднагалосна. Сход, на якім будзе абмяркоўвацца справа, прызначылі на *«1 красавіка а 12 гадзіне»*.

Што ўрэшце вырашылі на тым першакрасавіцкім сходзе, невядома, бо пратакол яго не захаваўся. У часопісе «Маладняк» (1928. № 4) знаходзім інфармацыю пра тое, што Алесь Гародня ня толькі выйшаў зь «Літкамуны», але й нават падаў заяву ў «Маладняк». А вось Янка Відук цягам красавіка яшчэ заставаўся ў рэдкалегіі «Росквіту» і мог нават вырашаць лёс часопісу. Пазьней ён прыгадваў:

*Памятаю і апошнюю хвіліну нашай выдавецкай дзейнасьці. Мы з Броўкам зайшлі ў друкарню, дзе друкаваўся другі нумар «Росквіту». Там быў Шукайла, ён прыйшоў, каб падпісаць часопіс у сьвет. Шчасьліва ён трымаў гэты нумар у руках. Гэтак жа шчасьліва перадаў яго Броўку, сказаўшы, што нарэшце напісаў дэкларацыю, якой вельмі не хапае нам як творчай арганізацыі. Зьдзівіўшы вочы, Броўка перадаў нумар мне. На першай старонцы за вокладкаю, набраныя рознымі шрыфтамі ўразьбіўку, крычма крычалі радкі дэкларацыі*[69].

У апавяданьні «Смага», а потым у кнізе ўспамінаў «Кругі» Ян Скрыган нават цалкам прывёў гэты тэкст, набраны сечанымі радкамі, быццам акцэнтны верш:

*Беларуская Літаратурна-мастацкая*
*Камуна*
*выйшла ў паход*
*па палёх, па шляхох*
*барацьбы*
*за росквіт!!!*
*(вызваленьне чалавецтва*
*ад прытухлых,*
*заскарузлых*
*конанаў,*
*традыцый*
*архіўных*
*вякоў).*
*Ідзе ў наступ,*
*руйнуе!*
*літаратурна-мастацкія*
*плецяні*
*і забарыкаджаньні,*
*сплеценыя,*
*нацяганыя*
*з трантаў*
*і гануч*
*стар'ёўшчыны.*
*У шэрагах фронту*
*няма*
*плякатаў,*
*шыльдаў,*
*маскіраваньня*
*ад сапраўднасьці.*
*У руках*
*ня сьцяг,*
*а вытворчасьць!*
*Сябры камуны*
*работнікі фабрыкі*
*літаратуры*
*і мастацтва;*
*вытворчасьць —*
*акорд жыцьця.*
*Пад лязг*
*фабрычных машын,*
*сьпеў жняярак і кос*
*чуецца жыцьця гудок —*
*пачынаецца*
*наша праца!..*[70]

Але ўбачыць сьвет у часопісе дэкларацыі не было наканавана: абвяшчаючы вайну клясычным традыцыям і імкнучы-

[69] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 223.

[70] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 62—63.

ся выклікаць эпатаж у прадстаўнікоў іншых літаратурных плыняў і суполак, Шукайла выклікаў яго ў... сваіх жа хаўрусьнікаў па «Літаратурнай Камуне», якім традыцыі Купалы й Коласа аказаліся бліжэйшыя за футурыстычна-лефаўскія. Вось як напісаў пра гэта Ян Скрыган:

*Гэта было ў друкарні, мы стаялі між друкарскіх машын — Броўка, Шалай і я, — чыталі яе, і нашы сэрцы сьціскаліся болем. Такая дэклярацыя была проці нашых перакананьняў, яна як бы адбірала ў нас права на тое, што мы любілі, чым жылі: на Купалу, на Коласа, на тую манеру, якой мы дагэтуль умелі пісаць. Нам вельмі не хацелася, каб такая дэклярацыя рабіла нас адшчапенцамі. Абараняў яе толькі Шукайла, і калі зь ціхага, спакойнага наш пратэст пачаў пераходзіць на раздражненьне, калі выявілася наша аднадушная трывога ў выпадку яе паяўленьня ў сьвеце і каб палажыць канец спрэчкам, я зь нецярпліваю асалодаю вырваў гэтую старонку…*[71]

Як бачым, авангардыстамі Броўка, Відук і Шалай сябе не адчувалі, пра што сьведчыць ужо сама па сабе боязь «быць адшчапенцамі». Не падзялялі яны эстэтычнага радыкалізму Паўлюка Шукайлы.

Такім чынам, «Росквіт» выйшаў з друку без дэклярацыі — пачынаецца ён адразу з фатаздымку літкамунаўцаў з Удзяку Акіта. Па аб'ёме другі нумар атрымаўся амаль удвая танчэйшы за першы. Склад аўтараў амаль той самы, зь невялікімі зьменамі. На 80 старонках зьмясьціліся вершы Петруся Броўкі («Дайце новую музыку», «Не выгінай свае далоні…», «Даўнейшае»), Рыгора Казака («У падвячорку»), Янкі Відука («Галоп»), Апанаса Атавы («Працоўнаму веку», «Дарогаю»), Юркі Бітуса («Вухкаюць заводы»), аповесьць «Затока ў бурах» Я. Відука, празаічныя фрагмэнты «На вятры» Юркі Лявоннага, апавяданьне «Быльнёг» Р. Казака, фэльетон «Начальства» Ўладзімера Варавы, крытычны нарыс «Удзяко Акіта» Зьмітра Сьнежкі, нарыс самаго Акіта «Аб Леф'е ў японскай літаратуры» і ягоная нататка «Ўражаньні аб Беларусі», працяг крытычнага нарысу «Літаратурнае сёньня» Паўлюка Шукайлы, яго ж артыкул «Пресвятая богородица, спаси нас» — пра творчасьць У. Жылкі і Міколы Байкова, крытычны нарыс «Паэты і пісьменьнікі Полаччыны» Макара Шалая, рэцэнзіі на «Вясновыя мэлёдыі» і «Полымя», № 1 за 1928 г., падпісаныя адпаведна крыптанімамі Б.-Б. і Г. і Ш. (Гароднія і Шалай), а таксама статут «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны».

«Росквіт» № 2 стаў апошнім сумесным плёнам дзейнасьці ўдзельнікаў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны».

*Пасьля другога нумару «Росквіту»,* — успамінаў Ян Скрыган, — *мы зноў сабраліся на Шукайлавай, цяпер ужо больш абжытай, кватэры па вуліцы 11 ліпеня (цяпер Кірава) і большасьцю галасоў парашылі, што далей нам рабіць няма чаго*[72].

## 6. ЗЬЕЗД СА СТРАЛЯНІНАЙ І ХАЎТУРНЫМ МАРШАМ

Зьезд «Літкамуны» меў адбыцца 29—30 красавіка — акурат напярэдадні пер-

[71] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 61—62.
[72] Тамсама. С. 63.

шамайскіх сьвяткаваньняў, і арганізацыя не пасьпела нават атрымаць на яго грошай у Наркамасьвеце. Давялося Паўлюку Шукайлу праезд іншагародніх дэлегатаў прафінансаваць з уласнай кішэні. Дзякуючы захаванаму чарнавіку з падлікам выдаткаў мы ведаем, што з Полацку на зьезд прыехалі Пятрусь Броўка і ягоны брат Андрэй Бурлівы (згаданы там як Бурлячы), з Амсьціслава — Юлі Таўбін, П. Скокаў і Зьмітрок Астапенка, з Магілёва — Юрка Лявонны, з Бабруйску — Барыс Мікуліч, з Слуцку — Юрка Бітус і Зьміцер Новік (Ліпнёвы). Захавалася прынятая на зьезьдзе (сходзе) Пастанова сяброў «Беларускай Літ.-Мастацкай Камуны»[73], а таксама сьціслае апісаньне ва ўспамінах Рыгора Крушыны (Казака) пра Барыса Мікуліча:

*Гэты зьезд быў першым і апошнім. Прафэсар Пятуховіч выступіў з дакладам аб творчасьці Цішкі Гартнага. Пасьля дакладу на парадку дня стаялі арганізацыйныя пытаньні. І тут, як гаворыцца, пачалася бура пасьля зацішша. Бальшыня сябраў «Літаратурна-мастацкай камуны» выступіла супраць ідэалягічных установак «Росквіту». Але гэта была толькі прычэпка. Ужо загадзя рыхтаваўся развал «Літаратурнай камуны». Ейны сябра Алесь Гародня ўзяў на сябе галоўную ролю ў змове. На зьезьдзе прысутнічалі і сябры «Маладняка». «Маладняк» у той час быў напаўразвалены: галоўныя літаратурныя сілы зь яго выйшлі разам з кіраўніком арганізацыі Міхасём Чаротам. Рэшта была зацікаўленая ў тым, каб захаваць «Маладняк» і аднавіць былых сяброў. Зразумела, што развал іншых літаратурных згуртаваньняў і прыцягненьне адтуль у свой бок пісьменьнікаў адпавядалі іхным імкненьням. Алесь Гародня запэўніў сваіх калегаў, што мэтазгодна пакінуць Шукайлу аднаго і перайсьці ізноў у «Маладняк», як гэта зрабілі некаторыя сябры «Праблiску». Нехта сеў у залі за раяль і зайграў хаўтурны марш. Барыс Мікуліч быў вельмі ўсхваляваны, ён гутарыў з Шукайлам, спрачаўся зь іншымі.*

*— Не, ня здрадзіў, — казаў ён горача. — Ня ўдасца разваліць. «Росквіт» выйдзе з друку*[74].

Паводле ўспамінаў Ніла Гілевіча, Пятрусь Броўка распавядаў яму, што на тым самым зьезьдзе Паўлюк Шукайла, не задаволены вынікамі галасаваньня, выхапіў рэвальвэр і стрэліў у столь — ажно іншыя ўдзельнікі «Літкамуны» ад страху пападалі пад сталы. Барыс Мікуліч ня згадвае гэтай пікантнай падрабязнасьці, затое прыгадвае пра досыць эпатажныя паводзіны Петруся Броўкі, які *«залез на стол і патрабаваў распусьціць «Камуну»*[75]. Ці не таму складальнікі яго 9-томнага Збору твораў пасаромеліся згадаць у «Летапісе жыцьця і творчасьці» пра Броўкаў удзел у «Літкамуне»?

Паўлюк Шукайла быў у шоку — такога фіналу ён яўна не чакаў. З касьцяка суполкі зь ім засталіся толькі Ўладзімер Варава да Рыгор Казак. Спрабуючы ўратаваць арганізацыю, яны ўтрох тэрмінова стварылі Раду Літаратурна-Мастацкай Камуны і 5 траўня 1928 г. сабраліся на пасяджэньне. Сяброў хвалявала пытаньне: што рабіць далей і як захаваць суполку, ці, калі казаць моваю пратаколу

[73] Гл. Дадатак.

[74] Рамановіч К. Барыс Мікуліч // Бацькаўшчына. 1962. № 1—2 (585—586). С. 6.

[75] Мікуліч Б. Аповесць для сябе. Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. С. 16.

(вырашыўшы, што давядзецца ўсё пачынаць з нуля, літкамунаўцы пазначылі яго нумарам 1):

*1. Слухалі аб разьмеркаваньні абавязкаў.*

*Пастанавілі: Старшынёю і адказным рэдактарам т. Шукайлу, намесьнікам старшыні Рады і рэдактара — т. Вараву, сакратаром адказным Рады і сакратаром рэдакцыі — т. Казака.*

*2. Слухалі аб падачы інфармацыі ў друку і ЦК КПБ аб існаваньні аб'яднаньня.*

*Пастанавілі: Згадзіцца з праектам інфармацыі ў друку аб выніках зьезду і даручыць т. Шукайлу ў тэрміновым парадку напісаць пісульку, як аб выніку зьезду, так і аб становішчы ў аб'яднаньні.*

Такое разьмеркаваньне абавязкаў сьведчыць, што акрамя прысутных на сходзе трох чалавек у «Камуне» больш нікога не засталося. Некаторы час Шукайла, праўда, пісаў лісты былым літкамунаўцам з правінцыі, спадзеючыся, што тыя вернуцца ў суполку. Аднак ягоныя намаганьні былі марныя. Даведаўшыся, што ў арганізацыі засталіся толькі тры чалавекі, хай нават і настроеныя выдаваць часопіс, Камітэт па справах друку адмовіў «Літкамуне» ў далейшым існаваньні. Акрамя таго, Шукайлу прымусілі прымусілі зрабіць грашовую справаздачу аб даходах і выдатках «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», ажыцьцёўленых за восем месяцаў бурнай дзейнасьці. Капітан затанулага карабля беларускага футурызму засеў за падлікі. Трэба было ўлічыць усё: ганарары і авансы аўтарам і супрацоўнікам, арганізацыйныя, транспартныя і канцылярскія выдаткі, плату за памяшканьне і прыбіраньне рэдакцыі, карыстаньне тэлефонам і электрычнасьцю, ацяпленьне памяшканьня... Урэшце атрымалася 5269 руб. 31 кап. — крыху больш, чым было атрымана ад дзяржавы[76]. Да таго ж, засталіся й сякія-такія запазыкі некаторым установам (Белдзяржвыдавецтву, рэдакцыі газэты «Зьвязда») і асабіста тэхсупрацоўніку Янку Валынцу.

19 траўня, сабраўшы ўсе неабходныя зьвесткі, Паўлюк Шукайла прыйшоў у Камітэт па справах друку, дзе яны разам са старшынём камітэту Ігнатам Шыпілам падпісалі акт аб ліквідацыі «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны» і часопісу «Росквіт». Цяжка, відаць, даўся Шукайлу гэты подпіс: хто-хто, а ён зусім і ня думаў ліквідаваць суполку, не хацеў так лёгка хаваць сваю вялікую футурыстычную мару. Пра гэта сьведчыць хоць бы пункт 7 згаданага акту:

*Ліквідаваньне Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны робіцца ў адміністрацыйным парадку Камітэтам па Справах Друку і з паасобнымі сябрамі тав. Шукайла непагоджана, на падставе чаго апошні складае зь сябе ўсякую*

[76] Гісторыя з выданьнем «Росквіту» мела свой працяг. Калі былы кіраўнік «Літкамуны» зьехаў на навучаньне ў Маскву, партыйныя чыноўнікі раптам не далічыліся 1454 рублёў 40 капеек дзяржаўных сродкаў, якія, насуперак закону, быццам бы растраціў Шукайла, прадставіўшы ў апраўданьне выдаткаў «шэраг самніцельных дакумэнтаў». Справу то прыпынялі, то ўзбуджалі ізноў, і ўрэшце пасьля адпаведнай экспэртызы паэт быў прыцягнуты за растрату 244 рублёў 50 капеек і перавышэньне ўлады пры выдаткоўваньні сродкаў на выданьне часопісу «Росквіт» («няправільна выдаў ганарар: 355 руб. сабе і 190 іншым»). Гл.: НАРБ. Ф. 15. Воп. 22. Спр. 148. Арк. 67.

*адказнасьць за ліквідаваньне аб'яднаньня і толькі выконваючы загад Камітэту па Справах Друку ад .......... за № ....., апошні падпісаў гэты акт.*

Улетку 1928 г. «Хроніка» часопісу «Маладняк» засьведчыла: *«На паседжаньні ЦБ ад 29 мая разглядалася заява Я. Відука, П. Броўкі, Шалая і Атавы — былых сяброў зьліквідаванай Літ.-Маст. Камуны, з просьбай аб залічэньні іх у «Маладняк»*[77].

А цяпер вернемся да прыведзенага вышэй урыўку з успамінаў Рыгора Крушыны і зьвернем увагу на такую дэталь: паэт сцьвярджае пра сплянаванасьць развалу «Літкамуны», называе галоўнага зачыншчыка — Алеся Гародню, і часткова раскрывае прычыны такой загадзя падрыхтаванай ліквідацыі суполкі: маладнякоўцы жадалі падмацаваць склад уласнай арганізацыі (якая перажыла ўжо не адзін раскол) коштам прыцягненьня/вяртаньня сяброў зь іншых суполак. І сапраўды, «Маладняк» амаль да апошняга моманту свайго існаваньня імкнуўся захаваць вяршэнства ў літаратурным працэсе, і прысутнасьць суполак-канкурэнтаў (нават значна меншых па колькасьці чальцоў) яму вельмі замінала. Тое самае зазначае і другі непасрэдны сьведка тых падзеяў, крытык-узвышанец Антон Адамовіч, робячы акцэнт на палітычным аспэкце гэтай справы.

*Пачаліся пошукі больш надзейнай агентуры, якая была б у беспасярэднім падпарадкаваньні артадаксальных бальшавікоў. Стварыць такую агентуру можна было толькі на базе тых мізэрных астаткаў, што захаваліся ад старога «Маладняка», блізу зусім ліквідаванага пры стварэньні «Полымя». Пазасталыя ў «Маладняку» партыйцы атрымалі дырэктыву паставіць арганізацыю зноў на ногі. Перш-наперш трэба было пашырыць яе колькасна, бо пасьля ўсіх выхадаў, расколу й чыстак ад легендарнай пяцісоткі засталася толькі пяцёрка сапраўдных сяброў. Пачалася кампанія на зварот. У травені 1928 году ў «Маладняк» вярнулася бальшыня «прабліскаўцаў» і «літкомаўцаў», а лідэры гэтых арганізацыяў — Нічыпар Чарнушэвіч і Паўлюк Шукайла — засталіся па-за літаратурнымі групамі*[78].

Працэсы, пра якія піша А. Адамовіч, урэшце завяршыліся ўтварэньнем на базе «Маладняка» новай літаратурнай арганізацыі — Беларускае Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў (БелАПП), якая ў сваю чаргу ўваходзіла ў «Всесоюзное Объединение Ассоциации Пролетарских Писателей» (ВОАПП) і, адпаведна, мусіла падпарадкоўвацца агульнасавецкай партыйнай літаратурнай палітыцы, што зыходзіла з Масквы[79]. Змагаючыся за «гегемонію пралетарскае літаратуры», ідэолягі БелАПП актыўна займаліся выкрыцьцём усялякіх «нацыянал-дэмакратычных» праяваў у беларускай літаратуры.

Алесь Гародня, ахарактарызаваны Р. Крушынам як галоўны ініцыятар развалу «Літкамуны», заняў у БелАПП па-

[77] Хроніка // Маладняк. 1928. № 6. С. 127.

[78] Адамовіч А. Да гісторыі беларускае літаратуры. С. 919.

[79] Былы лідэр «Літкамуны» П. Шукайла напачатку быў адным з актыўных праціўнікаў утварэньня БелАПП (гл.: НАРБ. Ф. 15п. Воп. 28. Спр. 4. Арк. 37), аднак, жывучы ў Маскве, у канцы 1930 г. усё ж узначаліў беларускую сэкцыю МАПП.

зыцыю крытыка-вульгарызатара. Аднак прызнаньне ў ліквідацыі першай у Беларусі футурыстычнай суполкі знаходзім у прамове іншага крытыка белаппаўскае кагорты, а па сумяшчальніцтве — партыйнага дзеяча і рэктара Камуністычнага ўнівэрсытэту Алеся Сянкевіча. Выступаючы на 2-м пленуме савету ВОАПП у Маскве як прадстаўнік ад Беларусі, ён сказаў наступнае:

*В Белоруссии была попытка к созданию еще одной литорганизации — «Литературной коммуны», лефовского типа организации, которая имела все тенденции к тому, чтобы стать третьей по счету* [пасьля «Маладняка і «Ўзвышша». — **В. Ж.**] *ячейкой белорусского национал-демократизма. Мы взорвали эту организацию изнутри, большая часть членов этой организации вошла в БелАПП и теперь работает на фронте пролетарской литературы...*[80]

У 1930 г. на пасяджэньні Парткалегіі ЦКК КП(б)Б па справе нацдэмаў Сянкевіч, адзін з апалягетаў клясавай барацьбы ў беларускай літаратуры, пералічыў усе Шукайлавы грахі перад радзімай і партыяй, назваўшы сярод іх і стварэньне «Літкамуны», якая «ў руках нацдэмаў» зьявілася «зброяй для разломваньня нашай пралетарскай арганізацыі (маецца на ўвазе будучы «БелАПП». — **В. Ж.**)»[81]. Магчыма, менавіта Сянкевіч і даў адпаведнае ўказаньне Алесю Гародню, і той, увайшоўшы ў ролю «левага» празаіка і скарыстаўшыся ўнутранымі рознагалосьсямі ў суполцы, падахвоціў іншых літкамунаўцаў змовіцца супраць Шукайлы. Прынамсі, такі сцэнар развалу суполкі падаецца найбольш верагодным.

## 7. ЗАМЕСТ ПАСЬЛЯСЛОЎЯ

Даведаўшыся пра тое, што «Літаратурная Камуна» спыніла існаваньне, паэт Станіслаў Шушкевіч пад псэўданімам Янка Б-р надрукаваў у «Маладняку» (1928. № 10) эпіграму пад назваю «Былому кіраўніку былой літарганізацыі»:

*Зь вялікай буры,*
*Маленькі дождж...*
*Вы лезьлі са скуры...*
*За што ж, за што ж?!*
*Літаратура*
*Мінула вас,*
*І без хаўтураў схаваў вас*
*Час...*

Бадай, ува ўсе эпохі паэты ў палемічным запале любілі прарочыць адзін аднаму забыцьцё. Вось і тады сучасьнікі былі ўпэўненыя, што пра «Літкамуну» больш ніхто і ніколі не згадае. І праблема ня ў тым, што нехта зь іх лічыў футурызм неактуальным для тагачаснай беларускай

[80] Пролетарская литература СССР на новом этапе: Сокращенный стенографический отчет 2-го пленума совета ВОАПП. Москва — Ленинград: ГИХЛ, 1931. С. 194.

[81] НАРБ. Ф. 15п. Воп. 28. Спр. 4. Арк. 37. Характэрна, што П. Шукайлу ў 1939 г. асудзілі як «кіраўніка нацыяналістычнай фашысцкай арганізацыі ў Беларусі», матывуючы гэта тым, што ўдзельнікі «Літкамуны» праводзілі папулярызацыю нацыяналістычных ідэй сярод беларускай моладзі (гл. выпіскі паэтавай дачкі Дзівы Кандратавай са сьледчай справы П. Шукайлы: БДАМЛіМ. Ф. 55/252. Воп. 1 (неапрацаваны)). Рэальна ж літкамунаўцы, як і многія іншыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі савецкай Беларусі, паводле перакананьняў былі нацыянал-камуністамі й бачылі ў сацыялістычным ладзе адну з магчымасьцяў разьвіцьця ўласна беларускай культуры.

літаратуры. Праблема ў тым, што, абвясьціўшы сябе футурыстычнай, суполка грунтавался хутчэй на сяброўскіх і зямляцкіх стасунках, чым на эстэтычнай еднасьці і, акрамя таго, ня здолела належным чынам рэалізаваць тую выяўленчую зброю, што захоўвалася ў арсэнале футурыстычнай паэтыкі, — зброю вобразаў, мэтафараў, гукапісу, словатворчасьці. Зброю, якою з посьпехам карысталіся Маякоўскі, Кручоных, Хлебнікаў, Марынэцьці, Сэмэнко, Тувім, Бранеўскі... Найбольш радыкальны літкамунаўскі экспэрымэнтатар (нават не правадзейны сябар, а прыхільнік) Уладзімер Прыбыткоўскі (Лад Прыбытак) пасьля 1931 г. зьнік зь літаратурнай арбіты[82], пакінуўшы зусім невялікую спадчыну, іншыя ж урэшце знайшлі сябе не ў авангардысцкай, а ў агульнамадэрнісцкай (Р. Крушына) ці рэалістычнай (П. Броўка) галіне паэзіі альбо ўвогуле ў прозе (Я. Скрыган).

Юны Аркадзь Куляшоў, напрыклад, цікавіўся дзейнасьцю «Літкамуны», «бо спадзяваўся, што яна будзе нейкаю экспэрымэнтальнаю школаю»[83]. Аднак, завітаўшы аднойчы на сход суполкі, ён даволі хутка ўцёк адтуль — напэўна, расчараваўся. Нашмат пазьней, празь некалькі дзесяцігодзьдзяў, пасталелы А. Куляшоў так тлумачыў у размове зь Янам Скрыганом сваё разуменьне ролі «Літкамуны» ў літаратурным працэсе:

*— А ведаеш, пра што я думаў? Правільна ці няправільна вы ліквідавалі сваю «Літаратурна-мастацкую камуну». Мне здаецца, што зрабілі вы гэта заўчасна. Рэч у тым, што нешта падобнае на вашу «Літкамуну» ўсё роўна было патрэбна. Маладой нашай літаратуры маладнякоўскія рамкі рабіліся цесныя. Насьпявала неабходнасьць шукаць новых сродкаў паэтычнага ўвасабленьня часу. Ваша «Літкамуна» якраз і магла памагчы гэтаму. Нездарма ж, памятаю, адзін час я блізка прыглядаўся да яе*[84].

Што да А. Куляшова, дык «новыя сродкі паэтычнага ўвасабленьня часу» ён знайшоў — гэта выявілася хоць бы ў неардынарнай па фармальным вырашэньні паэме «Аманал», выдадзенай у 1933 г. Усяго ж праз «Беларускую Літаратурна-Мастацкую Камуну» прайшло каля дваццаці (а з улікам прыхільнікаў-гурткоўцаў — нават болей) літаратараў featuring рознага ўзроўню і творчай скіраванасьці. Аднак толькі для аднаго зь іх — а менавіта кіраўніка «Літкамуны» Паўлюка Шукайлы — суполка была чымсьці важным, нават галоўнаю справаю жыцьця. Пра гэта сьведчыць хоць бы такі факт: Шукайла пэўны час быў даволі пладавітым пісьменьнікам, але пераехаўшы ў Маскву, а затым у Ленінград, ён мала што захаваў з уласных твораў, напісаных у беларускі пэрыяд. У адрозьненьне ад тых самых пратаколаў пасяджэньняў «Літкамуны» й яе фінансавых дакумэнтаў, якія ён зьберагаў, нягледзячы на тое, што яго неаднойчы вымушалі прызнаць «памылкі левага толку», а створаную ім суполку называлі «нацдэмаўскай».

Паўстае пытаньне: чаму ж Шукайла, ведаючы, што ягоныя будучыя паплечнікі зусім па натуры не футурысты («мы былі, як фон»), набраў іх у суполку, каб абвясьціць яе «беларускім Лефам»? Дзеля чаго ён распаўсюджваў інфармацыю

[82] Паводле некаторых зьвестак быў высланы, а потым загінуў на Другой сусьветнай вайне.

[83] Скрыган Я. Выбраныя творы. С. 143.

[84] Тамсама. С. 242.

пра грандыёзныя пляны арганізацыі, хоць, напэўна ж, адчуваў, што доўга яна не пратрымаецца? Значыць, яго хвалявала ня якасьць, а сама наяўнасьць, факт існаваньня ў Беларусі «левай» творчай суполкі — прыкладна такой, якія былі ў суседніх краінах: Расеі, Украіне, Польшчы. Таму Паўлюк Шукайла паўстае ў ролі стваральніка ня так беларускага футурызму, як хутчэй — міту пра беларускі футурызм. Адыграла ролю тут і задавальненьне ўласных творчых амбіцый: лідэр па натуры, Шукайла бачыў сябе ні больш ні менш як заснавальнікам «новай літаратурнай плыні».

Такім чынам, нейкаю эстэтычна значнаю «экспэрымэнтальнаю школаю», на якую ўскладалі спадзяваньні некаторыя пісьменнікі, «Літкамуна» так і не зрабілася. Аднак яна пасьпела адыграць пэўную ролю ў супраціве «Маладняку», які ў той час імкнуўся манапалізаваць літаратурнае жыцьцё Беларусі. «Літкамуна» ўвайшла ў гісторыю і як адна зь першых авангардысцкіх суполак, створаных на беларускай нацыянальнай глебе[85], а такcама — як адна са спробаў упісаць беларускую літаратуру ў агульнаэўрапейскі літаратурны працэс і зрабіць яе больш разнастайнай. Як вядома, праблема інтэграцыі айчыннай літаратуры ў сусьветны кантэкст у той час займала думкі пэўнай колькасьці беларускіх пісьменьнікаў. Але адны зь іх меркавалі, што кожная «інтэграваная ў сусьвет» літаратура мусіць разьвівацца сваім адметным, не падобным да іншых шляхам, з уласьцівымі толькі ёй школамі, кірункамі, плынямі (адсюль — тэрміны адраджанізм, маладнякізм, вітаізм, аквітызм, узвышэнства, распрацаваныя выдатным крытыкам і мысьляром Адамам Бабарэкам). Другія лічылі, што актуальныя ў сьвеце (трэба зазначыць, што актуальнасьць у 1920—1930-я гг. нярэдка вызначалася палітычнымі меркаваньнямі) плыні й кірункі абавязкова павінны быць прадстаўленыя і ў Беларусі. Менавіта адной з такіх спробаў інтэграваць беларускую літаратуру ў сусьветны кантэкст і была «Беларуская Літаратурна-Мастацкая Камуна».

[85] Самай першай быў усё ж «Маладняк», некаторыя ўдзельнікі якога ў 1923—1924 гг. абвяшчалі сябе імажыністамі; але пра гэта — гаворка асобная.

## ДАДАТАК

Калі матэрыял быў ужо завярстаны, аўтар здолеў азнаёміцца зь яшчэ адным датычным тэмы дакумэнтам — Пастановай сяброў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», прынятай у часе Ўсебеларускага сходу 30 красавіка 1928 г., апублікаванай у часопісе «Маладняк», 1928, № 11, с. 106—107, у разьдзеле «Некаторыя дакумэнты з гісторыі «Маладняка». Пастанова (напісаная ў характэрнай для таго часу ідэалягічнай афарбоўцы) яскрава пацьвярджае, што да ліквідацыі першай беларускай футурыстычнай суполкі «Маладняк» меў самае непасрэднае дачыненьне, кіруючыся ў роўнай ступені эстэтычнымі й палітычнымі матывамі. Мала таго, дакумэнт дазваляе па-новаму зірнуць на некаторыя моманты гэтай справы. Зь яго, напрыклад, вынікае, што пасьля канфэрэнцыі 17 лютага 1928 г. аб'яднаньне «Маладняк» «выразна выправіла сваю лінію… як у галіне правядзеньня літаратурнае палітыкі партыі наогул, гэтак і ў прыватнасьці ў адносінах да шуканьняў пісьменьніка ў галіне формы», што быццам бы дало падставу літкамунаўцам зразумець, што рознагалосьсяў з «Маладняком» у іх «няма і… быць ня можа». Як жа тады зразумець добраахвотны выхад Петруся Броўкі з «Маладняка» акурат пасьля 17 лютага і яго прыняцьце 23 лютага ў «Беларускую Літаратурна-Мастацкую Камуну»? Ці не адмыслова для таго, каб разваліць «Літкамуну», уступіў у яе будучы народны паэт?

Поўны тэкст Пастановы зьмяшчаем ніжэй.

### Пастанова сяброў «Беларускай Літ.-Мастацкай Камуны», прынятая ў часе Ўсебеларускага сходу 30 красавіка 1928 г.

Мы, большасьць сяброў «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», азнаёміўшыся ў час зьезду зь лініяй, якая дагэтуль праводзілася кіраўніцтвам «Камуны» як вонкі, гэтак і ўнутры згуртаваньня, канстатуем:

1. Што для «Беларускае Літаратурна-Мастацкае Камуны» магчымы толькі наступныя асноўныя ўстаноўкі:

а) літаратура, зьяўляючыся важнаю зброяю клясавае барацьбы, павінна быць рашуча апанавана пралетарыятам;

б) для гэтага неабходна, каб яна адбівала жыцьцё гораду і вёскі з пралетарска-клясавае кропкі гледжаньня; неабходна змагацца ў першую чаргу за новы зьмест літаратуры, за новую тэматыку;

в) паколькі форма вынікае са зьместу, паколькі немагчыма новы зьмест уліваць у старую форму, патолькі неабходна энэргічнае шуканьне новае формы, якая адпавядала б новай тэматыцы і новаму бурнаму тэмпу разьвіцьця савецкае краіны;

г) неабходна самая рашучая барацьба з расткамі нова-буржуазнай літаратуры і з прасочваньнем у пралетарскую літаратуру антыпралетарскіх настрояў, што ў апошні час усё больш і больш выразна наглядаецца ў беларускай літаратуры;

д) усё вышэйадзначанае можа быць дасягнена беларускімі пралетарскімі пісьменьнікамі ня йнакш, як шляхам самае інтэнсіўнае вучобы і самакрытыкі.

2. Тым часам палітычная лінія, якая праводзілася да гэтага кіраўніцтвам Беларускае Літаратурна-Мастацкае Камуны, не была хоць колькі-небудзь выразнай; нават,

наадварот, мела хістлівы, няясны характар. У публічных выступленьнях дапушчаны цэлы шэраг памылак, дзякуючы якім увесь час затушоўвалася клясавая пралетарская лінія, якую згуртаваньне павінна было б праводзіць. Замест таго, каб супрацоўнічаць з пралетарскімі згуртаваньнямі — «Маладняком» і «Полымем», ідэалягічна самымі блізкімі да «Камуны», Бел. Літ.-Маст. Камуна, захопленая гурткоўшчынай, будавала сваю палітыку на асабістых разрахунках з паасобнымі пралетарскімі пісьменьнікамі, галоўным чынам зь Цішкам Гартным, Алесем Дударом, Глыбоцкім і інш. і тым самым ліла ваду на Ўзвышаўскі млын. Прынцыповыя пытаньні літаратурнае тэорыі і практыкі ў працягу больш паўгода існаваньня «Бел. Літ.-Маст. Камуны» не распрацоўваліся і ніякай плятформы згуртаваньне дагэтуль ня мае.

Унутры згуртаваньня пануюць інтрыгі, сябры «Камуны» прынцыповыя спрэчкі абяртаюць у склоку і ў выпадку рознагалосьсяў між сабою абзываюць адзін другога кулакамі, разложанымі элементамі і г. д. Гэтая склока зайшла так далёка і набыла такі брыдкі характар, што аб прымірэньні сяброў між сабою ня можа быць і гутаркі.

3. У той жа час мы канстатуем, што сярод іншых літаратурных згуртаваньняў найбольш правільную лінію заняло беларускае аб'яднаньне пралетарскіх пісьменьнікаў «Маладняк» (уступіла ў ВОАПП), якое выразна выправіла сваю лінію пасьля канфэрэнцыі — 17 лютага г. году, як у галіне правядзеньня літаратурнае палітыкі партыі наогул, гэтак і ў прыватнасьці ў адносінах да шуканьняў пісьменьніка ў галіне формы, якія сучаснае кіраўніцтва «Маладняка» знайшло свой яскравы адбітак у акце выключэньня з шэрагаў гэтага згуртаваньня такога выразнага прадстаўніка новабуржуазнае плыні ў літаратуры, як Уладзімер Жылка, а гэтак сама і Ал. Валошку (Ф. Купцэвіча[86]). Дзеля гэтага ніякіх прынцыповых рознагалосьсяў з «Маладняком» у нас няма і быць, пры сучасным становішчы, ня можа. У той жа час вялізная задача, якая стаіць перад беларускай пралетарскай літаратурай, задача дасягненьня гегемоніі пралетарскай літаратуры ў мастацкай творчасьці, асабліва ў сучасны, надзвычайна адказны момант, калі клясавая дыфэрэнцыя сярод беларускіх культурных дзеячоў увогуле і пісьменьнікаў у прыватнасьці ідзе асабліва шпаркім тэмпам, гэтая задача вымагае як найбольш сьціслага згуртаваньня сіл беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў, якое магчыма толькі ў шэрагах «Маладняка» — складанай часткі як Усесаюзнага Аб'яднаньня Асацыяцый Пралет. Пісьменьнікаў.

4. Дзеля гэтага ў сучасны, надзвычайна адказны момант мы пастанаўляем:

а) Ліквідаваць «Беларускую Літ.-Маст. Камуну».

б) Тым сябрам яе, якія гэтага жадаюць, — групаю ўступіць у склад беларускага аб'яднаньня пралетарскіх пісьменьнікаў «Маладняк».

в) Заснаваць ліквідацыйную камісію ў складзе прадстаўнікоў арганізацыі і установаў, прадугледжаных статутам, а таксама і прадстаўнікоў ЦБ «Маладняка».

г) У склад ліквідацыйнае камісіі абраць тт. Відука і Броўку, і даручыць ёй скончыць сваю працу не пазьней 5-га мая г. г.

д) Прызнаць неабходным перадаць усю маёмасьць «Беларускай Літаратурна-Мастацкай Камуны», увесь яе грашовы актыў і пасіў, а таксама і каштарысныя асыгнаваньні беларускаму аб'яднаньню пралетарскіх пісьменьнікаў «Маладняк».

[86] У дакумэнце — Кунцэвіча.

## ГІСТОРЫЯ

ЛУКАН УЭЙ

# Сіла і слабасць сучасных аўтарытарных рэжымаў

Каб зразумець, чаму некаторыя сучасныя аўтарытарныя рэжымы палі пад напорам пратэстаў апазіцыі, тады як іншыя засталіся непахісныя, карысна прыгадаць казку пра трох парсючкоў. Адкінуўшы звыклыя сімпатыі, уявім, што парсючкі — гэта правіцелі-аўтакраты, іхныя хаткі — гэта іхныя рэжымы, а воўк увасабляе прадэмакратычныя рухі. Воўк дзьмухае на ўсе тры хаткі, але вынікі яго намаганняў у кожным выпадку розныя: калі халупы з саломы і дрэва лёгка бурацца, то цагляны дамок застаецца непашкоджаны. І рэч тут не ў здольнасцях або стратэгіі ваўка, а ў рознай трываласці буданоў.

Вялікая частка нядаўна выдадзенай літаратуры аб зменах рэжымаў засяроджваецца якраз на «дзьмуханні» дэмакратычнай апазіцыі, надаючы пры гэтым недастатковa ўвагі пытанню трываласці аўтарытарных «домікаў». У некаторых краінах банкруцтва дзяржаўных інстытутаў, слабасць, незабяспечанасць і дэзарганізаванасць спецслужбаў, а таксама раздробленасць элітаў зрабілі рэжымы ўразлівымі для самых мінімальных пратэстаў. Так, менавіта слабасць афрыканскіх рэжымаў, а не моц тамтэйшай дэмакратычнай апазіцыі прычынілася да шэрагу

---

***Лукан Уэй*** *— палітоляг, прафэсар катэдры паліталёгіі ўнівэрсытэту Таронта. У ягоныя навуковыя інтарэсы ўваходзяць трансфармацыя палітычных рэжымаў, гібрыдныя рэжымы, кампаратыўнае вывучэньне постсавецкіх рэжымаў. Аўтар прэстыжных заходніх акадэмічных пэрыёдыкаў «Communist and Post-Communist Studiem», «Comparative Politics», «East European Politics and Societies», «Journal of Democracy», «Journal of Communist Studies and Transition Politics», «Politics and Society», «Post-Soviet Affairs», «Studies in Comparative and International Development», «World Politics». Вывучае беларускую мову. Летась у «ARCHE» быў апублікаваны яго тэкст «Дынаміка прымусу пры аўтакратычных рэжымах пасьля «халоднае вайны» (7—8/2007).*

паспяховых дзяржаўных пераваротаў у гэтым рэгіёне. Многія афрыканскія дэмакратычныя рухі процістаялі рэжымам, якія «прагнілі знутры». Аднаго штуршка было досыць для таго, каб яны пасыпаліся. Падобны стан можна было назіраць і ў шэрагу былых савецкіх рэспублік. Напрыклад, у Грузіі, дзе паліцыянты тры месяцы не атрымлівалі зарплаты, Эдуард Шэварднадзэ сышоў з пасады прэзідэнта пасля серыі не вельмі маштабных пратэстаў у вялікай ступені таму, што ён больш не кантраляваў арміі і спецслужбаў і, адпаведна, не мог ужыць у дачыненні да мітынгоўцаў рэпрэсіяў. У Кыргызстане хапіла ўсяго 5000—10 000 пратэстоўцаў, каб скінуць прэзідэнта Аскара Акаева. Нарэшце, на Гаіці ўрад Арыстыда быў зрынуты натоўпам дэкласаваных элементаў, які ледзь налічваў 200 чалавек. Пратэстоўцам нават не давялося ўступаць у бой: паліцэйскія папросту пазнімалі форму, пахапалі бутэлькі з ромам і ўцяклі ў горы.

У іншых выпадках гісторыя разгортвалася інакш. Калі дзяржава і (або) кіроўная партыя былі моцныя, аўтакраты часта паспяхова пераадольвалі сур’ёзныя выклікі з боку апазіцыі. У Арменіі, напрыклад, урад пры падтрымцы армейскіх ветэранаў, якія незадоўга перад тым вярнуліся з паспяховай вайны з Азербайджанам, прыдушыў пратэсты больш чым 200-тысячнага натоўпу, які выйшаў на плошчу пасля фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў у 1996 г. У Зімбабвэ планы апазіцыі па правядзенні масавых акцый пратэсту супраць парушэнняў у час выбараў 2000 г. былі «адкладзеныя на няпэўны тэрмін» з прычыны жорсткіх паліцэйскіх рэпрэсій. Праз два гады апазіцыйныя лідэры ўжо не ўспаміналі пра масавыя пратэсты, «беручы пад увагу грандыёзны рэпрэсіўны механізм, з якім прыйшлося б сутыкнуцца». У Малайзіі, дзе арышт у 1998 г. Анвара Ібрагіма справакаваў беспрэцэдэнтны паводле маштабу рух рэфармістаў, рэжым выставіў супраць сваіх апанентаў надзвычай эфектыўныя і рэпрэсіўныя паліцэйскія сілы. Пратэсты былі гвалтоўна падаўленыя спецназам і ў выніку не стварылі ніякай пагрозы дзяржаўнай стабільнасці. Нарэшце, у Сербіі апазіцыя рэжыму Мілошавіча намагалася скінуць яго праз усе 1990-я гг., але крах настаў толькі пасля чатырох ваенных паражэнняў і глыбокага эканамічнага крызісу, які падарваў магутнасць дзяржавы і кіроўнай партыі. Апазіцыйныя рухі ў Арменіі, Зімбабвэ і Малайзіі былі, напэўна, мацнейшыя, чым на Гаіці, у Грузіі ці Кыргызстане. Тое ж, што змена рэжыму адбылася не ў першым, а ў другім выпадку (а таксама ў Сербіі, але толькі пасля аслаблення дзяржавы шэрагам ваенных паражэнняў), сведчыць, што лёс аўтакратаў залежыць не толькі ад дзейнасці апазіцыйных сіл, але і ад трываласці рэжымаў, якім яны процістаяць.

## СЛАБЫЯ І МОЦНЫЯ АЎТАРЫТАРНЫЯ РЭЖЫМЫ

Такім чынам, цэнтральнае пытанне, якое паўстае ў сучасных даследаваннях аўтарытарызму, — наколькі моцны аўтарытарны рэжым пануе ў той ці іншай краіне. Вядома, лёгка ідэнтыфікаваць «слабы» рэжым пасля таго, як ён падзе. Але сапраўды важнае пытанне — ці можна гэта высветліць да яго падзення. Я лічу, што можна.

Каб вызначыць ступень слабасці таго ці іншага рэжыму ў рэспубліках былога Савецкага Саюза і іншых краінах, трэба прааналізаваць, пры дапамозе якіх сродкаў аўтакратам удаецца захоўваць лаяльнасць паплечнікаў і прадухіляць, прыглушаць або падаўляць масавыя пратэсты. Да такіх сродкаў адразу можна залічыць: 1) маналітную, шчыльна ўбудаваную ў дзяржаўную сістэму кіроўную партыю; 2) разгалінаваныя і добра фінансаваныя сілавыя структуры, якія паспяхова зарэкамендавалі сябе ў шырокамаштабных канфліктах; 3) шырокі кантроль дзяржавы над эканомікай. Рэжымы, якія валодаюць адным ці некалькімі сродкамі з гэтага спісу, намнога лепш абароненыя, чым тыя, у якіх нічога гэтага няма.

## Палітычныя партыі і магутнасць аўтакратаў

У свой час Барбара Гедэс і іншыя выказвалі меркаванне, што наяўнасць трывалай кіроўнай партыі мае першаступеннае значэнне ў прадухіленні пераходу прыхільнікаў рэжыму на бок апазіцыі ў крытычны момант. Мы ў дадатак сцвярджаем, што сілу такой партыі можна ацаніць з гледзішча яе ахопу і згуртаванасці. Ахоп датычыць велічыні партыйнай інфраструктуры або глыбіні пранікнення партыйных структур у грамадства. Калі ступень ахопу вялікая, як на Тайвані, у Малайзіі, Нікарагуа або Танзаніі, партыі валодаюць разгалінаванай арганізацыйнай структурай, вялікай колькасцю членаў і актывістаў, а таксама пакрываюць большую частку нацыянальнай тэрыторыі. Партыйныя камітэты дзейнічаюць практычна ў кожным населеным пункце, уключаючы сельскія, і не спыняюць сваёй актыўнасці ў міжвыбарчы перыяд. Напрыклад, 16 500 суполак Аб’яднанай малайскай нацыянальнай арганізацыі дазволілі ёй пранікнуць у кожную вёску ў краіне і выдзеліць па адным партыйцы для назірання за кожнымі 10 дамамі; гэтаксама разгалінаваны апарат і два мільёны членаў Рэвалюцыйнай партыі Танзаніі далі ёй магчымасць стварыць такую ж шчыльную «сотавую» структуру ва ўсёй краіне. Калі ж ахоп малы, як у Беніне, Перу, Украіне або Расіі часу Ельцына, партыі не хапае рэальнай арганізацыі, шараговых членаў і актывістаў, а яе дзейнасць абмяжоўваецца буйнымі гарадамі, сталіцай ці ў некаторых выпадках прэзідэнцкім палацам.

Згуртаванасць партыі вызначае яе здольнасць забяспечыць супрацоўніцтва паміж сваімі прыхільнікамі ва ўрадзе, парламенце і на мясцовым або рэгіянальным узроўні. Згуртаванасць мае вырашальнае значэнне для прадухілення здрады элітаў, асабліва ў перыяд крызісаў, калі здольнасць партыі ўтрымаць уладу апынаецца пад пагрозай. У тых выпадках, калі ступень згуртаванасці высокая, як у Малайзіі, Мазамбіку, Нікарагуа, Сербіі і Зімбабвэ, лаяльныя міністры, члены парламента і губернатары без ваганняў падтрымліваюць цэнтральны ўрад, праводзяць у жыццё прэзідэнцкія дырэктывы і галасуюць за прыняцце партыйных рашэнняў. Калі ж згуртаванасці бракуе, як у Беніне, Грузіі, Украіне, Замбіі і Расіі часу Ельцына, партыі ўяўляюць з сябе не больш чым свабодныя кааліцыі аўтаномных гульцоў, многія з якіх атрымліваюць свае паўнамоцтвы і статус не з рук партыі. Цэнтральная ўлада ў такіх выпадках пастаянна сутыкаецца з пра-

вамі непадпарадкавання, бунту і здрады з боку сваіх чыноўнікаў, дэпутатаў парламента і мясцовых кіраўнікоў. Праз гэта рэжым робіцца ўразлівым для ўнутранага крызісу, які выклікаецца расколам сярод кіроўнай кааліцыі і стварае магчымасць захопу апазіцыяй кантролю над парламентам або перамогі на выбарах кандыдата з ліку былых функцыянераў рэжыму. Сапраўды, у некаторых выпадках крызіс можа выбухнуць нават пры адсутнасці сур'ёзных вонкавых выклікаў.

Крыніцы згуртаванасці могуць быць розныя. Параўнальна слабой крыніцай з'яўляецца патранат. Хоць у звычайны час ён здольны гуртаваць эліты, партыі, якія грунтуюцца выключна на пратэкцыяніслкіх узаемаадносінах, робяцца ўразлівымі ў перыяд крызісаў. Калі эканамічны крызіс пазбаўляе аўтакратаў магчымасці размяркоўваць матэрыяльныя даброты ці калі ім пагражае параза, партыі, якія заснаваныя на патранаце, часта пачынаюць трашчаць па швах. Згуртаванасць куды большая ў структурах, якія можна было б акрэсліць як кансалідаваныя палітычныя механізмы, ці шчыльна ўбудаваных у дзяржаўную сістэму, заснаваных на пратэкцыяніслкіх узаемаадносінах партыях з грунтоўным досведам пераадолення крызісаў і заваявання перамог на выбарах. Высокая ступень згуртаванасці можа таксама караніцца ў супольнай этнічнай прыналежнасці (як, напрыклад, у Гаяне) ці ідэалогіі (як у Нікарагуа, Малдове). Магчыма, аднак, што найбольш трывалая згуртаванасць нараджаецца з повязей салідарнасці часу сумеснай узброенай барацьбы. Партыі, якія ўзніклі на базе паспяховых рэвалюцыйных ці нацыянальна-вызваленчых рухаў (як у Мазамбіку, Нікарагуа, Зімбабвэ), як правіла, вельмі з'яднаныя, прынамсі на працягу жыцця першага пакалення партыйцаў.

Пры ацэнцы згуртаванасці партыі трэба захоўваць асцярожнасць, каб не зблытаць яе з унутранай дысцыплінай у пару магутнасці арганізацыі. Замест гэтага важна знайсці доказы наяўнасці нематэрыяльных фактараў згуртаванасці. Нядаўна ўтвораныя партыі, сяброў якіх яднаюць толькі кароткатэрміновыя палітычныя мэты або зменлівыя пратэкцыяніслкія адносіны (напрыклад, маладыя кіроўныя партыі ў Беніне і ва Украіне ў 1990-я гг.), ацэньваюцца як малазгуртаваныя. Партыі на чале з харызматычнымі лідэрамі (як, напрыклад, у Перу) і трывалымі адносінамі патранату без праверанага досведу перамог на шматпартыйных выбарах (як у Кеніі, Замбіі) залічваюцца да сярэднезгуртаваных. Партыі ж, унутры якіх існуюць моцныя ідэалагічныя (Малдова) ці этнічныя (Гаяна) повязі і якія маюць правераны досвед паспяховага ўдзелу ў шматпартыйных выбарах (Малайзія, Мексіка, Тайвань), лічацца высоказгуртаванымі.

Што да былога Савецкага Саюза, то забарона КПСС пасля няўдалага жнівеньскага путчу ў 1991 г., спалучаная з адсутнасцю рэвалюцыйнай барацьбы, пазбавіла большасць тамтэйшых аўтакратаў якой бы там ні было трывалай арганізацыйнай базы. У такіх краінах, як Кыргызстан за Акаевым, Украіна за Кучмам або Малдова 1990-х, лідэры або не мелі за сабой ніякай партыйнай арганізацыі, або абапіраліся на хісткія кааліцыі канкурэнтных партый. Адзіным, што гуртавала гэтыя альянсы, былі кароткатэрміновыя адносіны патранату. У выніку апазіцыя амаль усюды паўставала з нетраў старога рэжыму.

## Сіла дзяржаўнага прымусу

Наступным ключом да аўтарытарнай стабільнасці з'яўляецца разгалінаваны, згуртаваны, добра забяспечаны і дасведчаны апарат прымусу, пры дапамозе якога аўтакраты здольныя надзейна трымаць у цуглях апазіцыю і падаўляць масавыя пратэсты. Зноў-такі, патэнцыял такога апарату можа быць змераны ў тых самых катэгорыях — паводле яго ахопу і згуртаванасці. Ахоп — гэта, інакш кажучы, эфектыўны радыус дзеяння. Нас будуць пераважна цікавіць памеры і якасць «сектару ўнутранай бяспекі» — тых дзяржаўных структураў, якія непасрэдна адказваюць за ўнутраную бяспеку дзяржавы і ўнутраны парадак. Гэтыя структуры ўключаюць у сябе армію і паліцыю, прэзідэнцкую гвардыю, жандармерыю і спецназ, тайную паліцыю і іншыя спецслужбы, а таксама органы ўнутранай разведкі. Да іх могуць далучацца рознага роду нефармальныя ці паўваенныя арганізацыі накшталт «эскадронаў смерці», народнага апалчэння, уброеных маладзёжных атрадаў. Гэты сектар можа таксама пашырацца коштам іншых дзяржаўных структураў — мясцовай адміністрацыі, падатковых органаў, дырэктараў дзяржаўных прадпрыемстваў, якія ўдзельнічаюць у падаўленні апазіцыі. Калі маштабы такога сектару вялікія, як у Беларусі, Малайзіі, Нікарагуа, Расіі, Зімбабвэ ці на Тайвані, ён уключае ў сябе шырокую разведвальную сетку, спецназ і ваенізаваныя атрады, якія могуць кантраляваць грамадства на ўсёй нацыянальнай тэрыторыі. Гэтыя спецслужбы добра аснашчаныя, забяспечаныя, навучаныя і маюць вялікі досвед сачэння за апазіцыяй ды падаўлення любых формаў яе пратэсту.

Калі ахоп невялікі, як у Албаніі, Грузіі, Македоніі ці на Гаіці, то ўзброеныя сілы маюць сціплыя памеры, кепскі рыштунак, часта адсутнічаюць адмысловыя ўнутраныя спецслужбы. Тыя ж структуры, што ёсць, недастаткова поўна ахопліваюць тэрыторыю краіны; органы правапарадку ў многіх месцах адсутнічаюць ці прысутнічаюць чыста сімвалічна; калі ж яны і ёсць, то фінансуюцца настолькі дрэнна, што аказваюцца неэфектыўнымі і адмаўляюцца выконваць загады. У такіх выпадках на тэрыторыі краіны могуць існаваць вялізныя «шэрыя зоны» — раёны, пазбаўленыя якой-кольвек прысутнасці дзяржавы. Напрыклад, у Грузіі паліцыя часта месяцамі не атрымлівала зарплаты, і вялікая частка краіны заставалася непадкантрольная цэнтральнаму ўраду.

Маштаб сілавога апарату мае асабліваe значэнне пры невялікай інтэнсіўнасці здушэння. Сістэматычнае назіранне за апанентамі рэжыму, іх уціск і запалохванне патрабуе развітай інфраструктуры, здольнай каардынаваць дзейнасць агентаў па ўсёй тэрыторыі краіны. Калі такой інфраструктуры няма або яна неэфектыўная, здольнасць улады адсочваць і кантраляваць апазіцыйную дзейнасць на нізавым узроўні будзе абмежаваная. Наяўнасць такой (часам невідавочнай) прасторы для дзеяння аблягчае апазіцыі арганізацыю выбарчых кампаній ці масавых пратэстаў.

Згуртаванасць у гэтым кантэксце азначае гатоўнасць дзяржаўнага апарату да выканання загадаў. Каб прымус быў эфектыўны, падначаленыя павінны дакладна выконваць каманды свайго начальства. Калі згуртаванасць высокая, уладары

могуць быць пэўныя, што нават надзвычай сумнеўныя ці незаконныя загады (напрыклад, стральба па натоўпе пратэстоўцаў, забойствы лідэраў апазіцыі ці фальсіфікацыя выбараў) будуць ажыццяўляцца як высокапастаўленымі супрацоўнікамі спецслужбаў, так і шараговымі салдатамі ды чыноўнікамі. Калі згуртаванасць нізкая, лідэры не могуць быць упэўненыя ў тым, што такія распараджэнні будуць выкананыя як першымі, так і другімі.

Згуртаванасць нярэдка мае вырашальнае значэнне пры высокай інтэнсіўнасці прымусу. Такія адчайныя крокі, як адкрыццё агню па вялікім натоўпе ці фальсіфікацыя выбараў, на якіх у сапраўднасці перамагла апазіцыя, надзвычай рызыкоўныя. Паколькі такія дзеянні могуць выклікаць рэзка негатыўную рэакцыю як унутры краіны, так і за мяжой, яны часцяком паглыбляюць крызіс рэжыму ці нават выклікаюць яго крах. З гэтай прычыны службовыя асобы, якія аддаюць такія загады або ажыццяўляюць рэпрэсіі, сур'ёзна рызыкуюць, бо ў выпадку пройгрышу іх чакае адплата. Такім чынам, акты грубага прымусу нясуць у сабе асаблівую пагрозу кіраванасці рэжыму, павялічваючы імавернасць унутраных беспарадкаў. Раскол у сілавым апараце не дазволіў мясцовым аўтакратам ужыць грубы гвалт у Беніне ў 1990 г., Грузіі ў 1991 і 2003 гг., Расіі ў 1993 г., Украіне ў 1994 і 2004 гг., а таксама на Мадагаскары ў 2001—2002 гг. Толькі там, дзе сілавыя структуры захоўваюць згуртаванасць (як у Арменіі, Малайзіі, Зімбабвэ), улада мае магчымасць упэўнена ажыццяўляць шырокамаштабныя рэпрэсіі ці чыніць беззаконне.

Згуртаванасць дзяржаўных структураў залежыць ад некалькіх фактараў. Адзін з іх — фінансавае здароўе эканомікі. Матэрыяльна незабяспечаныя чыноўнікі з меншай ступенню імавернасці будуць спраўна выконваць загады, асабліва калі яны датычаць масавых рэпрэсій або фальсіфікацыі галасавання. Так, шмат дзе ў Афрыцы і на абшарах былога СССР адразу пасля яго распаду ўнутрыдзяржаўная дысцыпліна была падарваная глыбокім эканамічным крызісам. У крайніх выпадках, як у Беніне, Малаві, Грузіі і Сербіі ў 1999—2000 гг., непадпарадкаванне пазбаўленых грашовага забеспячэння сілавых структур пакінула аўтакратаў без сродкаў барацьбы з пратэстамі апазіцыі. Тым не менш, наяўнасць матэрыяльных рэсурсаў не з'яўляецца ні неабходнай, ні дастатковай умовай для забеспячэння згуртаванасці. У Арменіі, Мазамбіку, Нікарагуа і Зімбабвэ дзяржаўны апарат не пахіснуўся, нягледзячы на значныя фінансавыя цяжкасці. У рэальнасці тыя правіцелі, якія спадзяюцца выключна на сілу грошай, найчасцей сутыкаюцца з непадпарадкаваннем у час крызісаў.

Найвышэйшы ўзровень згуртаванасці звычайна мае месца там, дзе фінансавае заахвочванне дапаўняецца альтэрнатыўнымі крыніцамі еднасці, у прыватнасці асабістымі повязямі, агульнай нацыянальнай прыналежнасцю і (або) ідэалогіяй. Найбольш трывалая згуртаванасць нараджаецца з повязей салідарнасці, узніклых у ходзе сумеснай узброенай барацьбы падчас вайны, рэвалюцыі або нацыянальна-вызваленчага руху. Калі найвышэйшыя дзяржаўныя пасады апаноўваюць эліты, што перамаглі ў вайне (Арменія) або ва ўзброеным мяцяжы (Ма-

замбік, Нікарагуа, Зімбабвэ), ім намнога часцей спадарожнічаюць згуртаванасць, упэўненасць у сабе і «смак» да насілля.

У межах былога Савецкага Саюза найярчэйшым прыкладам моцнай рэпрэсіўнай дзяржавы з'яўляецца Арменія, якая ў 1994 г. паспяхова захапіла 20 % тэрыторыі суседняга Азербайджана ў вайне за Нагорны Карабах. Гэтая вайна непасрэдна спрыяла захаванню аўтарытарнай стабільнасці, даўшы армянскім лідэрам сілу, якая мела дастаткова вопыту, рашучасці і згуртаванасці для таго, каб здушыць адзін з самых мабілізаваных у посткамуністычным свеце апазіцыйных рухаў. Так, у 1996 г., пасля таго як фальсіфікацыя прэзідэнцкіх выбараў вывела на вуліцы больш як сто тысяч дэманстрантаў, войскі, паліцыя і члены саюзу ветэранаў Карабахскай вайны «Еркрапа» паспяхова блакіравалі сталіцу, зачынілі офісы апазіцыйных партый і арыштавалі 250 лідэраў апазіцыі, тым самым спыніўшы антыўрадавыя выступленні. Пазней сілы, якія часткова складаліся з ветэранаў армянска-азербайджанскай вайны, здушвалі паслявыбарныя пратэсты, у якіх удзельнічалі да 35 000 чалавек, у 2003 і 2004 гг., а апошні раз — у сакавіку 2008 г., калі спецслужбы забілі сем мірных жыхароў, а ў сталіцы ўвялі ваеннае становішча. Другім важным прыкладам з'яўляецца Зімбабвэ. Нягледзячы на глыбокі эканамічны крызіс і амаль поўную міжнародную ізаляцыю, Роберту Мугабэ дагэтуль удаецца кансалідаваць свой рэжым і ў асноўным пазбягаць здрады элітаў, паколькі згуртаванасць кіроўных вярхоў была дасягнутая ў ходзе грамадзянскай вайны за незалежнасць краіны, якая тады называлася Радэзіяй. Так ход сённяшніх канфліктаў прадвызначаецца кантэкстам барацьбы за незалежнасць, што вялася ў канцы 1970-х гг.

Наадварот, рэжымам, якія не могуць шырока ўжываць гвалт з прычыны неразвітых ці недаасанашчаных спецслужбаў, вялікіх запазычанасцей па зарплаце або ваеннага разгрому, значна цяжэй даваць рады нават самым сціплым пратэстам. Слабы апарат прымусу быў уласцівы Грузіі, ад якой яшчэ да грамадзянскай вайны пачатку 1990-х гг. адкалоліся сепаратысцкія рэгіёны. На працягу ўсіх 1990-х і на пачатку 2000-х гг. грузінская дзяржава сутыкалася з няспыннымі рэгіянальнымі мяцяжамі і выдаткоўвала значныя сродкі на барацьбу з імі, у выніку чаго рэжым аказаўся не гатовы процістаяць адносна дробным пратэстам, якія пачаліся пасля сфальшаваных парламенцкіх выбараў 2003 г. Таму, калі 22 лістапада дзесяткі тысяч дэманстрантаў на чале з Саакашвілі, штурмуючы парламент з ружамі ў руках, не сустрэлі амаль ніякага адпору з боку паліцыі, прэзідэнт Шэварднадзэ быў вымушаны кінуцца наўцёкі і на наступны дзень падаў у адстаўку. Як прызнаўся пазней міністр унутраных справаў, паліцэйскія «тры месяцы не атрымлівалі заробку. Дык чаму яны павінны былі слухацца Шэварднадзэ?»

## Кантроль над эканомікай

Нарэшце, трываласць аўтарытарнага рэжыму вызначаецца ступенню, у якой дзяржаўныя лідэры распараджаюцца нацыянальным багаццем — ці шляхам прамога дзяржаўнага кантролю над эканомікай, ці праз атрыманне даходу ад прода-

жу энерганосьбітаў, захапіць кантроль над якім нават слабым аўтакратам досыць проста. Лідэр, які валодае поўным або амаль поўным кантролем над нацыянальным багаццем, можа падкупіць апанентаў або пазбавіць іх рэсурсаў, у крайніх выпадках нават пакінуўшы апазіцыйных актывістаў без элементарных сродкаў да існавання. Посткамуністычныя аўтакраты ў Беларусі, Таджыкістане і Узбекістане захавалі дзяржаўны кантроль над эканомікай, устрымаўшыся ад шырокамаштабнай прыватызацыі. Адсутнасць эканамічнай лібералізацыі ў гэтым выпадку дапамагла аўтакратам спыніць прыватнае фінансаванне апазіцыйных рухаў. У Беларусі, напрыклад, дзе дзяржава кантралюе пад 80 % эканомікі, а большая частка насельніцтва працуе па кароткатэрміновых кантрактах, апазіцыя практычна не мае доступу да ўнутраных крыніцаў фінансавання. Большасць яе актывістаў, з якімі я сустракаўся ў ходзе свайго даследавання, былі беспрацоўныя ці зараблялі на жыццё дробным гандлем. Іншымі словамі, апазіцыянерамі могуць стаць толькі тыя, хто гатовыя пайсці на значныя асабістыя страты. У той жа час шчодрыя газавыя субсідыі з боку Расіі дапамаглі беларускім уладам прадухіліць глыбокі эканамічны крызіс, які меў месца ў іншых постсавецкіх краінах.

У краінах, дзе прайшла маштабная прыватызацыя, як, напрыклад, у Грузіі, Кыргызстане і Украіне, апазіцыя змагла або знайсці падтрымку ў асяроддзі айчыннага бізнесу, або скарыстаць у сваіх інтарэсах нейтралітэт бізнес-колаў. Найбольш яскрава гэта праявілася ва Украіне, дзе мясцовыя алігархі ў часе парламенцкіх выбараў 2002 г. забяспечылі шырокую фінансавую падтрымку руху «Наша Украіна» на чале з Юшчанкам.

Апрача недапушчэння прыватызацыі, аўтарытарным лідэрам таксама ўдаецца захаваць кантроль над нацыянальным багаццем у тых выпадках, калі большая доля нацыянальнага даходу пастурае ад продажу карысных выкапняў, такіх, як нафта ці газ. Нават слабыя аўтакраты лёгка могуць захапіць і манапалізаваць гандаль энерганосьбітамі. Атрымаць кантроль над больш дыверсіфікаванай індустрыяльнай эканомікай нашмат складаней і даражэй. У гэтым сэнсе апора на гандаль прыроднымі рэсурсамі і адмова ад прыватызацыі ў аднолькавай ступені правакуюць аўтарытарызм, аблягчаючы валадарам прысваенне большай часткі нацыянальнага даходу і пазбаўленне апанентаў неабходных рэсурсаў. Так, у Расіі, Азербайджане, Казахстане, Туркменістане і ў меншай ступені ва Узбекістане аўтакраты здолелі скарыстаць юрыдычны або фактычны кантроль над нафтагазавай галіной для подкупу саюзнікаў, прыдушвання праціўнікаў і фінансавання разгалінаванага, высокааплатнага і добра навучанага рэпрэсіўнага апарату з мэтай запалохвання апазіцыйных сілаў. Часткова ў выніку гэтага апазіцыя ва ўсіх гэтых краінах застаецца надзвычай слабая і маргіналізаваная.

## Мера аўтакратычнай сілы і слабасці

Выкладзеная тут мадэль дазваляе вызначыць, ці з’яўляецца той ці іншы рэжым слабым або моцным, але не дае ўяўлення пра тыпалогію такой сілы ці сла-

басці. З аднаго боку, перад намі прыклады такіх рэжымаў, як у Зімбабвэ або ў Арменіі, што нарадзіліся ва ўзброеных канфліктах. У гэтых дзяржавах рэпрэсіўны апарат мае неабходныя навыкі, жаданне і згуртаванасць для таго, каб перажыць глыбокі эканамічны крызіс і (або) шырокамашабныя масавыя пратэсты. З другога боку, рэжымы накшталт беларускага ў большай ступені абапіраюцца на разгалінаваныя сілавыя структуры і неабмежаваны кантроль над значнай часткай эканомікі. Такія рэжымы выжываюць пераважна коштам «прэвентыўнага ўціску», г. зн. здушэння апазіцыі ў зародку, пакуль яна не стала моцнай. Аднак, згодна з гэтай тэорыяй, лукашэнкаўскі рэжым, відаць, не зможа перажыць глыбокага эканамічнага крызісу і (або) маштабных масавых пратэстаў. Гэтаму рэжыму бракуе кіроўнай партыі, а таксама якой-небудзь формы ідэалогіі або сумеснага досведу шырокамаштабнай узброенай барацьбы, які мог бы аблегчыць здушэнне масавых пратэстаў або засцерагчы паплечнікаў Лукашэнкі ад здрады яму ў выпадку крызісу. Адносна слабая згуртаванасць службаў бяспекі была прадэманстраваная ўвосень 2004 г., калі тагачасны старшыня КДБ Леанід Ерын сустрэўся з пратэстоўцамі, яўна праявіўшы гэтым сваю сімпатыю да іх. Хоць Ерын неўзабаве быў зняты з пасады, гэта можа быць прыметай больш шырокай нелаяльнасці ў колах спецслужбаў, што можа дацца Лукашэнку ў знакі ў будучыні. Апрача таго, скарачэнне з боку Расіі датацый на газ для Беларусі ў 2007 г. яшчэ больш павялічвае імавернасць крызісу.

*З амерыканскай пераклаў Сяргей Петрыкевіч*

КЭТЛІН ХЭНКАК

# Паўсуверэнная незалежная дзяржава: Беларусь і расійская неаімперыя

Беларускі прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка пазіцыянуе сваю дзяржаву як неад'емны элемент расійскай неаімперыі. Фактар нацыяналізму, ці, хутчэй, яго адсутнасці закліканы растлумачыць гэтую палітыку, якая супярэчыць меркаванню, што дзяржавы імкнуцца да поўнага суверэнітэту. Хоць сам фенамен нацыяналізму даследаваны вельмі дэталёва, постсавецкая прастора лічыцца навукоўцамі надзвычай плённым абшарам для вылучэння і аналізу розных ступеняў і тыпаў нацыяналізму. У гэтых даследаваннях беларусы выступаюць як супольнасць, у асаблівай ступені пазбаўленая нацыянальных сантыментаў. І сапраўды, адзін з найбольш абазнаных даследчыкаў гэтай дзяржавы даў сваёй кнізе назву «Дэнацыяналізаваная нацыя» (Marples, David R. Belarus: A Denationalized Nation. Amsterdam: Harwood Academic Publishers, 1999).

**Аляксандр Лукашэнка пазіцыянуе сваю дзяржаву як неад'емны элемент расійскай неаімперыі.**

Хоць фактар слабага нацыяналізму можа адыгрываць крытычную ролю ў рашэнні кіраўніка дзяржавы часткова пасупіцца суверэнітэтам, наяўная літаратура схільная ўскладаць на гэты фактар усю адказнасць за такі крок. У гэтым артыкуле я даводжу, што фактар нацы-

*__Кэтлін Хэнкак__ — прафэсар катэдры паліталёгіі і геаграфіі Тэхаскага ўнівэрсытэту ў Сан-Антоніё. У сфэру яе навуковых інтарэсаў уваходзяць вывучэньне ролі эканамічных чыньнікаў у постсавецкай палітыцы, параўнальны аналіз эканамічнай інтэграцыі ў гэтым рэгіёне, а таксама дасьледаваньне ролі Расеі як адной з эканамічных сіл у міжнароднай сыстэме. Гэты тэкст друкуецца з ласкавай згоды яго аўтаркі.*

яналізму толькі часткова вытлумачвае беларускую палітыку адмовы ад долі суверэнітэту на карысць Расіі. Апрача слабога нацыяналізму, да такой палітыкі прычыняюцца тры іншыя ключавыя фактары: спецыфічныя актывы, слабыя дэмакратычныя падваліны і вялікі інтарэс Расіі да іерархічных узаемаадносін. Я спыняюся перш за ўсё на ролі спецыфічных актываў, паколькі акурат гэты фактар ігнаруецца большасцю даследчыкаў. Усе пералічаныя фактары ў сукупнасці ў дастатковай меры тлумачаць Лукашэнкаву палітыку ў дачыненні да Расіі.

Я хацела б пачаць з выкарыстання базавых рацыяналісцкіх дапушчэнняў. Што б там ні сцвярджалі асобныя крытыкі, рацыяналісцкі падыход не вымагае ад удзельнікаў тых ці іншых працэсаў павагі да аднолькавых каштоўнасцей. Аналітыкі павінны толькі чакаць, што паасобныя лідэры кіруюцца пэўным прадвызначаным наборам установак. Аналіз умоў, у якіх дзейнічаюць людзі, і таго, як гэтыя ўмовы ўплываюць на іх установкі, дае аналітыкам магчымасць групаваць людзей у адносна шырокія катэгорыі. Палітычныя лідэры ў якасці такой катэгорыі падзяляюць пэўныя ўстаноўкі, якія можна вызначыць як супольныя незалежна ад іх роднай культуры і месцазнаходжання. Палітыкі, як правіла, маюць развітае «эга» (і, магчыма, слабое «суперэга»), моцнае пачуццё мэты і гатоўнасць да барацьбы за ўладу. Карыстаючыся гэтымі характарыстыкамі, можна вызначыць пэўныя жыццёвыя ўстаноўкі палітычных лідэраў, якія адрозніваюць іх ад іншых людзей.

**Сыход палітычнага лідэра можа прывесці яго ў турму, змусіць да эміграцыі, а то і абярнуцца яшчэ горшым канцом.**

Палітычныя лідэры ў першую чаргу імкнуцца захаваць за сабой уладу, каб пры яе дапамозе рэалізаваць свае палітычныя прыхільнасці. Уладалюбства часта сустракаецца ў міжнароднай палітыцы; асабліва пашыранае яно ў дзяржавах, што сталі на шлях развіцця, дзе сыход палітычнага лідэра можа прывесці яго ў турму, змусіць да эміграцыі, а то і абярнуцца яшчэ горшым канцом[1]. Другая супольная рыса палітычных лідэраў — апынуўшыся на пасадзе, яны намагаюцца рэалізаваць свае палітычныя прыхільнасці як ва ўнутраных справах, так і на міжнароднай арэне. Такім чынам, дзяржавы ўзаемадзейнічаюць з іншымі дзяржавамі, каб здабыць узаемную выгаду з гандлю, але лідэры адначасова намагаюцца зменшыць уразлівасць перад дзяржавамі, з якімі, як яны баяцца, іх палітычныя прыхільнасці будуць разыходзіцца.

Нарэшце, я вылучаю тэзіс пра абмежаваную рацыянальнасць і інертнасць прыхільнасцей. Удзельнікі палітычнага працэсу хочуць быць рацыянальнымі, але ім замінаюць абмежаванасць пазнавальных здольнасцей і няпоўная інфармацыя пра сітуацыю, у якой яны дзейнічаюць[2]. Іншымі словамі можна сказаць, што застаецца пэўная ступень няпэўнасці. Я таксама сцвярджаю, што

[1] Постсавецкая прастора поўніцца прыкладамі замахаў на жыццё былых лідэраў.

[2] Уільямсан ужывае тэрмін «няпоўная рацыянальнасць» (Williamson, Oliver E. The Economic Institutions of Capitalism: Firms, Markets, Relational Contracting. New York: Free Press, 1985. P. 47), але сэнс яго той самы: паказаць, што пры планаванні немагчыма ўлічыць усе наяўныя акалічнасці.

*прыхільнасці інертныя і што змены ў паводзінах выклікаюцца зменамі ў сітуацыі ці інфармацыі, даступнай удзельнікам*[3].

На падставе сігналаў звонку лідэры абнаўляюць свае ўяўленні пра тыя ці іншыя рэчы. Новая інфармацыя, накшталт масавых пратэстаў ці спробаў замаху, можа сведчыць аб тым, што перакананні лідэра крыху састарэлі. Калі такая інфармацыя паступае да яго своечасова і ў недвухсэнсоўнай форме, лідэр скарэгуе сваю стратэгію, з тым каб захаваць палітычную падтрымку.

Гэтыя заўвагі і меркаванні датычаць усіх палітычных лідэраў і, такім чынам, адпавядаюць агульнаму рацыяналісцкаму падыходу. У далейшым аналізе я больш падрабязна спынюся на дадатковых чынніках, якія трэба браць пад увагу ў выпадку канкрэтных лідэраў. Апрача матэрыяльных структурных фактараў, дзве пазіцыі ўключаюць нормы ў духу канструктывісцкіх аргументаў.

**Фактар славянскага братэрства не адыгрывае для Лукашэнкі ключавой ролі пры прыняцці рашэнняў.**

Канструктывісты засяроджваюцца на такіх нематэрыяльных фактарах, як маральныя нормы, ідэнтычнасць і культура. Даследчыцкі падыход канструктывістаў грунтуецца на тлумачэнні паходжання і эвалюцыі прыхільнасцей зыходзячы з таго, як яны суадносяцца з гэтымі фактарамі. Напрыклад, Кек і Сікінк у сваёй працы за 1998 г. разглядаюць, як рабства і закоўванне ў кайданы з агульнапрынятай практыкі, якою яны былі некалі, перайшлі ў катэгорыю антыгуманных актаў[4]. Як толькі такая ацэнка склалася, рацыяналіст можа ўключаць яе ў абгрунтаванне сваіх дзеянняў. «Канструктывісты спрабуюць зразумець, якім чынам фармуюцца маральныя прынцыпы і выпрацоўваюцца веды *да таго,* як яны пяройдуць у катэгорыю рацыянальных фактараў»[5]. Агляд чатырох канструктывісцкіх прац, зроблены Дэслерам і Оўэнам у 2005 г., каторы раз дэманструе засяроджанасць гэтага падыходу на тым, як

*людзі інтэрпрэтуюць дзеянні і падзеі па-новаму, смела і незвычайна нават тады, калі сітуацыя, у якой яны знаходзяцца, не дае ніякіх падстаў для гэтага*[6].

[3] Morrow, James D. Game Theory for Political Scientists. Princeton: Princeton University Press, 1994. P. 19.

[4] Keck, Margaret E., and Kathryn Sikkink. Activists Beyond Borders: Advocacy Networks in International Politics. — Ithaca: Cornell University Press, 1998.

[5] Katzenstein, Peter J., Robert O. Keohane, and Stephen D. Krasner. International Organization and the Study of World Politics. International Organization 52, 1998. P. 681, вылучана мной. *(Заўв. аўт.)*

[6] Dessler, David, and John Owen. Constructivism and the Problem of Explanation: A Review Article. Perspectives on Politics 3. 2005. P. 598.

Аднак, перш чым паспрабаваць растлумачыць паходжанне паноўных нормаў — канструктывісцкі праект, — я бяру як дадзенасць тую сукупнасць перакананняў, што ўласцівая беларускаму грамадству і Лукашэнку ў прыватнасці. Ніжэйпададзеныя довады сведчаць, што перакананні, якія я прыпісваю ўдзельнікам беларускага палітычнага працэсу, сапраўды адпавядаюць рэальнасці. Выкарыстоўваючы іх для тлумачэння існага стану, я наследую вялікай колькасці навукоўцаў, якія спалучалі рацыяналісцкі і канструктывісцкі падыходы, каб даць поўнае тлумачэнне аналізаваным працэсам.

**Дзеянні Лукашэнкі абумоўленыя такімі сацыяльнымі фактарамі, як слабасць беларускага нацыяналізму і дэмакратычных асноў беларускага грамадства.**

Хоць некаторыя аспекты, што датычаць нацыянальнай ідэнтычнасці, маюць сваё значэнне, у цэлым фактар славянскага братэрства не адыгрывае для Лукашэнкі ключавой ролі пры прыняцці рашэнняў. Хоць на першы погляд можа скласціся зусім адваротнае ўражанне, Лукашэнка і яго расійскія партнёры кіруюцца нашмат больш рацыянальнымі матывамі, дбаючы пра эканамічную і палітычную бяспеку, а зусім не пра братнюю любоў. Гэтаксама канцэпцыя Беларусі як малодшага брата і яе падпарадкаванасці, што вынікае з гэтага, абвяргаецца жорсткімі Лукашэнкавымі паводзінамі. У раздзеле пад назвай «У імкненні да кантролю над спецыфічнымі актывамі» я паказваю, якім чынам Лукашэнка і расійскія лідэры змагаюцца паміж сабой за першынство ў гэтай галіне. Апроч таго, наданне выключнай ролі этнічнаму фактару не можа растлумачыць шляху Украіны — яшчэ адной славянскай дзяржавы, лідэры якой праводзяць палітыку павольнага дрэйфу ў заходнім кірунку, дыстанцыююючыся пры гэтым ад Расіі.

**Лідэры Украіны праводзяць палітыку павольнага дрэйфу ў заходнім кірунку, дыстанцыююючыся пры гэтым ад Расіі.**

Тлумачэнні, якія робяць акцэнт на ўнутраных палітычных актарах, такіх, як бюракратыя, парламент, кланы, СМІ і звычайныя грамадзяне, кантрастуюць з маёй засяроджанасцю выключна на ролі прэзідэнта. Даследаванні, пабудаваныя на аналізе ўнутранай палітыкі, маюць на ўвазе, што пералічаныя ўдзельнікі адыгрываюць істотную ролю ў працэсе прыняцця рашэнняў і тым самым заўважна ўплываюць на вынік. Хоць часта такія меркаванні адпавядаюць рэчаіснасці, асабліва ў выпадку дэмакратый, беларускі прэзідэнт у значнай ступені падпарадкаваў сабе гэтых гульцоў, пакінуўшы ім толькі дробныя ролі. Я не хачу сказаць, што ён кіруе, не зважаючы абсалютна ні на кога. Дзеянні Лукашэнкі неадвольныя і абумоўленыя такімі сацыяльнымі фактарамі, як брак нацыяналізму і слабасць дэмакратычных асноў. Тым не менш, канцэнтрацыя ўвагі на адным галоўным актару добра працуе ў выпадку аўтарытарных рэжымаў — такіх, як лукашэнкаўскі.

## ФАКТАРЫ, ЯКІЯ ЎПЛЫВАЮЦЬ НА ЭКАНАМІЧНУЮ СТРАТЭГІЮ ЛУКАШЭНКІ

За выключэннем агульных упадабанняў і сімпатый, да саюзу з Расіяй Лукашэнку падштурхоўваюць чатыры фактары:

1) спецыфічныя актывы, якія робяць Беларусь уразлівай, але адначасова даюць Лукашэнку некаторыя рычагі ў перагаворах з Расіяй;

2) слабы беларускі нацыяналізм, які дазваляе Лукашэнку прагматычна шукаць заступніцтва той дзяржавы ці дзяржаў, якія робяць найбольш выгадныя эканамічныя прапановы;

3) слабасць дэмакратычных асноў, што дае Лукашэнку магчымасць звяртацца да аўтарытарных метадаў кіравання і такім чынам падаўляць апазіцыю, у тым ліку эканамічнымі метадамі;

4) моцная зацікаўленасць Расіі ў эканамічным саюзе.

### Спецыфічныя актывы зачыняюць дзверы

Спецыфічныя актывы адыгрываюць асаблівую і часта недаацэненую ролю ва ўзаемаадносінах на постсавецкай прасторы. У адрозненне ад лідэраў большасці былых савецкіх еўрапейскіх рэспублік — Украіны і краін Балтыі, — Лукашэнка кіруе дзяржавай, што пазбаўленая выхаду да мора і да таго ж цесна звязаная сваёй гаспадаркай з Расіяй. Эканамісты вызначаюць спецыфічныя актывы як доўгатэрміновыя інвестыцыі, накіраваныя на вырашэнне канкрэтных задач, у выніку чаго іх каштоўнасць змяншаецца, калі мяняюцца першапачатковыя ўмовы або ўдзельнікі ўзаемаадносін. Іншымі словамі, гэта «доўгатэрміновыя здзелказалежныя скрытыя інвестыцыі»[7]. Усе аспекты гэтага азначэння важныя. Інвестыцыі павінны быць доўгатэрміновыя, маштабныя, а іх каштоўнасць па-за кантэкстам першапачатковых узаемаадносін павінна быць значна ніжэйшая.

Тэарэтыкі, якія працуюць ў традыцыі эканомікі аперацыйных выдаткаў, сцвярджаюць, што пад спецыфічнымі актывамі маецца на ўвазе ўся разнастайнасць узаемаадносін паміж двума эканамічнымі суб’ектамі — пастаўшчыком і пакупніком. Могуць узнікаць два тыпы ўзаемаадносін: іерархічныя ўзаемаадносіны, пры якіх адна структура пануе над усімі астатнімі, і рынкавыя ўзаемаадносіны, пры якіх розныя структуры купляюць і прадаюць актывы на свабодным рынку. Калі паміж двума суб’ектамі ўзнікае высокі ўзровень спецыфічных сувязей, кожны з іх уразлівы да спынення ўзаемаадносін з боку другога суб’екта. Апасаючыся апартунізму другога суб’екта, пакупнік намагаецца купіць пастаўшчыка, тым самым уключыўшы яго ў склад сваёй фірмы. Як толькі пакупнік і былы пастаўшчык зліваюцца ў адну структуру, небяспека разрыву ўзаемаадносін паміж імі знікае.

[7] Joskow, Paul L. Vertical Integration and Long-term Contracts: The Case of Electric Generating Plants. Journal of Law, Economics, and Organization 1. 1985. P. 37.

Як я тлумачу ніжэй, у міжнародных узаемаадносінах логіка падобнага зліцця двух суб'ектаў у адзін крыху адрозніваецца. Тым не менш, разуменне характару каштоўнасці спецыфічных актываў пры зменлівых узаемаадносінах карыснае для тлумачэння аб'яднаўчых тэндэнцый паміж дзвюма дзяржавамі.

Калі ў эканоміцы два крайнія полюсы — гэта манапольная карпарацыя і раўнапраўныя фірмы, што працуюць у рыначных умовах, дык у міждзяржаўных стасунках такімі полюсамі з'яўляюцца імперыя і цалкам суверэнныя дзяржавы. Пасярэдзіне знаходзяцца градацыі «абмежаванага суверэнітэту». У выпадку імперыі большае дзяржаўнае ўтварэнне паглынае меншыя прыблізна такім жа чынам, як буйная фірма скупляе сваіх пастаўшчыкоў. Зліццё каманій можа быць таксама няпоўным, як у выпадку сумесных прадпрыемстваў. Аналагічна дзяржавы могуць перадаваць на карысць іншых істотную частку свайго суверэнітэту, захоўваючы за сабой фармальна незалежны статус і правасуб'ектнасць.

Эканамісты вылучылі тры асноўныя тыпы спецыфічных актываў — геаграфічна, фізічна і мэтава абумоўленыя. Геаграфічна абумоўленыя спецыфічныя актывы — гэта тыя, якія надта вялікія або грувасткія для перамяшчэння ў іншае месца. Фізічна абумоўленыя спецыфічныя актывы маюць канструктыўныя характарыстыкі, якія дазваляюць выкарыстоўваць іх толькі для канкрэтных аперацый і зніжаюць іх каштоўнасць у іншых выпадках. Гэтыя актывы фізічна прывязаныя да таго ці іншага праекта. У адрозненне ад геаграфічна абумоўленых спецыфічных актываў, іх можна лёгка перамясціць у іншае месца, але іх немагчыма там эфектыўна скарыстаць. Мэтавыя актывы ўключаюць у сябе доўгатэрміновыя інвестыцыі агульнага прызначэння, у якіх не было б патрэбы, калі б не асаблівыя ўзаемаадносіны з партнёрам. Калі такія ўзаемаадносіны разрываюцца, інвестар сутыкаецца з лішкам вытворчых магутнасцей.

Кожная разнавіднасць спецыфічных актываў можа быць спецыфічнай у адным ці некалькіх аспектах. Напрыклад, нафта- і газаправоды, а таксама лініі электраперадачы валодаюць усімі трыма вышэйпададзенымі рысамі: яны выключна цяжкія для перамяшчэння, што робіць іх геаграфічна абумоўленымі актывамі; яны маюць пэўныя канструктыўныя асаблівасці, якія робяць іх альтэрнатыўнае выкарыстанне вельмі праблематычным — прымета фізічна абумоўленых спецыфічных актываў; нарэшце, дзяржавы будуюць іх у разліку на канкрэтных спажыўцоў і ўсталяваны попыт, што дазваляе вызначыць іх як мэтавыя актывы.

Некалькі значных спецыфічных актываў уласцівыя беларуска-расійскаму саюзу. Па-першае, Беларусь моцна залежыць ад расійскіх энерганосьбітаў. У 2000 г. Беларусь здабывала толькі 41 600 барэляў нафты ў суткі — невялікую долю ад неабходных 180 000 барэляў. Дэфіцыт пакрывала расійская нафта. Расійская нафта неабходная і для беларускай нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Два беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы — наваполацкі «Нафтан» і Мазырскі НПЗ — маюць сукупную магутнасць, роўную 493 000 барэлям у суткі, — у два з лішкам разы больш, чым Беларусь спажывае. Пераважная частка экспарту ідзе назад у Расію, прыносячы Беларусі вялікія даходы. Што да прыроднага газу, у

2001 г. Беларусь вырабіла толькі каля 300 млн $м^3$ гэтага паліва, што крайне далёка ад неабходных для краіны 18 млрд $м^3$. Як і ў выпадку з нафтай, Беларусь пакрыла нястачу коштам расійскага прыроднага газу (звесткі амерыканскага Дэпартамента па энергетыцы за 2004 г.).

Па-другое, расійскія энерганосьбіты ідуць па беларускіх нафта- і газаправодах транзітам у Цэнтральную і Заходнюю Еўропу. Праз Беларусь праходзіць паўночная ветка нафтаправода «Дружба», якая дастаўляе нафту ў латвійскія парты, а таксама ў Германію і Польшчу. Доля расійскай нафты ў германскім імпарце складае адну трэць — больш як любога іншага вытворцы. Польшча яшчэ болей залежыць ад расійскай нафты: тут яе доля ў сукупным імпарце даходзіць да паловы. Хоць нафта- і газаправоды даюць Беларусі магчымасць атрымліваць даходы ад транзіту, яны яшчэ шчыльней прывязваюць Беларусь да Расіі, паколькі Расія з'яўляецца адзіным экспарцёрам, які выкарыстоўвае гэтыя трубаправоды. Без расійскай сыравіны яны не маюць каштоўнасці. Іншымі словамі, яны з'яўляюцца мэтавым спецыфічным актывам.

Па-трэцяе, на Расію завязаны беларускі ваенна-прамысловы комплекс. У савецкі час на тэрыторыі БССР размяшчалася значная частка прадпрыемстваў гэтага комплексу. Беларускі ваенна-прамысловы сектар уключае заводы ў галіне электронікі, машына- і прыладабудавання. Многія з гэтых прадпрыемстваў выпускаюць не гатовыя вырабы, а кампаненты для тэхнікі, што вырабляецца расійскімі заводамі. Мінск таксама вырабляе цяжкія шасі для балістычных ракет і процiракетных комплексаў, у тым ліку для міжкантынентальных балістычных ракет СС-25 і ракет «зямля—паветра» СА-10[8]. Таму беларускі ВПК, зразумела, залежыць ад расійскіх ваенных заказаў. За выключэннем Расіі, Беларусь не зможа знайсці кліента, зацікаўленага ў яе прадукцыі такога роду.

Чацвёрты спецыфічны актыў — геаграфічнае становішча — яшчэ больш абумоўлівае Лукашэнкаў стратэгічны выбар. Гэты вельмі стабільны «актыў» зазнае змены толькі тады, калі дзяржавы карэнным чынам мяняюць свае граніцы, што звычайна здараецца хіба што ў выніку буйных войнаў. У прынцыпе геаграфічнае становішча можа як значна абмежаваць, так і пашырыць магчымасці дзяржаўных лідэраў што да выбару палітычнага курсу. У выпадку Беларусі яе блізкасць да Еўропы нясе, як уяўляецца, шырокі спектр магчымасцей. У адрозненне ад дзяржаў Сярэдняй Азіі, Беларусь прэтэндуе на тое, каб быць еўрапейскай краінай. Такая блізкасць можа быць на карысць Беларусі з трох прычынаў: па-першае, беларуская прамысловасць можа пераймаць капіталістычныя прынцыпы гаспадарання ад суседзяў; па-другое, у выпадку прыняцця заходніх прынцыпаў Беларусь можа чакаць росту прамых замежных інвестыцый і двухбаковых гандлёвых кантактаў; па-трэцяе, іншыя постсавецкія краіны-экспарцёры, карыстаючыся беларускім гандлёвым калідорам на еўрапейскі рынак, могуць прыносіць Беларусі даход. Як прадэманструе наступны аналіз, Лукашэнка, ад-

[8] The Defense Eurasia. Washington: Central Intelligence Agency. 1993. P. 9.

нак, пагрэбаваў гэтымі патэнцыйнымі выгадамі, аддаўшы перавагу больш плённаму, на яго думку, супрацоўніцтву з Расіяй пры меншай палітычнай рызыцы.

Але пакуль супрацоўніцтва з Еўропай застаецца моцна абмежаваным, мінусы беларускага геаграфічнага становішча выходзяць на першы план. Перш-наперш варта ўлічыць, што Беларусь пазбаўленая водных шляхоў, якія яна магла б скарыстаць для сувязі з іншымі дзяржавамі ды рэгіёнамі і для пастаўкі адтуль неабходных рэсурсаў без змянення ўнутранай палітычнай і эканамічнай сістэмы, на якім настойвае Еўропа. Параўнаем становішча Беларусі са становішчам Украіны і трох балтыйскіх дзяржаў. Украіна можа атрымліваць энерганосьбіты з Казахстана і Азербайджана, а таксама танкерамі праз Чорнае мора. Эстонія, Літва і Латвія маюць выхад да Балтыйскага мора, што дае ім шмат альтэрнатыўных крыніц энергіі. Звязаная трубаправодамі толькі з Расіяй, Беларусь мае куды больш абмежаваныя магчымасці.

Пералічаныя вышэй чатыры спецыфічныя актывы вызначаюць ступень прывязанасці Беларусі да расійскай эканомікі. Ранейшыя аналізы эканамічнай узаемазалежнасці на постсавецкай прасторы часцей бралі пад увагу гандлёвыя сувязі, а не спецыфічныя актывы. Улік у якасці крытычнага фактару такіх актываў, якія насілу паддаюцца зменам, выяўляе сапраўдную ступень доўгатэрміновай узаемазалежнасці. Гандлёвая ж статыстыка толькі паказвае інтэнсіўнасць узаемаадносін, але нічога не гаворыць пра цяжкасць разрыву гэтых узаемаадносін.

Аналіз спецыфічных актываў сведчыць, што Беларусь у вялікай ступені залежыць ад Расіі, і гэтая залежнасць можа дорага ёй каштаваць у выпадку разрыву ўзаемаадносін паміж дзяржавамі. У сваю чаргу, аднак, некаторыя з гэтых актываў робяць і Расію залежнай ад Беларусі, што заўважаецца радзей. Напрыклад, геаграфічнае становішча Беларусі разам з наяўнай на яе тэрыторыі сеткай трубаправодаў робіць Беларусь важным транспартным калідорам для расійскага экспарту энерганосьбітаў у Еўропу.

Як жа спецыфічныя актывы, што абумоўліваюць такую ўзаемазалежнасць, уплываюць на ўзаемаадносіны паміж дзвюма дзяржавамі? Іншымі словамі, які прагноз даюць вышэйпералічаныя фактары і які прычынны механізм спрыяе ажыццяўленню такога прагнозу? Прыгадаем цверджанні эканамістаў, што вялікая колькасць спецыфічных актываў прыводзіць да павышанай уразлівасці, у выніку чаго выспявае тэндэнцыя да ўсталявання іерархічных узаемаадносін. Страх разрыву ўзаемаадносін з партнёрам прыводзіць да яго пакупкі і ўключэння ў склад сваёй фірмы. Эквівалентам такога працэсу ў міждзяржаўных стасунках з’яўляецца ўтварэнне імперыі ці нейкай слабейшай формы палітычнай іерархіі — напрыклад, гандлёвага саюзу на чале з адной дзяржавай.

Нягледзячы на гэтае падабенства, паводзіны дзяржаў і іх лідэраў істотна адрозніваюцца ад тактыкі паасобных кампаній і іх кіраўнікоў. Для нашых мэт вылучым два найважнейшыя адрозненні. Па-першае, паколькі такі крок цягне за сабой значныя наступствы ў галіне міжнароднай палітыкі, дзяржавы не могуць пайсці на зліццё з такой лёгкасцю і хуткасцю, як эканамічныя структуры. Мусяць быць вельмі важкія прычыны, у першую чаргу пагроза палітычнай стабіль-

насці кіроўнага рэжыму. Спецыфічныя актывы, якія я апісала вышэй, акурат маюць істотнае значэнне для захавання такой стабільнасці. Па-другое, логіка зліцця дзяржаў адрозніваецца ад логікі аналагічнага працэсу ў выпадку кампаній. Эканамісты сцвярджаюць, што вялікая колькасць спецыфічных актываў вядзе да ўтварэння іерархізаваных фірмаў, паколькі адны партнёры баяцца, што другія «кінуць» іх. Але дзейнасць дзяржаў мае значна больш вымярэнняў і працякае ў розных сферах, такіх, як бяспека, эканоміка, сацыяльная палітыка, ахова навакольнага асяроддзя. Палітычныя лідэры могуць выявіць, што, хоць у адной сферы спецыфічныя актывы робяць іх уразлівымі, у другой іншыя актывы ставяць у аналагічнае становішча іх партнёра. У выніку дзяржавы робяцца ўзаемазалежнымі.

Узаемазалежнасць дазваляе дзяржаве адстойваць свае інтарэсы, пагражаючы нанесці партнёру шкоду ў адной сферы, калі ён пашкодзіць свайму кампаньёну ў другой. Такія пагрозы могуць датычыць як розных сфер, так і нейкай адной. Напрыклад, калі расійскі прэзідэнт Уладзімір Пуцін пагражае спыніць пастаўкі энерганосьбітаў у Беларусь, Лукашэнка можа пагражаць спыніць перапампоўванне паліва праз беларускія трубаправоды або рэзка павысіць тарыфы на транзіт. Пры вызначэнні патэнцыйнага тыпу ўзаемаадносін аналітыкі павінны высветліць, ці ўзнікае ўразлівасць толькі для аднаго з бакоў, ці для абодвух. Калі ўразлівымі робяцца абодва бакі, мы можам чакаць раўнапраўных узаемаадносін, паколькі слабасці кампенсуюцца перавагамі. Большая дзяржава не будзе прымушаць меншую да падпарадкавання, калі тая мае чым адказаць. Аднак калі больш магутная дзяржава — у гэтым выпадку Расія — не з'яўляецца ўразлівай, можна чакаць узнікнення іерархічнасці ва ўзаемаадносінах, што і мае месца ў выпадку з Беларуссю. Гэтак адбываецца таму, што Расія выкарыстоўвае сваю перавагу для таго, каб прымусіць Беларусь паступіцца часткай свайго суверэнітэту.

## Слабы нацыяналізм адчыняе дзверы

Хоць спецыфічныя актывы адыгрываюць ключавую ролю ў тлумачэнні Лукашэнкавай гатоўнасці ахвяраваць часткай суверэнітэту на карысць Расіі, іх адных было б недастаткова для ўсталявання такога тыпу ўзаемаадносін. Другой ключавой іх перадумовай служыць адносна слабы ўзровень нацыяналізму сярод беларусаў.

На прэзідэнцкіх выбарах, якія прывялі Лукашэнку да ўлады, большасць беларускіх грамадзян згуртавана прагаласавала супраць кандыдата ад адзінай моцнай нацыяналістычнай партыі — Беларускага Народнага Фронту. У савецкі час Беларусь ніяк нельга было лічыць агменем апазіцыйнасці. Тым не менш задоўга да распаду Савецкага Саюза, у 1988 г., беларусы ўтварылі значны апазіцыйны рух. Яго нараджэнню спрыялі дзве трагічныя падзеі. Па-першае, беларусы сталі галоўнымі ахвярамі трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. З прычыны напрамку вятроў, што веялі ў тыя дні, Беларусь нашмат болей пацярпела ад радыяцыі, чым Украіна, на чыёй тэрыторыі знаходзілася станцыя, ці суседняя

Расія. Савецкі ўрад захоўваў працяглае і небяспечнае маўчанне пра трагедыю і толькі пазней павольна і запознена адрэагаваў на крызіс, што выклікала моцную незадаволенасць сярод многіх беларусаў. Праз два гады беларускія археолагі выявілі ва ўрочышчы Курапаты каля 500 масавых пахаванняў, у якіх знаходзіліся астанкі 250 000 ахвяр сталінскага рэжыму. Хоць два члены следчай групы сцвярджалі, што гэтае злачынства ўчынілі немцы, сведчанняў аб датычнасці да расстрэлаў савецкай улады было больш чым дастаткова. Уражаная гэтым адкрыццём, група беларускай інтэлігенцыі заснавала арганізацыю пад назвай «Мартыралог Беларусі», місіяй якой мелася стаць расследаванне і абнародаванне злачынстваў, учыненых у Беларусі ў сталінскі час. На ўстаноўчым сходзе гэтай арганізацыі быў утвораны і Беларускі Народны Фронт. Яго заснавальнікі выбралі старшынём новага руху Зянона Пазняка — археолага, які выявіў пахаванні ў Курапатах.

У ходзе першых прэзідэнцкіх выбараў Пазняк разглядаўся як адзін з найбольш сур'ёзных кандыдатаў; разам прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду набралася дзевятнаццаць. У той час Лукашэнка ўзначальваў даволі «мутную» парламенцкую камісію па барацьбе з карупцыяй. Сярод іншых кандыдатаў былі сакратар Партыі камуністаў Беларусі, старшыня Саюза аграрнікаў, прэм'ер-міністр, які быў моцным прыхільнікам расійска-беларускага саюзу, і былы старшыня парламента Станіслаў Шушкевіч. Як і Пазняк, Шушкевіч выражаў інтарэсы прыхільнікаў перамен. Ён адстойваў рыначныя рэформы, працяг цеснага эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй і замежнапалітычны нейтралітэт. Ён цесна асацыяваўся з новай беларускай ідэнтычнасцю, паколькі ўзначальваў парламент у той час, калі краіна абвясціла аб сваёй незалежнасці і атрымала новую назву ды сімволіку.

На здзіўленне амаль усіх назіральнікаў, Лукашэнка па выніках першага туру галасавання выйшаў на першае месца з уражвальнымі 45 % галасоў. У другім туры ён перамог былога прэм'ер-міністра, набраўшы 80 % галасоў. Два кандыдаты-рэфарматары, разам узятыя, — Пазняк і Шушкевіч — атрымалі ўсяго 20 % галасоў. Іх гучнае паражэнне недвухсэнсоўна сведчыла аб прыхільнасці беларусаў да адназначна прарасійскай замежнай палітыкі, іх практычна поўнай незацікаўленасці ў рынкавых рэформах і малой цікавасці да беларускага нацыяналізму. Прынамсі, так многія інтэрпрэтавалі вынікі выбараў.

Я лічу, аднак, што гэтыя вынікі варта ўспрымаць па-іншаму. Лукашэнка ў вачах выбаршчыкаў быў звязаны перш-наперш з антыкарупцыйнай кампаніяй, а не з прарасійскім ці антызаходнім курсам. Беларусы былі па горла сытыя чыноўніцкімі злоўжываннямі і хлуснёй, што асацыяваліся з камуністычным рэжымам, і падтрымалі кандыдата, які здаваўся самым прыдатным для развязання гэтай праблемы, а таксама выступаў за цесныя эканамічныя ўзаемаадносіны з Расіяй. У сваёй перадвыбарнай праграме Лукашэнка сцвярджаў: «Карупцыя паралізавала работу ўлады». Пасля вырашэння найбольш тэрміновых эканамічных пытанняў ён кляўся распачаць вайну з карупцыяй і разагнаць мафію, што апанавала дзяржаву. Ён даводзіў далей, што

*Карупцыя — гэта пагроза і палітычнай, і эканамічнай бяспецы дзяржавы. Гэта поўнае раскладанне дзяржаўнага апарату і абсалютная страта кіравання дзяржаўным сектарам эканамікі. Гэта тормаз на шляху станаўлення прававой сацыяльнай дэмакратычнай дзяржавы, эфектыўнага развіцця вытворчасці*[9].

Адразу пасля свайго выбрання Лукашэнка гаварыў не пра вяртанне да савецкай сістэмы, а аб правядзенні эканамічных рэформаў. Ён абяцаў умацаваць дысцыпліну, адмовіцца ад каманднa-адміністрацыйных метадаў, а таксама абвяшчаў пра намер супрацоўнічаць з МВФ. Сфармаваны ім урад падзяляў гэтыя мэты. Ён пакінуў на сваёй пасадзе па-рэфармісцку настроенага старшыню Нацыянальнага банка Станіслава Багданкевіча. Незадоўга да гэтага Багданкевіч заявіў:

*Пакуль я сяджу ў гэтым крэсле, не будзе ніякага аб'яднання грашовых сістэм па правілах, прапанаваных Масквой... Я ніколі не пагаджуся перадаць актывы Нацыянальнага банка ў распараджэнне іншай дзяржавы.*

Ён процістаяў ідэям, што

*жыццёва важныя элементы эканамічнай палітыкі (падаткаабкладанне, бюджэтную і крэдытную палітыку) трэба аддаваць у рукі чужой, няхай і дружалюбнай, краіны або што трэба ўводзіць супольны бюджэт, калі няма супольнага парламента... Хто будзе прымаць такі бюджэт? У расійскай Дзярждуме няма прадстаўнікоў Беларусі*[10].

Лукашэнка таксама прызначыў прэм'ер-міністрам чалавека, амаль не звязанага з камуністычнай наменклатурай (Міхаіла Чыгіра), а міністрам замежных спраў — чалавека празаходніх поглядаў (Уладзіміра Сянько).

Лукашэнкаў кар'ерны шлях, яго публічныя заявы напярэдадні выбараў, а таксама першыя паслявыбарныя назначэнні зусім не сведчылі ні аб яго прарасійскасці, ні аб процістаянні беларускаму нацыяналізму. Можна, такім чынам, зрабіць выснову, што беларусы не так ужо пагарджалі незалежнасцю і любілі Расію: падтрымаўшы Лукашэнку, яны звязвалі з ім надзеі на адраджэнне эканомікі і разгон карумпаваных чыноўнікаў. Калі б беларусы сапраўды жадалі вяртання ў савецкую эпоху, яны б выбралі аднаго з кандыдатаў, якія ўвасаблялі яе, — напрыклад, лідэра камуністычнай партыі, старшыню Саюза аграрнікаў ці былога прэм'ер-міністра. Усе яны былі цесна звязаныя з ранейшым рэжымам і, відавочна, выказваліся за больш шчыльныя стасункі з Расіяй, чым Лукашэнка. Такое лаяльнае стаўленне беларускіх грамадзян дазволіла Лукашэнку выбраць курс, які прынёс

[9] «Народная газета». 14 чэрвеня 1994.

[10] «Российская газета». 16 ліпеня 1994.

бы дзяржаве максімальную эканамічную выгаду пры мінімальных стратах для яго асабістай улады і дзяржаўнага суверэнітэту.

## Слабыя дэмакратычныя нормы расчышчаюць шлях да аўтарытарнага кіравання

Трэці ключавы фактар, які аблягчае Лукашэнку правядзенне яго курсу, тычыцца тыпу кіравання дзяржавай, а дакладней, таго, ці мае народ і яго лідэры цвёрдую прыхільнасць да ўсталяваных правілаў кіравання, ці гэтыя правілы з'яўляюцца нетрывалымі. Заходнія палітыкі і даследчыкі часам называюць посткамуністычныя дзяржавы «пераходнымі», маючы на ўвазе, што гэтыя дзяржавы ажыццяўляюць няўхільны пераход да дэмакратыі (і рынкавай эканомікі, само сабой). Але, як прадэманстравалі дзяржавы Сярэдняй Азіі і Беларусь, у спектры паміж аднапартыйнай сістэмай і дэмакратыяй існуе шмат градацый. Калі ў грамадстве няма шырокай кааліцыі, якая патрабавала б руху ў адным кірунку, і адсутнічаюць выразныя ідэалагічныя прыхільнасці, палітычныя лідэры могуць выбіраць такі тып праўлення, які найлепш можа паслужыць іх асабістым утылітарным мэтам.

Беларусы, як і жыхары многіх іншых нованароджаных дзяржаў на постсавецкай прасторы, не маюць досведу ў дэмакратыі. У адрозненне ад прыбалтыйскіх краін у міжваенны перыяд, Беларусь ніколі раней не была незалежнай дзяржавай і ніколі не жыла пад дэмакратычным кіраваннем чужой дзяржавы. Не маючы трывалых дэмакратычных традыцый, як амерыканцы, і не зведаўшы ўкаранення дэмакратычных прынцыпаў звонку пасля вайны, як японцы і немцы, беларускія грамадзяне аказаліся па меншай меры абыякавыя да пераваг дэмакратыі. Куды ў большай ступені іх хвалявала паляпшэнне іх жыццёвага ўзроўню. Адпаведна, яны былі згодныя на любую форму праўлення, абы яна гарантавала дасягненне гэтай мэты. Яскравай праявай апатыі беларусаў у гэтай сферы была мізэрная падтрымка тых партый, якія надавалі першараднае значэнне дэмакратыі і іншым заходнім каштоўнасцям.

Не маючы патрэбы кіравацца дэмакратычнымі нормамі, Лукашэнка быў вольны выбіраць свае ўласныя метады праўлення. Ён мог выбраць як аўтарытарызм, так і дэмакратыю — у залежнасці ад таго, што абяцала большы эканамічны плён. Не маючы асабістай схільнасці і не адчуваючы цягі грамадства да празаходняга выбару, прэзідэнт не меў патрэбы змагацца за няпэўныя дэмакратычныя ідэалы. Тым больш што Расія прапанавала Лукашэнку эканамічныя выгады, за якія не трэба было расплачвацца выкананнем патрабаванняў Сусветнага банка ці МВФ або дэмакратычных прынцыпаў Еўрапейскага Саюза.

Могучы выбіраць сістэму праўлення, Лукашэнка выбраў аўтарытарызм. Яшчэ да таго, як мінулі яго першыя сто дзён на пасадзе, прэзідэнт прыгразіў арыштаваць чыноўнікаў, якія выказваліся супраць яго палітыкі, у тым ліку прэм'ер-міністра і старшыню Нацыянальнага банка; паабяцаў узяць пад асабісты кантроль КДБ; раскрытыкаваў СМІ за тое, што яны недастаткова пазі-

тыўна асвятляюць яго палітыку; намякнуў на роспуск парламента, назваўшы гэты орган «рэакцыйным» і «шахрайскім»; змяніў рэдактараў амаль усіх буйных газет. У рэйтынгу арганізацыі «Freedom House», якая ацэньвае стан палітычных і грамадзянскіх правоў, а таксама ступень свабоды прэсы, Беларусь перамясцілася з катэгорыі «часткова свабодных» у разрад «несвабодных». У 1996 г. Лукашэнка незаконна распусціў парламент і падоўжыў сабе тэрмін знаходжання на пасадзе. У 2001 г. ён перамог на змадэляваных выбарах, у ходзе якіх улады пазбавілі зарэгістраваных назіральнікаў іх мандатаў, перакрылі доступ да апазіцыйных вэб-сайтаў і арыштоўвалі сваіх палітычных праціўнікаў[11]. Нарэшце, у 2004 г. Лукашэнка скарыстаў парламенцкія выбары для правядзення «сфальсіфікаванага рэферэндуму, які зняў для яго абмежаванні на ўдзел у наступных прэзідэнцкіх кампаніях»[12]. Паводле дакладу амерыканскага Дзяржпартамента, «у краіне цяпер пануе аўтарытарны рэжым, пры якім і заканадаўчая, і судовая галіны ўлады падкантрольныя прэзідэнту»[13].

Выбраўшы аўтарытарны падыход для гарантавання сваёй палітычнай бяспекі, Лукашэнка быў вымушаны звязаць Беларусь з такім эканамічным партнёрам, які быў бы згодны ігнараваць ці прынамсі глядзець скрозь пальцы на яго дыктатуру. Брак дэмакратычных традыцый і Лукашэнкава гатоўнасць задаволіць настроі насельніцтва зрабілі Расію найбольш імаверным такім партнёрам.

## Расійскае жаданне падпарадкаваць Беларусь

Будучы прэзідэнтам РСФСР, а пазней незалежнай Расійскай Федэрацыі, Барыс Ельцын праводзіў выключна празаходні курс, які быў празваны атлантычным ці інтэрнацыянальным. Згодна з гэтай канцэпцыяй, расійская палітыка павінна была перайсці ад спробаў сфармаваць уласную «сферу ўплыву» ў межах былога СССР да «салідарнасці з «цывілізаваным светам» на чале з ЗША»[14]. Ча-

[11] Немагчыма адназначна сказаць, ці выйграў бы Лукашэнка сумленныя выбары. У рэпрэсіўнай дзяржаве грамадзяне часта баяцца сказаць, што яны не падтрымліваюць свайго лідэра. Да таго ж, сацыялагічныя вынікі разыходзяцца ў залежнасці ад пастаўленага пытання. Напрыклад, Карасцялёва цытуе справаздачу амерыканскага Дзяржпартамента: «Лукашэнка захоўвае давер прыблізна паловы беларусаў — 51 % давяраюць яму і 38 % не давяраюць». Гэтаксама ён па-ранейшаму захоўвае легітымнасць: «61 % гавораць, што яны галасавалі за яго ў верасні 2001 г. і амаль столькі ж (56 %) сцвярджаюць, што ён заслугоўвае пераабрання» (Korosteleva, Elena A. Is Belarus a Demagogical Democracy? Cambridge Review of International Affairs 16. 2003. P. 530). З другога боку, Роджэр Патоцкі (2002) піша, што «Лукашэнкава папулярнасць упала з 41 % перад выбарамі [2001 г.] да менш як 20 % сёння» (Potocki, Rodger. Dark Days in Belarus. Journal of Democracy 13. 2002. P. 154). І справаздача Дзяржпартамента, і Патоцкі не прыводзяць сваіх крыніц.

[12] Press. European Union. 2005. The EU's Relations external_relations/belarus/intro.

[13] U.S. Department of State. State Department Post Reports, November 28, 2003. http://www.foia.state.gov/mms/postrpt/pr_view_all.asp?CntryID=13i.

[14] Aron, Leon. The Foreign Policy Doctrine of Postcommunist Russia and Its Domestic Context. In The New Russian Foreign Policy, edited by Michael Mandelbaum. New York: Council on Foreign Relations, 1998. P. 24.

сопіс «Jane's Intelligence Review» з захапленнем пісаў, што ў Расіі «празаходняя арыентацыя карыстаецца папулярнасцю нават сярод кансерватыўнай часткі вайсковай бюракратыі» (1 жніўня 1992).

Гэты перыяд бескампраміснай празаходняй рыторыкі хутка мінуў, галоўным чынам таму, што Захад не змог ці не захацеў вылечыць хворую расійскую эканоміку. Насельніцтва Расіі і многія яе палітыкі пачалі расчароўвацца ў Захадзе і ельцынскай празаходняй палітыцы.

Як толькі расійская эканоміка рухнула ў выніку маштабных і імклівых рыначных рэформаў, былы савецкі рэгіён пачаў трашчаць па швах. У Азербайджане, Грузіі, Малдове і Таджыкістане ўспыхнулі ці актывізаваліся грамадзянскія войны. Тры прыбалтыйскія дзяржавы пачалі праводзіць палітыку дыскрымінацыі ў дачыненні да сваіх рускамоўных меншасцей, а Украіна адмовілася падпарадкавацца Расіі ў некаторых важных палітычных пытаннях.

У абставінах дыскрэдытацыі ранейшага празаходняга курсу, прыгранічнага хаосу, нападак на рускамоўнае насельніцтва ў былых савецкіх рэспубліках і пагрозы прэзідэнцкай уладзе з боку парламента Ельцын даў задні ход і перайшоў да еўраазіяцкай канцэпцыі, якая прэвалюе і сёння. Гэтая канцэпцыя разглядае Расію як унікальную вялікую дзяржаву, у сферу ўплыву якой павінны ўваходзіць былыя савецкія рэспублікі. Прыхільнікі еўраазійства цвердзяць, што Расія мае «тысячагадовую гісторыю і законныя інтарэсы» ў постсавецкіх дзяржавах і што яна «не павінна баяцца паказваць мускулы», абараняючы гэтыя свае інтарэсы.

Расійская ўвага да еўраазійскага рэгіёну неаднолькава ўвасабляецца ў розных яго частках. У сферы эканомікі расійскія лідэры праяўляюць асаблівы інтарэс і аказваюць асаблівы ціск на сваіх непасрэдных суседзяў, у тым ліку Беларусь. Хоць ельцынскі і пуцінскі энтузіязм наконт саюзу з Беларуссю зазнае пад'ёмы і спады, расійскія лідэры нязменна праяўляюць цікавасць да той ці іншай формы дамінавання над Беларуссю. Як паказана ў гэтым артыкуле ніжэй, Расія падпісала з Беларуссю вялікую колькасць пагадненняў і ў многіх выпадках аказвала агрэсіўны ціск на Лукашэнку, спрабуючы прымусіць яго адмовіцца ад большай долі суверэнітэту — напрыклад, прыняць расійскі рубель. У процілегласць расійскай гатоўнасці супрацоўнічаць з Лукашэнкам, не зважаючы на яго адмову ад прыватызацыі або дэмакратызацыі, заходнія дзяржавы накладаюць дадатковыя абмежаванні на эканамічнае супрацоўніцтва і дапамогу. Напрыклад, Еўрапейскі Саюз заявіў, што Лукашэнкава нелюбоў да дэмакратыі

*робіць немагчымым далучэнне Беларусі да еўрапейскай палітыкі добрасуседства, якая грунтуецца на ўзаемнай прыхільнасці да супольных каштоўнасцей, у тым ліку дэмакратыі, павагі да вяршэнства закону і правоў чалавека, уключаючы правы нацыянальных меншасцей* [15].

[15] European Union. The EU's Relations with Belarus. 2005. http://europa.eu.int/comm/external_relations/belarus/intro.

Патрабаванні ЕС, такім чынам, супярэчаць эканамічнай і палітычнай праграме Лукашэнкі. Гэта, разам з моцнай расійскай зацікаўленасцю ў Беларусі, штурхае Лукашэнку ў рукі Расіі. Хоць аналіз усіх прычын расійскай зацікаўленасці выходзіць за межы гэтага артыкула, логіка спецыфічных актываў наводзіць на думку пра дзве магчымыя прычыны: адчуванне неабароненасці, да якога прычыняюцца пракладзеныя праз Беларусь трубаправоды, спалучанае з бояззю «здрады» з боку Лукашэнкі. З часу распаду СССР Расія ажыццявіла значныя капіталаўкладанні ў беларускія трубаправоды, павялічыўшы іх магутнасць на ўчастках, што вядуць у Еўропу. Гэта рабілася акурат таму, што Беларусь выбрала Расію сваім эканамічным партнёрам. Чуючы пастаянныя і гучныя заявы Лукашэнкі пра неабходнасць расійска-беларускага саюзу, Ельцын і Пуцін заканамерна маглі чакаць, што неўзабаве яны атрымаюць кантроль над сваім суседам і яго актывамі. Паводле іроніі лёсу, чым больш Расія дамагалася кантролю, тым большае было супраціўленне Лукашэнкі. Да таго ж перамога ва Украіне ў 2005 г. празаходняга Віктара Юшчанкі паглыбіла расійскую залежнасць ад Беларусі. Юшчанка прыйшоў на змену адкрыта прарасійскаму Леаніду Кучму, які толькі што падпісаў ключавое эканамічнае пагадненне з Расіяй. Са стратай Украіны Расія больш чым калі займела патрэбу ў кантролі над беларускімі актывамі, якія гарантавалі доступ на заходнія рынкі.

Чатыры вышэйпералічаныя фактары, узятыя ў сукупнасці, абумоўліваюць залежнасць Беларусі ад Расіі, але залежнасць з пэўнымі агаворкамі. Спецыфічныя актывы звязваюць Лукашэнку рукі, калі з'яўляецца неабходнасць процістаяць памкненням расійскага кіраўніцтва паглынуць Беларусь. З другога боку, гэтыя актывы даюць Лукашэнку сродак націску на Расію і зброю супраць паглынання, якое ў адваротным выпадку магло б адбыцца. Хоць моцны нацыяналізм і дэмакратычныя традыцыі маглі б прымусіць Лукашэнку пайсці ў галіне эканомікі насустрач Захаду, іх адсутнасць дазваляе яму прагматычна праводзіць такую палітыку, якая найбольш спрыяе захаванню яго рэжыму і забяспечвае найбольш самастойнасці. Нарэшце, моцная зацікаўленасць Расіі ў той ці іншай форме кантролю над Беларуссю дае Лукашэнку магчымасць вытаргоўваць у суседкі тыя ці іншыя эканамічныя бонусы.

## ПЕРАМЕННЫЯ ФАКТАРЫ

Нельга сумнявацца ў тым, што Лукашэнка кінуў Беларусь у рукі Расіі, а не Захаду. Ён адмовіўся ад рэкамендацый МВФ і Сусветнага банка. Ён паказаў на дзверы заходнім праваабаронцам, абвінаваціўшы іх у тым, што яны ўмешваюцца ва ўнутраныя справы яго краіны. Ён неаднаразова выступаў з гучнымі заявамі наконт расійска-беларускай федэрацыі. Ён паставіў і бяспеку, і эканамічную палітыку краіны ў залежнасць ад суседняга славянскага гіганта. Тым не менш, аналітыкам не пашкодзіла б правесці выразнае адрозненне паміж палітычнай рыторыкай і канкрэтнымі справамі. Шукаючы сведчанняў братэрства, якое зайшло б далей за пустую балбатню, мы знойдзем некалькі сфер, у якіх Лу-

кашэнка адмовіўся ад суверэнітэту, у той час як у іншых выпадках ён паспяхова змагаецца за беларускі суверэнітэт і адначасова сваю асабістую ўладу. Калі адна дзяржава адмаўляецца ад свайго суверэнітэту на карысць іншай дзяржавы ці арганізацыі, яна ўваходзіць ва ўзаемаадносіны, якія я называю «дэлегаванай іерархіяй».

Пры дэлегаванай іерархіі слабейшая дзяржава можа палічыць мэтазгодным перадаць іншаму палітычнаму ўтварэнню пэўныя дырэктыўныя функцыі ў абмен на пэўныя выгады — эканамічную падтрымку, гарантыі бяспекі ці нейкія іншыя бонусы, якія дапамогуць палітычным лідэрам слабейшай дзяржавы ўтрымаць свае пазіцыі. Для лідэра, які апасаецца страціць уладу, адмова ад часткі суверэнітэту можа быць выбарам паміж палітычным жыццём і палітычнай смерцю.

Задаўшыся мэтай высветліць, ад чаго акурат адмовілася Беларусь, можна ўбачыць, што Лукашэнка не пажадаў даць расіянам многага з таго, чаго яны патрабавалі. Аналітыкі, як правіла, выпускалі гэта з-пад увагі, галоўным чынам таму, што яны былі занадта засяроджаныя на больш глабальным пытанні «Расія ці Захад?». Мы можам упэўнена адказаць на гэтае пытанне: «Расія». Але следам паўстае больш тонкае пытанне: «Як шмат належыцца Расіі?» На яго адказам будзе: «Менш, чым вы маглі думаць». Паступова Лукашэнка прадэманстраваў, што яго і ягоную дзяржаву нельга заваяваць лёгка.

«Постнезалежніцкая» Беларусь пазіцыянуе сябе як былую савецкую рэспубліку, якая найбольш прагне ўз'яднацца з Расіяй у новым, але па-ранейшаму вельмі іерархізаваным палітычным саюзе. Нягледзячы на раннія дэкларацыі Ельцына аб тым, што рэспублікі могуць узяць сабе столькі суверэнітэту, колькі яны могуць ператравіць, неўзабаве ён пачаў абмяжоўваць гэты суверэнітэт такім чынам, каб ступень падпарадкаванасці задавальняла Расію і адначасова не была для яе празмерным цяжарам. Адным з першых яго крокаў была спроба стварыць эканамічны саюз у маштабе ўсёй Садружнасці незалежных дзяржаў. Аднак, як і большасць ініцыятыў у рамках СНД, ідэя саюза хутка загразла ў віры дакументаў, нарадзіўшы на свет даволі невыразнае ўтварэнне. К 1995 г. Ельцын адмовіўся ад ідэі шматбаковага саюза на карысць саюза двухбаковага, які можна было ствараць праз персанальныя перагаворы з зацікаўленымі дзяржавамі, а не праз неэфектыўныя бюракратычныя працэдуры СНД. У студзені 1995 г. расійскія чыноўнікі абвясцілі, што неўзабаве будзе падпісаны пратакол аб утварэнні мытнага саюза і пагадненне аб свабодным гандлі з удзелам шэрагу дзяржаў СНД — Беларусі, Казахстана і Украіны. Калі дайшло да справы, дагавор падпісалі толькі Беларусь і Казахстан; Украіна адмовілася далучацца да саюза з той прычыны, што дагавор не даваў усім удзельнікам роўных правоў.

Мытныя саюзы, паводле азначэння, закліканыя ўстараняць мытныя пошліны паміж дзяржавамі-членамі, а таксама ўзгадняць іх гандлёвую палітыку ў дачыненні да рэшты свету. Што да мытнага саюза краін СНД, дык яго робіць нетыповым — і іерархічным — тое, што ўсе яго ўдзельнікі разумеюць: у такім саюзе знешнія мытныя пошліны будзе вызначаць Расія, а ўсе астатнія вымушаныя будуць падпарадкоўвацца яе рашэнню. Хоць пагадненне прадугледжвае, што ра-

сійскія заканадаўчыя органы павінны браць пад увагу эканамічныя і палітычныя інтарэсы іншых удзельнікаў саюза, яно не прапісвае для гэтага ніякага канкрэтнага механізму. І сапраўды, цяжка паверыць у тое, што расійская Дзярждума будзе схіляцца перад інтарэсамі меншых дзяржаў.

Даследчыкі гэтага рэгіёну яшчэ не да канца задакументавалі іерархічную прыроду гэтага мытнага саюза. Тым не менш, доказаў гэтага досыць. З моманту далучэння да саюза Лукашэнка пачаў прыводзіць мытныя пошліны Беларусі ў адпаведнасць з расійскімі. У 1995 г. беларускі Кабінет міністраў устанавіў на шэраг тавараў такія самыя пошліны, якія былі вызначаныя расійскай Дзярждумай. Пазней Лукашэнка падпісаў указ аб увядзенні адносна ўкраінскага імпарту падатку на дададзеную вартасць з мэтай прывесці беларускія пошліны ў адпаведнасць з расійскімі. У 1996 г. беларускі Кабінет міністраў абвясціў, што ён рыхтуе новы пералік пошлін, у якім будуць улічаныя змены ў мытным рэгуляванні, што адбыліся ў Расіі. У 1997 г. ЦРУ паведамляла, што

> *пагадненне аб мытным саюзе з Расіяй, якое вымагае ад Мінска ўзгадняць свае правілы замежнага гандлю з маскоўскімі, прывяло да павышэння для беларускіх спажыўцоў імпартных пошлін; апошнія выраслі з 5—20 % да 20—40 %*[16] *Беларускія межы па перыметры мытнага саюза ахоўваліся расійскімі мытнікамі, што яшчэ больш узмацняла іерархічную прыроду пагаднення.*

Расія час ад часу аказвала ціск на Беларусь з мэтай прымусіць яе больш строга прытрымлівацца дагавору. Напрыклад, гендырэктар беларускага нафтавага канцэрну аднаго разу паведаміў, што, нягледзячы на мытны саюз, Беларусь захавае цану на бензін у памеры 24 цэнтаў за літр, у той час як расіяне плацілі 45 цэнтаў. Пасля сустрэчы з расійскімі чыноўнікамі прадстаўнікі беларускага боку далі задні ход, заявіўшы, што цэны на нафту і нафтапрадукты будуць узнятыя да ўзроўню расійскіх, як і прадугледжвае мытны саюз.

Хоць канфлікты і супярэчнасці ва ўзаемаадносінах захоўваліся, дзве дзяржавы паглыблялі і ўмацоўвалі свой саюз. У кастрычніку 2000 г. мытны саюз Беларусі і Расіі пашырыўся за кошт далучэння да яго трох цэнтральнаазіяцкіх дзяржаў — Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана. Удзельнікі назвалі новае аб'яднанне «Еўразійскай эканамічнай супольнасцю» — на ўзор папярэдніцы ЕС. У 2003 г. сакратарыят ААН зарэгістраваў аб'яднанне ў якасці афіцыйнай міжнароднай арганізацыі. У наступным годзе органы ЕўрАзЭС (скарочаная назва саюза) паведамілі пра 90-працэнтную адпаведнасць беларускіх мытных тарыфаў расійскім.

Колькасць галасоў дзяржаў — удзельніц ЕўрАзЭС адпавядае іх укладу ў бюджэт супольнасці: Расія мае 40 % галасоў, Беларусь і Казахстан — па 20 %, тады

[16] U.S. Central Intelligence Agency. 2003. World Factbook/Belarus. www.odci.gov/cia/publications/factbook/country.html (наведаная ў студзені 2003 г.; цяпер на сайце знаходзіцца новая справаздача).

як самыя дробныя дзяржавы (Кыргызстан і Таджыкістан) — па 10 % кожная. Каб мець перавагу ў супольнасці, Расіі, такім чынам, патрэбен толькі адзін саюзнік, што дазваляе ёй настройваць меншыя дзяржавы адну супраць другой. Каб процістаяць Расіі, дзве наступныя па велічыні эканамічнага ўкладу дзяржавы — Беларусь і Казахстан — павінны аб'яднаць свае пазіцыі, а таксама залучыць да сябе хоць бы яшчэ адну цэнтральнаазіяцкую дзяржаву.

Члены ЕўрАзЭС бачаць у ім у перспектыве ўсёабдымны эканамічны саюз. Як паведамляецца, у рамках супольнасці плануецца стварыць зону свабоднага гандлю, аб'яднаць мытныя тарыфы і меры нетарыфнага рэгулявання, выпрацаваць супольную пазіцыю на перагаворах з СГА, узгадніць прынцыпы і ўмовы пераходу да адзінай валюты, каардынаваць правядзенне эканамічных рэформаў, увесці ў дзеянне супольную плацежную сістэму, стварыць супольны рынак транспартных паслуг, стандартызаваць нацыянальныя адукацыйныя праграмы, а таксама наладзіць супрацоўніцтва ў галіне памежнай бяспекі, у тым ліку стварыць сумесныя падраздзяленні па барацьбе з кантрабандай і іншымі мытнымі парушэннямі. Пакуль застаецца няясным, ператворыцца ЕўрАзЭС у яшчэ адну СНД — пераважна папяровы праект з малой колькасцю рэальных вынікаў — ці зробіцца свайго роду ЕС для Еўразіі.

Куды менш дынамічным, але патэнцыйна больш значным праектам з'яўляецца Адзіная эканамічная прастора, у якую ўваходзяць чатыры дзяржавы СНД. У верасні 2004 г. Расія і Беларусь разам з Украінай і Казахстанам падпісалі шэраг пагадненняў, вынікам якіх меўся стаць гэты шырокамаштабны саюз. Але нават без уліку гэтага аб'яднання Лукашэнка працягвае весці Беларусь да эканамічнага саюза на чале з Расіяй.

Хоць Лукашэнка саступіў Расіі ў галіне тарыфнага рэгулявання, ён па-ранейшаму паспяхова процістаіць спробам прынесці беларускі рубель у ахвяру яго расійскаму субрату. Лукашэнкава пазіцыя кантрастуе з першапачатковым нежаданнем Беларусі выходзіць з так званай рублёвай зоны, якое мела месца адразу пасля здабыцця незалежнасці. Тое, што цяпер Лукашэнка процістаіць навязванню Беларусі расійскага рубля, можа тлумачыцца, прынамсі часткова, ранейшым досведам існавання ў рублёвай зоне.

Рублёвая зона была першай і найбольш цеснай формай постсавецкага эканамічнага саюза. З распадам СССР 15 новых незалежных дзяржаў атрымалі ў спадчыну савецкі рубель у якасці адзінай валюты. Расійскі ж Цэнтральны банк стаў дэ-факта іх галоўным фінансавым органам. У 1992 г. Расія павялічыла свой уплыў на астатніх членаў рублёвай зоны праз стварэнне для іх карэспандэнцкіх рахункаў. Рахункі былі прызначаныя для аблягчэння разлікаў паміж прадпрыемствамі, якія апынуліся на тэрыторыі розных дзяржаў. Пабочным эфектам гэтага заходу сталася, аднак, узнікненне ў кожнай дзяржавы сваіх уласных безнаяўных рублёў. Гэта дало Расіі падставу пачаць вызначаць курсы абмену гэтых рублёў паміж сабой. Цэнтральны банк Расіі мяняў рублі з розных краін у суадносінах 1:1 да пэўнага ліміту, пасля якога нерасійскія рублі абясцэньваліся. Выкарыстоўваючы гэтыя рахункі і сваё манапольнае становішча,

Расія выдзяляла субсідыі Беларусі і іншым дзяржавам пры дапамозе грашовых пераводаў з расійскага Цэнтрабанка ў цэнтральныя банкі іншых дзяржаў. Кожная дзяржава пры гэтым захоўвала за сабой пэўныя эмісійныя паўнамоцтвы, шчодра раздаючы крэдыты прамысловасці, што занепадала. Гэтыя злоўжыванні прывялі да велізарнай інфляцыі, якая ў многіх дзяржавах дасягнула 1000 % на год і вышэй. У адказ расійскі Цэнтрабанк у 1993 г. абвясціў, што савецкія і эмітаваныя да таго часу постсавецкія рублі на працягу двух дзён будуць выведзеныя з абарачэння. Рэзкі крок Расіі нанёс па эканоміцы Беларусі і іншых дзевяці дзяржаў, што карысталіся савецкім рублём, моцны ўдар. Нягледзячы на намаганні Лукашэнкі ўваскрасіць саюз, пад канец 1995 г. усе дзяржавы выйшлі з рублёвай зоны.

Падчас існавання рублёвай зоны Ельцын дзейнічаў на шкоду інтарэсам Беларусі. Таму Лукашэнка цалкам мог апасацца нават больш недружалюбных крокаў у выпадку перадачы кантролю над грашовым абарачэннем. У інтэрв'ю 2003 г. ён сказаў, што Беларусь можа ўступіць у грашовы саюз пры дзвюх умовах: калі пры гэтым не пацерпіць яе суверэнітэт і калі Расія прапануе «фінансавыя гарантыі». Ён дадаў: «Я стаўлю пытанне [перад Расіяй]: дзе гарантыі, каб не быў парушаны наш суверэнітэт дзяржаўны, каб людзі былі незалежныя? Таму што, якая незалежнасць без грошай?»

Пазней Лукашэнка пісаў Пуціну, што любы пераход на расійскую валюту магчымы толькі на ўмовах дагавору аб утварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Нягледзячы на значны ціск з боку Расіі на Беларусь з мэтай прымусіць яе перадаць кантроль над сваёй грашовай сістэмай, Лукашэнка дагэтуль працівіцца такому кроку, замест гэтага працягваючы патрабаваць фінансавай кампенсацыі і іншых выгод у абмен на пагаршэнне становішча Беларусі. Хоць пра Беларусь часта гавораць, што яна імкнецца ў расійскія абдымкі, факты сведчаць, што Лукашэнка, так бы мовіць, павольна валачэцца ў гэтым кірунку, вымагаючы саступак.

## У імкненні да кантролю над спецыфічнымі актывамі

Пакуль пераход на адзіную валюту застаецца прадметам перамоў, Расія настойліва імкнецца да панавання ў вельмі спецыфічнай сферы — кантролю над галоўнымі беларускімі трубаправодамі. У лістападзе 2002 г. Беларусь, імпартуючы газ, выйшла за межы раней агавораных з Расіяй аб'ёмаў. У адказ Расія знізіла пастаўкі на 50 % — драматычнае абмежаванне для краіны, якая цалкам залежыць ад расійскага імпарту. Беларускі ўрад тут жа выплаціў «Газпрому» 11 мільёнаў долараў з 282-мільённай запазычанасці, дзякуючы чаму праз некалькі дзён пастаўкі крыху выраслі. Яшчэ праз некалькі дзён прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі нарэшце сустрэліся для абмеркавання складанай сітуацыі, што склалася. Пасля сустрэчы кіраўнікі ўрадаў чарговы раз паведамілі, што «Белтрансгаз» і «Газпром» утвораць сумеснае прадпрыемства, — сувязь гэтай маючай адбыцца трансфармацыі з беларускімі даўгамі была відавочная. Бакі падпісалі

пагадненне аб будучым аб'яднанні кампаній яшчэ ў ліпені 2002 г., абавязаўшыся заключыць здзелку на працягу года. У лістападзе беларускі прэм'ер-міністр паабяцаў унесці ў беларускі парламент закон, які б прадугледжваў стварэнне сумеснага прадпрыемства не пазней за ліпень 2003 г. — роўна праз год пасля першапачатковага абвяшчэння тэрміну. Беручы пад увагу кішэнны Лукашэнкаў парламент, абяцанне ўрада павінна было без праблем увасобіцца ў жыццё. Прыблізна праз тыдзень абедзве палаты парламента (верхняя аднагалосна і без абмеркаванняў) знялі заканадаўчую забарону на прыватызацыю беларускай газатранспартнай сістэмы, тым самым адкрыўшы шлях да ўтварэння сумеснага прадпрыемства. Продаж самага «казырнага» актыву дзяржавы мог падацца кепскім рашэннем з боку Лукашэнкі. Аднак жа пагадненне было заклікане аслабіць расійскі націск. Паводле яго ўмоў, «Газпрому» павінна было адысці 25—30 % «Белтрансгаза» ў якасці плацяжу за беларускія даўгі газаваму манапалісту.

Агаворaны крайні тэрмін мінуў без якіх-небудзь дзеянняў. Бліжэй да канца 2003 г. расійскі прэм'ер-міністр прыгразіў Беларусі ультыматумам: або яна нарэшце-такі пойдзе на стварэнне сумеснага прадпрыемства, або «Газпром» пачне прадаваць краіне прыродны газ па рынкавай цане. Калі б гэта адбылося, беларусы панеслі б сур'ёзныя страты. Цэны на расійскі прыродны газ істотна вагаюцца ў залежнасці ад пакупніка. Напрыклад, у 2002 г. Беларусь плаціла 30 долараў ЗША за 1000 $м^3$, тады як Украіна — 50 долараў, прыбалтыйскія краіны — 70—80 долараў, а Польшча і Славакія — 100 долараў за той самы аб'ём газу. На працягу многіх гадоў Расія падтрымлівала Беларусь, прадаючы ёй газ па ўнутрырасійскіх цэнах. Значнае павышэнне цэн моцна ўдарыла б па беларускіх прадпрыемствах і літаральна пакінула б беларусаў сам-насам з маразамі.

2004 г. паказаў Лукашэнку куды больш незгаворлівым палітыкам, чым гэта вынікала з яго ранейшай прарасійскай і антынезалежніцкай рэпутацыі. Замест таго каб падпарадкавацца газаваму гіганту, беларускія ўлады абвясцілі 30 снежня 2003 г., што яны спыняюць перагаворы аб сумесным прадпрыемстве з Расіяй. На наступным тыдні, пасля навагодніх святаў, прадстаўнікі «Белтрансгаза» паведамілі, што вартасць гэтага прадпрыемства складае каля 5 мільярдаў долараў. У Расіі гэтае паведамленне выклікала насмешку. На думку расіян, больш правільнай лічбай меліся быць 600 мільёнаў долараў, якія адлюстроўвалі «балансавую вартасць» «Белтрансгаза».

Рознагалоссі паміж дзвюма славянскімі дзяржавамі працягвалі паглыбляцца і перайшлі ў фазу прамога процістаяння. Беларусь заявіла, што яна разглядае магчымасць павышэння для Расіі платы за транзіт у Еўропу расійскай нафты. Украінскія тарыфы на транзіт складалі ў той час 73 цэнты за 100 км, у той час як Беларусь брала ўсяго 51 цэнт. Цяпер Беларусь пагражала ўзняць свае тарыфы да ўзроўню ўкраінскіх. Расія ў адказ паабяцала зменшыць квоты на пастаўкі нафты ў Беларусь. Спадзеючыся на ўрэгуляванне канфлікту, прэм'ер-міністры дзвюх краін сустрэліся ў Маскве. Разгледзелі адразу два праблемныя пытанні — аб'яднанне газавых прадпрыемстваў і пераход на адзіную валюту. Але перагаворы не мелі вялікага плёну.

Так і не здолеўшы заключыць пагадненне, 20 студзеня 2004 г. «Газпром» спыніў пастаўкі газу ў Беларусь. Умовай аднаўлення паставак была абвешчаная згода Беларусі на павышэнне цаны на газ з 30 да 80 долараў за 1000 м$^3$ — г. зн. на 167 %. Лукашэнка адкінуў такую прапанову. Спрэчка за беларускія спецыфічныя актывы настолькі сапсавала адносіны паміж дзвюма дзяржавамі, што за перагаворы ўзяліся прэзідэнты. Хоць пра дэталі перамоў СМІ не гавораць, іх вынікі не прымусілі сябе чакаць. 23 студзеня, усяго праз тры дні пасля радыкальнага кроку «Газпрома», газ ізноў пайшоў па трубах. Адначасова Пуцін распарадзіўся выдзеліць Беларусі крэдыт для аплаты паставак. Хоць гэтае распараджэнне пярэчыла наяўнаму заканадаўству, яно было выкананае.

Нягледзячы на ўмяшанне прэзідэнтаў, а таксама шматлікія перагаворы і сустрэчы паміж рознымі эканамічнымі і палітычнымі суб'ектамі, бакі так і не здолелі прыйсці да канчатковай згоды. У сярэдзіне лютага, калі тэмпература паветра дасягнула -20 °C, «Газпром» зноў спыніў пастаўкі газу ў Беларусь. Ён паабяцаў аднавіць іх, толькі калі Беларусь пагодзіцца на перадачу расійскаму боку 50 % акцый «Белтрансгаза». Пры гэтым «Газпром» нават пагаджаўся плаціць удвая большую плату за транзіт газу па беларускай тэрыторыі. Ізноў Лукашэнка і яго чыноўнікі засталіся непахісныя, адмовіўшыся саступіць свой галоўны і найбольш каштоўны актыў.

Загнаны ў кут, Лукашэнка даў адпор, абвінаваціўшы расіян у шантажы і бессардэчнасці. «Гэта акт тэрарызму на самым высокім узроўні», — заявіў ён на нарадзе па сітуацыі, што склалася ў сувязі са спыненнем паставак. Таксама Лукашэнка сказаў: «Хоча Пуцін, каб мы плацілі гэтыя грошы, давайце збяром іх ад лекаў чарнобыльцаў, ад тых, хто гніў у акопах».

Апроч гэтага, Лукашэнка выкарыстаў беларускія спецыфічныя актывы для прыцягнення на свой бок саюзнікаў. Пасля спынення паставак у Беларусь газ перастаў паступаць і да яе больш платаздольных суседзяў. Таму цяпер супраць Пуціна выступіла і Польшча. Польская апазіцыя запатрабавала адстаўкі міністра інфраструктуры, паколькі той не здолеў дыверсіфікаваць крыніцы паставак энерганосьбітаў. Польскі прэм'ер-міністр звярнуўся да Расіі, назваўшы яе «не вельмі надзейным пастаўшчыком». Калі пагроза застацца без паліва падобным чынам навісла і над Германіяй, Еўракамісія накіравала ў Маскву афіцыйны ліст, у якім запатрабавала растлумачыць прычыны, з якіх спыніліся крытычна важныя пастаўкі газу. Урэшце Расія ўзяла пад увагу супольныя пратэсты Беларусі, Польшчы і Еўракамісіі. 20 лютага пастаўкі газу ў Беларусь былі адноўленыя па цане 46,68 долара ЗША за м$^3$ — вышэйшай, чым ранейшыя 30 долараў, але ніжэйшай, чым першапачаткова запатрабаваныя «Газпромам» восемдзесят. Аднавіўся і транзіт.

Некаторыя СМІ апісалі вырашэнне гэтага канфлікту так, нібыта Лукашэнка паддаўся расійскаму шантажу. Аднак канчатковая мэта Расіі авалодаць найважнейшымі беларускімі трубаправодамі засталася не дасягнутай. Беларускі прэзідэнт між тым абвінаваціў Расію ў жаданні «прыбраць да рук» не толькі беларускія трубаправоды, але і нафтаперапрацоўчую прамысловасць, энергетычную сістэму і чыгунку — усе спецыфічныя актывы. Замест продажу гэтых актываў

Лукашэнка хутчэй быў гатовы пагадзіцца плаціць за газ па вышэйшых цэнах — асабліва пры ўмове выдзялення крэдыту. У мінулым такія крэдыты ўрэшце залічваліся па бартэры (у кошт паставак трактароў і іншага абсталявання) ці ўвогуле спісваліся ў абмен на працяг ваеннага супрацоўніцтва або льготы па транзіце. Ад самых важных сваіх актываў Лукашэнка так і не адмовіўся.

Хоць узаемныя нападкі і пагрозы аказаліся тупіковым шляхам, канчатковай і поўнай згоды бакі таксама не здолелі дасягнуць. На працягу 2004 г. яны ўжо не рабілі ніякіх захадаў дзеля ажыццяўлення сваіх патрабаванняў. Гатоўнасць Расіі «замарозіць» беларусаў у лютым, няхай і часова, абярнулася працяглым ахаладжэннем ва ўзаемаадносінах дзвюх дзяржаў. Згодна з сацыялагічным апытаннем, праведзеным у красавіку 2004 г., толькі 13,8 % беларусаў падтрымлівалі ідэю аб'яднання з Расіяй у адну дзяржаву (БелаПАН, 6 красавіка 2004). Паводле стану на студзень 2005 г., дзве дзяржавы так і не заключылі паміж сабой доўгатэрміновага пагаднення.

## ВЫСНОВЫ

Чатыры фактары тлумачаць Лукашэнкава рашэнне ахвяраваць пэўнай часткай незалежнасці на карысць Расіі. Першы і дагэтуль найбольш ігнараваны — гэта вялікая доля спецыфічных актываў у эканоміцы. Крытычна важныя актывы, уласцівыя расійскай і беларускай гаспадаркам, звітоўваюць дзве дзяржавы між сабой і штурхаюць іх да цеснага саюза, заснаванага на эканамічных падставах. Хоць Беларусь не можа дамінаваць над сваёй больш магутнай суседкай, яна можа здабываць перавагі ў тых сферах, у якіх мае сякія-такія рычагі ўплыву. У якасці такіх рычагоў Лукашэнка выкарыстоўваў нафта- і газаправоды, па якіх ідзе значная частка расійскага экспарту энерганосьбітаў у Еўропу. Хоць Пуцін паспрабаваў пры дапамозе жорсткіх захадаў прымусіць Лукашэнку перадаць кантроль над беларускімі трубаправодамі, Лукашэнка застаўся непахісны, у адказ агрэсіўна атакаваўшы Пуціна. Паводле іроніі лёсу, аўтарытарны лідэр, якога вінавацяць у шматлікіх парушэннях правоў чалавека, разыграў акурат «праваабарончую» карту, выставіўшы Пуціна бяздушным суб'ектам, які хацеў дзеля прыбытку пакінуць беларускіх грамадзян замярзаць. Значная частка гэтага артыкула прысвечаная таму, як спецыфічныя актывы выкарыстоўваліся для ўзмацнення пазіцый слабай дзяржавы. Гэты працэс быў амаль не асветлены ў наяўнай дагэтуль літаратуры.

Апрача крытычнай ролі спецыфічных актываў, Лукашэнкаў выбар тлумачаць і тры іншыя чыннікі. Па-першае, беларускі народ выявіў малую прыхільнасць да ідэалогіі нацыяналізму, якая магла б прымусіць Лукашэнку адвярнуцца ад гістарычна «варожай» Расіі. Гэта надзіва кантрастуе з сітуацыяй у краінах Балтыі і, у меншай ступені, ва Украіне. Слабы нацыяналізм дазволіў Лукашэнку прагматычна абраць для збліжэння тую дзяржаву, якая прапаноўвала найбольшыя эканамічныя выгады. Ёю сталася Расія. Хоць слабы нацыяналізм адыгрываў пры гэтым ключавую ролю, адным гэтым фактарам прычыны збліжэння з Расіяй не

вычэрпваюцца. Пазбаўлены моцнай цягі да «беларускасці», Лукашэнка мог скіраваць свой народ да празаходняй ці праўсходняй ідэнтычнасці або нават балансаваць паміж гэтымі двума варыянтамі, што можна назіраць у выпадку Казахстана. Аднак адсутнасць у Лукашэнкі прыхільнасці да дэмакратыі давала яму магчымасць звярнуцца да аўтарытарных метадаў кіравання і барацьбы з апазіцыяй. Апроч таго, моцная зацікаўленасць Расіі ў саюзе з Беларуссю падштурхоўвала Ельцына і Пуціна дапамагчы Лукашэнку ў яго намаганнях ўратаваць надзвычай залежную ад Расіі эканоміку сваёй краіны. Гэты апошні фактар цесна змыкаецца з першым — роляй спецыфічных актываў. Калі б не такія шчыльныя сувязі паміж дзвюма дзяржавамі і не крытычна важнае геаграфічнае становішча Беларусі на шляху да заходніх рынкаў энерганосьбітаў, Расія наўрад ці была б настолькі зацікаўленая ў аказанні Беларусі якой-небудзь эканамічнай падтрымкі.

З прычыны сваёй уласнай неабароненасці Расія так і не здолела дасягнуць настолькі поўнага кантролю над Беларуссю, як ёй хацелася. У прыватнасці, Лукашэнка захаваў кантроль над беларускімі трубаправодамі, а таксама над грашовай сістэмай. З другога боку, ён не вагаючыся саступіў Расіі паўнамоцтвы ў сферы тарыфнага рэгулявання. Іншымі словамі, узважыўшы расійскія прэтэнзіі, ён задаволіў тыя, ад наступстваў якіх было б лягчэй вызваліцца ў будучыні.

**Пераход да дэмакратыі, хутчэй за ўсё, выкліча крах лукашэнкаўскага рэжыму.**

Ці будзе Беларусь мацаваць свой саюз з Расіяй або рушыць у кірунку больш аўтаномнага існавання? Першы фактар — доля спецыфічных актываў — хутчэй за ўсё, застанецца нязменны. Ні ў якай іншай дзяржавы, апрача Расіі, няма матываў забяспечваць Беларусь танным палівам або будаваць на яе тэрыторыі дарагую інфраструктуру накшталт магістральных газаправодаў. З празаходнім кіраўніцтвам Украіны — адзінай іншай дзяржавы, якая злучае Расію з Еўропай, — расійская залежнасць ад Беларусі толькі расце. У такіх умовах зацікаўленасць Расіі ў саюзе з Беларуссю — чацвёрты фактар — відаць, павялічыцца. Гэта можа ўрэшце прымусіць Пуціна, стомленага ад перагавораў і спрэчак, пайсці на агрэсіўныя крокі супраць Лукашэнкі. Загнаны ў кут, Пуцін можа гэтым разам, напрыклад, зусім перакрыць газ Беларусі, палічыўшы, што Расія куды лягчэй перажыве страту даходаў ад экспарту паліва ў Еўропу, чым Лукашэнка — зімовыя маразы без газу і страту прыбыткаў ад транзіту. Сутыкнуўшыся з падобным масіраваным націскам, Лукашэнка, відаць, будзе вымушаны пайсці на цяснейшы саюз.

Два іншыя фактары — слабы нацыяналізм і хісткія дэмакратычныя асновы — даюць Лукашэнку магчымасць выбіраць стратэгіі, найбольш прыдатныя для дасягнення яго палітычных мэт або для захавання сваёй улады. Калі «расійскі выбар» выяўляецца праблематычным, многія беларусы дэманструюць гатоўнасць да змены вектара. Калі беларускі незалежны сацыялагічны інстытут правёў апытанне з мэтай высвятлення сімпатый беларусаў да Расіі і ЕС, 47 % рэспандэнтаў

аддалі перавагу Расіі, тады як 36 % — Еўрапейскаму Саюзу. Пры гэтым 60 % ухвалілі магчымае ўступленне Беларусі ў ЕС. Каб пераарыентавацца на Еўропу, аднак, Лукашэнку трэба пераканацца, што гэта прынясе большыя эканамічныя выгады, чым супрацоўніцтва з Расіяй; яшчэ істотней тое, што для гэтага яму давядзецца ўспрыняць дэмакратыю. Улічваючы яго жорсткую палітыку і слабую беларускую эканоміку, пераход да дэмакратыі, хутчэй за ўсё, выкліча крах лукашэнкаўскага рэжыму. Таму, калі ўзяць пад увагу ўсе чатыры фактары, адмова Лукашэнкі ад яго цяперашняга курсу, які вядзе Беларусь «назад у СССР», выглядае малаімавернай.

Гэтае даследаванне ўзнімае важныя пытанні аб суверэнітэце і іерархіі ў міжнароднай сістэме, а таксама аб ролі, якую ў гэтых узаемаадносінах адыгрываюць слабыя дзяржавы. Пералічаныя тут фактары могуць быць тыповымі для тых выпадкаў, калі лідэры слабых дзяржаў вырашаюць, да якога тыпу ўзаемаадносін з магутнай дзяржавай ім імкнуцца. Можна зрабіць выснову, што, па-першае, слабая дзяржава, звязаная з больш магутнай спецыфічнымі актывамі, хутчэй за ўсё захавае цесныя эканамічныя ўзаемаадносіны з ёю ўжо толькі з той прычыны, што такія сувязі занадта складана і дорага разарваць ды замяніць нейкімі іншымі. Хоць лідэр слабой дзяржавы можа палічыць за лепшае ахвяраваць некаторай часткай суверэнітэту ў абмен на эканамічныя бонусы, у яго таксама застаецца магчымасць скарыстаць наяўныя спецыфічныя актывы для аказання сустрэчнага ціску на магутную дзяржаву з мэтай атрымання ад яе саступак і, як вынік, змяншэння залежнасці. У сваю чаргу (хоць мы яшчэ і не назіралі гэтага на прыкладзе расійска-беларускага саюза), калі магутная дзяржава вырашыць ужыць усю сваю моц супраць слабой, сустрэчны націск не ўратуе партнёра ад цеснага саюза, а то і поўнага аб'яднання ў фармаце імперыі. Па-другое, нормы і традыцыі, якія спавядаюць жыхары дзяржавы і яе лідэры, вызначаюць як саму магчымасць правядзення палітыкі здачы суверэнітэту, так і выбар дзяржавы, на карысць якой такая палітыка будзе праводзіцца. Калі дэмакратычныя асновы сярод насельніцтва і кіраўніцтва хісткія, то цалкам магчымы зварот да аўтарытарызму. Калі лідэры становяцца на такі шлях, яны могуць выключыць магчымасць выбару альтэрнатыўных варыянтаў — напрыклад, далучэння да ЕС. Выбіраючы паміж гарантыямі палітычнага выжывання і прывіднымі дэмакратычнымі перспектывамі, такія лідэры аддадуць перавагу першаму варыянту.

Аналагічным чынам некаторыя народы менш схільныя да нацыяналізму, чым іншыя. Выдатным прыкладам, процілеглым у гэтым сэнсе Беларусі, на постсавецкай прасторы служаць тры балтыйскія дзяржавы. У гэтых паўночных дзяржавах, таксама цесна звязаных спецыфічнымі актывамі з Расіяй, нацыяналізм у сукупнасці з моцнымі антырускімі настроямі робіць любую прарасійскую палітыку самазабойчай. Сацыялагічныя апытанні, а таксама поспех на выбарах нацыяналістычных партый выразна сведчаць пра тое, наколькі ўнутранае становішча ў гэтых краінах адрозніваецца ад беларускага.

Расійская зацікаўленасць у эканамічным панаванні таксама можа разглядац-

ца ў кантэксце інтарэсаў вялікай дзяржавы. Хоць я кранаю ў некаторых аспектах расійскі інтарэс, я разглядаю яго як знешні фактар, які часткова ўплывае на Лукашэнкавы дзеянні. Тым не менш, гэты артыкул адкрывае шлях далейшым даследаванням прычын, паводле якіх магутныя дзяржавы імкнуцца да панавання[17]. Для гэтага можна скарыстаць тую самую аналітычную глебу — спецыфічныя актывы, мясцовыя нормы і палітычныя фактары. Нарэшце, разгледжаны выпадак паказвае, што, па-першае, палітычныя нормы не могуць у поўнай меры вызначаць міждзяржаўных узаемаадносінаў, прынамсі ў некаторых выпадках, а па-другое, што рацыянальны падыход з поспехам можна скарыстаць нават там, дзе, як уяўляецца, пераважаюць пытанні ідэнтычнасці.

*З амерыканскай пераклаў з невялікімі скарачэннямі Сяргей Петрыкевіч паводле:* Foreign Policy Analysis. 2006. № 6. P. 117—136.

[17] Іншыя навукоўцы даследавалі выпадкі, у якіх вялікія дзяржавы імкнуліся да поўнай імперыі або саюза, у аснове якога ляжалі меркаванні бяспекі. Аднак мала было зроблена для апісання эканамічных саюзаў і даследавання матэрыяльных, нарматыўных ды іншых палітычных фактараў, што ляжалі ў іх аснове.

## ⌘ ЛІТАРАТУРА

АНДРЭЙ ДЫНЬКО

# Пасажыры танных ліній

*Пасажыры танных авіяліній*
*стаяць натоўпам перад гейтам*
*трымаюць ношаныя сумкі*
*і надарваныя пакеты.*
*Майкі засьціраныя*
*штаны палінялі*
*валасы перапаленыя фарбай.*
*Тут няма дасканалых.*
*У хлопцаў на танных лініях*
*мускулы ня граюць пад кашулямі*
*біцэпсы не рэльефныя*
*пазногці абчыканыя*
*мяшкі пад вачыма*
*а адзін увогуле ў поліэстэрным спартовым касьцюме*
*валасы нямытыя і непрычасаныя*
*такіх у Расеі называюць людзьмі паўднёвай нацыянальнасьці.*
*У дзяўчат на танных лініях*
*колеры вопраткі не дапасаваныя*
*скура абсыпаная*
*пазногці ў колерах агню.*
*Дзеці з танных ліній*
*верашчаць*
*паўзуць на абдзёртыя жоўтыя крэслы*
*падаюць*
*вырываюцца ад мацярок.*
*У бацькоў зямлістыя твары*
*бацькі сутуляцца*
*прычоскі танныя*

***Андрэй Дынько** — паэт.*

*пярсьцёнкі срэбныя*
*пацеркі плястмасавыя*
*шмінка на вуснах.*
*Яшчэ пасадку не абвясьцілі*
*а яны ўжо пруцца да гейту*
*падціскаюцца*
*гудуць.*
*А раптам месцаў забракне?*
*месцаў у самалёце?*
*месцаў працы?*
*месца на зямлі?*
*Старыя пасьпешліва даядаюць бутэрброды,*
*Пара маладых мэнэджэраў робіць выгляд*
*што яны не такія як усе тут.*
*Усё ў іх наперадзе*
*яны яшчэ палятаюць дарагімі рэйсамі.*
*Самыя спакойныя пстрыкаюць у гульні на сваіх мабільніках.*
*Пасажыр які выкупіў прыярытэт фліртуе*
*з цынічнымі стуардэсамі-бляндынкамі.*
*«Як вас зваць?»*
*а тыя жуюць жуйку і закатваюць вочкі*
*«Алеся. Энд Ай’м Мэлані».*
*Пілоты танных ліній*
*не здымаюць акуляраў ад сонца*
*нібы таксісты прывакзальныя.*
*Твары без вачэй*
*мулаты*
*ніякіх прыкметаў*
*грамадзяне «Раянэйру».*
*Пасажыры танных ліній*
*бягуць да трапу*
*нібы да вагону*
*прыгараднай электрычкі.*
*Месцы не пазначаныя,*
*месца на багажных паліцах бракуе.*
*Рукі дрыжаць пасьля цяжкіх пакетаў.*
*Гастарбайтэр шырокай даланёй прыціскае мабільнік да вуха*
*«Сынку, я званю табе з самалёта*
*праз дзьве гадзіны мы пабачымся, сынку…»*

*Франкфурт-Хан,*
*аэрапорт кампаніі «Раянэйр» на месцы былой вайсковай базы,*
*сярод пакінутых бункераў з-пад ракетаў за атамнымі*
*боегалоўкамі*

## ЛІТАРАТУРА

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

# Дом творчасьці

## Выбраныя месцы перапіскі з фрэндамі

* * *

*Эх, скручу я дудку!*
*Такое зайграю...*
*А лепей ня буду.*
*І табе ня раю.*

* * *

*Я бачыў сон на кургане:*
*курган на мне і сьніць мяне,*
*а матылькі Чжуана-Цзы*
*сьмяюцца з гэтае шызы.*

***Андрэй Хадановіч** — паэт. Як паведамляе беларуская «Вікіпэдыя», паэзія А. Хадановіча — прыкметная зьява сучаснай беларускай літаратуры, і адрозьніваецца багацьцем і разнастайнасьцю мовы, стылістычнымі экспэрымэнтамі, спалучэньнем дасягненьняў усходнееўрапейскай «кніжнай» паэзіі з элемэнтамі «нізкай» культуры (рок, рэп, гарадзкое прастамоўе).*

## СОН РОЗУМУ...

*Хто сьніў, быццам дзевак клеіў*
*па ўсіх* nightclub*’ах сталіцы...*
*Я сьніў, што я Мендзялееў,*
*якому сьніцца табліца.*

*Хто сьніць, быццам ён — газон,*
*і дзеўка ў спадніцы пройдзе...*
*Мне сьніцца, быццам я — сон,*
*які тлумачаць па Фройдзе.*

* * *

*Ня дай Гасподзь мне страціць клёк.*
*Не, лепей торба і кіёк...*
(пер. Р. Барадуліна)

*Ня дай мне, Божа, страціць розум.*
*Лепш быць галодным і цьвярозым!*

*Ня дай Гасподзь, каб дах мне зьнесла.*
*Лепш электрычнае ўжо крэсла!*

*Ня дай мне, Божа, зьехаць з глузду.*
*Ўжо лепей кій... шары і лузу!*

*Ня дай Гасподзь мне стаць вар’ятам.*
*Лепш аффтара хай пояць йадам!*

*Ня дай мне, Божа, параноі.*
*Лепш кляфэліну мне ў сьпіртное!*

*Ня дай Гасподзь шызафрэніі.*
*Лепш сам башкой аб камяні я!*

*Ня дай мне, Божа, у Навінкі.*
*Лепш маладым памру ад сьвінкі!*

*Ня дай Гасподзь быць звар’яцелым —*
*хай галава сябруе зь целам!*

# ОДА ПАМЫЛЦЫ

*Як сьвежых вуснаў без ухмылкі,*
*Без граматычнае памылкі*
*Я мовы рускай не люблю.*
(пер. А. Куляшова)

*Гаворыш беларускай хіба?*
*А дзе твая памылка, хіба?*

*Чым багдановічаў і жылак*
*чытаць — лепш нарабі памылак!*

*Хутчэй пазбаўся ад граматык,*
*нашто нам правілы? Зашмат іх!*

*Не зазірай так часта ў слоўнік,*
*нашто нам слоўнікі? Ўсё зло ў іх!*

*Хто без памылак ставіць націск —*
*ня наш, не беларускі нацык!*

*Хто піша правільна апостраф —*
*адправіць на бязьлюдны востраў!*

*Хто пагарджае мяккім знакам —*
*даць Нобэль, разам з Пастэрнакам!*

*Людзей бяз хібаў вымаўленьня*
*паставіць вораг на калені,*

*а для сапраўднага змаганьня*
*патрэбны талент заіканьня!*

*Мой дзядзька — самых чэсных правіл,*
*а ўсё таму, што ён картавіў,*

*і кожнае гучала слова*
*абавязкова памылкова!*

*Ня трэба акаць, шмат ня якай —*
*ніхто табе ня скажа «дзякуй»!*

*Няхай ніколі цьвёрдым «чэ»*
*тваю душу не апячэ!*

*Хай мяккім будзе тваё «эрь»,*
*як у часы БССРЬ...*

*Каб забівала твая мова*
*манкуртаў вусна і пісьмова!*

*Каб ворагам — пісьмова й вусна! —*
*было агідна, брыдка, гнюсна!*

## ДРУЖБА НАРОДАЎ

*Спытаўся ў красуні над Віслаю:*
*«Ці не пра мяне Вы марыце?»*
*І пыска ў яе стала кіслаю,*
*як яблыкі ў супэрмаркеце.*

*Глядзіць пашпартысткаю ў РАЎСе.*
*Распусьціўш хвост — аскубе:*
*«І як жа ты так здагадаўся,*
*што не пра цябе?»*

* * *

*Усе, хто нас кахае ў снах,*
*наяве пасылаюць нах!*

* * *

*Адарвалі мішку лапу,*
*запіхнулі пад канапу.*
*Усё адно яго ня кіну:*
*у ім заначка какаіну!*

## ДЗЬВЕ ЗАГАДКІ ПРА АДНАГО ГЕРОЯ

*1.*
*Узімку і ўлетку*
*кахае німфэтку.*

*2.*
*Улетку і ўзімку*
*зь німфэткай ў абдымку.*

## ДОМ ТВОРЧАСЬЦІ

*Толькі ў роднай кватэры*
*напішу (я) бэстсэлер!*
У. Арлоў

*Мой родны кут, як ты мне мілы!*
*Або я тут, або мне вілы!*
Я. Колас

*Змаганьне за жытло дастала!*
*Не напішу вам «Капітала»!*
К. Маркс

*Выселіце з дома —*
*не пішу пра Тома!*
М. Твэн

*Толькі ў сваёй роднай хаце*
*напішу аб Гаяваце!*
Г. Лангфэла

*Пра піяністку — мне ня ўсё адно! —*
*не напішу бяз роднага фано!*
Э. Елінэк

*Пра Пецьку Пустату і вочы Анкі*
*не напішу бяз роднае тачанкі!*
В. Пялевін

*Яшчэ б разок мне Болдзінскую восень —*
*дажыў бы і да лічбы трыццаць восем!*
А. Пушкін

*Закручу сюжэт (чытач прыпухне),*
*посуд мыючы на ЎЛАСНАЙ кухні!*
А. Крысьці

*Зь любімай норкі? Што ж вы робіце?!*
*Зраблю вас гоблінамі ў «Хобіце»!*
Дж. Р. Р. Толкіен

*Калі разбурана гняздо,*
*не дачакаесься Гадо!*
С. Бэкет

*Няма таго, што раньш было…*
*Пісьменьнік, барані жытло!*
М. Багдановіч

*Як апісаць на чужой тэрыторыі*
*дзесяць вякоў беларускай гісторыі?*
Г. Сагановіч

*Добра выводзіць рускія літары*
*у ВКЛаўскім горадзе Піцеры!*
Ф. Скарына

*Прыемна, калі дом твой — не дурдом!*
Кен Кізі.
«Над зязюльчыным гняздом»

*Ни строчки*
*без бочки!*
Дыяген

*Бяз роднага татамі*
*ні кніжкі!*
Муракамі

*Бяз роднай хаты не прышыць і гузіка,*
*ня тое што — Бябешку і Арбузіка!*
Э. Скобелеў

*Бяз родных ніў, бяз роднай хаты*
*пішу я толькі кампраматы!*
Ананім

# КАЛЯДЫ Ў ДОМЕ ЛІТАРАТАРА

*Я паэт, завуся Броўка.*
*Ад мяне вам — паўлітроўка!*

*Я паэт, завуць Пэтрарка.*
*Ад мяне вам — іншамарка!*

*Я паэт, завуся Дантэ.*
*Мой прэзэнт зь мяшка дастаньце.*

*Я паэт, завуся Блок.*
*Ад мяне вам гэты блог.*

*Я паэт, завуся Шэлі.*
*Ад мяне вам вэрмішэлі.*

*Я паэт Фэрлінгеці.*
*Ад мяне вам спагеці.*

*Я паэтка, Зоська Верас.*
*Ад мяне вам смачны херас.*

*Я паэт, Пашкевіч Алаіза.*
*Ад мяне вам шэнгенская віза.*

*Я паэт, завуся Глобус.*
*Ад мяне ў прэзэнт аўтобус.*

*Я паэт, завуся Тарас.*
*Ад мяне ў прэзэнт «Ікарус».*

*Я паэт, завуць Пістончык.*
*Ад мяне вам рыфмы кончык.*

*Я паэт, завуся Скобла.*
*Ад мяне вам — піва й вобла!*

*Я паэт, завуся Быкаў.*
*Многа выхаваў я фрыкаў.*

*Я паэт Ня-Памятаю-Хто,*
*ад мяне вам конь у паліто!*

*— Я паэт, завуся Колас,*
*я цябе аблаю ўголас!*
*— Вельмі добра, пан Якуб,*
*бо маглі і выбіць зуб!*

## ЗА БЕЛАРУСЬ!

*Мы вялікія артысты, кожны зорка і вандроўнік,*
*наш матыўчык прыліпае, нібы муха цэцэ.*
*На канцэрце для даярак нас пачуе ўвесь кароўнік,*
*і назаўтра ўся краіна патанае ў малацэ!*

*Вецер ласкава казыча нашы майтачкі ў палоску,*
*і на ўсіх пагранзаставах б'е трывогу палітрук.*
*Як казаў паэт Гамэр Вэнэры Мілоскай,*
*я ня бачу,*
*я ня бачу,*
*я ня бачу вашых рук!*

Чуваць зашыбісь нас,
відаць зашыбісь нас!
Выклікай на біс нас,
рабі з нас
бізнэс!

*Нашы постэры і дыскі разыходзяцца са сьвістам,*
*нас на ролі партызанаў запрашаюць у кіно.*
*Нам зялёныя з чырвоным шыюць тапачкі стылісты,*
*нам паэты-гімнапісцы пішуць лоўка і даўно!*

*Мы гучым у вашых сэрцах — ад народзін да паховін!*
*Альпіністы пад Лагойскам, не вярнуўшыся з гары,*
*паміраюць з нашай песьняй... Як казаў паэт Бэтховэн,*
*я ня чую вашых вопле... вашых воплескаў, сябры!*

Чуваць зашыбісь нас,
відаць зашыбісь нас!
Выклікай на біс нас,
рабі з нас
бізнэс!

*Пець бяз голасу і слыху — цяжка, самі паспрабуйце!*
*Гэта як мянтам — раманы, але ж пішуцца тамы!*
*Вашы стомленыя пальцы нас намацваюць на пульце…*
*Ўсё бліжэй да першай кнопкі… Добры вечар, вось і мы!*

*Хай зайздросьнікі гавораць, што ня тыя дупы ліжам,*
*што тры чвэрці нашых зорак па-ангельску зараўлі…*
*Гэта нашая фанэра пралятае над Парыжам,*
*каб вярнуцца на Палесьсе, як увесну жураўлі!*

Чуваць зашыбісь нас,
відаць зашыбісь нас!
Выклікай на біс нас,
рабі з нас
бізнэс!

# ЭСЭІСТЫКА

НОАМ ХОМСКІ

# Як разумець сістэму ўлады

## Раздзел 6

(…)

### КІБУЦНЫ ЭКСПЕРЫМЕНТ

**Мужчына:** Як можна прымаць рашэнні дэмакратычным шляхам і без бюракратыі? Я не ведаю, як вялікая маса людзей можа браць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы ўсіх рашэнняў, неабходных у гэткім складаным сучасным грамадстве.

**Хомскі:** І я не разумею, як можна. Мяркую, людзям у кожным разе давядзецца дэлегаваць частку адказнасці. Але пытанне ў тым, дзе ўрэшце знаходзіцца ўлада? Ад самага пачатку мадэрных палітычных рэвалюцый у XVII і XVIII стагоддзях заўсёды прызнавалася, што народ мусіць быць кімсьці рэпрэзентаваны — дык вось, хто нас будзе рэпрэзентаваць, «мальцы з нашага раёну» ці «мудрацы, лепшыя за нас»?

Уявіце, што мы жывем у нейкай грамадзе і захацелі пра нешта дамовіцца з грамадою, што жыве цераз дарогу. Калі нашыя супольнасці дастаткова вялікія, *усе разам* мы не зможам перамаўляцца з *усімі тымі*, цераз дарогу. Нам давядзецца дэлегаваць правы весці перамовы прадстаўнікам. Тады пытанне: хто мае ўладу ў выніку зацвярджаць гэтыя рашэнні? Калі ідзецца аб дэмакратыі, гэтай уладай мусіць валодаць насельніцтва — не фармальна, а рэальна. Гэта значыць, што прадстаўнікоў можна адклікаць, замяніць на другіх, яны адказныя перад

***Ноам Хомскі** — сусьветна вядомы лінгвіст, прафэсар Масачусэцкага тэхналягічнага інстытуту. Апрача гэтага, шырока вядомы ў сьвеце як левы інтэлектуал і палітычны нонканфарміст. Ніжэй увазе беларускага чытача прапануюцца фрагмэнты яго папулярнай кнігі «Understanding Power: The Indispensable Chomsky», якая вытрымала нямала перавыданьняў.*

грамадою. Насамрэч, павінна мець месца пастаянная ратацыя, каб палітычны ўдзел стаў часткай штодзённага жыцця.

Але я згодны, што наўрад ці магчыма штораз збіраць вялікія масы людзей для вырашэння праблем — гэта нерэальна і бессэнсоўна. Для канкрэтных спраў патрэбныя камітэты, якія вывучалі б стан рэчаў і давалі справаздачы. Аднак рэальная праблема — дзе, у чыіх руках знаходзіцца ўлада?

**Мужчына:** Мадэль, якую вы прапануеце, здаецца, блізкая да кібуцнай[1].

**Хомскі:** Так, кібуцы сапраўды блізкія да поўнай дэмакратыі. Пэўны час я жыў у адным кібуцы і планаваў там застацца менавіта з гэтай прычыны. З другога боку, жыццё бруіць парадоксамі, і факт ёсць фактам: кібуцы вельмі дэмакратычныя ўнутры, аднак у іх ёсць і шмат жахліва брыдкіх рысаў. Аднойчы я ўсвядоміў іх і з цягам часу ўсё больш разумею, што меў рацыю.

Па-першае, кібуцы пакутуюць на скрайні расізм: не думаю, што ў якім-небудзь ізраільскім кібуцы вы знойдзеце хоць аднаго араба. Нямала арабаў не былі туды дапушчаныя. Так, калі кібуцнік з арабкай ці кібуцніца з арабам уступаюць у шлюб, яны звычайна перабіраюцца на жыхарства ў арабскую вёску. Іншая дужа непрыемная рыса ў кібуцах, пра якую я даведаўся зусім нядаўна, хоць яна праяўляецца ўжо шмат гадоў, — іх дачыненні з дзяржавай. Тое, што кібуцы — гаспадаркі эканамічна паспяховыя, часткова тлумачыцца атрыманнем імі істотнай грашовай дапамогі ад дзяржавы. Наўзамен афіцэрскія кадры ў элітных вайсковых адзінках Дзяржавы Ізраіль рэкрутуюцца пераважна з кібуцнікаў. Так што калі вы паглядзіце, хто ідзе ў лётныя школы і рознага кшталту спецназ — гэта амаль напэўна будуць дзеці кібуцнікаў. Тут мае месца своеасаблівы гешэфт: дзяржава фундуе кібуцы, а яны пастаўляюць ёй прэтарыянскую гвардыю. Больш за тое, я мяркую, што часткова гэтая гвардыя пастаўляецца ў выніку кібуцнай адукацыі. І тут адбываюцца працэсы, якія прыхільнікі лібертарных ідэй (і я ў тым ліку) лічаць вельмі небяспечнымі.

Разумееце, у лібертарнай структуры кібуца ёсць нешта дужа аўтарытарнае — я назіраў гэта, калі там жыў. Вялізны ціск з боку групы прымушае цябе падпарадкоўвацца, — не, не сілай, але ціск насамрэч магутны. *Як* гэта працуе, я ніколі дарэшты не ведаў, але вы адчуваеце працэс у дзеянні. Існуе моцны страх выключэння — не тое каб цябе не пускалі ў сталоўку ці куды-небудзь яшчэ, а проста ты неяк перастаеш быць часткай групы. Гэта нагадвае выключэнне з сям'і. Уявіце, што вы — маленькі хлопчык і ваша сям'я вас пазбягае: вам дазваляюць сядзець за сталом, але з вамі не гавораць. Гэта жахлівае выпрабаванне для асобы, вы проста не зможаце гэтага вынесці. Дык вось, нешта падобнае адбываецца ў гэтых супольнасцях.

Я ніколі не чуў, каб нехта вывучаў гэты феномен, але, калі вы прасочыце, як растуць дзеці ў кібуцах, вы зразумееце, *чаму* яны збіраюцца ісці ў вайсковую

[1] Кібуцы — калектыўныя сельскагаспадарчыя суполкі ў Ізраілі. *(Тут і далей заўв. рэдактара амерыканскага выд., калі не пазначана іншае.)*

паліцыю, лётную школу ці спецназ. У кібуцах навязваецца інтэнсіўнае «мужчынскае выхаванне» — лічыцца, што, калі ты не здольны прайсці праз курсы марской пяхоты і стаць «крутым», ты нічога не варты. Яно пачынаецца з маленства, і думаю, што дзеці атрымліваюць балючыя траўмы, калі не адпавядаюць нейкім крытэрам: псіхалагічна гэта вельмі цяжка.

Вынікі ўражваюць. Напрыклад, у Ізраілі дзейнічае пратэстны рух людзей, якія не хочуць служыць на акупаваных тэрыторыях, пад назвай «Еш гвуль»[2]. Аднак у гэтым руху няма нікога з выхаванцаў кібуцаў, рух там папросту не прадстаўлены. Кібуцныя хлопцы таксама маюць рэпутацыю «добрых жаўнераў» — гэта, як вы разумееце, не абавязкова «добрыя людзі». «Добры жаўнер» значыць «рабі, што загадана». Усе гэтыя рэчы — іншая грань таго, пра што я гаварыў, і ўсё адбываецца без сілы або улады, а пад уціскам надзвычай магутнага канфармізму.

Кібуц, у якім я жыў, быў населены даволі адукаванымі людзьмі — уцекачамі з Германіі, многія з іх мелі універсітэцкія ступені і г. д. — але ўсе кібуцнікі ва ўсенькім кібуцы чыталі адну і тую ж газету. І немагчыма было сабе ўявіць, што нехта стане чытаць другую газету — не тое каб гэта было забаронена законам, але становішча было такое: ты — член *гэтай* галіны кібуцнага руху, значыць, вось газета, якую ты чытаеш.

**Мужчына:** Тады ці магчыма накрэсліць грамадскі дагавор, які ў сваёй існце адпавядаў бы інтарэсам супольнасці, але ў той жа час прызнаваў каштоўнасць асобных людзей? Мне здаецца, што паміж двума полюсамі заўсёды існуе вельмі моцнае разыходжанне.

**Хомскі:** Дзе разыходжанне, паміж якімі полюсамі?

**Мужчына:** Паміж вартасцямі калектыву і вартасцямі індывіда.

**Хомскі:** Не думаю, што тут абавязкова ёсць нейкае разыходжанне. Мне здаецца, што для чалавека жыццёва важнай з’яўляецца прыналежнасць да дзейных супольнасцей — так што калі ўтварыць сацыяльныя стасункі, у якіх людзі знаходзяць асалоду, будзе ўсё ў парадку, без ніякай супярэчнасці.

Глядзіце, насамрэч вы не здолееце даведацца, якія праблемы ўзнікаюць унутры групы людзей, пакуль вы не праведзяце эксперыменту з гэтай групай. Гэта як у фізіцы: нельга проста сядзець і разважаць, якім быў бы свет пры такіх ці іншых варунках, трэба эксперыментаваць і атрымліваць веды пра сапраўдны стан рэчаў. Адна з рэчаў, якую, мяркую, вы засвоілі на прыкладзе кібуцнага эксперыменту — сапраўды магчыма пабудаваць цалкам жыццяздольныя і паспяховыя дэмакратычныя структуры, ды ўсё-ткі іх будуць суправаджаць праблемныя моманты. Адна з праблем, з якімі сутыкнуцца людзі, — эфект ціску групы на індывіда, ад якога чакаецца паслухмянасць.

Напэўна, кожны ведае пра гэта на прыкладзе сям’і. Жыццё ў сям’і — адна з найважнейшых частак чалавечага існавання, вы не прамяняеце яе ні на што іншае. З другога боку, ні для кога не навіна, што ў сям’і непазбежна паўстаюць прабле-

[2] «Ёсць мяжа» *(іўр.)*

мы. Сур'ёзная праблема, якая становіцца амаль паталагічнай, калі ўзнікае ў згуртаванай групе, — выключэнне з супольнасці, і каб яго пазбегнуць, вы часта мусіце рабіць непрыемныя для вас рэчы. Але сутыкненне з падобнымі клопатамі — гэта проста частка жыцця.

Папраўдзе, я не вялікі прыхільнік Маркса, але адзін з яго каментарыяў здаецца тут дарэчным. Недзе ён сказаў: сацыялізм з'яўляецца спробай развязаць *жывёльныя* праблемы чалавека, а пасля развязання жывёльных праблем мы зможам даць рады *чалавечым* праблемам — але ў задачы сацыялізму не ўваходзіць развязанне чалавечых праблем. Сацыялізм — намаганне давесці вас да ўзроўню, калі вы самі зможаце *даць рады* чалавечым праблемам. Мяркую, што праблема, што вас хвалюе, — якраз чалавечая. Што ж, людзі — дужа складаныя стварэнні і вынаходзяць тысячы шляхоў самакатавання ў міжасабовых зносінах. Усе ведаюць гэта і без мыльных опер.

## «АНАРХІЗМ» І «ЛІБЕРТАРЫЗМ»

**Жанчына:** Прафесар Хомскі, трохі аб іншым… Ёсць значэнне слова «анархія», якое розніцца ад таго, што вы часта ўжываеце, — «анархія» можа азначаць «хаос».

**Хомскі:** Так, гэта тыповы трук, наданне якому-небудзь тэрміну другога значэння з мэтай распачаць ідэалагічную вайну. Гэта падобна да таго, як назваць бюракратыю савецкага тыпу «сацыялізмам». Я маю на ўвазе, што «хаос» — адно з значэнняў слова «анархія», але яно зусім не дарэчнае ў кантэксце сацыялагічнага мыслення. Анархія як сацыяльная філасофія ніколі не азначала «хаосу» — насамрэч анархісты, як правіла, вераць у высокаарганізаванае грамадства, якое дэмакратычным чынам парадкуе сябе «знізу».

**Жанчына:** Мне здаецца, што ў якасці сацыяльнай сістэмы анархізм мае такі глыбокі сэнс, што некаму было неабходна дыскрэдытаваць само слова, выключыць яго з чалавечай мовы і мыслення, каб вы адчувалі страх адно пры яго вымаўленні.

**Хомскі:** Так, анархізм заўсёды разглядаўся як чорнае ліха людзьмі, надзеленымі ўладай. Калі Вудра Вільсан абвясціў пра «чырвоную пагрозу»[3], улады жорстка абыходзіліся з сацыялістамі, але больш за ўсіх дасталося анархістам.

Ідэя таго, што людзі могуць быць свабоднымі, сама па сабе дужа палохае носьбітаў улады. Менавіта таму 1960-я гады маюць такую кепскую рэпутацыю. Пра 1960-я існуюць багатыя літаратурныя крыніцы, створаныя пераважна інтэлектуаламі, бо гэта людзі, якія пішуць кнігі. Натуральна, анархізм кепска ўспрымаецца — таму што яны *ненавідзелі* яго. Вы маглі назіраць гэта ў факультэцкіх клубах у той час: выкладчыкі проста атрымалі траўму ад таго, што студэнты раптам пачалі задаваць пытанні, а не проста запісваць лекцыі. Сапраўды, калі

[3] Кампанія 1919 г. супраць «падрыўных элементаў» у ЗША.

такія людзі, як Алан Блум[4] пішуць, што ў 1960-я гг. бурыліся падмуркі цывілізацыі, са свайго гледзішча яны маюць рацыю: так, бурыліся. Бо падмуркі заключаліся ў наступным: «Я вялікі прафесар, я паведамляю вам, што трэба адказваць, што думаць, а вы натуеце мае словы ў сшытках і паўтараеце іх». Калі вы ўзнімаецеся і кажаце: «Не разумею, чаму я мушу чытаць Платона; па-мойму, гэта не мае сэнсу», вашыя словы, вядома, разбуралі падмуркі цывілізацыі. Але, магчыма, вашае пытанне было абгрунтаванае — мноства філосафаў задавалі яго, дык чаму б яму не быць абгрунтаваным?

Як у кожным масавым народным руху, у руху 1960-х прысутнічала шмат бурапены, але менавіта тое шалупінне з перыферыі было ўпісанае ў гісторыю. Асноўныя рэчы былі выкрасленыя з гісторыі акурат таму, што яны мелі лібертарны характар, а для людзей пры ўладзе няма нічога больш страшнага.

**Мужчына:** У чым дакладна заключаецца розніца паміж «лібертарным» і «анархічным»?

**Хомскі:** Ды ў існасці няма розніцы. Але разумееце, у ЗША «лібертарыянства» набыло асаблівае значэнне: тут яно азначае распеsразаны капіталізм. Еўрапейская лібертарная традыцыя заўсёды процістаяла такой трактоўцы, у Еўропе кожны анархіст з’яўляецца сацыялістам. Рэч у тым, што, калі вы маеце распеsразаны капіталізм, у вас ёсць усе вагары ўлады: ваша ўлада *абсалютная*.

Калі капітал кантралюецца прыватнымі асобамі, то людзі гатовыя здаваць сябе ў арэнду, каб выжыць. Вы можаце запярэчыць: «яны здаюць сябе ў арэнду добраахвотна, у рамках вольнага дагавору» — але гэта смеху вартае пярэчанне. Калі вам прапануюць выбар «рабі, што я табе кажу, альбо здыхай», гэта не выбар. Фактычна, гэта формула гандлю рабамі ў больш ці менш цывілізаваны час, напрыклад, у XVIII—XIX стагоддзях.

Амерыканскі варыянт «лібертарыянства» — гэта аберацыя, але ніхто не ўспрымае аблуду ўсур’ёз. Усе разумеюць, што грамадства, пабудаванае на лібертарных прынцыпах па-амерыканску, разбурыла б сябе за тры хвіліны. Адзіная прычына, з якой людзі робяць выгляд, што ўспрымаюць гэты варыянт усур’ёз — магчымасць яго выкарыстання ў якасці зброі. Такім чынам, калі хто-небудзь выступае за нейкі падатак, вы можаце сказаць: «Не, я лібертарыянец, я супраць гэтага падатку» — але, вядома, вы ўсё-ткі за тое, каб урад будаваў дарогі, падтрымліваў школы, забіваў лівійцаў і ўсё такое.

Апрача таго, ёсць паслядоўныя лібертарыянцы, такія як Мюрэй Ротбард[5] — і калі вы пачытаеце пра свет, які яны апісваюць, вам стане страшна, настолькі ён поўны нянавісці. Ніхто не захоча жыць у ім. Гэта свет, дзе няма дарог, бо няма прычын, з якіх вы павінны супрацоўнічаць з іншымі, каб будаваць дарогі, якімі не збіраецеся карыстацца. Калі вам патрэбная дарога, вы збіраецеся разам з купкай іншых людзей, што мяркуюць ёй карыстацца, і будуеце яе, а потым спаганя-

[4] Аўтар кнігі «Closing of the American Mind» (1987) — «Закрытасць амерыканскага розуму».

[5] Амерыканскі навуковец.

еце грошы за яе карыстанне. Калі вам не падабаюцца выхлапы чужога аўтамабіля, вы цягнеце ўладальніка ў суд і атрымліваеце з яго грошы. Хто захоча жыць у падобным свеце, пабудаваным на нянавісці?

Так што ўсе гэтыя ідэі не вартыя размовы. Па-першае, свет амерыканскіх лібертарыянцаў не праіснаваў бы і пяці хвілін — а калі б і праіснаваў, адзінае, чаго б вам хацелася, гэта ўцячы з яго ці забіць сябе. Аднак гэта чыста амерыканская аберацыя, не вельмі сур’ёзная.

## АКРЭСЛІЦЬ ПОГЛЯДЫ

**Мужчына:** Часта здаецца, што вы ўхіляецеся ад выказвання канкрэтных поглядаў на анархісцкае грамадства і не даяце парадаў, як яго пабудаваць. Ці не лічыце вы, што важна акрэсліць свае погляды хаця б актывістам — паспрабаваць давесці да людзей рэальны план на будучыню, які даў бы ім надзею і энергію для працягу барацьбы? Цікава, чаму вы не робіце гэтага рэгулярна?

**Хомскі:** Ну, я не адчуваю, што ў імя руплівай працы для дасягнення зменаў у грамадстве трэба распрацаваць дэталёвы план будучага грамадства. Мне здаецца, што, каб чалавек працаваў дзеля пераменаў, ім павінны кіраваць пэўныя *прынцыпы*. Вы не можаце ведаць з усімі падрабязнасцямі — думаю, ніхто з нас не можа ведаць, — як гэтыя прынцыпы найлепшым чынам здольныя рэалізавацца ў дадзеным пункце складанай сістэмы, якой ёсць чалавечае грамадства. Але я не разумею, навошта праводзіць адрозненне паміж прынцыпамі і працоўным планам: імкнучыся ажыццявіць прынцыпы, вы працуеце. Можа, некаторыя назавуць такі падыход «рэфармізмам», каб прынізіць яго, але рэформы, калі рушаць у пэўным кірунку, могуць быць рэвалюцыйнымі. А каб скіроўваць іх у пэўным кірунку, вы не абавязаны ведаць, як будзе функцыянаваць грамадства будучыні: мяркую, вам дастаткова ўмець выказаць прынцыпы, якія вы хочаце бачыць рэалізаванымі ў гэтым грамадстве. Мы можам уявіць сабе *шмат* розных спосабаў, у якія будучае грамадства здолее рэалізаваць гэныя прынцыпы. Працуйце, каб дапамагчы людзям выпрабаваць розныя спосабы.

Напрыклад, у выпадку з рабочымі, якія бяруць кантроль над сваім працоўным месцам, ёсць маса розных шляхоў для захопу кантролю. Калі ніхто дакладна не ведае, якімі будуць вынікі шырокамаштабных сацыяльных змен, мяркую, нам трэба пакаштаваць пудынг, каб даведацца ягоны смак. Папраўдзе, я даволі кансерватыўна стаўлюся да грамадскіх змен: паколькі мы маем справу са складанымі сістэмамі, пра якія ніхто з нас не ведае дастаткова, абгрунтаваным крокам я лічу спробу нешта змяніць і паглядзець, што выйдзе. Калі рэформа працуе, можна ісці далей. Насамрэч, гэткі падыход дарэчны для ўсіх груп.

Такім чынам, я не адчуваю, што ведаю ў дэталях — а нават калі б і адчуваў, не прызнаўся б, — якімі будуць доўгатэрміновыя вынікі. На мой погляд, яны раскрыюцца ў працэсе зменаў. Аднак вось асноватворны прынцып, які б я хацеў данесці да людзей, — кожная форма ўлады, дамінацыі, іерархіі, кожная аўтарытарная структура павінна падаць доказы, што яна мае апраўданне — у яе няма і

не можа быць апрыёрнага апраўдання. Напрыклад, калі вы спыняеце сваё пяцігадовае дзіцё, якое хоча перайсці вуліцу, гэта аўтарытарнае дзеянне: яго трэба апраўдаць. У гэтым выпадку, мяркую, вы *здольныя* даць апраўданне. Але цяжар пошуку апраўданняў за кожны ўладны акт заўсёды ляжыць на асобе, якая гэты акт ажыццяўляе. Вось жа, у наш час структуры ўлады ў большасці выпадкаў не маюць ніякіх апраўданняў. Яны не здатныя даказаць, што дзейнічаюць у інтарэсах маралі, ці ў інтарэсах падначаленых, ці іншых людзей, ці дзеля аховы навакольнага асяроддзя, ці дзеля будучыні, ці дзеля грамадства… Яны проста імкнуцца захаваць пэўныя структуры ўлады і дамінацыі, захаваць рычагі ўлады ў руках пэўных высокапастаўленых асоб.

Так што, я думаю, дзе б вы ні сутыкнуліся з уладнымі адносінамі, гэтыя пытанні павінны быць зададзеныя — і асоба, якая прэтэндуе на легітымнасць сваёй улады, заўсёды нясе цяжар пошуку апраўданняў. Калі ж носьбіты ўлады не могуць апраўдаць яе, то яна нелегітымная і мусіць быць рэарганізаваная. Праўду кажучы, я не лічу анархізм чымсьці нашмат большым за гэты прынцып. Наколькі я бачу, ён адпавядае таму пункту гледжання, што людзі маюць права быць свабоднымі, а калі на гэтую свабоду накладаюцца абмежаванні, іх накладанне павінна абгрунтоўвацца. Часам абгрунтаванні магчымыя — але, вядома, анархісцкае ці якое-небудзь іншае вучэнне не дадуць вам адназначнага адказу на пытанне, *калі* яны магчымыя. Трэба разбіраць канкрэтныя выпадкі.

**Мужчына:** Аднак калі ўрэшце паўстане грамадства без стымулу зарабляць грошы і без акрэсленай улады, адкуль возьмецца прага руху наперад і росту?

**Хомскі:** Ну, прага «руху наперад» — мяркую, трэба спярша высветліць, *што* гэта значыць. Калі гэта значыць жаданне *больш вырабляць* — дык каму гэта трэба? Ці гэта менавіта тое, што трэба рабіць? Не відавочна. Насамрэч, шмат у якіх галінах якраз было б неабходна, каб прагі вырабляць больш не было. Людзей штурхаюць да некаторых жаданняў у нашай сістэме — а навошта? Чаму б не пакінуць іх у спакоі, каб яны проста былі шчаслівыя, займаліся іншымі справамі?

Любая «прага» мусіць быць унутраным станам. Паглядзіце на малых дзяцей: яны — творчыя істоты, нешта даследуюць, хочуць выпрабаваць новыя рэчы. Ну вось, напрыклад, чаму дзіцё пачынае хадзіць? Аднагадовае дзіцё цудоўна поўзае, можа дабрацца ў пакоі да чаго заўгодна з вялікай хуткасцю, гэтак хутка, што бацькі мусяць бегчы за ім, каб яно не нарабіла вэрхалу — і раптам дзіцё ўстае і пачынае хадзіць. Ходзіць яно жахліва: на кожным кроку падае, і калі сапраўды хоча куды-небудзь трапіць, то пачынае паўзці. Дык чаму дзеці пачынаюць хадзіць? Проста таму, што хочуць выпрабаваць нешта новае, так ужо ўладкаваныя людзі. Мы арганізаваныя так, што хочам новага, нават калі навінка неэфектыўная, нават калі яна шкодная, нават калі вы набіваеце гузакі, — я думаю, гэты працэс ніколі не спыняецца.

Людзі хочуць даследаваць тое, што вакол іх, выпрабаваць свае здольнасці дарэшты, ацаніць, што яны могуць. Але ў нашым грамадстве радасць творчай працы дадзена адчуць нямногім: артыстам, мастакам, навукоўцам. Калі вам выпала

шчасце адчуць радасць стварэння, то вы ведаеце, што яе нічога не заменіць. Неабавязкова адкрываць новую тэорыю адноснасці: асалоду можа атрымаць кожны, нават гледзячы на тое, што зрабілі *іншыя* людзі. Напрыклад, калі вы сочыце за простымі матэматычнымі доказамі накшталт тэарэмы Піфагора, якую вывучаюць у класе 10-й ступені[6] і ўрэшце разумееце, што ў ёй да чаго, гэта захапляльна — «О Божа, я ніколі не ведаў гэтага раней». Так, тут ёсць элемент творчасці, нават калі нехта іншы даказаў тэарэму 2000 гадоў таму.

Вы захапляецеся цудамі таго, што вам адкрываецца, і вы «адкрываеце» іх, нават калі нехта зрабіў гэта да вас. Калі вам удаецца дадаць хоць нешта да ўжо вядомага — гэта вельмі захапляльна. Мяркую, тое самае можна сказаць пра чалавека, які будуе лодку: то бок і я б хацеў аказацца здольным стварыць яе, дарма што не магу ўявіць сябе ў ролі будаўніка лодкі.

Маё меркаванне такое, што людзям варта было б жыць у грамадстве, дзе яны змогуць рэалізаваць свае ўнутраныя памкненні і развіць свае здольнасці свабодна. У сучасным свеце большасці людзей даступны толькі вельмі бедны выбар варыянтаў. Маю на ўвазе не толькі выбар *аб'ектыўна* даступных варыянтаў, але і *суб'ектыўна* даступныя опцыі — напрыклад, як людзям дазволена мысліць, як яны здольныя мысліць? Бо ёсць жа шматлікія спосабы мыслення, выдаленыя з нашага грамадства, — не таму, што мы не здатныя на іх, а таму, што паўсталі розныя перашкоды, якія замінаюць людзям мысліць у гэтыя спосабы. Сучасны стан — перадусім вынік індактрынацыі, і я маю на ўвазе не тое, што нехта чытае вам лекцыі. Тэлевізійныя перадачы, спартовыя спаборніцтвы, кожная грань культуры непрыкметна навязваюць вам уяўленне аб «правільным» жыцці і «правільным» наборы каштоўнасцей — гэта ўсё індактрынацыя.

Так што я лічу, што здарыцца павінна наступнае — людзям павінны быць паказаныя іншыя шляхі, як суб'ектыўна, так і канкрэтна. Маю на ўвазе, што вы можаце зрабіць нешта новае без вялікіх пакутаў. І я мяркую, гэта адна з галоўных мэт сацыялізму: дасягнуць пункту, у якім людзі здолеюць свабодна вырашаць для сябе, у чым заключаюцца іх патрэбы, а не проста мець «выбар», навязаны ім нейкай адвольнай сістэмай улады.

## СТВАРЭННЕ «ХАЦЕННЯ»

**Мужчына:** Але ж можна сказаць, што «мяняць і гандляваць» ёсць часткай чалавечай прыроды — што людзі ў істоце сваёй матэрыялісты і заўсёды будуць жадаць назапасіць больш і больш пры любой сацыяльнай арганізацыі?

**Хомскі:** Можна так *сказаць*, але няма прычын, каб у гэта *паверыць*. Уявіце сялянскія грамады, яны жылі тысячы гадоў без мены і гандлю — ці тыя людзі мелі іншую «чалавечую прыроду»? Ці зірніце на якую-небудзь звычайную сям'ю:

[6] У ЗША. *(Заўв. перакл.)*

ці сямейнікі вядуць «гандаль» наконт таго, колькі з'есці за абедам? Між тым сям'я, безумоўна, ёсць нармальнай сацыяльнай арганізацыяй, але ж вы не ўбачыце ў ёй людзей, якія назапашваюць для сябе ўсё больш і больш, не зважаючы на патрэбы іншых.

Нарэшце, проста зірніце на саму гісторыю «мены і гандлю» — на гісторыю сучаснага капіталізму, пра які мы шмат чаго ведаем. Першае, што вы заўважыце: сялян цягнулі сілай і прымусам у сістэму наёмнай працы, якой яны не хацелі; тады былі зробленыя вялікія намаганні — усвядомленыя намаганні — дзеля стварэння «хаценняў». Ёсць вялізны пласт цікавай літаратуры, дзе свядома абмяркоўвалася патрэба ўтварыць «хаценні» ў маштабах усяго насельніцтва. Гэты працэс ішоў, вядома, цягам усяго развіцця капіталістычнай сістэмы, аднак найлепш яго ілюструе перыяд, калі было скасаванае рабства. На падобныя ілюстрацыі цяжка глядзець без болю.

Напрыклад, у 1831 г. адбылося вялікае паўстанне рабоў на Ямайцы, што падштурхнула брытанцаў скасаваць рабства ў калоніях. Пасля некалькіх паўстанняў рабоў яны сказалі сабе: «Рабства больш не акупляецца». Такім чынам, за пару гадоў брытанцам закарцела перайсці ад рабаўладальніцкай эканомікі да т. зв. «свабоднай» эканомікі, але пры гэтым яны жадалі захаваць асноўныя характарыстыкі грамадства. У час парламенцкіх дэбатаў у Брытаніі выступоўцы свядома выяўлялі сваю пазіцыю. Яны казалі: добра, мы захаваем парадак, былыя гаспадары рабоў стануць наймальнікамі, рабы — шчаслівымі наёмнымі работнікамі, сістэма неяк запрацуе.

Але ж на Ямайцы была «невялічкая праблема»: паколькі там хапала свабоднай зямлі, то, калі брытанцы адпусцілі рабоў на волю, тыя проста захацелі асесці на зямлі і жыць у сваё задавальненне. Яны больш не хацелі працаваць на брытанскіх цукровых плантацыях. Так што кожны ўдзельнік дэбатаў у лонданскім парламенце пытаўся: «Як нам прымусіць іх працаваць на нас, калі яны ўжо не прыгонныя?» Былі вырашаныя дзве рэчы: па-першае, брытанцы ўжылі сілу дзяржавы, каб перакрыць доступ да вольных земляў і зашкодзіць людзям ісці і выжываць самім. Па-другое, брытанцы зразумелі, што, паколькі ўсе работнікі не *хацелі* многага (яны хацелі толькі задаволіць свае асноўныя патрэбы, што ў трапічным клімаце лёгка дасягалася), — брытанскія капіталісты мусілі стварыць для работнікаў цэлы набор «хаценняў», прымусіць жадаць рэчы, якіх яны не жадалі, каб адзіным шляхам да задавальнення новых матэрыяльных патрэб сталася наёмная праца на брытанскіх цукровых плантацыях.

У той час вялася вельмі асэнсаваная дыскусія аб стварэнні хаценняў — і насамрэч, шырокамаштабныя намаганні былі зробленыя ў тым рэчышчы, як цяпер на тэлевізіі. Усё рабілася для таго, каб прымусіць вас пажадаць новую пару абутку, якая вам насамрэч не патрэбная, каб людзі былі ўцягнутыя ў грамадства наёмнай працы. І гэтая схема штораз паўтаралася ў гісторыі капіталізму. Папраўдзе, гэтая гісторыя дэманструе, што людзі ўцягваліся ў становішча, якое потым выдавалася за адпаведнае іх прыродзе. Калі гісторыя капіталізму нешта і даказвае, то толькі тое, што гэтае становішча не адпавядае іх прыродзе, што людзі

туды заганяліся пад прымусам, і што гэтыя намаганні мусяць падтрымлівацца да сённяшняга дня.

## ДЫСІДЭНТЫ: ПАМІЖ ІГНАРАВАННЕМ І ПАКЛЁПАМ

**Мужчына:** Ноам, ці можна трохі змяніць тэму? Вас называлі неанацыстам, ворагам Ізраіля, вашы кнігі спальваліся — ці не турбуецеся вы з-за таго, што вашы погляды заўсёды скажаюць СМІ і інтэлектуалы?

**Хомскі:** Не, чаму я мушу турбавацца? Мяне называлі па-рознаму, абвінавачвалі ў чым заўгодна: што я прапагандую камунізм, нацызм, што я замахваюся на свабоду слова, што я антысеміт, хлус і г. д. Папраўдзе, лічу, што гэта добры знак, бо дысідэнтаў звычайна папросту ігнаруюць. Калі цябе немагчыма ігнараваць і табе немагчыма адказаць па сутнасці, на цябе паклёпнічаюць, і гэта лёгка вытлумачыць. Ніводная інстытуцыя не стане дапамагаць людзям падрываць ейныя апоры. Так што я лічу рэчы, пра якія вы гаворыце, прыкметамі прагрэсу.

Насамрэч, многае палепшылася з 1960-х гадоў. Мы ўжо і не можам сабе ўявіць (асабліва не цэняць гэтага маладзейшыя), наколькі сітуацыя змянілася. Вось вам ілюстрацыя. Бостан лічыцца даволі ліберальным горадам, і першая акцыя супраць вайны ў В'етнаме прайшла там у кастрычніку 1965 г. — яна называлася «Міжнародныя дні пратэсту». Тады на «Бостан Коман» (кшталт Гайд-Парку ці Юніян-Скверу — месца, дзе вам дазваляюць выказацца) прайшла публічная дэманстрацыя. Але мітынг быў сарваны: нам не далі вымавіць і слова. Контрдэманстрантаў, пераважна студэнтаў, што маршыравалі з універсітэтаў, былі тысячы, і я быў вельмі рады, што там знаходзіліся сотні мянтоў, іначай бы нас лінчавалі.

Медыі прыйшлі ў шаленства ад дэманстрацыі. На першай паласе «Бостан Глоўб» рэдакцыя размясціла вялікае фота параненага ветэрана вайны ды інвектывы на адрас людзей, якія асмеліліся ўстаць і сказаць, што нам не варта бамбаваць Паўночны В'етнам. Усе радыёпраграмы выкрывалі «камуністаў і здраднікаў». Лібералы ў Кангрэсе бурчэлі пра «найвялікшую безадказнасць» дэманстрантаў, якія паставілі пад сумнеў права Злучаных Штатаў бамбаваць Паўночны В'етнам. Нагадаю, гэта было ў 1965 г. Дарэчы, мушу сказаць, што тыя дэманстрацыі былі настолькі бяззубыя, што цяпер нават прыкра пра іх думаць. Мы нават не крытыкавалі напад на *Паўднёвы* В'етнам, значна больш жахлівы, мы гаварылі толькі пра пашырэнне бамбаванняў на Поўнач.

Наступная вялікая дэманстрацыя адбылася ў сакавіку 1966 г. — гэта былі Другія міжнародныя дні пратэсту. Мы палічылі, што не варта ладзіць яе на вуліцы, бо нас проста заб'юць, і не захацелі рабіць яе ва ўніверсітэце, бо нашы апаненты маглі разнесці ўніверсітэт у друзачкі, таму мы вырашылі ладзіць дэманстрацыю ў царкве. Такім чынам, адбыўся марш з Гарвардскай плошчы па вуліцы Арлінгтон у дзелавы раён Бостана, дзе царква унітарыстаў была чымсьці накшталт штабу актывістаў. Наш рух быў даволі добра абаронены — туды-сюды ездзілі хлопцы на матацыклах, спрабуючы не даць удзельнікам забіць сябе, і г. д. Урэшце мы зайшлі ў царкву, і яна апынулася пад ударам. Звонку сабраўся на-

тоўп людзей, яны кідалі ў нас гранаты, памідоры, банкі. Я кажу гэта да таго, што паліцыя там прысутнічала і спрабавала пазбегнуць забойстваў, але ў цэлым амаль не ўмешвалася. Гэта быў год 1966-ты.

З таго часу багата чаго змянілася. Уся гэтая штука *неверагодная* сёння, абсалютна неверагодная.

**Мужчына:** У кожным з трох вялікіх непаразуменняў, скарыстаных супраць вас — справы Фарысона[7], заявы пра Камбоджу[8] і вашай пазіцыі адносна ізраільска-палестынскага канфлікту, я быў уражаны, наколькі вашы погляды скажаліся і прымітывізаваліся прэсай. Не разумею, чаму вы надалей настойваеце на перадачы сваіх ідэй у медыі, калі журналісты заўсёды адвольна абыходзяцца з імі.

**Хомскі:** Чаму гэта вас здзіўляе? Па-першае, гэта адбываецца не ў мас-медыях, а ў выданнях для інтэлектуалаў. А інтэлектуалы з'яўляюцца спецыялістамі па дыфамацыі, у існце сваёй яны камісары, ідэалагічныя работнікі, якія адчуваюць, што дысідэнцтва пагражае найперш ім. Мас-медыі не дужа клапоцяцца пра скажэнне маіх поглядаў, яны іх проста ігнаруюць ці кажуць што-небудзь накшталт «во дзе лухта». Насамрэч, скажэнне ледзь-ледзь назіраецца ў медыях нацыянальнага маштабу. Вядома, вы здолееце прачытаць, што «гэты тып — апалагет таго і сяго», але ўсё ж такія заявы больш характэрныя для інтэлектуальнай культуры. Больш за ўсё скажэнняў — у выданнях для інтэлектуалаў, бо гэта іх спецыяльнасць. Яны — камісары, амаль як у камуністычнай партыі.

Апроч таго, я стаў адмысловай мішэнню з іншай прычыны. Вялікая частка таго, што я пішу, ёсць крытыкай амерыканскага ліберальна-інтэлектуальнага істэблішменту, і ясная рэч, істэблішменту гэта не надта падабаецца.

**Жанчына:** Вы ж таксама крытыкавалі Ізраіль, ці не так?

**Хомскі:** Так, найбольш далікатныя з гэтых пытанняў маюць дачыненне да Блізкага Усходу. Насамрэч, існуюць арганізацыі, створаныя адмыслова, каб распаўсюджваць дэзінфармацыю аб гэтым рэгіёне. Спярша я нават не пісаў пра яго, хоць Блізкі Усход быў для мяне найбольш цікавай тэмай з дзяцінства, — не пісаў часткова з гэтай прычыны. Арганізацыі, пра якія ідзе гаворка, вельмі падобныя да сталінскіх, і я ведаў знутры, як яны працуюць. Насамрэч, я быў адным з людзей, уцягнутых у дэзінфармацыю з дзяцінства: ведаеце, вы ўсмоктваеце гэтую лухту. А яны проста *апантаныя* тым, каб спыніць абмеркаванне рэальных праблем.

Вось, напрыклад, Антыдыфамацыйная ліга[9], што маскуецца пад праваабарончую суполку, з'яўляецца насамрэч арганізацыяй, якая пашырае дыфамацыю.

[7] У 1979 і 1980 гг. Хомскі публічна заявіў, што ўрад Францыі не павінен пазбаўляць волі французскага прафесара, які адмаўляў Халакост, і таму быў запісаны ў прыхільнікі поглядаў Фарысона.

[8] Хомскі параўнаў генацыд у Камбоджы з масавымі забойствамі ва Усходнім Тыморы, адзначыў некалькі статыстычных фальсіфікацый у камбаджыйскім выпадку і быў абвешчаны прыхільнікам Пол Пота.

[9] «Бнай-Брыт».

Офіс Лігі ў Бостане — месца, дзе не вельмі дбаюць пра ахову сваіх сакрэтаў, і я атрымаў адтуль шмат розных матэрыялаў — ад людзей, якія працавалі ў офісе і абураліся тым, што адбывалася. Напрыклад, пару гадоў таму яны перадалі мне дасье на мяне — сотні старонак матэрыялаў. Дзе б я ні выступаў, яны пасылалі туды віжа, які занатоўваў мае прамовы і дасылаў іх у цэнтральны офіс. Так што, мяркую, нехта і тут канспектуе тое, што я кажу, нейкая справаздача трапіць у дасье на мяне і далей пойдзе гуляць па краіне. Яны перахопліваюць інфармацыю; іх офісы ліхаманкава абменьваюцца міжсобку дакладнымі запіскамі: «ён сказаў тое і тое там і там». Карацей, поўны шмуц, як гэта называецца ў маёй культуры[10].

Аднак, калі хто-небудзь з вас, згодна з Законам аб свабодзе інфармацыі, зазірне ў складзенае на яго дасье ФБР, то, хутчэй за ўсё, выявіць, што разведвальныя службы ўвогуле вельмі некампетэнтныя, таму яны так часта і правальваюцца. З шэрагу прычын яны ніколі не ўспрымаюць рэчы такімі, як ёсць. Часткова і таму, што здабытая імі інфармацыя звычайна перадаецца агентамі і інфарматарамі, якія ёсць ідэалагічнымі фанатыкамі. Гэтыя фанатыкі заўсёды блытаюць рэчы на свой шалёны манер. Так што, калі вы зазірнеце ў дасье ФБР, ведаючы факты, вы ўбачыце, што інфармацыя мае пэўнае дачыненне да рэчаіснасці — сёе-тое можна зразумець, аднак у той жа час звесткі былі скажоныя ідэалагічным фанатызмам разведвальнай сістэмы, і вы знойдзеце ў дасье розныя дзівосы ды лухту. Тое, што я кажу, прыдаецца і для ацэнкі разведдзейнасці Антыдыфамацыйнай лігі.

Аднак лухта, безумоўна, цыркулюе — магчыма, нехта з гэтай мясцовасці атрымаў яе з рэгіянальнага офіса, і заўтра ў мясцовай газеце з'явіцца артыкульчык, у які напхаюць шмат смецця, узятага з дасье на мяне, — як гэта звычай здараецца, калі я вандрую па краіне. Гэтая лухта скарыстоўваецца, каб закрыць дыскусію: паколькі яны не ўмеюць абмяркоўваць праблемаў, яны спрабуюць спыніць іх абмеркаванне. Вядома, найлепшы сродак для гэтага — падпусціць больш бруду, каб людзі меркавалі, што няма дыму без агню, і адмовіліся слухаць мяне.

Антыдыфамацыйная ліга — асноўная арганізацыя, адказная за гэты бруд. Аднак ёсць мноства іншых, якія робяць тое самае — бо гэта ж насамрэч арганізацыйная задача ўсёй інтэлектуальнай супольнасці. Я маю на ўвазе, што праца інтэлектуалаў з «мэйнстрыму» заключаецца ў тым, каб служыць кімсьці накшталт секулярных святароў — дбаць, каб захоўвалася дактрынальная вера. Калі вы звернецеся да часоў, у якія Царква дамінавала ў грамадстве, святары займаліся якраз гэтым: высочвалі ерэтыкоў і пераследавалі іх. А калі ў XVIII—XIX стст. грамадствы сталі больш секулярызаваныя, узнікла патрэба ў аналагічным відзе кантролю. Сапраўды, грамадскія інстытуты мусяць абараняць сябе, і калі яны не паляць людзей на вогнішчы ці не адпраўляюць іх на пакаранне ў інквізіцыю, то павінны знайсці іншыя шляхі. З цягам часу адказнасць перайшла да класу інтэ-

[10] *Шмуц* на ідышы азначае «бруд».

лектуалаў — цяпер яны сталі ахоўнікамі святых палітычных ісцін, выканальнікамі тых ці іншых прысудаў.

Так што, калі вы дысідэнт, то не мусіце дзівіцца таму патоку бруду, які на вас абрынаецца. Насамрэч гэта добры знак, прыкмета таго, што вас ужо проста не могуць ігнараваць.

**Жанчына:** Вас сапраўды не бянтэжыць той факт, што ваша праца амаль ніколі не даносіцца да публікі ў нескажоным выглядзе ці ўсур'ёз не аглядаецца прэсай?

**Хомскі:** Не, зусім не — і нам сапраўды *не варта* бянтэжыцца з-за такіх рэчаў. Мне наўрад ці стануць пляскаць у ладкі ў рэдакцыях часопісаў і газет ды ў факультэцкіх клубах — гэта не мая аўдыторыя. Але ж нядаўна я быў у Індыі і наведаў сельскую мясцовасць, вёскі, якія кіруюць сабою самі, і там людзі былі шчаслівыя мяне бачыць. Я быў у Аўстраліі на запрашэнне ўцекачоў з Тымору, і яны былі радыя, што я спрабаваў дапамагчы ім. Толькі што я гутарыў з людзьмі ў федэрацыі працоўных у Канадзе, і ў ЗША я часта сустракаюся з членамі аналагічнай федэрацыі — гэта людзі, з якімі мне хочацца мець кантакт, яны — мая аўдыторыя.

Цікава адзначыць, што медыі ў ЗША адрозніваюцца сваёй пазіцыяй — мне даволі проста ўдаецца атрымаць доступ да нацыянальных медыяў у іншых краінах. Насамрэч, толькі ў Злучаных Штатах і ў былой савецкай імперыі я гадамі не меў рэальнага доступу да найбуйнейшых медыяў. І не толькі я, вядома: асноўныя медыі ў ЗША і ў экс-СССР амаль заўсёды выключалі *каго б там ні было* з галасам «супраць». Такім чынам, публікуюцца мае інтэрв'ю і артыкулы ў буйных часопісах і газетах Заходняй Еўропы, у Аўстраліі ды краінах Заходняга паўшар'я. Часта атрымліваю запрашэнні нешта напісаць ад вядучых газет іншых краін — нядаўна мой артыкул надрукавала газета «Гаарэц», у Ізраілі гэта найбольш важная газета, аналаг амерыканскай «Нью-Ёрк Таймс». Гэта была крытыка іх замежнай палітыкі і т. зв. «мірнага працэсу». Ці вось у Аўстраліі — я выступіў у Нацыянальным прэс-клубе ў будынку парламента, і маё выступленне двойчы паказалі па канале «Острэйліэн Уорлд Сёрвісэс», гэта аўстралійскі аналаг Бі-Бі-Сі. Мяне папрасілі пагаварыць пра аўстралійскую знешнюю палітыку, і я выступіў перад нацыянальнай аўдыторыяй з вельмі крытычнай прамовай, гутарыў з членамі парламента ды журналістамі, і ўсе СМІ шумелі пра гэта. Тое самае ў Еўропе; я часта выступаю на нацыянальным канале Сі-Бі-Эс у Канадзе і г. д. Вы можаце сказаць, што ўсё гэта не даходзіць да ЗША. Мяркую, у ЗША тое, што людзі думаюць і што ім дазволена думаць, мае большую важнасць, таму і кантроль тут нашмат мацнейшы.

**Мужчына:** Я чуў, нібыта аднойчы вашы кнігі палілі ў Канадзе. Вы прысутнічалі пры гэтым? Што вы адчувалі?

**Хомскі:** Гэта было ў Таронта. Так, я прысутнічаў. Мяркую, людзі маюць права паліць кнігі, калі хочуць. Папраўдзе, у мяне бралі інтэрв'ю на гэты конт, я сказаў простую рэч: маўляў, было б лепш, каб гэтыя людзі прачыталі мае кнігі, а не спальвалі, але калі ім карціць іх спаліць, мне ўсё роўна. Увогуле, не трэба

вельмі клапаціцца пра спаленне кніг — спаліць іх дашчэнту немагчыма. Кнігі — як цэгла, вельмі цяжка паддаюцца агню.

**Мужчына:** Хто паліў вашы кнігі — натоўп? Як гэта здарылася?

**Хомскі:** Гэта былі ўцекачы з В'етнама, суполка ўцекачоў, якія чулі, ці вырашылі, што я быў… нават не ведаю што. Немагчыма было высветліць, што яны там чулі пра мяне. Відаць, яны ведалі, што я выступаў супроць вайны ў В'етнаме, а самі яны актыўна падтрымлівалі вайну — пэўна, лічылі, што амерыканцы павінны застацца ў В'етнаме і выйграць яе. Таму яны і апынуліся ў ролі ўцекачоў. Дык вось, яны палілі кнігі — па-мойму, гэта добра, гэта нармальная форма пратэсту. Вядома, калі ўрад спальвае кнігі, гэта зусім іншае, і калі карпарацыя спальвае кнігі, гэта зусім іншае.

Невялічкае адступленне — мушу сказаць, што назіраў значна горшае знішчэнне кніг. Вы ведаеце, як нядаўна на першых старонках газет абмяркоўваліся ўсе гэтыя справы, зліццё медыягігантаў, як каментатары з разумным выглядам меркавалі, нашкодзіць гэта свабодзе прэсы ці не? Мне ад усіх такіх размоваў проста смешна. Першая кніга, якую Эд Герман і я напісалі разам, выйшла ў даволі паспяховым выдавецтве ў 1974 г. Гэтае выдавецтва належала «Уорнер Кам'юнікэйшнс». Дык вось, адзін з кіраўнікоў карпарацыі[11] натрапіў на рэкламу кнігі і не ўпадабаў яе, папрасіў здабыць кнігу — і жахнуўся, і забараніў выдаўцу распаўсюджваць яе. Пачалася доўгая мітульга, людзі, якія кіравалі выдавецтвам, спрабавалі настояць на сваім праве выпускаць тое, што лічаць патрэбным. Урэшце «Уорнер Кам'юнікэйшнс» проста вывела выдаўца з бізнеса: яны там вырашылі, што найлепшы спосаб развязаць сітуацыю — пакончыць з выдавецтвам. Гэта азначала, што знішчаная была не толькі *наша* кніга, а *ўсе* кнігі гэтага выдаўца — дзеля таго, каб не дапусціць да распаўсюду ўжо аддрукаваную кнігу. Аятала на такім фоне глядзіцца лепш. Дзеянні «Уорнер Кам'юнікэйшнс» я разглядаю як значна больш сур'ёзныя ў параўнанні з дзеяннямі купкі людзей, якія спальваюць кнігі з сімвалічных прычын. Ім гэтага захацелася — цудоўна.

**Жанчына:** Якое значэнне трэба надаваць згаданаму вамі зліццю медыягігантаў?

**Хомскі:** У першым раздзеле кнігі «Фабрыкаванне свядомасці» крыху расказваецца пра канцэнтрацыю медыяў — гэты раздзел напісаны Эдам Германам, ён спецыяліст па карпаратыўным кантролі, мне не давялося глыбока занурацца ў тэму. Аднак маё ўласнае адчуванне такое: праблема не настолькі важная, як яе часам намагаюцца прадставіць. Напрыклад, калі было б пяцьдзесят медыякарпарацый замест трох, яны ўсё адно рабілі б тое самае, што і цяпер — проста таму, што яны ў прынцыпе маюць тыя самыя інтарэсы. Хіба было б трохі больш канкурэнцыі. Прынамсі так я бачу сітуацыю.

**Мужчына:** Ці здаралася, што вашы лінгвістычныя працы цэнзараваліся або не дапускаліся да друку праз вашу палітычную пазіцыю?

[11] Уільям Сарноф.

**Хомскі:** У ЗША такога ніколі не было, але ў іншых краінах свету здаралася. Напрыклад, ніколі не забуду аднаго тыдня, прыблізна ў 1979-м, калі мне даслалі дзве газеты: адну з Аргентыны, а другую з СССР. Аргентынай тады кіравалі генералы-неанацысты, і я атрымаў газету «Ла Прэнса» з Буэнас-Айрэса. У гэтай буйной аргентынскай газеце быў пра мяне вялікі артыкул: «Нельга чытаць працаў па лінгвістыцы, напісаных гэтым чалавекам, бо яны марксісцкія і маюць падрыўны характар». На тым жа тыдні я атрымаў артыкул з савецкай газеты «Известия»: «Нельга чытаць працаў па лінгвістыцы, напісаных гэтым чалавекам, бо ён ідэаліст і контррэвалюцыянер». Мяне тады гэта дужа пацешыла.

**Мужчына:** Ноам, вы зусім не баіцеся, што істэблішмент прымусіць вас змоўкнуць за гучную і абгрунтаваную крытыку ўладаў ЗША, іх злоўжыванняў?

**Хомскі:** Не, амаль не баюся, і маю на тое вельмі простую прычыну. Калі вы паглядзіце на мяне, то зразумееце, у чым справа. Я — белы, належу да прывілеяванага класу, а гэта значыць, што ўлады мяне наўрад ці пакараюць. Няма ўпэўненасці на 100 % — аднак дзве прыкметы, пра якія я сказаў, дазваляюць набыць многа свабоды.

У свеце няма ніводнага сапраўднага капіталістычнага грамадства, такое грамадства не праіснавала б і дзесяці хвілін — але ёсць варыяцыі на тэму капіталізму, і ЗША імкнецца да капіталістычных мэт — не тое каб Штаты вельмі прасунуліся на гэтым шляху, але прынамсі яны засвоілі капіталістычныя каштоўнасці. Дык вось, калі б мы мелі сапраўды капіталістычнае грамадства, усё было б таварам, уключаючы свабоду. Яе было б гэтак многа, колькі вы маглі купіць. Паколькі Штаты імкнуцца да капіталістычных мэт, тут ёсць вялізны аб'ём свабоды для тых, хто можа сабе яго дазволіць. Калі вы — чорны актывіст з гета, у вас мала свабоды і могуць узнікнуць сур'ёзныя праблемы, вас могуць забіць рукамі чыкагскай паліцыі, як гэта здарылася з Фрэдам Гамптанам[12]. Аднак калі вы — белы прафесіянал, як я, вы можаце набыць сабе шмат свабоды.

Апрача таго, мне выпала належаць да той часткі грамадства, дзе тыя, хто маюць рэальную ўладу, зацікаўленыя абараняць мяне — яны могуць мяне ненавідзець і жадаць, каб я знік, але яны не хочуць, каб дзяржава абрынала сваю моц на такіх людзей, як я, бо потым яна зможа абрынуцца на такіх людзей, як *яны*. Так што насамрэч, у такім грамадстве, як наша, прывілеяваныя людзі, як я, вельмі добра абароненыя. Няма стоадсоткавай гарантыі, але ёсць вялікае поле для манеўраў.

## НАВУЧАННЕ СУПРАЦІВУ

**Жанчына:** Ці можаце вы прапанаваць нешта, каб памагчы людзям зразумець некаторыя з гэтых ідэй — напрыклад, ідэю аб медыях і тым, як яны замінаюць людзям свабодна і самастойна мысліць?

[12] Актывіст руху «Чорныя пантэры», забіты ФБР у 1969 г.

**Хомскі:** Ну, напраўду, я не думаю, што гэта вельмі складана. Маю на ўвазе, што інтэлектуалы робяць кар'еру, спрабуючы ўскладніць простыя рэчы, бо гэта дазваляе ім атрымліваць заробак і г. д. Насамрэч жа ўсё прасцей: грамадскі свет, як мы яго разумеем, адкрываецца перад намі бадай што сам сабою, варта толькі скінуць шоры. Сапраўды, вельмі цяжка рабіць гэта ў самоце, аднак у працэсе ўзаемаадносінаў, у групах справа пойдзе даволі лёгка.

Такім чынам, калі вы сустракаецеся з людзьмі, гутарыце з імі, лічу, варта паспрабаваць давесці ім, як важна мысліць самастойна — напрыклад, дапамагчы ім самім зразумець, як мас-медыі фармуюць і вызначаюць праблемы, маючы на ўвеце маніпуляванне і кантроль. Вядома, няма вялікага сэнсу выкрываць медыі абстрактна — падводзіць тэарэтычную базу пад тое, як яны працуюць. Вам трэба дэманстраваць канкрэтныя выпадкі. Вазьміце прыклады, якімі людзі цікавяцца, і проста навучыце сваіх суразмоўцаў ажыццяўленню даследчых праектаў. Даследчыя праекты — вельмі простая справа, неабавязкова мець доктарскую ступень (хіба толькі ў фізіцы). Вам трэба мець адно здаровыя глузды. Трэба мець здаровыя глузды і пільна прыглядацца да фактаў. Можа спатрэбіцца трохі часу на тое, каб знайсці факты — звычайна яны не змяшчаюцца ў загалоўках газет. Аднак, калі вы праробіце невялікую працу, то зможаце вызначыць і факты, і спосабы, у якія яны скажаюцца і зацямняюцца рознымі ўстановамі. Тады мэты гэтых скажэнняў хутка выйдуць на паверхню.

**Мужчына:** У якасці выкладчыка ці арганізатара няпроста вызначыць найлепшы шлях да стымулявання цікавасці людзей, затое ёсць маса шляхоў, каб не стымуляваць цікавасць, імітуючы бурную дзейнасць. Адказваючы на пытанне аб грамадзянскім непадпарадкаванні, вы згадалі людзей, якія чытаюць лекцыі пра супрацію — мне здаецца, гэта якраз імітацыя бурнай дзейнасці.

**Хомскі:** Я не настолькі ўпэўнены, што ідзецца аб імітацыі. Мяркую, што ёсць рэчы, якія варта расказваць аб супраціве — асабіста мне падабалася слухаць людзей, якія мелі каштоўны досвед у гэтай сферы, якія маглі падзяліцца са мной новымі ідэямі. Калі гэта называецца «чытаннем лекцый», добра — але гэта неабавязкова памылковая рэч. Ёсць многае, пра што вы можаце даведацца ад іншых людзей, якія асэнсавалі нейкую тэму і маюць досвед.

**Мужчына:** Але мне цікава, што яшчэ, на вашу думку, патрэбна, каб навучаць людзей супраціву і актыўнай дзейнасці ўвогуле?

**Хомскі:** Перш за ўсё, мяркую, вы не павінны ўводзіць людзей у зман. Вы павінны патлумачыць ім, што, калі яны хочуць мысліць незалежна, за гэта, верагодна, прыйдзецца заплаціць. Маю на ўвазе, што ўсе мусяць зразумець, як уладкаваны свет: ён не заахвочвае сумленнасці і незалежнасці, ён узгароджвае паслухмянасць і канфармізм. Мы жывем у свеце канцэнтраванай улады, і носьбіты ўлады не збіраюцца ўзнагароджваць людзей, якія ставяць яе пад пытанне. Так што для пачатку варта нікога не ўводзіць у зман.

Пасля таго як вы гэта зразумелі — добра, рабіце ўласны выбар. Калі ваш выбар у тым, што вы хочаце быць незалежныя, нават ведаючы, чым гэта абярнецца, то вам варта проста ісці наперад і спрабаваць быць незалежнымі. Але гэта

можа аказацца выключна цяжкім выбарам. Да мяне часта падыходзяць маладыя людзі і просяць парады. Я заўсёды моцна вагаюся (дарма што часам акалічнасці вымушаюць мяне нешта радзіць) — таму што я не маю права вырашаць штосьці за кагосьці. Але я лічу, што варта дапамагчы людзям зразумець рэальны стан рэчаў.

Вы можаце шмат чаго набыць дзякуючы сваёй актыўнай дзейнасці — але шмат чаго можаце і страціць. Прычым некаторыя страты не з'яўляюцца неістотнымі, напрыклад, бяспека. І людзі мусяць проста рабіць уласны выбар, калі яны вырашаюць, што іменна ім рабіць.

## ІЗАЛЯЦЫЯ

**Жанчына:** Ноам, калі можна, я затрымаюся на асабістым. Мяне заўсёды захапляла тое, як вы знаходзіце час на пісанне кніг і артыкулаў, выкладанне, сустрэчы з людзьмі па ўсёй краіне, сямейнае жыццё. Апрача таго, вы — вядучая асоба ў лінгвістыцы, вы вельмі акуратна дакументуеце сваю працу. Ці не знаходзіцеся вы ў нейкай часавай анамаліі, не жывяце ў іншым свеце, дзе больш за дваццаць чатыры гадзіны?

**Хомскі:** Не, мяне штурхае чысты, звычайны фанатызм — і сапраўды, многія справы ідуць наперад. Кожны чалавек, сур'ёзна ангажаваны ў палітычную ці адміністрацыйную дзейнасць, ведае, што многія рэчы проста праходзяць, як часам і людскія жыцці. Так, я спрабую рэгуляваць сваё асабістае жыццё — мае ўнукі і дзеці былі тут колькі дзён таму, я гуляў з імі і гэтак далей. Але асабістае жыццё, вядома, церпіць. Напрыклад, калі я бачу маіх найбліжэйшых сяброў, якіх ведаю пяцьдзесят гадоў, раз ці два на год, то гэта — добры год. Але такая ўжо рэчаіснасць — немагчыма рабіць усё, трэба выбіраць.

Насамрэч, вельмі ўражвалі супярэчнасці паміж асабістым і неасабістым у 1960-я гады: раптам шмат людзей даслоўна кінуліся ў актыўную грамадскую дзейнасць, і вельмі нямногія сем'і прайшлі праз яе цэлымі. Вельмі нямногія. Не тое каб муж і жонка ненавідзелі адно аднаго, але тая дзейнасць выявілася агромністым эмацыйным цяжарам, нават калі абодва сужэнцы бралі ў ёй удзел. Нешта ламалася. Была ў той перыяд нейкая хваля разводаў, асабліва пасля вялікіх палітычных працэсаў. Муж і жонка заставаліся разам, пакуль працэс цягнуўся, але адразу па заканчэнні разводзіліся. Гэта, напэўна, агульная тэндэнцыя, калі вы сур'ёзна ўцягваецеся ў нейкую грамадскую справу.

Апантанаму чалавеку вельмі цяжка падзяліць жыццё на некалькі розных сегментаў і прымусіць іх усе працаваць. Некаторыя кульгаюць, і часта ідзецца якраз пра асабістае жыццё — і цяжка нешта змяніць, бо вы проста не можаце надаць дастатковай увагі гэтаму сегменту. Папраўдзе, я не ведаю, якім павінен быць адказ: людзі знаходзяць розныя адказы.

**Мужчына:** Мяне суцяшае, што вы сутыкнуліся з гэтай самай праблемай.

**Хомскі:** О, усе сутыкаюцца.

**Мужчына:** Калі я актыўна займаюся сваёй дзейнасцю, то адчуваю сябе вельмі

ізаляваным — настолькі, што маё асабістае жыццё перастае існаваць. Я нібыта ў пустэчы, адлучаны ад людзей.

**Хомскі:** О так, гэта жахлівая пустэча, і ў выніку яна робіць немагчымай вашую працу. Урэшце, мы не аўтаматы: мы працуем у рамках сістэмы сацыяльных адносінаў і маем патрэбу ў кантактах з іншымі людзьмі.

**Мужчына:** І асабістая ізаляцыя ўзмацняе палітычную ізаляцыю.

**Хомскі:** Так, гэта дужа цяжка. Я маю на ўвазе, што праблема ўзнікае часткова і таму, што мы настолькі ізаляваліся адно ад аднаго. Калі б мы ўдзельнічалі ў народнай арганізацыі, было б лягчэй. У гэтым плане цікавая гісторыя рабочага руху ў Злучаных Штатах: калі людзі рэальна працуюць разам над арганізацыйнымі пытаннямі, яны пераадольваюць ізаляцыю. Насамрэч, яны ў вялікай ступені пераадольваюць нават такія рэчы, як расізм і сексізм. Зазірнем у гісторыю.

Прыкладна сто гадоў таму рабочы рух у Злучаных Штатах душыўся ў зародку: ён ніколі не перамагаў. Аднак нават у час паражэнняў — такіх, як Гомстэдаўскі страйк[13] — здараліся важныя рэчы. Названы страйк з'яўляецца цікавым выпадкам, бо ён адбыўся ў гарадку, дзе дамінаваў рабочы клас, і забастоўшчыкі проста захапілі ў ім уладу: яны падпарадкавалі сабе горад і кіравалі ўсім. Успомніце, гэта быў перыяд, калі панаваў расізм, — там не было шмат чорных, але стаўленне да ўсходнееўрапейцаў вызначалася сапраўдным расізмам. Тых, каго прозвалі «гунамі» (гэта маглі быць славакі ці хто іншы, неабавязкова венгры), трактавалі не лепш за чорных, і расізм быў вельмі ўкаранёным. Але ён паў у сярэдзіне Гомстэдаўскага страйку. І жанчыны таксама кіравалі ўсім, сексізм таксама шмат у чым быў падарваны ў час страйку. Гэткія рэчы звычайна здараюцца, калі людзі дзейнічаюць супольна ў сумеснай барацьбе.

Падобнае адбылося таксама ў час стварэння КПА[14] — каб стварыць гэты саюз, чорныя і белыя рабочыя працавалі разам. Гэта не раз адбывалася ў Руху за грамадзянскія правы — напрыклад, СНКК[15] быў вельмі адкрытай арганізацыяй, «белай», «чорнай», якой заўгодна. Многія непрыемныя грані жыцця знікаюць, вы атрымліваеце за іх кампенсацыю, калі ўцягваецеся ў супольную барацьбу. Адзін мой стары сябар, былы ўдзельнік польскага супраціву ў Варшаве ў час нацысцкай акупацыі, заўсёды казаў, што гэта быў найлепшы перыяд у яго жыцці. Гэта быў выключна небяспечны перыяд — змагары маглі скон-

[13] Забастоўка 1892 г. на металургічным заводзе Карнегі ў Пенсільваніі.

[14] «Кангрэс прамысловых арганізацый» (КПА) — федэрацыя прафесійных саюзаў у прамысловасці ЗША і Канады, заснаваная ў 1935 г. КПА быў больш актыўнай арганізацыяй, чым Амерыканская федэрацыя працы, хоць і саступаў ёй у памерах. Лідэры КПА часта былі маладзейшыя і прытрымліваліся больш радыкальных метадаў барацьбы. У цэлым КПА падтрымліваў палітыку «Новага шляху» Франкліна Д. Рузвельта і быў адкрыты для афраамерыканцаў. У 1955 г. КПА зліўся з АФП. *(Заўв. перакл.)*

[15] СНКК (Студэнцкі негвалтоўны каардынацыйны камітэт) — адна з асноўных суполак, якая змагалася за грамадзянскія правы ў ЗША 1960-х гг. СНКК быў заснаваны ў красавіку 1960 г., знік у 1970-я гг. *(Заўв. перакл.)*

чыць жыццё ў газавых камерах, і ўсе пра гэта ведалі — але ў той час існаваў дух супольнасці, якога мой сябар ніколі не адчуваў да вайны і ніколі не адчуваў пасля вайны.

Так што, мяркую, найлепшым адказам на вашае пытанне будзе той самы адказ — нам трэба развіваць устойлівыя народныя арганізацыі, культуру суўдзелу, адданасці, актывізму, салідарнасці, што дапаможа нам у баталіях і зламае некаторыя з бар'ераў, усталяваных, каб падзяляць нас і рассейваць.

## НАВУКА І ЧАЛАВЕЧАЯ ПРЫРОДА

**Мужчына:** Ноам, што вы думаеце пра чалавечую прыроду — напрыклад, ці лічыце вы людзей больш дэструктыўнымі, чым канструктыўнымі істотамі, або наадварот?

**Хомскі:** Па-першае, мае думкі на гэты конт не глыбейшыя ад вашых: тут уступае ў гульню чыстая інтуіцыя, ніхто насамрэч нічога не разумее ў чалавечай прыродзе. Глядзіце, людзі няшмат разумеюць нават у вялікіх малекулах, а калі гаворка заходзіць пра такія рэчы, як прырода чалавека, усе здогады маюць аднолькавую вартасць.

**Мужчына:** Але ж вы шмат вывучалі наступствы чалавечай прыроды.

**Хомскі:** Так, аднак калі вы зірнеце на наступствы, вы ўбачыце ўсё: вялізнае самаахвяраванне, смеласць, сумленнасць, прагу разбурэння — усё, што хочаце. Аналіз наступстваў мала ў чым удасканаліць вашы веды.

**Мужчына:** З вашых даследаванняў вынікае, аднак, што ў чалавеку закладзена шмат разбуральнага…

**Хомскі:** А многія іншыя даследаванні сведчаць пра іншае. Маё агульнае адчуванне такое: з часам людзі ў цэлым удасканальваюцца, не нашмат, але прыкметна. А здараецца, што прагрэс ідзе хуткімі тэмпамі. Возьмем, напрыклад, «першародны грэх» амерыканскай гісторыі — лёс карэннага насельніцтва. Да 1960-х гг. культура проста не магла з ім змірыцца. Датуль — за вельмі рэдкімі выключэннямі — акадэмічная навука ў цэлым фальсіфікавала гісторыю, забараняла задумвацца пра тое, што здарылася. Нават колькасць забітых людзей была радыкальна сфальсіфікаваная. Нават у 1969 г., у адной з добрапрыстойных кніг па гісторыі Злучаных Штатаў Томас Бэйлі напісаў, што пасля Амерыканскай рэвалюцыі былыя каланісты перайшлі да іншай справы, «расчысткі тэрыторыі ад дрэваў і індзейцаў». *Ніхто* не можа сказаць такога цяпер — нават у перадавіцы «Уол Стрыт Джорнал» вы не зможаце напісаць такога. Так што адбываюцца важныя змены, і яны з'яўляюцца часткай значнага прагрэсу ў іншых сферах. Рабства лічылася вельмі карысным рэччу яшчэ не так даўно.

**Мужчына:** Дык вы лічыце, што на індывідуальным узроўні чалавечая прырода дэструктыўная, але ў цэлым — канструктыўная?

**Хомскі:** Я не ведаю — у XIX ст. не было газавых камер, так што шукайце адказ самі. Калі ж вы хочаце атрымаць навуковы адказ, то гэта наіўна, ніхто нічога не ведае. Адказы паступаюць пераважна з гісторыі, ці з інтуіцыі, ці ад-

куль-небудзь яшчэ. Навука можа адказаць толькі на вельмі простыя пытанні — калі справы ўскладняюцца, можна толькі прапаноўваць здагадкі.

**Іншы мужчына:** Людзі часта пытаюцца ў вас пра ўзаемасувязі паміж вашай навуковай працай у лінгвістыцы і вашай палітычнай пазіцыяй, і вы звычайна адказваеце: «Так, ёсць пэўныя нязначныя ўзаемасувязі». Ці не маглі б вы развіць гэтую тэму? Асабіста мне здаецца, што нашы палітычныя праблемы часткова абумоўленыя якраз тым, што чалавечы мозг вельмі ахвотна ўспрымае рэчы ў канкурэнтных тэрмінах накшталт «больш» ці «менш», але не вельмі ахвотна ўспрымае паняцце «дастаткова».

**Хомскі:** Так, магчыма, гэта праўда — аднак гэтая тэма не паддаецца навуковаму даследаванню мовы. Вы ведаеце пра гэта акурат столькі, колькі найспрытнейшы з лінгвістаў.

**Мужчына:** Тады дзе яны — гэтыя нязначныя ўзаемасувязі?

**Хомскі:** Не тут, недзе ў іншым месцы.

Па-першае, памятайма, што рэчы, на якія можа праліць святло навука, займаюць невялікую частку нашага свету. Калі вы пераходзіце да складаных сістэм, роля навуковай веды вельмі хутка падае, а калі гаворка заходзіць пра прыроду чалавечых істот, навуцы проста няма чаго сказаць. Ёсць некалькі сфер, у якія можна пранікнуць з дапамогай унутранага перажывання і разумення, некаторыя аспекты мовы якраз належаць да гэтых сфер — але такі пагляд не закранае пытанняў, што ўяўляюць цікавасць для чалавека. Прынамсі адказы на гэтыя пытанні не маюць ніякіх наступстваў для чалавечага жыцця.

Узаемасувязі маюць зусім іншы характар — і яны *з'яўляюцца* нязначнымі. Адзіная прычына, з якой я на іх настойваю, — у тым, што яны шматкроць адзначаліся ў мадэрнай інтэлектуальнай гісторыі і насамрэч ляжаць якраз у аснове класічнага лібералізму. Насуперак сучаснай версіі лібералізму, класічная версія (дакапіталістычная і, больш за тое, антыкапіталістычная) факусуецца на праве людзей кантраляваць уласную працу, на патрэбе свабоднай творчай працы пад вашым уласным кантролем — у імя чалавечай свабоды і творчасці. Для класічнага лібералa наёмная праца ў капіталістычным грамадстве была абсалютна амаральнай, бо замахвалася на прынцып кантролю чалавека над уласнай працай — пры капіталізме наёмны работнік ёсць у існасці рабом.

Спрабуючы вызначыць нешта накшталт ядра ў чалавечай прыродзе дзеля абароны права на свабодную, творчую працу і кантроль над ёю, некаторыя класічныя ліберальныя філосафы звярнуліся да іншых аспектаў чалавечага розуму. Адным з аспектаў, які вывучаецца з XVII ст. і шмат у чым мае дачыненне і да картэзіянскай думкі, была мова. Было прызнана, зусім справядліва, што крытэрам, паводле якога вызначаецца наяўнасць розуму ў чалавечым сэнсе (у адрозненне ад жывёлы ці робата), з'яўляецца свабоднае і творчае ўжыванне мовы.

Напрыклад, цэнтральнай часткай у развагах Дэкарта, дзе ён праводзіць жорсткае, нават анталагічнае размежаванне паміж чалавечым розумам і ўсімі іншымі рэчамі, была наступная: калі вы задаяце чалавеку пытанне пра нешта новае, выкарыстоўваючы сказы, якіх чалавек ніколі не чуў раней, вам можа быць дадзе-

ны новы адказ, адпаведны таму, што вы сказалі. Гэты адказ абумоўліваецца не ўнутраным станам і не знешнімі абставінамі, а нейкай творчай здольнасцю чалавечага розуму. Аднак вы не дачакаецеся падобнай рэакцыі ад робата, ці жывёлы, ці кагосьці яшчэ — калі вы возьмеце нейкую машыну і націснеце кнопку, выйдзе тое, што запраграмавана загадзя, калі вы дасцё голубу нейкі стымул, рэакцыю птушкі таксама можна прадбачыць. Але ў мове чалавека вынік не запраграмаваны, ён не вызначаны загадзя, хоць усё ж неяк абумоўлены сітуацыяй.

Такім чынам, для Дэкарта ядром чалавечага розуму было якраз свабоднае валоданне мовай. І цягам усяго класічнага ліберальнага перыяду рабіліся спробы (Русо, Гумбальтам і іншымі) звязаць гэтыя элементы і вызначыць патрэбу і права на свабоду — «інстынкт свабоды», як ён часам называўся — нешта накшталт кагнітыўнага ядра чалавечай прыроды. Гэтым ядром станавілася свабоднае творчае мысленне і яго выражэнне ў мове.

Тое, пра што ішла гаворка, мае метафарычны характар — паколькі ніхто нічога не ведае пра чалавечую прыроду, вы не можаце ведаць, ці існуе насамрэч «інстынкт свабоды». Калі нехта захоча сказаць, што людзі нараджаюцца для рабства, ён можа прыцягнуць гэтак сама шмат навуковых довадаў, як Русо, які казаў, што яны нараджаюцца для свабоды — усё залежыць ад вашых спадзяванняў ды інтэнцый, да навуковай веды яны не маюць дачынення.

Тое самае адбываецца і цяпер: вы можаце прачытаць любую кнігу па сацыябіялогіі[16], і гэта будуць пераважна казкі. Усё стыкуецца, калі гаворка ідзе пра мурашоў; калі развагі сацыябіёлагаў тычацца сысуноў, пачынаюцца кульганні; а калі навука звяртаецца да людзей, можна казаць усё, што прыходзіць у галаву. Хто ведае, ці можна вывучыць прыроду чалавека? Усё настолькі далёка ад навуковага разумення, што нельга нават марыць пра тое. Так што я не кажу шмат пра сувязі лінгвістыкі і чалавечай прыроды, проста мяркую, што ў гэтай сферы ёсць цікавыя ідэі, магчыма, варта іх захоўваць у галаве, ці напісаць на іх падмурку верш, ці нешта яшчэ. Аднак пакуль што яны не могуць быць прадметам навуковага даследавання.

## ШАРЛАТАНЫ Ў НАВУЦЫ

**Жанчына:** Ноам, у біхевіярызме ёсць меркаванне, звязанае з тэорыяй кагнітыўнага развіцця Піяжэ, што чалавечае спачуванне з'яўляецца якасцю, якая набываецца[17]. Некаторыя палітыкі ўхапіліся за гэтую ідэю для прапаганды часцейшага выкарыстання смяротнай кары: маўляў, або вы ў лодцы, або не, або вы навучыліся чалавечага спачування, або не. Такім чынам, калі забойцы ў свой час

[16] Тэорыя, згодна з якой не толькі фізічныя рысы, але і сацыяльныя паводзіны залежаць ад эвалюцыі.

[17] Швейцарскі псіхолаг Піяжэ лічыў, што развіццё інтэлекту ў дзяцей праходзіць скрозь чатыры генетычна вызначаныя стадыі.

яго не навучыліся, немагчыма прышчапіць ім «чалавечнасць» цяпер. Што вы думаеце пра гэткія довады?

**Хомскі:** Гэтая лухта нават не можа прэтэндаваць на найменне ідыятызму. Маю на ўвазе, што калі людзям патрэбны ілжэаргумент на карысць смяротнай кары, няхай сабе, але пры чым тут навуковасць? Вазьміце Піяжэ: яго працы ў псіхалогіі развіцця асобы былі цікавымі, ён ладзіў розныя цікавыя эксперыменты і г. д. — але ўся яго канструкцыя ляснула, ніхто не верыць больш ніводнаму слову з яго тэорыі. Выявілася, што ўсе гэтыя «стадыі развіцця» — ілжывыя. Калі вы правядзеце лепшыя эксперыменты, то зможаце паказаць, што немаўлятам даступныя ўсе тыя рэчы, якія, паводле Піяжэ, не даступныя ім на гэтай стадыі. Яго набор ідэй быў цікавы, недурны — людзі нямала даведаліся з эксперыментаў Піяжэ. Аднак ад яго карціны не засталося нічога. Нуль.

Калі ідзецца пра доследы такога прадмета, як спачуванне, кожны з вас ведае столькі ж, колькі найвядомейшы даследчык. Калі вы нешта ведаеце, то дзякуючы інтуіцыі і досведу: вы бачылі дзяцей, магчыма, у вас ёсць дзеці, вы гулялі з імі, вы бачылі, як яны растуць. Ніхто не ведае больш за тое, што ведае кожны. І ніякая навука вам не скажа большага, і няма прыкметаў таго, што скажа ў будучыні, хіба што ў вельмі аддаленай будучыні. Так, даследчыкі дадуць вам нейкія статыстычныя звесткі, ці можа калі-небудзь нехта зможа паказаць, што пэўныя ўмовы выхавання спрыяюць з'яўленню больш чулых людзей, чым іншыя — гэта цалкам магчыма. Аднак гэта не значыць, што мы нават наблізімся да разумення феномену.

У меру таго, як навука прагрэсуе, будуць назірацца спробы вывесці з яе палітычныя высновы. Але ўсе гэтыя спробы будуць нагадваць прыклад з Піяжэ і смяротнай карай — то бок людзі, палітычна заангажаваныя, знойдуць якога-небудзь поўнага шарлатана ад навукі, які скажа ім: «Вось база для вашых дзеянняў». Аднак у сэнсе сапраўдных навуковых ведаў — мы знаходзімся на супераастранамічнай дыстанцыі ад усіх гэтых праблем. Не тое каб нельга было даследаваць іх: можна заняцца іх апісаннем, можна — тэрапіяй, можна пастарацца пранікнуць у іх настолькі, каб трохі лепш іх кантраляваць — але гэта ўсё.

Гэта як у псіхатэрапіі. Некаторыя людзі кажуць, што яны нешта атрымліваюць ад яе метадаў — магчыма, так, а магчыма, не. Але нават калі яны нешта атрымліваюць, то не дзякуючы навуцы. За псіхатэрапіяй няма навукі, гэтаксама, як і за сродкамі бабкі-шаптухі. Проста часам у справу ўступаюць разнастайныя віды чалавечых узаемаадносінаў.

Прыгадваю, як адзін мой сябар-антраполаг, які даследаваў індзейскае племя на захадзе Паўднёвай Амерыкі, расказаў мне, як вылечваліся людзі ў час лекавальнай цырымоніі. Ён сказаў, што, калі б не бачыў на свае вочы, не паверыў бы. Нехта быў сапраўды хворым (з сур'ёзнымі праблемамі, фізічнымі сімптомамі і г. д.), але прайшоў праз нейкі абшчынны рытуал са скокамі, спевамі — і акрыяў. Такое здараецца, і ніхто не ведае, чаму: магчыма, тут спрацоўвае эмпатыя, пачуццё прыналежнасці да грамады ці нешта іншае. Навука далёкая ад гэтага феномену, як і ад псіхатэрапіі.

Ці закранем вузейшыя медыцынскія пытанні. Ці ведаеце вы, як вырашаецца, якія лекі варта выпісаць вам — дапусцім, ад сэрца? Не ў тым рэч, што *навука* пра гэта ведае — проста ладзяцца эпідэміялагічныя даследаванні з групамі насельніцтва. Адна група прымае адзін від лекаў, другая — іншы і жыве трохі даўжэй. Так, вы можаце назваць гэта «навуковым даследаваннем», але гэта такая навука, якой можа авалодаць кожны, хто ведае арыфметыку ці нешта чуў пра выбаркавыя доследы насельніцтва. Нельга сказаць, што нехта разумее біялагічны эфект лекаў — звычайна ён ледзь-ледзь прасочваецца, калі ўвогуле паддаецца разуменню.

Так што калі вы пачуеце людзей, што кажуць пра «вывучэнне спачування» і гэтак далей, лепш заткніце вушы.

**Жанчына:** Вы мяркуеце, што навука ніколі не раскажа шмат пра чалавечыя паводзіны — рэч у тым, што ў чалавеку ёсць нейкі духоўны пачатак, недаступны навуцы?

**Хомскі:** Навуковы падыход вельмі абмежаваны не толькі ў вывучэнні людзей — нават простыя фізічныя аб'екты часта не паддаюцца навуковаму даследаванню. Напрыклад, у фізіцы ёсць «праблема трох целаў»: немагчыма вылічыць, што адбываецца, калі рухаюцца тры целы, бо раўнанні выходзяць занадта складаныя. Фізік, з якім я гутарыў, даў мне іншы прыклад: калі вы возьмеце кубак кавы з вяршкамі, што круцяцца на паверхні, то ўсе прыродныя законы вядомыя, але вы не зможаце развязаць раўнанняў, бо яны занадта складаныя. Гэта не чалавечыя істоты, гэта вяршкі, якія плаваюць у кубку кавы, але мы не здольныя вылічыць, што там адбываецца.

Праблема ў тым, што мы можам ведаць законы, але магчымасць іх ужывання, развязання раўнанняў, выпрацоўкі рашэнняў, разумення таго, што адбываецца, падае вельмі хутка па меры таго, як мы адыходзім ад самых простых рэчаў да больш складаных. Да таго ж мы, верагодна, *не ведаем* усіх законаў: хутчэй за ўсё, што мы не ведаем нават галоўных. Фізікі раскажуць вам пра гэта болей, чым я, але возьмем для прыкладу касмічную матэрыю: больш за 90 % космасу складаецца з таго, што называецца «цёмнай матэрыяй» — яна называецца цёмнай рыхтык таму, што ніхто нічога пра яе не ведае. Проста ёсць пастулат, што яна існуе, таму што пры адсутнасці такога пастулата ўсё ляціць дагары нагамі. Гэта больш за 90 % матэрыі ў космасе, і мы нават не ведаем, з чым яе ядуць! Яшчэ прыклад: цяпер разбудавалася новая галіна ў фізіцы, звязаная са звышправоднасцю[18]. У мяне не хапае ведаў, каб ацаніць прэтэнзіі фізікаў, але многія з тых, хто над гэтым працуюць, кажуць, што могуць урэшце даказаць (не абсалютна, але наблізіцца да доказу), што ў гэтай сферы высокакандэнсаваных рэчываў дзейнічаюць прынцыпы, чужыя вядомым нам законам прыроды. Нельга звесці прынцыпы звышправоднасці да вядомых законаў. Ізноў-такі, гаворка ідзе пра зусім простыя рэчы, а не пра складаны арганізм.

[18] Звышправоднасць азначае поўнае знікненне электрычнага супраціву ў розных цвёрдых целах пры звышнізкіх тэмпературах.

Часта чуюцца размовы пра тое, як арганізмы развіваюцца. Людзі называюць гэта «натуральным адборам», і, напэўна, не памыляюцца. Бясспрэчна, Дарвін у чымсьці меў рацыю. Але можа аказацца, што натуральны адбор — толькі вельмі перыферыйная частка развіцця арганізмаў. Ёсць панэль фізічных магчымасцей, даступная нам дзякуючы веданню законаў фізікі, і ўнутры гэтай панэлі могуць здарыцца толькі пэўныя рэчы — і вывучаючы гэтыя рэчы, вы заўважаеце эфекты, абумоўленыя натуральным адборам. Але структура ўсёй панэлі застаецца невядомая. Ніхто не ведае, якія законы дзейнічаюць у складаных арганізмах, толькі цяпер ледзь-ледзь пачынаюцца студыі самаарганізоўных сістэм — як сістэмы развіваюць структуру і ўскладняюцца дзякуючы сваёй прыродзе. Гэтыя рэчы толькі-толькі пачынаюць паддавацца разуменню — а мы гаворым пра рэчы, значна прасцейшыя, чым чалавечыя істоты.

Напрыклад, у нейрафізіялогіі людзі вывучаюць маленькіх чарвякоў, званых нематодамі. Чаму нейрафізіёлагі вывучаюць нематодаў? Таму што яны малыя-малыя, размнажаюцца за тры дні, маюць усяго тысячу клетак і трыста нейронаў. Узаемасувязі ўсіх нейронаў вядомыя, але дагэтуль ніхто не можа сказаць, чаму дурны чарвяк робіць тое, што ён робіць: паварочваецца налева ці кудысьці там паўзе. Тое, што ён робіць, дагэтуль не вытлумачана, дарма што добра вывучаныя і сістэма з трох соцень нейронаў, і перыяд размнажэння. Папросту ўсё занадта складана, занадта шмат рэчаў адбываецца, замнога хімічных рэакцый. А гэта ж трыста нейронаў, а не дзесяць у адзінаццатай ступені, як у вашай галаве. Так што разуменне працэсаў, якія адбываюцца ў чалавечым арганізме, увогуле ніякае.

Вось чаму вывучэнне мовы ўяўляе такую цікавасць: з нейкай прычыны яно падобнае да вывучэння неарганічнага свету. У мове ёсць аспекты, якія вы можаце даследаваць з дапамогай навуковых метадаў, што захапляе, аднак гэтае вывучэнне можна параўнаць з праменьчыкам святла, што праходзіць скрозь чалавечыя паводзіны, пакідаючы большасць моўных загадак у цемры. Навука не можа нічога сказаць пра тое, што вы і я цяпер робім — яна нешта скажа толькі пра механізмы, *уцягнутыя* ў гэты працэс, а не пра тое, як мы іх выкарыстоўваем. Пра гэтае выкарыстанне няма чаго сказаць — зноў жа, магу параіць напісаць пра яго верш. Такім чынам, навуковае разуменне вельмі спецыфічнае: яно сягае вельмі глыбока ў невялікай колькасці сфер, куды можа пранікнуць, але гэтыя сферы абмежаваныя.

Калі вы кажаце, што нейкія чалавечыя паводзіны апынаюцца па-за межамі нашага доступу, гэта магчыма — але я б не сказаў, што з прычыны «духоўных» якасцей, якімі мы валодаем. Недаступнымі нашаму разуменню могуць аказацца і вялікія часткі прыроднага свету. Проста ў мозгу ёсць пэўная здольнасць, нейкая ўласцівасць розуму, якой ніхто не разумее — яна спрыяе нашым навуковым пошукам. Як і ўсё ў біялогіі, яна моцна структураваная — вельмі прыдатная для пэўных рэчаў і ў выніку вельмі непрыдатная для іншых. Маю на ўвазе, што вы не зможаце дасягнуць поспеху ў чымсьці, калі вы не выявіцеся няздольным на штосьці іншае, гэтыя дзве рэчы звязаныя міжсобку. Напрыклад,

калі вы бугай, то не здолееце лётаць, як матылёк — нельга быць бугаём і матыльком адначасова. Гэтаксама калі чалавечы эмбрыён здольны стаць чалавекам, ён не зможа стаць мухай — ён занадта «слабы», каб стаць мухай, калі хочаце, бо ён дастаткова «моцны», каб стаць чалавекам. Лагічна, што слабасць і сіла тут ідуць поруч. Калі вы маеце незвычайныя здольнасці ў адной сферы, то будзеце мець абмежаваныя здольнасці ў другой. І калі чалавечая здольнасць да навукі дастаткова добрая, каб з нейкай абсалютна невядомай прычыны стварыць квантавую тэорыю, то яна не зможа стварыць мноства іншых рэчаў. І мы нават не ведаем, якія гэта рэчы — але яны могуць быць якраз тым, што нас найбольш цікавіць.

Так што, калі нехта заяўляе, што пад сацыяльнай палітыкай ці нечым яшчэ, звязаным з людзьмі, ляжыць навуковы падмурак, я б на вашым месцы быў настроены вельмі скептычна — бо ведаў тут проста няма, а можа, ніколі і не будзе.

## АДАМ СМІТ: РЭАЛЬНАСЦЬ І ФАЛЬШЫЎКА

**Мужчына:** Вы сказалі, што класічны лібералізм быў «антыкапіталістычны». Што вы мелі на ўвазе?

**Хомскі:** Фундаментальныя прынцыпы Адама Сміта і іншых класічных лібералаў заключаліся ў тым, што людзі павінны быць свабодныя: яны не павінны знаходзіцца пад кантролем аўтарытарных інстытутаў, не павінны падпарадкоўвацца такім з’явам, як падзел працы, які разбурае іх. Звернемся да спадчыны Сміта: чаму ён выступаў за рынкі? Ён абараняў іх складаным шляхам, але ў аснове аргументацыі была ідэя, што, калі б вы мелі абсалютную свабоду, рынкі прывялі б да поўнай роўнасці — вось чаму Адам Сміт абараняў рынкі. Ён лічыў, што людзям варта быць зусім роўнымі — так, *зусім роўнымі* — і з гэтай прычыны ён, як класічны ліберал, меркаваў, што асноватворчыя рысы чалавечага характару ўключаюць сімпатыю, салідарнасць, права на кантроль над уласнай працай і г. д. — усё гэта процістаіць капіталізму.

Насамрэч, няма дзвюх тэорый, больш антаганістычных, чым класічны лібералізм і капіталізм — і менавіта таму Чыкагскаму ўніверсітэту, калі той выдаваў творы Сміта да 200-годдзя, давялося сказіць тэкст (што і было зроблена). Як сапраўдны класічны ліберал, Сміт катэгарычна не згадзіўся б з той лухтой, якую цяпер распаўсюджваюць ад яго імя.

Калі вы пачытаеце ўводзіны Джорджа Стыглера да перавыдання «Даследавання аб прыродзе і прычынах багацця народаў», прымеркаванага да 200-гадовага юбілею твору (гэта вялікае навуковае выдавецтва пры Чыкагскім універсітэце, таму цікава зірнуць на гэтую кнігу) — гэтыя ўводзіны дыяметральна процілеглыя ідэям Сміта, пункт за пунктам. Сміт праславіўся тым, што пісаў пра падзел працы: лічыцца, што ён ухваляў гэты падзел. А насамрэч Сміт лічыў, што падзел працы — *жахлівая* рэч; ён пісаў, што ў любым цывілізаваным грамадстве ўрад павінен умешвацца, каб прадухіліць разбурэнне людзей шляхам падзелу працы. Добра, зараз зазірнем у індэкс кнігі, у дэталёвы, акадэмічны індэкс, і па-

шукаем словаспалучэнне «падзел працы». Вы не знойдзеце спасылкі на гэты ўрывак Сміта, яго проста няма.

Так, гэта *рэальная* акадэмічная навука: поўная забарона фактаў, трактоўка іх у процілеглым сэнсе, спадзяванне, што «напэўна ніхто не прачытае старонку 473, бо я не прачытаў». Спытайце ў рэдактараў Сміта, ці яны калі-небудзь чыталі старонку 473? Атрымаеце адказ: можа быць, чыталі першы абзац. Потым яны ўспомняць тое, пра што ім расказвалі ў каледжы.

Але праблема ў тым, што для класічных лібералаў у XVIII ст. існавала пэўная канцэпцыя таго, чым з'яўляюцца людзі. Меркавалася, што станаўленне людзей як асобаў залежыць ад віду працы, якую яны выконваюць, ад кантролю, які яны маюць над уласнай працай, і ад іх здольнасці дзейнічаць творча, паводле ўласных рашэнняў і ўласнага выбару. І ў той час гэты тэзіс вельмі ўдумліва каментаваўся.

Напрыклад, адзін з заснавальнікаў класічнага лібералізму, Вільгельм фон Гумбальт (які дзіўным чынам вельмі шануецца сёння так званымі кансерватарамі, бо яны яго не чыталі), адзначаў, што, калі работнік стварае прыгожую рэч на замову, можна «захапляцца тым, што ён робіць, але ненавідзець тое, што з сябе ўяўляе сам працаўнік». Прычына ў тым, што ён паводзіць сябе не як чалавечая істота, а як машына. І гэтая канцэпцыя праходзіць чырвонай ніткай праз увесь класічны лібералізм. Нават праз паўстагоддзя Алексіс дэ Таквіль[19] адцеміў, што існуюць сістэмы, у якіх «мастацтва ўдасканальваецца, а рамеснік дэградуе», але гэта негуманныя сістэмы, бо вы насамрэч цікавіцеся рамеснікам, *людзьмі*. А каб людзі мелі магчымасць жыць паўнавартасным жыццём, якое прыносіць аддачу, ім трэба ажыццяўляць кантроль над тым, што робяць, нават калі здараецца, што такая сістэма эканамічна менш эфектыўная.

Відавочна, у інтэлектуальным і культурным асяродку за пару стагоддзяў адбыліся радыкальныя змены, у т. л. і ў стаўленні да Сміта. Але я мяркую, што гэтыя класічныя ліберальныя канцэпцыі трэба цяпер вярнуць ва ўжытак, а ідэі, што ляжаць у іх падмурку, варта ўкараніць у масавым маштабе.

Крыніцы ўлады і аўтарытэту, якія людзі маглі бачыць перад сабою ў XVIII ст., істотна адрозніваюцца ад тых, што мы бачым сёння, — тады перад вачыма лібералаў стаялі феадальная сістэма, царква, абсалютысцкая дзяржава. Яны не маглі бачыць прамысловай карпарацыі, бо яна ў той час яшчэ не існавала. Аднак, калі вы возьмеце асноўныя прынцыпы класічнага лібералізму і накладзеце іх на мадэрны перыяд, мяркую, што вы наблізіцеся да прынцыпаў, якія натхнялі рэвалюцыйную Барселону ў другой палове 1930-х гг. — да т. зв. анарха-сіндыкалізму[20]. Мяркую, што на дадзены момант гэта найвышэйшы ўзровень, якога людзі

[19] Французскі палітык і пісьменнік.

[20] Анарха-сіндыкалізм — форма лібертарнага сацыялізму, якая на кароткі час расквітнела ў некаторых рэгіёнах Іспаніі ў час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны 1936 г., пакуль не была разбураная адначасовымі намаганнямі Савецкага Саюза, заходніх дзяржаў і фашыстаў.

дасягнулі, спрабуючы рэалізаваць прынцыпы лібертарызму, якія, на мой погляд, з'яўляюцца правільнымі. Не кажу, што ўсё, зробленае ў час той рэвалюцыі, было правільным, але сваім агульным духам і характарам, які дазваляў развіццё грамадства з народным кантролем над усімі грамадскімі інстытутамі (што Дж. Оруэл убачыў і апісаў у сваім, лічу, найлепшым творы — «Даніна Каталоніі») гэты час вызначыў напрамак, да якога варта рухацца.

## КАМП'ЮТЭР І ЛОМ

**Мужчына:** Ноам, беручы пад увагу тое, што вы сказалі раней пра абмежаванасць нашага разумення чалавечай натуры і сацыяльных зменаў, ці не лічыце вы, што павінна быць агульная перасцярога для людзей, якія ўмешваюцца ў сацыяльныя працэсы з удзелам людзей?

**Хомскі:** Так — любы від рашучага ўварвання ў чалавечае існаванне, ці ў чалавечае грамадства, з'яўляецца дужа сумнеўным. Дапусцім, вы маеце персанальны камп'ютэр і ён не працуе — кепскай ідэяй было б рамантаваць яго з дапамогай лома. Магчыма, удар ломам выпадкова паправіць камп'ютэр, але ў цэлым гэта аблудная тактыка — а чалавечыя грамадствы значна больш складаныя, чым камп'ютэры, як і чалавечыя істоты. Такім чынам, навязваючы перамены, вы ніколі не разумееце дакладна сутнасці таго, што робіце. Людзі павінны ажыццяўляць змены самі: іх нельга навязваць звонку.

Зноў-такі звернемся да іспанскай рэвалюцыі. Так, яна ішла ўсяго адзін год у не вельмі развітай краіне (хоць у Іспаніі была прамысловасць і г. д.), яна не можа быць мадэллю для будучыні. Аднак у час рэвалюцыі адбывалася многа цікавых рэчаў, і яны не зваліліся як гром сярод яснага неба — яны рыхтаваліся, можа, цягам пяцідзесяці гадоў. У час падрыхтоўкі вялася арганізацыйная праца, ставіліся эксперыменты, часам непаспяховыя. Здаралася, што гэтыя эксперыменты і спробы зрывала армія, але яны ставіліся зноў. Такім чынам, калі нехта кажа, што рэвалюцыя была спантанная, гэта няпраўда: яна была вынікам мноства эксперыментаў, роздумаў, працы і г. д. Калі надышоў рэвалюцыйны момант і існая сістэма пачала бурыцца, людзі ўжо мелі ў галовах вобраз таго, што трэба рабіць, і нават мелі досвед ажыццяўлення сваіх вобразаў на мясцовым узроўні. Ім заставалася развіць свой вобраз у масавым маштабе. І яны паспрабавалі развіць яго рознымі шляхамі — не было адзінай схемы, паводле якой ладзіліся змены, розныя супольнасці самі выбіралі варыянты ў розных умовах і знаходзілі для сябе варыянт, які працаваў. Гэта добры прыклад таго, як павінны ісці канструктыўныя змены.

З іншага боку, калі эканаміст з Гарварда (дапусцім) прылятае сёння ва Усходнюю Еўропу і кажа: «Вось шлях вашага развіцця», гэта горш, чым удар па камп'ютэры ломам: ёсць мільён розных сацыяльных, культурных і эканамічных чыннікаў, якіх гэты эканаміст не разумее. Любыя вялікія перамены, навязаныя народу, хутчэй за ўсё, акажуцца катастрафічнымі. Вядома, катастрафічнымі для яго ахвяр — для людзей, якія праводзяць гэтыя эксперыменты, яны звычайна вельмі

добрыя, чаму гэтыя эксперыменты і вядуцца цягам апошняй пары стагоддзяў (з таго часу, як брытанцы распачалі іх у Індыі). Маю на ўвазе, што кожны эксперымент — катастрофа для яго ахвяр, але, бясспрэчна, цудоўная рэч для тых, хто торгае за нітачкі. Калі ўжо казаць пра неабходнасць сацыяльных рэформ, то людзі лепш праводзяць іх самі — крок за крокам — пад сваім уласным кантролем. Такія рэформы праводзіліся на мясцовым узроўні ў Барселоне 1930-х гг., і я мяркую, цяпер нам трэба імкнуцца да такога тыпу рэформ.

# Раздзел 7

## ІНТЭЛЕКТУАЛЫ І САЦЫЯЛЬНЫЯ ЗМЕНЫ

(Раздзел заснаваны пераважна на матэрыялах дыскусій у Вудс Холе і Роў, Масачусетс, у 1989, 1993 і 1994 гг.)

## ЛЕНІНСКАЯ/КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ

**Мужчына:** Ваша бачанне лібертарнага сацыялізму вельмі прывабнае — дзіўна, чаму яно не спрацоўвае?

**Хомскі:** Па-першае, не факт, што яно не спрацоўвае. Вы можаце запярэчыць, што мы яшчэ не гатовыя да такога тыпу сацыялізму — але быў перыяд, калі мы не былі гатовыя і да скасавання рабства, калі варункі, разам з суб’ектыўнымі, былі такімі, што адмена рабства проста не абмяркоўвалася, здавалася неверагоднай. Нехта можа заявіць, што цяперашнія ўмовы патрабуюць такога ўзроўню іерархіі і дамінавання, які існуе ў таталітарных інстытутах накшталт капіталістычных прадпрыемстваў — проста для таго, каб задаволіць нашы патрэбы. Нехта скажа, што нам патрабуецца «дыктатура пралетарыяту» ці іншая аўтарытарная структура. Я не веру ніводнаму слову ў гэтых заявах, але рэч у тым, што апраўданне любой сістэмы ўлады трэба абмеркаваць і давесці людзям, перш чым гэтая сістэма прэтэндуе на якую-любя легітымнасць. А ў нашым выпадку гэтых доказаў няма.

Калі вы паглядзіце на тое, што *здаралася* з разнастайнымі спробамі наладзіць сістэму лібертарыянскага сацыялізму, якія адбываліся ў свеце, то ўбачыце: канцэнтрацыя сілы і гвалту ў гэтых сітуацыях была настолькі вялікая, што некаторыя вынікі забяспечваліся, але ўрэшце ўсе зародкавыя спробы, напрыклад, супольнага рабочага кантролю, проста падаўляліся. Сацыялісты намагаліся пабудаваць сістэму цягам соцень гадоў — праблема ў тым, што гэтая сістэма бурылася. І часта яна бурылася сілай.

Выдатны прыклад — бальшавікі. На стадыях, папярэдніх бальшавіцкаму перавароту ў кастрычніку 1917 г., у Расіі *зараджаліся* сацыялістычныя інстытуты — рады рабочых, прафсаюзы і падобнае[21]. Яны існавалі і пасля захопу ўлады

[21] Г. зн. пасля народнай рэвалюцыі, якая скінула цара ў лютым 1917 г.

бальшавікамі, але нядоўга; Ленін і Троцкі практычна знішчылі іх, як толькі ўмацавалі сваю ўладу. Можна спрачацца, ці мае апраўданне гэтае знішчэнне, але факт застаецца фактам: сацыялістычныя ініцыятывы былі хутка знішчаныя.

Людзі, якія шукаюць апраўданняў, скажуць: «Бальшавікі мусілі зрабіць гэта». Вось стандартнае апраўданне: Ленін і Троцкі павінны былі зрабіць гэта з прычыны бедстваў грамадзянскай вайны, для выжывання дзяржавы, інакш яны б не мелі харчоў і г. д. Ці слушнае такое апраўданне? Трэба заглыбіцца ў гістарычныя факты. Я не думаю, што яно правільнае. Я лічу, што зародкавыя сацыялістычныя суполкі ў Расіі былі разбураныя перад тым, як узніклі насамрэч жахлівыя ўмовы. Добра, тут мы сутыкаемся з праблемай, якой нельга развязаць мімаходзь — праблемай гістарычнага факту, якімі былі людзі, што яны думалі і г. д. Тут мала проста здагадвацца — трэба знайсці дакладныя адказы. Але з таго, што я прачытаў у іхніх пісаннях, я адчуваю, што Ленін і Троцкі ўсведамлялі тое, што яны робяць — яны наўмысна і свядома разбуралі сацыялістычныя супольнасці, абгрунтоўваючы гэта нават у тэорыі, прычым як маральнай, так і сацыялагічнай.

Па-першае, як артадаксальныя марксісты, яны насамрэч не верылі, што сацыялістычная рэвалюцыя была магчымая ў Расіі, бо Расія была проста сялянскім балотам: яна не была развітай індустрыяльнай краінай, дзе, на іх думку, павінна была адбыцца сацыялістычная рэвалюцыя. Таму, калі бальшавікі захапілі ўладу, яны спадзяваліся распачаць ланцуговую рэакцыю і чакалі, што «жалезныя законы гісторыі» справакуюць рэвалюцыю ў Германіі, дзе яна, як меркавалася, павінна была здарыцца як гістарычная неабходнасць. Расіі ж было наканавана застацца балотам — але ў далейшым яна развілася б з нямецкай дапамогай.

У студзені 1919 г. у Германіі адбылася рэвалюцыя, але яна была раздушаная і нямецкі рабочы клас апынуўся пад прыгнётам. Леніну і Троцкаму давялося несці цяжар улады — і ўрэшце яны вырашылі кіраваць сялянскай краінай пры дапамозе гвалту. Паколькі Расія была збяднелай краінай «трэцяга свету», яны лічылі, што трэба проста падганяць людзей да развіцця. Таму яны паспрабавалі загнаць рабочых у «працоўныя арміі», падпарадкаваць іх кантролю «правадыра», які б прымусіў краіну да індустрыялізацыі ва ўмовах рэжыму, які самі бальшавіцкія лідэры называлі «дзяржаўным капіталізмам». Яны спадзяваліся на тое, што ў гэтым працэсе Расія пройдзе раннія стадыі капіталізму і індустрыялізацыі і дасягне ступені матэрыяльнага развіцця, дзе пачнуць дзейнічаць жалезныя законы гісторыі. Тады, згодна з запаветамі Вялікага настаўніка, нарэшце будзе пабудаваны сацыялізм[22].

Такім чынам, за дзеяннямі Леніна і Троцкага была тэорыя, а таксама і маральныя прынцыпы — маўляў, калі мы гэтак зробім, то ў выніку людзям будзе лепш жыць. Аднак я лічу, што насамрэч яны заклалі падмурак таталітарнай сістэмы, будаўніцтва якой, вядома, паскорыў Сталін.

[22] Г. зн. згодна з тэорыяй Карла Маркса, дзе гаворыцца, што гісторыя развіваецца паводле натуральных «законаў», і што вышэйшыя стадыі капіталізму непазбежна вядуць да сацыялізму.

**Мужчына:** Як бы вы ацанілі аўтарытарныя наступствы бальшавіцкіх дзеянняў — шчырай памылкай, «гістарычнай выпадковасцю», магчыма, — ці яны былі натуральным чынам абумоўленыя ленінісцкім светапоглядам, думкай, што толькі нямногія людзі дастаткова разумныя і развітыя, каб быць лідэрамі, і яны мусяць весці рэй?

**Хомскі:** Так, на мой погляд галоўная праблема хаваецца ў самім марксізме-ленінізме, у самой ідэі, што «партыя новага тыпу» можа, ці мае права, весці дурныя масы да нейкай будучыні, якой яны самі не здольныя зразумець. Я думаю, што гэта прывядзе да прынцыпу: «буду кіраваць вамі пугай». Структуры дамінацыі вельмі лёгка рэпрадукуюць сябе — мяркую, гэта амаль відавочны сацыялагічны труізм.

Калі вы зазірнеце ў мінуўшчыну, то ўбачыце — насамрэч збылося прадказанне Бакуніна, зробленае на паўстагоддзя раней[23] . Бакунін казаў пра людзей з атачэння Маркса, гэта было яшчэ да нараджэння Леніна. Яго прадказанне заключалася ў наступным: прырода інтэлігенцыі як сацыяльнай групы ў мадэрным капіталістычным грамадстве ў тым, што яна імкнецца да ролі пераўтваральніка грамадства («сацыяльнага менеджэра»). Інтэлігенты імкнуцца стаць сацыяльнымі менеджэрамі не дзякуючы ўласнаму капіталу ці таму, што маюць шмат зброі. Прычына ў тым, што інтэлігенты ўмеюць кантраляваць, арганізоўваць і скіроўваць тое, што называецца «ведай» — яны маюць навыкі апрацоўкі інфармацыі, мабілізацыі падтрымкі для прыняцця рашэнняў і г. д. Бакунін прадказаў, што гэтыя людзі падзеляцца на дзве часткі. Адна будзе складацца з «левых» інтэлектуалаў, якія паспрабуюць заваяваць уладныя пасады на плячах масавых народных рухаў. Калі яны здолеюць заваяваць уладу, то змусяць народ да падпарадкавання і паспрабуюць паставіць яго пад поўны кантроль. З другога боку, інтэлігенты, якія зразумеюць, што не здолеюць самі дабіцца ўлады вышэйапісаным шляхам, стануць служкамі таго, што мы цяпер назвалі б «дзяржаўным капіталізмам», хоць Бакунін не ўжываў гэтага паняцця. І кожная з гэтых груп, казаў Бакунін, будзе «біць народ сваім уласным бізуном», то бок спярша выставіць сябе ў ролі прадстаўнікоў народа, каб захапіць народны бізун, а потым скарыстае яго супраць народа.

Бакунін не развіў сваёй думкі, але я мяркую, што з яго аналізу вынікае наступнае: дужа проста перайсці з адной групы інтэлігентаў у другую і набыць сіндром «развенчанага бога». Вы пачынаеце як ленініст, чалавек, які збіраецца стаць часткай «чырвонай бюракратыі» (тэрміналогія Бакуніна), але потым вы бачыце, што моц не на гэтым баку, і вельмі лёгка становіцеся ідэолагам правіцы, прысвячаеце сваё жыццё выкрыванню грахоў вашых былых таварышаў, якія яшчэ не ўбачылі святла і не перакінуліся туды, дзе насамрэч знаходзіцца ўлада. Вам амаль не трэба мяняцца, вы проста дзейнічаеце ў рамках іншай структуры

[23] Бакунін быў расійскім анархістам XIX ст., разам з Марксам кіраваў асноўнай сацыялістычнай працоўнай арганізацыяй таго часу, Першым Інтэрнацыяналам.

фармальнай улады. Цяпер мы назіраем гэта на тэрыторыі былога Савецкага Саюза: тыя самыя людзі, якія былі камуністычнымі бандытамі, сталіністамі два гады таму, цяпер кіруюць банкамі, зрабіліся апантанымі прыхільнікамі свабоднага рынку, хваляць Амерыку і г. д. І гэта адбывалася цягам сарака гадоў — увесь працэс стаў свайго кшталту іроніяй лёсу.

Аднак Бакунін не сцвярджаў, што *прырода* людзей абумоўлівае яго сцэнар падзей. Не ведаю, наколькі глыбока ён прадумаў свае тэзісы, але мы мусім сказаць, што ні «чырвоная бюракратыя», ні яе аналаг — камісары дзяржаўнага капіталізму — не абавязаныя перамагчы таму, што такая прырода людзей. Рэч проста ў тым, што інтэлігенты, якія не будуць дзейнічаць згодна з бакунінскім сцэнаром, акажуцца выпхнутымі на ўзбочыну, а тыя, хто будзе дзейнічаць, праб'юцца. Бязлітасныя, грубыя, дастаткова жорсткія, каб захапіць уладу — гэта тыя, хто выжыве. Тыя, хто спрабуе атаясаміць сябе з народнымі арганізацыямі і дапамагчы насельніцтву арганізаваць сябе, хто спрабуе падтрымаць народныя рухі ў гэтым кірунку, проста не выжывуць ва ўмовах канцэнтраванай улады.

## МАРКСІСЦКАЯ «ТЭОРЫЯ» І ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ АШУКАНСТВА

**Жанчына:** Ноам, акрамя ідэі «авангарду», мяне цікавіць, чаму вы гэтак крытычна настроены да вялікай часткі марксісцкага аналізу і да людзей з універсітэтаў і г. д., якія называюць сябе марксістамі. Я заўважыла, што вам ніколі не было добра з імі.

**Хомскі:** У «марксізме» мяне адштурхоўвае сама ідэя, што *ёсць* такая рэч. Памойму, відавочна, што ў навуцы не можа быць «марксізму» — як у фізіцы няма, да прыкладу, «эйнштэйніянізму» ці «планкізму». У гэткіх паняццях няма сэнсу, бо людзі — не богі: яны проста адкрываюць нейкія рэчы, дапускаюць памылкі, вучні паказваюць ім на памылкі, яны выпраўляюцца і гэтак далей. Але сярод нас няма багоў. Часам навукоўцы скарыстоўваюць тэрміны накшталт «ньютаніянства» ці «дарвінізм», але ніхто не прэзентуе іх як дактрыны, да якіх трэба быць лаяльнымі, не пралічвае, пра што думаў «вялікі настаўнік», што б ён сказаў у новых абставінах і г. д. Гэткі падыход цалкам чужы рацыянальнаму існаванню, ён выяўляецца толькі ў ірацыянальных сферах.

І марксізм, і фрэйдызм я разглядаю як ірацыянальныя культы. Яны належаць да тэалогіі, таму нясуць яе рысы: я няшмат думаю пра тэалогію. Насамрэч, на мой погляд аналогія відавочная — такія паняцці, як «марксізм» і «фрэйдызм», належаць да гісторыі арганізаванай рэлігіі.

Так што з майго гледзішча праблемай з'яўляецца само іх існаванне: мне здаецца, што нават абмяркоўваць такія рэчы, як «марксізм», значыць рабіць памылку. Мы ж не абмяркоўваем «планкізм» — чаму? Бо гэта было б вар'яцтвам. Макс Планк[24] сказаў нямала рэчаў, некаторыя былі правільныя, і яны сталі падмур-

[24] Нямецкі фізік.

кам для сучаснай навукі, некаторыя — няправільныя, і Планка паправілі. Гэта не значыць, што Планк не быў вялікім чалавекам — у яго былі вялікія адкрыцці, былі і памылкі. Вось такім чынам мы павінны ацэньваць яго спадчыну, на маю думку. А заводзячы гаворку пра «марксізм» ці «фрэйдызм», вы ўжо адыходзіце ад рацыянальнасці.

Мне здаецца, рацыянальная асоба павінна перадусім задаць сабе пытанне: што ў творчасці Маркса вартае захавання і ўдасканалення, а што варта адкінуць? Тады вы глядзіце на гэтую творчасць і многае заўважаеце. Думаю, Маркс стварыў вельмі цікавыя апісальныя працы па гісторыі XIX ст. Ён быў выдатным журналістам. Калі ён апісвае дзеянні брытанцаў у Індыі, ці Парыжскую камуну, яго цікава чытаць. Тое самае можна сказаць пра раздзелы «Капіталу», дзе ён расказвае пра індустрыяльны Лондан. Па-мойму, пазнейшая навука многае ўдасканаліла і ўнесла змены, але апісанні Маркса цікавыя.

Ён стварыў абстрактную мадэль капіталізму, якая… папраўдзе, не ведаю, якую яна мае каштоўнасць. Як любая абстрактная мадэль, яна не павінна была змяшчаць скрупулёзнае апісанне ўсіх дэталяў. Яна задумвалася для абмалёўкі некаторых найважнейшых характарыстык і іх вывучэння. Вы запытаецеся, наколькі ўдала ў ёй схопленыя рысы складанай рэчаіснасці? Тут ёсць пытанні — па-першае, можна запытацца, наколькі ўдала схоплены капіталізм XIX ст., а па-другое, адпаведнасць мадэлі Маркса капіталізму XX ст. яшчэ больш праблематычная.

У Маркса нібыта выведзеныя «законы»[25]. Я не магу зразумець іх — вось усё, што я магу сказаць. Не думаю, што з яго апісанняў выводзяцца нейкія законы. Не тое каб я ведаў *лепшыя* законы, проста я не думаю, што мы ўвогуле ведаем «законы» гісторыі.

Маркс нічога не пісаў пра сацыялізм, ён не быў сацыялістычным філосафам. Ва ўсёй спадчыне Маркса сацыялізму прысвечана недзе пяць сказаў. Ён быў тэарэтыкам капіталізму. Я мяркую, ён ва ўсякім разе ўвёў некаторыя цікавыя паняцці, якія кожнаму разумнаму чалавеку варта было б засвоіць і выкарыстоўваць — такія паняцці, як клас, вытворчыя адносіны…

## ДЫЯЛЕКТЫКА?

**Хомскі:** Дыялектыка — гэта нешта такое, чаго я ніколі не разумеў. Проста не цямлю, што азначае гэтае слова. Маркс, дарэчы, не ўжываў яго, у адрозненне ад Энгельса. І калі нехта патлумачыць мне, што такое дыялектыка, я буду рады. Я чытаў пра дыялектыку ўсё, што можна, — і не маю нават найбольш туманнага ўяўлення пра сэнс гэтага паняцця. Яно нібыта значыць складанасць, выбар з двух варыянтаў, зменлівасць? Не ведаю.

Скажу вам чыстую праўду: калі гаворка заходзіць пра такія рэчы, я станаўлюся прастаком. Калі я чую чатырохскладовае слова, то станаўлюся скептыкам, бо хачу ўпэўніцца, што вы не маглі выказаць тое самае ў аднаскладовых словах. Не

[25] Гісторыі і эканомікі.

забывайцеся, часткай паклікання інтэлектуалаў з'яўляецца стварэнне для сябе нішы; калі ўсе могуць зразумець, пра што вы гаворыце, вы — інтэлектуал-небарака, бо чым вы адрозніваецеся ад «паспалітага люду»? Вас ратуе, калі вы прамаўляеце нешта вельмі цяжкое для разумення, авалодваеце гэтым мастацтвам настолькі, што людзі вакол не разумеюць вас. Гэтае неразуменне робіцца падмуркам вашых прывілеяў і ўлады.

Вазьміце тое, што называецца «тэорыяй літаратуры», — не думаю, што існуе такая рэч, як «тэорыя» літаратуры, ці «тэорыя» культуры, гісторыі. Калі вы проста чытаеце кнігі, гаворыце пра іх і звяртаецеся да людзей так, каб яны вас зразумелі — цудоўна, вы можаце стаць майстрам гэтай справы, падобным да Эдмунда Уілсана, — але Уілсан не меў ніякай «тэорыі» літаратуры. З іншага боку, калі вы хочаце мець статус, які мае фізік, што расказвае пра кваркі, вам лепш выпрацаваць «тэорыю»: яго тэорыя складаная, яе ніхто не можа зразумець, чаму б мне не мець складанай тэорыі, якой ніхто не зможа зразумець… Калі нехта выступае з тэорыяй гісторыі, тое самае: гэта будуць альбо прапісныя ісціны, ці, магчыма, нейкія хітрыкі накшталт: «чаму б не паглядзець на эканамічныя фактары, якія стаяць за Канстытуцыяй?» Але ўсё ў гэтых тэорыях можа быць выказана ў аднаскладовых тэрмінах.

Насамрэч, апрача як у прыродазнаўчых навуках, вельмі цяжка знайсці дзенебудзь рэчы, якія няможна выказаць у аднаскладовых тэрмінах. Існуюць проста цікавыя, простыя ідэі, да якіх часта надзвычай цяжка дарасці і з якімі складана працаваць. Напрыклад, калі вы захочаце зразумець, як развілася сучасная індустрыяльная эканоміка, гэта зойме шмат часу і працы. Але «тэорыя» будзе вельмі беднай, калі пад тэорыяй мы разумеем нешта, заснаванае на прынцыпах, якія не відавочныя пры першым поглядзе, з чаго вы можаце вывесці нечаканыя наступствы і паспрабаваць пацвердзіць прынцыпы — нічога падобнага вы не знойдзеце ў сацыяльным свеце.

Дарэчы, мушу сказаць, што мае ўласныя палітычныя пісанні часта ганяцца і левымі, і правымі за тое, што яны нетэарэтычныя — апошняе сцвярджэнне абсалютна карэктнае. Але яны гэткія ж тэарэтычныя, як і пісанні іншых, проста я называю іх не «тэарэтычнымі», а «трывіяльнымі», якімі ў існасці яны і ёсць. Не кажу, што людзі, чыя пісаніна лічыцца «глыбокай тэорыяй», не могуць сказаць нейкіх цікавых рэчаў. Але ў іх няма нічога, што перавышала б узровень школьніка старэйшых класаў. У любым разе, школьнік мог бы сказаць тое самае, калі б меў час, падтрымку і трохі трэніроўкі.

Мяркую, людзі павінны з вялікім недаверам ставіцца да непразрыстых інтэлектуальных канструктаў — з той прычыны, што ў большасці сегментаў жыцця мы проста нічога не цямім. Так, ёсць некаторыя сегменты, накшталт, дапусцім, квантавай фізікі, дзе гэтыя канструкты не падманлівыя. Але ў большасці выпадкаў яны проста падманлівыя: усё, што ўвогуле можна зразумець, верагодна, можна апісаць вельмі проста. А калі з'яўляюцца словы «дыялектыка» ці «герменеўтыка», ці іншая лухта, якая лічыцца вельмі глыбокай, я, падобна Гёрынгу, «хапаюся за рэвальвер».

**Мужчына:** Вельмі суцяшае, што вы не разумееце слова «дыялектыка», гэта мяне неяк бадзёрыць.

**Хомскі:** Я не кажу, што гэтае слова зусім не мае значэння — можна назіраць, як людзі ўжываюць гэты тэрмін і пры гэтым быццам бы камунікуюць. Аднак для мяне гэта ўсё адно, як чуць людзей, якія гутараць па-турэцку: нешта адбываецца, але без мяне.

Насамрэч, час ад часу ў інтэрв'ю я казаў пра сваё неразуменне «дыялектыкі» і атрымліваў доўгія лісты, дзе гаварылася: «Вы не разумееце, а дыялектыка — гэта…», і далей ішло ці нешта незразумелае, ці нешта зусім трывіяльнае. Так што, магчыма, у мяне адсутнічае ген, адказны за разуменне дыялектыкі, — як у людзей, якія не чуюць нейкага тону і проста не могуць слухаць музыку. Але ўсё, на што я натрапляў у гэтай сферы, здаецца мне альбо цікавым, але дужа відавочным (магчыма, вы не бачылі гэтага спярша і нехта мусіў паказаць вам на гэта), альбо проста незразумелым.

Я скептык і лічу, што кожны мае права быць скептыкам, калі чагосьці не разумее. Калі я гляджу на старонку, дзе напісана пра, скажам, квантавую электрадынаміку, я не разумею там ні слова. Але я ведаю, *што* я мусіў бы зрабіць, каб пачаць яе разумець, і я веру, што я мог бы пачаць гэта разумець — мне ўдавалася зразумець іншыя складаныя рэчы. Такім чынам, я ацэньваю, ці паглыбіцца мне ў дысцыпліну: калі я прайду пэўныя стадыі, то ўрэшце дабяруся да пункту, на якім здолею зразумець квантавую электрадынаміку. Ці я пайду да каго-небудзь на фізічны факультэт і запытаюся: «Раскажыце мне, чаму ўсе захапляюцца гэтай лухтой», мне дадуць тлумачэнне, улічваючы мой узровень, і раскажуць, як займацца фізікай у далейшым. Магчыма, я не здолею асэнсаваць фізічных праблемаў вельмі глыбока, не дасягну ўзроўню адкрыццяў, але я прынамсі пачну разумець тое, пра што мне гавораць. З іншага боку, калі я чытаю марксісцкую філасофію або тэорыю літаратуры, я адчуваю, што магу ўзорыцца на старонку кнігі да канца майго жыцця і ніколі не зразумею таго, што там напісана — і не ведаю, як *пачаць* лепш разумець гэта, я нават не ведаю, якія крокі зрабіць.

Магчыма, гэтыя сегменты вышэйшыя за маё разуменне, бо я недастаткова разумны. Але гэта прывяло б да смешных высноў, якія не мелі б дачынення да асаблівасцей майго (не)разумення. Выйшла б так, што ў гэтых сегментах людзі аказаліся здольныя стварыць нешта больш складанае, чым у фізіцы і матэматыцы — бо ў гэтых навуках, мне здаецца, я магу пачаць нешта разумець. Папраўдзе, я не веру ў гэта: не веру, што літаратурныя тэарэтыкі ці філосафы-марксісты прасунуліся на нейкі новы інтэлектуальны ўзровень, які перасягае стагоддзі цяжкой разумовай працы.

**Мужчына:** Ці мяркуеце вы, што тое самае можна сказаць пра філасофію ўвогуле?

**Хомскі:** Ёсць часткі філасофіі, якія, мне здаецца, я разумею, і гэта тычыцца большай часткі класічнай філасофіі. А ёсць рэчы, якіх я не разумею, бо яны не маюць ніякага сэнсу — і тут таксама ўсё ў парадку, ідзецца пра складаныя пытанні. Сказаць, што нешта нейкае не мае сэнсу — неабавязкова крытыка: проста ёсць прадметы, якія цяжка паддаюцца сэнсоўнаму абмеркаванню. Аднак калі я

чытаю, дапусцім, Расэла, ці аналітычную філасофію, ці Вітгенштайна, і гэтак далей, я думаю, што магу прыйсці да разумення іх слоў, і магу зразумець, чаму я лічу іх думкі памылковымі, як гэта часта здараецца. Аднак калі я чытаю Дэрыду, Лакана, Альтусэра ці кагосьці з гэтай кампаніі — я проста нічога не разумею. Словы проста праходзяць перад маімі вачыма: я не магу прасачыць аргументацыі, не бачу ніякіх довадаў, а ўсё, падобнае да апісання фактаў, здаецца мне падманлівым. Так што, магчыма, мне бракуе нейкага гена. Але, праўду кажучы, я мяркую, што ўся гэтая філасофія — падман.

**Мужчына:** Думаю, вы ў чымсьці перабольшваеце «чысціню» навукоўцаў-прыродазнаўцаў. Напрыклад, возьмем ньютанаўскую механіку: Айнштайн паказаў, наколькі яна недасканалая, але цягам гадоў навуковая супольнасць называе яе «ньютанаўскай».

**Хомскі:** Гэта цікавы выпадак, бо ньютанаўская механіка *была* трактавалася як нешта святое — настолькі рэвалюцыйным крокам яна выглядала ў свой час. Маю на ўвазе, што, сапраўды, упершыню ў чалавечай гісторыі людзі здолелі вытлумачыць рэчы ў глыбокім сэнсе: механіка Ньютана была такая ўсёахопная і такая простая, такая далёкасяжная, што амаль заўсёды выглядала неабходнай. І насамрэч, доўгі час яна так і трактавалася — так што, да прыкладу, Кант бачыў задачу філасофіі ў шляху да ньютанаўскай фізікі ад апрыёрных прынцыпаў, каб паказаць, што яна была найвялікшай ісцінай, нароўні з матэматычнымі ісцінамі. І толькі ў канцы XIX — пачатку XX стст. памылковасць тых канцэпцый стала зусім ясная, і з гэтым праясненнем адбыўся сапраўдны крок наперад у нашым разуменні таго, што такое «навука». Так што ў пэўны перыяд навука сапраўды мела рэлігійны характар, вы маеце рацыю — і ад гэтага мы павінны былі пазбавіцца. Больш такога не здарыцца.

## ІДЭАЛАГІЧНЫ КАНТРОЛЬ У ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ НАВУКАХ І ГУМАНІСТЫЦЫ

**Мужчына:** Ці лічыце вы, што ў якасці акадэмічных дысцыплін прыродазнаўчыя навукі істотным чынам адрозніваюцца ад гуманістыкі і сацыяльных навук у плане ідэалагічнага кантролю? Здаецца, што ў прыродазнаўчых навуках няма такіх бар’ераў для даследавання ці такой жа апантанасці ў справе індактрынацыі, як у іншых сферах — напрыклад, у эканоміцы ці паліталогіі.

**Хомскі:** У прыродазнаўчых навуках *існавала* праблема ідэалагічнага кантролю, мы яе пераадолелі адносна нядаўна. Напрыклад, Галілей з ёй сутыкнуўся[26]. Заглыбіцеся на пару стагоддзяў у гісторыю Захаду і ўбачыце, што ідэалагічны кантроль у прыродазнаўчых навуках быў жорсткім. Лічыцца, што Дэкарт знішчыў апошні том свайго трактата пра свет — том, прысвечаны чалавечаму розуму, бо

[26] Італьянскі астраном і навуковец, арыштаваны Рымска-каталіцкай царквой у 1633 г. і змушаны адмовіцца ад сваёй высновы, што Зямля круціцца вакол Сонца.

даведаўся пра лёс Галілея. Інквізіцыя дзейнічала акурат як «эскадроны смерці». Так, гэта ўсё справы мінулага часу прынамсі на Захадзе, але не паўсюдна.

**Мужчына:** Але чаму гэта «справы мінулага часу»?

**Хомскі:** Мяркую, можна назваць некалькі прычын. Адна заключаецца проста ў агульным павелічэнні свабоды і асветы, заваяваным шляхам народнай барацьбы на працягу стагоддзяў — мы сталі значна больш свабодным грамадствам, чым былі ў час абсалютызму. Інтэлектуалы часта адыгрывалі ў гэтым пэўную ролю, ламалі ідэалагічныя бар'еры і стваралі нешта накшталт пляцоўкі для большай свабоды мыслення, напрыклад, у час Асветніцтва[27]. Гэта часта вымагала шмат смеласці і не давалася без барацьбы, як, зрэшты, і цяпер.

Былі таксама і утылітарныя прычыны. Выявілася, што, асабліва з сярэдзіны XIX ст., здольнасць да глыбейшага разумення фізічнага свету дзякуючы навуцы была шчыльна звязаная з мадэрным індустрыяльным развіццём. Прагрэс у навуках матэрыяльна спрыяў росту прыватных даходаў, прыватнай уладзе. Такім чынам, былі утылітарныя прычыны, каб дазволіць свабоду навуковага даследавання, але я б не перабольшваў іхняга значэння — мяркую, што працэс, які спрыяў свабодзе навуковага мыслення, шмат у чым нагадвае працэс, які прывёў да свабоды ў іншых сферах — да скасавання рабства ці да набыцця жанчынамі права голасу праз сто пяцьдзесят гадоў гісторыі Злучаных Штатаў[28].

Таксама згадайце, што, пасля вялікіх навуковых рэвалюцый, якія прывялі да эпохі Асветніцтва, была дасягнутая кропка — вы ўжо не маглі б займацца навукай, падпарадкоўваючыся дактрынальнаму кантролю, які застаўся вельмі эфектыўны ў іншых сферах. Уявіце, што вы — фізік; калі пасля Ньютона спрабавалі б вызнаваць ідэалагічны фанатызм, то аказаліся б проста па-за гульнёй, настолькі далёка зайшоў прагрэс. Тут назіраецца вялікае адрозненне фізікі ад сацыяльных навук і гуманістыкі — у гэтых сферах вы можаце вечна казаць глупствы і нішто вас не спыніць, бо вакол вас няма «маці-прыроды», якая праверыла б вас на сумленнасць. Як вынік, паміж дзвюма культурамі ёсць сапраўднае разыходжанне.

Калі вы скончылі школу прыродазнаўчых навук, вы адразу ж кідаецеся ў крытычнае даследаванне — тое, што вы вывучаеце, з'яўляецца рамяством у найлепшым сэнсе. Насамрэч навука не выкладаецца — людзі асвойваюць яе, як чаляднікі, па магчымасці працуючы з добрымі майстрамі. Мэта навучання ў тым, каб займацца творчай працай, кідаць выклік усяму. А ў гуманістыцы і сацыяльных навуках ад вас чакаюць, што вы пераварыце вялікую колькасць ведаў, потым выбераце маленькі сегмент і рэшту вашага жыцця будзеце працаваць над ім. Як стаць шанаваным навукоўцам у гуманістыцы? Трэба выбраць нейкі таямнічы сегмент, напрыклад, англійскія раманы з 1720 да 1790 гг., і даведацца больш інфармацыі пра гэты сегмент, чым любы чалавек у гісторыі. Такім чынам, вы даведваецеся,

[27] У XVIII ст.

[28] У 1920 г.

хто ў каго спісаў якое слова, і г. д. Многія з такіх звестак не маюць ніякага сэнсу, але лічыцца, што вы павінны іх ведаць. І тут насамрэч вельмі мала інтэлектуальных выклікаў: вы можаце памыліцца хіба ў тым, што няправільна паставіце коску — і сапраўды, гэта лічыцца найгоршым злачынствам. Я малюю сітуацыю трохі карыкатурна, але, шчыра кажучы, мяркую, што сістэма працуе менавіта так. Вядома, прыродазнаўчыя навукі моцна адрозніваюцца.

## ФУНКЦЫЯ ШКОЛ

**Жанчына:** Баюся, што не зусім разумею, як фактычна механізм ідэалагічнага кантролю працуе ў гуманістыцы і сацыяльных навуках. Як ён ажыццяўляецца ў школах, што становяцца часткай сістэмы індактрынацыі? Ці маглі б вы апісаць працэс больш падрабязна?

**Хомскі:** Асноўнае, што трэба сказаць — увесь курс навучання, з дзіцячых садкоў да вышэйшай школы, будзе захоўвацца толькі датуль, пакуль ён працягвае выконваць сваю інстытуцыйную ролю. Возьмем універсітэты, якія шмат у якіх дачыненнях і спосабах функцыянавання не вельмі адрозніваюцца ад медыяў — дарма што ўяўляюць з сябе нашмат больш складаныя сістэмы, і універсітэты цяжэй вывучаць сістэматычна. Універсітэты не зарабляюць дастаткова грошай, каб акупляць сябе коштам платы за навучанне: гэта паразітычныя інстытуты, якія патрабуюць падтрымкі звонку. Гэта значыць, што яны залежаць або ад супольнасці заможных былых выпускнікоў, або ад карпарацый, або ад уладаў. Усё гэта групы, чые супольныя інтарэсы ў прынцыпе аднолькавыя. Пакуль універсітэты *абслугоўваюць* гэтыя інтарэсы, яны будуць фінансавацца. Калі спыняецца абслугоўванне, пачынаюцца непрыемнасці.

Напрыклад, у канцы 1960-х гг. пачало выяўляцца, што універсітэты *неадэкватна* выконвалі сваю ролю — студэнты задавалі пытанні, мыслілі самастойна, адкідалі многае з сістэмы каштоўнасцей істэблішменту, кідалі выклік ва ўсіх сферах — і карпарацыі пачалі рэагаваць на гэта рознымі шляхамі. Па-першае, яны пачалі разгортваць альтэрнатыўныя праграмы навучання: так, Ай-Бі-ЭМ распачала ўласную праграму прафесійнай падрыхтоўкі інжынераў. Калі Мачасусецкі тэхналагічны інстытут (МТІ) не рабіў для іх таго, чаго яны хацелі ў спосаб, які яны хацелі, яны вырашылі рабіць гэта самі — што азначала спыненне фінансавання МТІ. Вядома, у 1960-я працэс адыходу універсітэтаў ад інтарэсаў карпарацый не выйшаў з-пад кантролю, таму крокі да адмовы ад фінансавання былі вельмі абмежаваныя. Аднак яны былі.

Можна бачыць падобныя рэчы і цяпер. Зірніце на Алана Блума і яго кнігу, пра якую ўсе гавораць, «Закрытасць амерыканскага розуму». Гэта тоўстая кніга, бестселер — не ведаю, ці зазіралі вы ў яе, яна жахліва дурная. Я прачытаў яе ў супермаркеце, калі мая… не хацеў бы казаць пра гэта, калі мая жонка хадзіла на закупы, я чакаў яе і чытаў гэтую дурную кнігу. Чытанне заняло ў мяне каля пятнаццаці хвілін.

**Мужчына:** Вы чытаеце дзве тысячы слоў за хвіліну?

**Хомскі:** Ну, «прачытаў» — моцна сказана. Пагартаў, каб убачыць, ці ёсць там нешта не зусім дурное. Што важнага кажа аўтар? Ён хоча, каб адукацыя была пабудаваная на манер падрыхтоўкі курсантаў у вайскова-марской вучэльні: каб студэнты проста праганяліся праз канон «вялікіх думак», выбраных для ўсіх. Тады нейкая група людзей скажа: «Гэта вялікія думкі, у гэтай зборцы — вялікія думкі заходняй цывілізацыі. Вы, мальцы, сядаеце тут і вучыце іх, чытаеце іх і вучыце іх, а потым паўтараеце іх». Вось да такой мадэлі навучання заклікае Блум.

Кожны, хто калі-небудзь задумваўся пра адукацыю, ці займаўся ёй, ці проста хадзіў у школу, ведае, што эфект ад таго, што вывучаць студэнты ў вышэйапісанай мадэлі, будзе практычна нулявы. Не мае значэння, наколькі вялікія тыя думкі, — калі яны проста навязваюцца вам звонку і вы змушаны засвойваць іх крок за крокам, пазней вы проста забудзецеся пра іх. Я ўпэўнены, што кожны з вас вывучаў у школе нейкія прадметы, над якімі вы працавалі, рабілі хатняе заданне, праходзілі іспыт, магчыма, нават атрымлівалі найвышэйшую адзнаку — і праз тыдзень не маглі нават успомніць, што там вам выкладалі. Вы зможаце нешта вывучыць і навучыцца мысліць толькі тады, калі ёсць нейкая мэта навучання, нейкая матывацыя, якая ідзе знутры *вас*. Насамрэч, уся метадалогія ў адукацыі зводзіцца да гэтага — дабіцца, каб студэнты хацелі вучыцца. Калі яны хочуць, яны зробяць усё.

Але праблема ў тым, што гэтая мадэль — Блума і іншых — проста частка агульнай стратэгіі, якая заключаецца ў навязванні дысцыпліны праз школы, у прадухіленні навучання людзей самастойнаму мысленню. Усё, што робіцца згодна з метадам Блума — прагон інфармацыі праз студэнтаў, каб яны запомнілі, што такое «Добрыя Кнігі», якія ім навязваюцца, і тады нібыта адбудуцца вялікія падзеі. Гэта абсалютна дурная форма адукацыі, але, думаю, якраз з гэтай прычыны яна выбіраецца і падтрымліваецца. З гэтай прычыны было так шмат істэрык, калі ў апошнія гады сістэма ставілася пад сумнеў — проста таму, што яна вельмі функцыянальная ў плане дысцыплінавання людзей. Папулярнасць Блума, мяркую, з'яўляецца больш рэакцыяй на вызвольны эфект, які пачаў выяўляцца дзякуючы студэнцкаму руху 1960-х і іншым уплывам на школы і універсітэты.

**Жанчына:** Усе «вялікія мысляры» паводле Блума — белыя мужчыны, якія належаць да эліты.

**Хомскі:** Так, добра — але не мела б значэння, нават калі б ён інакш падабраў матэрыял. Сама ідэя, што ёсць нейкі набор «глыбокіх думак», і мы, разумныя людзі, выберам іх для навучэння вас, дурных мальцаў (ці каб вы вывучылі гэтыя думкі на памяць, бо вы не зможаце зразумець іх сэнсу без прынукі) — гэта нонсенс. Калі вы сур'ёзна чытаеце Платона, вам варта задумвацца, што ў яго слушна, што ў яго памылкова, які найлепшы спосаб глядзець на яго спадчыну, чаму ён сказаў тое, калі мусіў сказаць нешта іншае, якую відавочную памылку ў развагах ён дапусціў тут, і г. д. — тады чытанне Платона ператвараецца ў карысны занятак. Вы чытаеце яго, быццам робіце навуковае даследаванне. Але няма чаго яго чытаць, калі ад вас чакаюць, што вы прачытаеце яго толькі так, а не інакш, калі ад вас чакаюць прызнання, што яго творы — ісціна ў апошняй інстанцыі,

скарб вялікіх думак ці нешта падобнае. Тады ідзецца аб найгоршай форме тэалогіі.

Рэч у тым, што не мае значэння, *што* вы чытаеце, важна, *як* вы чытаеце. Я не маю на ўвазе кніжкі коміксаў, але культурнае багацце прысутнічае амаль паўсюдна, і каб даведацца, што яно азначае, каб стаць багацейшым у культурным плане, вы можаце даследаваць амаль усё і паўсюль. Няма фіксаванага спісу, які быў бы падмуркам ісціны і разумення. Вы можаце прачытаць усе «Добрыя Кнігі», запомніць тое, што там сказана — і забыць гэта праз тыдзень; калі для вас асабіста гэта нічога не значыць, лепш і не чытаць. Вельмі цяжка ведаць, які твор *будзе* нешта азначаць для розных людзей. Але ў свеце ёсць маса захапляльнай літаратуры, і зусім няма прычыны верыць, што калі вы не прачыталі грэкаў, Дантэ і г. д., вы нешта фатальнае страцілі — так, бясспрэчна, вы нешта страцілі, але вы несяце страты і ў тым выпадку, калі не ведаеце нечага і пра іншыя культурныя традыцыі.

Зірніце на кнігі па філасофіі — гэта сфера, якую я трохі ведаю. Некаторыя з найлепшых, найбольш актыўных філосафаў сучаснага свету, людзі, якія аказваюць рэальны ўплыў на развіццё філасофіі, не маглі б адрозніць Платона ад Арыстоцеля, хіба што запомнілі нешта з курсу для пачаткоўцаў, які некалі наведвалі. Гэта не значыць, што вам не трэба чытаць Платона з Арыстоцелем — вядома, ёсць мільёны рэчаў, якія варта прачытаць (праўда, ніхто не можа асвоіць больш за маленечкую частку рэчаў, што хацеў бы ведаць). Але проста чытаць іх не прынясе вам ніякай карысці. Вы чагосьці навучыцеся толькі тады, калі матэрыял інтэгруецца ў вашыя ўласныя творчыя працэсы, іначай ён проста пройдзе праз ваш розум і знікне. У гэтым няма нічога каштоўнага — гэта ўсё адно, што зубрыць катэхізіс, вучыць на памяць Канстытуцыю ці падобныя рэчы.

Сапраўдная адукацыя заключаецца ў падштурхоўванні людзей да самастойнага мыслення — і тлумачыць, як гэта зрабіць найлепш, справа рызыкоўная. Але відавочна, што прадмет навучання павінен уяўляць цікавасць для людзей, *правакаваць* іх на мысленне, паглыбленне ў тэму і даследаванне прадмета. А простае пражоўванне «Добрых Кніг» — найгоршы шлях да абуджэння цікавасці. Гэта шлях да ператварэння людзей у робатаў. Вы можаце назваць яго адукацыяй, калі хочаце, але гэта — процілегласць адукацыі. Таму людзі кшталту Уільяма Бенета[29], Алана Блума і іншыя гэтак змагаюцца за яго.

**Жанчына:** Ці вы мяркуеце, што рэальная мэта універсітэтаў і школ — індактрынацыя людзей, і нічога больш?

**Хомскі:** Не зусім так. Я б не сказаў таксама, што зусім ніякай змястоўнай працы не вядзецца ў школах, ці што яны існуюць толькі дзеля забеспячэння працоўнай сілай карпаратыўнай сістэмы — урэшце, гэта вельмі складаныя ўстановы. Але асноўная інстытуцыйная роля і функцыя школ, прычына, з якой яны падтрымліваюцца, маюць ідэалагічны характар. У школах адбываецца сапраўд-

[29] Міністр адукацыі ва ўрадзе Рэйгана.

ная селекцыя паслухмяных і канфармістаў. Насамрэч, мяркую, гэты працэс пачынаецца яшчэ ў дзіцячых садках.

Раскажу вам прыклад з асабістага жыцця. Мой найстарэйшы і найбліжэйшы сябар — хлопец, які прыбыў у Злучаныя Штаты з Латвіі, калі яму было пятнаццаць. Ён уцёк ад Гітлера ў Нью-Ёрк разам са сваімі бацькамі і пайшоў у школу імя Дж. Вашынгтона, якая ў той час была школай для разумных яўрэйскіх хлопчыкаў з горада Нью-Ёрка. Аднойчы ён расказаў мне, што першым дзівам у амерыканскай школе стаў для яго той факт, што атрыманне ім нізкай адзнакі за курс не мела б значэння, але, калі б ён з’явіўся ў школу са спазненнем на тры хвіліны, то быў бы пакараны — і гэтак адбывалася паўсюдна. Ён зразумеў, што цанілася здольнасць працаваць на канвееры, нават калі гэта быў інтэлектуальны канвеер. Важна было падпарадкоўвацца загадам, рабіць тое, што табе сказалі, быць тым, чаго ад цябе чакаюць. Каштоўнасць заключаецца ў тым, што вы збіраецеся быць рабочым на нейкай фабрыцы — магчыма, яна завецца універсітэтам, і вы будзеце слухацца чыіхсьці загадаў, проста рабіць сваю працу нейкім прадпісаным чынам. Сапраўдную важнасць мае дысцыпліна, а не выбар таго, што важна для вас, ці разуменне рэчаў, якія вас цікавяць: проста дайце зразумець, што вы адпавядаеце патрабаванням фабрыкі.

Па-мойму, школы дагэтуль заахвочваюць дысцыпліну і паслухмянасць, караюць незалежнасць розуму. Калі вам здараецца быць трохі інаватарам, ці вы ў нейкі дзень забыліся пайсці ў школу, бо чыталі кніжку, гэта трагедыя, гэта злачынства — ад вас не чакаюць мыслення, ад вас чакаюць падпарадкавання, апрацоўкі матэрыялу ў той спосаб, які ад вас патрабуюць.

Насамрэч, многія людзі, якія прайшлі праз адукацыйную сістэму і паступілі ў элітныя універсітэты, аказаліся прыдатныя для гэтага, бо жадалі падпарадкоўвацца дурным загадам гады і гады — гэты шлях і я прайшоў. Вось нейкі дурны настаўнік кажа вам: «Рабі так», а вы ведаеце, што гэта не мае ніякага сэнсу, але робіце. Калі робіце, то пераходзіце на чарговую прыступку, а потым выконваеце наступны загад, і нарэшце працярэбліваеце ўвесь шлях, вам выдаецца дыплом: вялізная частка адукацыйнага працэсу адбываецца такім чынам, ад самага пачатку. Некаторыя людзі спраўляюцца, кажучы сабе: «Окей, я зраблю любыя глупствы, якія гэты прыдурак кажа зрабіць, бо хачу ісці наперад», іншыя проста прымаюць каштоўнасці падпарадкавання, як свае, — але ўрэшце гэтыя дзве рэчы зацягваюць. У кожным разе, або вы слухаецеся, або вы — за бортам. Таго, хто задае замнога пытанняў, падпільноўваюць непрыемнасці.

Ёсць таксама людзі, якія *не* спраўляюцца — іх клічуць «праблемнымі» ці «нематываванымі», ці неяк інакш. Не варта быць занадта катэгарычнымі — сапраўды *бываюць* дзеці з праблемамі паводзінаў, але многія з іх проста маюць незалежны склад розуму, ці не любяць падпарадкоўвацца, ці проста хочуць ісці сваім шляхам. І яны сутыкаюцца з непрыемнасцямі ад самага пачатку, і звычайна адсейваюцца. Я таксама навучаў малых дзяцей, і сярод іх заўсёды ёсць нехта, хто проста не прымае вашае слова за дадзенасць. Вельмі кепская тэндэнцыя — спрабаваць затыкаць ім рот, бо з імі сядзіш, як на іголках. Іх трэба заахвочваць.

А сапраўды, чаму маё слова трэба прымаць за ісціну? Хто, увогуле, я такі? Падумайце самастойна. Такой мусіла б быць сапраўдная адукацыя.

Асабіста мне вельмі пашчасціла: з 1,5 да 12 гадоў я наведваў эксперыментальную прагрэсіўную школу прыхільнікаў Д'юі[30]. Там гэта была звычайная рэч: дзяцей заахвочвалі ўсяму кідаць выклік, вы працавалі самі, вам трэба было абдумваць рэчы самастойна і для сябе — гэта быў каштоўны досвед. Для мяне было рэзкай пераменай, калі ўсё скончылася і я мусіў пайсці ў гарадскую сярэднюю школу, якая лічылася гонарам гарадской адукацыйнай сістэмы. Гэта была школа для асабліва адораных дзяцей у Філадэльфіі — і гэта было самае тупое, найбольш смеху вартае месца, у якім я калі-небудзь апынаўся. Для мяне гэта было ўсё адно, што трапіць у чорную дзірку. Гэта была школа з выключна развітым духам канкурэнцыі — таму што ўвядзенне канкурэнцыі з'яўляецца адным з найлепшых сродкаў кантралявання людзей. Такім чынам, усе былі ранжыраваныя, і вы заўсёды ведалі, дзе вы знаходзіцеся: ці вы трэці ў класе, ці мо ўжо з'ехалі на чацвёртае месца? Уся гэтая лухта ўбіваецца ў галовы ў розных тыпах школ — што вы мусіце змагацца з асобай, якая перад вамі, і клапаціцца толькі пра сябе. І ў той школе было шмат падобных рэчаў.

Рэч у тым, што ўсе гэтыя рэчы зусім не неабходныя ў адукацыі. Я ведаю, бо я прайшоў праз альтэрнатыўны варыянт. Але ўлічваючы знешнюю структуру ўлады ў грамадстве, у якім школы цяпер функцыянуюць, інстытуцыйная роля школ — перадусім скіраванне людзей у бок паслухмянасці і канфармізму, каб яны паддаваліся кантролю і індактрынацыі. Пакуль школы адпавядаюць гэтай ролі, іх будуць падтрымліваць.

Вядома, гэтая сістэма не працуе на 100 % — так што заўсёды сустракаюцца людзі, якія не ўпісваюцца ў адведзеныя ім рамкі. І, як я казаў раней, у навуках людзі мусяць быць падрыхтаваныя да крэатыўнасці і непаслухмянасці — таму што іншага шляху, каб *займацца* навукай, няма. Але ў гуманістыцы ды сацыяльных навуках, гэтаксама як у журналістыцы, эканоміцы і г. д., гэта не так відавочна — там людзям даводзіцца рыхтавацца да ролі менеджэраў і кантралёраў, згаджацца з існым ладам, не задаваць лішніх пытанняў. Таму вы сапраўды атрымліваеце вельмі адрозны від адукацыі. І людзі, якія выбіваюцца са строю, адсейваюцца ці падаўляюцца ўсімі спосабамі.

*Пераклаў з амерыканскай Уладзімір Паўловіч паводле* Understanding Power: The Indispensable Chomsky. By Noam Chomsky, John Schoeffel, Peter Mitchell. New York: The New Press, 2002.

[30] Джон Д'юі — амерыканскі філосаф і рэфарматар адукацыі.

## IN MEMORIAM

**ВАСІЛЬ АЎРАМЕНКА**

# Ад дысыдэнта да імпэрыяліста

## Аляксандар Салжаніцын і яго шлях

Сьмерць Салжаніцына і згадкі аб ягоным жыцьці ўзьнялі цікавасьць да гэтай асобы ў Беларусі, якая мае свае падставы, адрозныя ад расейскіх.

Аляксандар Салжаніцын прайшоў доўгі шлях ад простага савецкага чалавека да прынцыповага антыкамуніста і далей да «імпэрскага рамантыка» канца XX ст. Гэта само па сабе ўжо нямала, нават для жыцьця працягласьцю 90 гадоў. Тым больш, што ён ня быў ні палітычным «флюгерам», ні літаратурным каньюнктуршчыкам, а церабіў свой шлях часам насуперак жыцьцёвым абставінам, агульнапрынятым правілам ды чаканьням. Ён стаў, бадай, узорам прынцыповага інтэлектуала, альбо, як кажуць у расейскай традыцыі, сапраўднага інтэлігента. Гэта яму належала меркаваньне, што сапраўдная інтэлігенцыя засталася ў дакастрычніцкай эпосе, а тыя, з каго бальшавікі зьляпілі рабоча-сялянскую інтэлігенцыю, былі толькі «образованщиной» — вінцікам таталітарнай машыны агульнага прымусу. Аднак вось парадокс, з развалам камунізму попыт на «інтэлігенцыю» ў Расеі практычна зьнік, і для многіх маладых само гэтае слова стала анахранізмам.

За саветамі гонар і традыцыі інтэлігенцыі здолелі захаваць якраз дысыдэнты, і Салжаніцын сярод іх фігура знакавая. Знакавая ў тым сэнсе, што быў у ліку пачынальнікаў дысыдэнцкага руху і пасьлядоўным крытыкам камунізму, перажыў зьдзяйсьненьне сваіх надзей, трыюмф вяртаньня на радзіму і крах нованароджаных ілюзій. Ня многім дадзена перажыць столькі падзей за адно жыцьцё. Напрыклад, камуністычны вязень і адзін зь першых апавядальнікаў пра жахі ГУЛАГу, наш зямляк Францішак Аляховіч, пісаў пра перажытыя пакуты яшчэ ў 1930-я гг., загінуў у 1940-я, але не пачуты сваімі суайчыньнікамі і да сёньня.

***Васіль Аўраменка** — эсэіст, жыве і працуе ў Магілёве.*

Васіль Быкаў стаў дысыдэнтам ужо сапраўдным, «стоадсоткавым» пры канцы жыцьця, і тым самым яшчэ больш далёкім ад зьдзяйсьненьня сваіх ідэалаў, чым у час «разьвітага сацыялізму».

Вядома, нязгодным (dissidens) рэдка ўдаецца пабачыць трыюмф пры жыцьці — ня ў гэтым іхнае прызначэньне. Дарэчы, мо тут і хаваецца разгадка лёсу «сапраўднай расейскай інтэлігенцыі»? Інтэлектуалы на Захадзе, або інтэлігенты ў Расеі, гэта тыя, хто ідзе наперадзе ці, прынамсі, убаку ад зьбітых дарог масавага спажыўца, рабочай клясы ці іншых «стрыжнявых» пуцявін гісторыі. Іхныя шляхі ідуць у кірунку, супрацьлеглым агульнаму трэнду ці «генэральнай лініі» грамадзтва. І гэта нармальна, бо імі выконваецца місія супраціву, процівагі ці апазыцыі паноўнай клясе, партыі, ідэалёгіі. У гэтай якасьці яны патрэбныя заўсёды, каб ураўнаважваць сацыяльныя «перагібы» ці прапаноўваць альтэрнатывы далейшага разьвіцьця. Праўда, у заходніх краінах палітычную альтэрнатыву стварае парлямэнцкая апазыцыя, якая раней ці пазьней час ад часу прыходзіць да ўлады і рэалізоўвае свае палітычныя праекты, пакліканыя выправіць хібы папярэднікаў. Але ж у Расеі XIX ст. не было легальнай апазыцыі, а таму інтэлігенцыі давялося ўзваліць на сябе шмат абавязкаў — і палітычнай, і сацыяльнай, і духоўнай, і культурніцкай альтэрнатывы. Тым часам апазыцыйнасьць заходніх інтэлектуалаў звычайна абмяжоўваецца эстэтычна-мастацкай ці філязофска-літаратурнай сфэрай. Расейская ж інтэлігенцыя, надзеўшы на сябе і строгі сурдут навукоўца ды народнага настаўніка, і вярыгі палітычнага правадыра, і цярновы вянец квазірэлігійнага прарока, замахнулася на немагчымае. Бо палітык — па прыродзе сваёй аптыміст і папуліст, які мусіць казаць народу тое, што ён хоча чуць, а навуковец ці інтэлектуал — звычайна скептык або пэсыміст, які выказвае маларыемныя, а часам проста крыўдныя рэчы, якія адэкватна ўспрымаюць далёка ня ўсе. У больш «вузкай» спэцыялізацыі ды меншай «прэтэнцыёзнасьці» заходніх інтэлектуалаў і хаваецца іх адрозьненьне ад мэсіянскага ўнівэрсалізму расейскіх інтэлігентаў, гэтым і тлумачыцца адносны посьпех першых і няўдачы другіх. Бо, калі інтэлігенцыя прыходзіць у палітыку, а потым ва ўладу, то, набываючы матэрыяльную сілу дзяржаўнай машыны, губляе сваю духоўную моц. Інтэлектуалы зьяўляюцца сілай, пакуль падтрымліваюць слабейшых, але слабнуць ды чэзнуць, калі кааптуюцца ва ўладу.

Такую сьмеласьць і настойлівасьць у сваіх перакананьнях, як у Салжаніцына, мелі нямногія. І зусім ужо адзінкі здолелі данесьці яе да сэрца і розуму прыгнечаных, адурманеных і растаптаных. Сваім чынам Салжаніцын вяртаў расейскай інтэлігенцыі духоўную моц ды інтэлектуальную самастойнасьць, а разам з тым яе спрадвечнае прызначэньне — выступаць на баку слабейшых. Абараняць слабых могуць толькі дужыя, а далучацца да моцных маюць звычку толькі слабыя.

Калі здарылася даўно жаданае — развал камуністычнага калёса, і місія савецкіх дысыдэнтаў была закончаная, пачалося тое, што можна назваць нараджэньнем новых ілюзій. Салжаніцын, які столькі намаганьняў прыклаў для выкрыцьця таталітарнай сыстэмы, не зразумеў тых, хто разьбіраў яе сваімі рукамі, а галоўнае — не прыняў вынікаў гэтага распаду. З-пад антыкамуністычнай ман-

тыі вялікага дысыдэнта вылезла постаць... банальнага «вялікарускага нацыяналіста». Прычым, у вэрсіі не канца XX, а сярэдзіны XIX ст. Акурат «крэўнай сувязьзю» з XIX ст. можна патлумачыць ягоны нацыяналізм і антысэмітызм пры канцы жыцьця. Яшчэ адзін красамоўны факт: са свайго лягернага вопыту Салжаніцын вынес вялікую павагу да чачэнаў, якія на фоне іншых нацыянальных меншасьцяў дэманстравалі прыклады нечуванай стойкасьці і фэнамэнальнай салідарнасьці. Супрацьлеглыя ацэнкі ад пісьменьніка яны атрымалі ў 1990-я гг., калі тыя ж якасьці праявіліся ўжо падчас расейска-чачэнскай вайны. Памяняліся гістарычныя абставіны, зьнешнія ўмовы жыцьця, памяняліся і людзі. Зьявіліся новыя альтэрнатывы і каштоўнасьці, якія разьвялі па розныя бакі барыкад учорашніх «братоў» па імпэрыі.

Былы дысыдэнт крытычна паставіўся да ўлады Ельцына, але вельмі прыхільна сустрэў «новаімпэрскі» курс Пуціна і Мядзьведзева. Ён верна ўлавіў новыя памкненьні расейскага грамадзтва — адбудову імпэрыі (у новай «энэргетычнай» іпастасі), адмову ад дэмакратычнага вопыту Захаду, «выключнасьць» духоўнага вопыту і сацыяльна-палітычнага курсу краіны. Прызнаньне чарговага «перавыданьня» Расейскай імпэрыі — вось вынік змаганьня з таталітарызмам Аляксандра Салжаніцына.

Сёньня ў Расеі час актыўнай палітычнай мабілізацыі. «Мабілізуюцца» ня толькі алігархі, чыноўнікі ды люд паспаліты, але і тыя самыя інтэлігенты, якія былі дысыдэнтамі ў 1970—1980-я, апазыцыянэрамі ў 1990-я, франдзіравалі на пачатку 2000-х. І лёс Салжаніцына ў гэтым сэнсе вельмі паказальны — ніякага прымусу, усё міжвольна, непрыкметна. Цяпер быць у Расеі дысыдэнтам практычна немагчыма, адразу атрымаеш ярлык «прадажнага заходніка», «каляровага рэвалюцыянэра» ці яшчэ якога «тэрарыста-сэпаратыста». Наша зямлячка, бескампрамісная Валерыя Навадворская, усё часьцей прадстаўляецца як эксцэнтрычны пэрсанаж батлеечнага тэлешоў, а не жывы чалавек, які захаваў сумленьне і можа выказаць непрычасаную праўду. Расейская інтэлігенцыя зьнікла, як і ў 1930-я гг., распусьцілася ў масе, нават не будаўнікоў, а ўжо фанатаў «энэргетычнай звышдзяржавы». Надоўга ці назаўсёды? Думаю, што надоўга, бо запасаў энэргіі, прынамсі ў форме нафты і газу, у гэтай дзяржавы хопіць яшчэ не на адзін год.

А што да таго нам? У нас, як ні дзіўна, захаваліся і дысыдэнты, і інтэлігенты, і значная частка грамадзтва, якая падзяляе іхныя погляды. Таму заклік «ня жыць ілжой» больш сугучны нашым грамадзкім настроям. Ды і афіцыёзная хлусьня ў нас больш кандова-«савецкая». Ці добра гэта? Мяркую, добра, бо хоць неяк аддзяляе нас ад былой мэтраполіі і вымушае жыць і думаць не па маскоўскіх лекалах.

Чаму яшчэ можа нас навучыць вопыт Салжаніцына? Як ні дзіўна — больш крытычна ставіцца да мінулага. Абсалютна справядліва, што мы кепска ведаем сваю гісторыю, а яе вывучэньне і папулярызацыю трэба працягваць на больш сучасным і якасным узроўні. Але гонар за сваё мінулае не павінен засьціць вочы, нельга вярнуць даўно зьніклае ў сёньняшні ўжытак. Ніколі не вярнуць Вялікага

Княства Літоўскага, шляхты і яе вольнасьці, гэтак жа як і імпэрыі Раманавых. Новыя палітычныя рэаліі будуюцца зь іншых «цаглінак» — інтарэсаў малога і сярэдняга бізнэсу, прыватызацыі, энэргабясьпекі, экалёгіі, будаўніцтва АЭС, пэнсійнай рэформы, дэмаграфічнага спаду, праблемы мястэчак і малых гарадоў, супрацьстаяньня алькагалізацыі і г. д. У рэальнай палітыцы далёкая гісторыя мае сымбалічны сэнс, блізкая — больш практычны, бо ўплывае на стратэгічныя мэты і спосабы іх дасягненьня. Аднак у цяперашніх умовах, на маю думку, самая дзейсная нацыянальная палітыка — «стратэгія малых спраў», калі кожны ўрабляе сваю прыватную «пляцоўку» ў бізнэсе, на працы, у коле сяброў ці ў сям'і, зь якіх і складзецца новая рэальнасьць. А калі нават і гэты варыянт немагчымы, то застанецца апошні сродак, прапанаваны калісь Салжаніцыным, — ня ўдзельнічаць у падмане, жыць без ілжы, каб сам час падтачыў асновы хлусьні і несправядлівасьці.

*Магілёў*

# SUMMARY, No. 9 (72), 2008

The issue was published shortly after the parliamentarian elections conducted in Belarus on September 28, and contains several analyses on its background and the political consequences.

Director of the Belarusian Institute of the Strategic Studies (BISS) **Vital Silicki** in his «**The Game with Risen Stakes: Official Minsk's Quest for Legitimization**» writes on the political maneuvering of official Minsk before the election. After bloody Russian invasion on Georgia the frustrated Lukashenka regime sent some significant sings to the European political community (for instance discharging Lukashenka's co-runner in 2006 presidential election Alaksandar Kazilin), trying to achieve additional guaranties of its own stability and convince the western economic actors to invest in the Belarusian economy.

A political observer **Jury Čavusaŭ** in his «**The Balance of Power within the Belarusian Opposition before the Parliamentary Elections**» sketches the opposition activity between major political campaigns in Belarus as well as the redistribution of the opposition capital, detente towards the West, blackmail policies etc.

Political science professor from the European Humanities University **Taciana Čulickaja**, in her «**Russian-Georgian War in the Media Space of Belarus: from the «Forced Friendship» to the Surrender after Unsuccessful Revolt**,» retraces the reaction of the official media to the Russian-Georgian war, which was relatively moderate and even critical towards Russia in spite of the initial expectations. The official media adopted the pro-Russian rhetoric only after the strongly-worded statements made by the Russian ambassador in Belarus Mr. Alexander Surikov and other Russian politicians and on the threshold of the official meeting between the Belarusian and Russian presidents in the end of August.

Mentioned above **Vital Silicki** and his colleague from BISS, political expert **Dzianis Mieljancoŭ** in their «**Parliamentary elections: Glass Half-Full or Glass Half Empty**?» express doubts that the rapprochement between Belarusian regime and western political community including EU and USA could be a stable and durable process. They argue that the dialogue was initiated without establishing the basis for common values, tough conditionality, and clear and non-negotiable benchmarks for the new accommodating moves towards the Belarusian authorities. Hence, the dialogue looks like political bargain, because it depends on the momentary geopolitical juncture and the variable political interests. The Belarusian regime, rooted in the Eurasian despotism, remains incompatible with the modern European political culture.

Finally a political expert of the European Council on Foreign Relations **Andrew Wilson**, in his analysis «**Belarus's Post-Georgia Elections: A New Paradigm or the Same Old Balancing Act?**» tries to forecast the short term policy implications of new Lukashenka 'titoist' game, i.e making periodic and secondary overtures to the West to secure the maximum gains in the primary game with Russia.

# SUMMARY, No. 9 (72), 2008

A set of essays «**Why I Became a Civic Activist, but my Classmates Didn't**» tells on the motivations of the decent, which urge some prominent young leaders and personalities on political or public activism. Among the authors are Viciebsk-based activists **Volha Karač** and **Vital Broŭka**, Minsk-based **Darka Słabčanka**, **Juraś Mielaškievič**, and **Michaś Paškievič**; **Aleś Čyhir** from Babrujsk, and **Aleś Zarembiuk** from Masty.

Editor in chief of «CD-mag» multi media magazine **Iryna Vidanava**, in her «**New Media as a Form of the Youth Resistance**» considers the Internet as a last stronghold of the independent Belarusian journalism under Lukashenka rule. The political commentator of the Radio Liberty Belarusian service **Jury Drakachrust** in his «**The Cultural Types and the Political Process**» sorts out the cultural preconditions for the existing political orientations within the Belarusian society. The former deputy chief of the oldest oppositional party in Belarus, Belarusian Popular Front (Biełaruski Narodny Front in Belarusain), **Aleś Michalevič**, in his «**Generations in Belarusian Popular Front**,» reconstructs its history, including intergeneration divisions within the party, the clash of the personal ambitions etc. The head of the of the Belarusian-American Association, oldest and biggest Belarusian national organization in the United States, **Viačka Stankievič**, in his «**The New Wave of Emigration: Different Goals and Values**,» suggests that the Belarusians, who emigrated in the United States not long ego, are generally more consumption-oriented than their compatriots who arrived to the US after WW II. He argues that a majority of the emigrants in the new wave are not interested in Belarusian issues, and that they do not participate in public activities. Many of them are only interested in their careers.

Professor **Lucan Way** from the University of Toronto (Canada), in his «**The Power and the Weakness of the Modern Authoritarian Regimes**,» states that the political regime of Belarus is not an impenetrable stronghold, but rather has both strengths and weaknesses. However, the society's ability to exert any pressure upon this regime is limited.

The ARCHE issue presents for the Belarusian readers the rendition of **Kathleen J. Hancock**, political scientist from the University of Texas, San Antonio, piece «**The Semi-Sovereign State: Belarus and the Russian Neo-Empire**», originally published in «Foreign Policy Analysis» Vol 6, p.117—136. (2006); fragments **Noam Chomsky** popular book «**Understanding Power**;» as well as lyrics of the Belarusian poets **Andrej Dyńko** and **Andrej Chadanovič**; and a short essay of Mahiloŭ based essayist **Vasil Aŭramienka** in memory of Alexander Solzhenitsyn.